Вольга КУРТАНІЧ

ЗАЛЮСТРЭЧЧА ДЛЯ АЛІСЫ

Вольга Куртаніч

ЗАЛЮСТРЭЧЧА ДЛЯ АЛІСЫ

Раман-парафраз, аповесці, п'еса, апавяданне

Мінск
«Беларускі кнігазбор»
2003

УДК 882.6-3
ББК 84 (4Беи) 6
К 93

Куртаніч В.

К 93 Залюстрэчча для Алісы: Раман-парафраз, аповесці, п'еса, апавяданне / В. Куртаніч. – Мн.: «Беларускі кнігазбор», 2003. – 312 с.

ISBN 985-6638-98-4.

Кніга В. Куртаніч арыентаваная на чытача-сааўтара, здольнага не проста суперажываць літаратурным персанажам, а пражываць іх лёсы. Паэтычны і жорсткі свет пачуццяў, пакутлівыя пошукі гармоніі ў абсурдзе паўсядзённага жыцця асветленыя тут неверагоднай шчырасцю аповеду — і празаічнага (у зборнік увайшлі раман-парафраз, аповесці, апавяданне), і драматычнага (п'еса «Ружы для чужога каханка»). Гэта кніга для тых, хто сумуе па вытанчанай і адначасова эмацыйна-аголенай, пранізлівай літаратуры.

УДК 882.6-3
ББК 84 (4Беи) 6

Аўтар выказвае шчырую ўдзячнасць
за дапамогу ў выданні кнігі
Старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі
Леаніду Пятровічу Козіку,
а таксама свайму сябру, грамадзяніну Італіі
Філіпа Вейцману.

ISBN 985-6638-98-4

© Куртаніч В., 2003

ЗАЛЮСТРЭЧЧА ДЛЯ АЛІСЫ



Гэтая дурнічка вельмі любіла прыкідвацца дзвюма рознымі дзяўчынкамі адразу*.

I

Я ведала, што які-небудзь дзень свайго жыцця я назаву пераломным. Мінуў месяц з таго часу, як загінуў на пласе хуткакрылы крамяны гарэза Купідон і з пульхных ручак яго выпаў маленькі лук. Пэўна ж я перажывала прысуд, вынесены маім мужам — маім былым мужам — гэтаму няшчаснаму боскаму стварэнню. «Ты яшчэ будзеш кахаць, і неаднойчы», — сказаў мне на развітанне Сымон.

Пасля трох год сумеснага жыцця нашы сапраўдныя пачуцці нагадвалі безыменных жыхароў прыфрантавых мястэчак, і калі Сымон кінуў мяне, — я толькі і рабіла, што прыладжвала белы сцяг часовай разгубленасці на дрэўка ахвярнасці.

Падчас трохгадовых побытавых баталій мяне не цікавілі такія магчымыя перадышкі, як: спецыфічна-сітуатыўная, геданісцкая, душэўная, зацягненая, заблытаная, якая падтрымлівае шлюб, якую трэба прымаць належна перад скасоўваннем шлюбу, — адным словам, здрады. Таму я запанікавала і, па ўсіх правілах сентыментальных раманаў, пачала праяўляць абыякавасць да жыцця. Я ведаю гісторыі, дзе пакрыўджаныя гераіні змагаліся за сваё шчасце, каб вярнуць няверных і «заблукалых» ці не для таго, каб адразу адпомсціць. Але сама была не з тых, «хто можа пастаяць за свае правы», — гэтак сцвердзіла мая адвакатка. Я была занадта маладая, каб зразумець: развод і пройгрыш на полі бою рэчы не ідэнтычныя; але, калі зрабіць некалькі маленькіх намаганняў над сваёй воляй, што дагэтуль прагнула адно няволі і залежнасці, дык высвятляецца, што дзень шлюбу і дзень разводу аднолькава лёсаносныя. У першы — ты надурніцу ахвяруеш сабой, у другі — ты па шчаслівай выпадковасці атрымліваеш сябе назад.

Мне было дваццаць два гады, і пры ўважлівым аглядзе можна запэўніцца, што гады шлюбу не сапсавалі ані твару, ані фігуры;

---

* Гэтая і ўсе далейшыя вытрымкі ўзятыя з кнігі Л. Кэрала «Прыгоды Алісы ў краіне цудаў. Аліса ў Залюстрэччы».

бляск недаспаных вачэй, худзізна, што прыкінулася, як хвароба, ад ляжання на нечакана мулкім ложку, нездаровы румянец яшчэ больш зрабілі мяне падобнай на Шэран Стоўн*. Толькі без яе сексуальнай усмешкі і ўпэўненай разняволенасці. Але з таго, што засталася адна, я не згубіла жаноцкасці і зразумела гэта вераснёўскай раніцай.

Як зазвычай: падхапілася ў апошнюю хвіліну. У вакне — шэрасць, хмары паціху завалаквалі неба — малюнак, адпаведны майму настрою пакутніцы; але чамусьці ўсё цяжэй было іграць гэтую ролю для сябе адной... Пасля кубка моцнай кавы я паадзявалася ва ўсё чорнае, бы ўдава, і ўжо рушыла, як заўважыла на блішчастых рабрынах сумачкі сонечных зайчыкаў. Яны скакалі так жвава-няспынна-хціва, так апантана, што я ўмомант пераапранулася ў ружовую блузку, белую лёгкую спадніцу і выслізнула за дзверы. Але пакуль бегла да прыпынку, узгадала, што засталася рэч, якая гарантуе процьму праблем: і гэтая рэч — на мне! Я тут жа павярнула галаву і сустрэла позірк мужчыны, які абмінуў мяне. Падалося: ён разглядвае маю белую італьянскую спадніцу, але ўжо ззаду. Бегчы дадому — значыць канчаткова спазніцца на працу, але ж мой шэф павінен быў атрымаць разабраную пошту роўна ў дзевяць трыццаць! Ірвануўшыся назад, я спынілася і зрабіла выратавальны, амаль інстынктыўны жэст. Міма праехала машына, але прыпынілася і пачала падкатвацца задам. Калі б інстынкт спрацаваў на хвілю пазней, гэты іхтыязаўр шчасліва б размінуўся з прыхільніцай сучаснай тэхнікі. Мой былы муж меў новенькі Nissan. Сузіранне доўжылася хвіліну, але я адчыніла дзверку, села ззаду і назвала адрас. Краем вока я зірнула ў люстэрка, што вісела на лабавым шкле, і ў мяне адразу ж пацямнела ў вачах. Нечаканапакорліва я змірылася са сваёй прысутнасцю ў слепка-аранжавым «масквічы», а разам з тым і прысутнасцю чорных трусікаў пад белай спадніцай... Але зусім ненадоўга, бо ўявіла, як выйду з машыны і гэты прыгожы юнак будзе праводзіць мяне поглядам, — і вочы ягоныя апынуцца на ўзроўні майго заду. Толькі з пачуцця жаночай непрадказальнасці: каб не прынізіць густ эстэта, калі ён аказаўся побач, я асцярожна сцягнула кавалачак чорнай тканінкі са свайго цела і цнатліва паклала ў сумачку.

— Не, вы толькі падумайце! — казала яна. — Які сёння дзіўны дзень? А ўчора ўсё ішло як зазвычай. Можа, гэта я змянілася за ноч? Дайце ўзгадаць: сёння раніцай, калі я ўстала, я гэта была ці не я?! Здаецца, ужо не зусім я! Але калі гэта так, то хто я ў такім разе? Усё так складана...

---

* Амерыканская актрыса.

І. І. сустрэў мяне незадаволеным позіркам, калі ў дзевяць сорак я зайшла ў кабінет з ранішняй поштай. Я міла павіталася і павярнулася да яго спіной, адчуўшы, як магнэз начальніцкай улады губляе сілу і становіцца інертным. Я выходзіла ад яго імкліва і ўладна, з перавагай руплівай пчалы, якая адмахваецца ад павуціння пад здзіўленым поглядам драпежніка-павука.

— Аліса, — дагнаў мяне ягоны голас. Я павярнула галаву; твар шэфа бледны і зацяты.

— Што?

— Я папрашу вас яшчэ хвілін дваццаць ні з кім мяне не злучаць.

Я згодна кіўнула. Ён рэдка наважваўся падымацца з-за стала, калі я стаяла. Як усе невысокія мужчыны, І. І. камплексаваў; але інстынкт паляпшэння роду прымушае такіх цягнуцца да высокіх жанчын: я падабалася шэфу, — і даўно.

Я села на месца ў чаканні будучых распараджэнняў, праверыла факс і правяла адыход раніцы салодкім позяхам, пасля адкінулася на спінку зручнага фатэля, заплюшчыла вочы і акунулася ў прыемныя ўспаміны. За апошні месяц іх было няшмат, а дакладней — роўна на дзесяць хвілін сённяшняй дарогі з прыгожым незнаёмцам. Маё радаснае ўзбуджэнне і загадкавую ўсмешку перапыніў наўмысна-стрыманы голас: І. І. некалькі разоў паўтарыў маё імя. Мяккі кілім суцішыў ягоныя крокі. Усе гады сумеснай працы ён быў настолькі разважны і стрыманы, што аніразу не прапанаваў сябе ў якасці насоўкі, хаця зрэдзьчас у ягоным поглядзе лёгка чыталася спачуванне. Ён нахіліўся да мяне, зірнуўшы на экран камп'ютара, што стаяў на стале, і папрасіў зрабіць яму кубак гарбаты.

— Можаце зрабіць і сабе, — дадаў шэф.

Нехта колісь сказаў мне, што І. І. літаральна разумее алегорыю, згодна з якой цела габрэя ўтрымлівае пачатак душы, і калі цела будзе пахаванае ў чужой краіне, то гэты пачатак не супакоіцца, покуль не дасягне святой зямлі Ханаанскай. І. І. штогод наведваўся ў Палесціну і шторазу прывозіў адтуль цудоўную гарбату, якую мы часта пілі разам.

І. І. меў цвярозы розум і ў бізнесе моцна стаяў на нагах, што абавязвала мяне праяўляць цвёрдасць і прадбачлівасць — якасці, мне не ўласцівыя. Але ў школе я займалася ў драмгуртку, была вытанчанай, наіўнай, а цяпер да таго ж і незалежнай. І калі ў тэхніцы мне імпанаваў дызайн, дык у мастацтве, як і ў жыцці, — рэтра: старую італьянскую школу майстроў жывапісу я ўспрымала гэтак жа замілавана, як і праявы рэтраградства ў паводзінах шэфа. Ён быў цвёрды ў рашэннях і амаль ніколі не памыляўся, а мая роля заключалася ў тым, каб прыцягваць кліентаў загадкавасцю жыво-

га антычнага профілю. Так сказаў мне адзін з наведвальнікаў, калі пачуў, як І. І. назваў мяне Юнонай.

...У абед я выскачыла з офіса і па сугуччы настрою з нечакана сонечным вераснёўскім поўднем рушыла ў Купалаўскі гаёк. Я стаяла на беразе Свіслачы, глядзела на дрыжэнне дробных зялёных водарасцяў і час ад часу кідала хлебныя шарыкі ў ваду, дзе куёўдзіліся шэрыя качкі. Яны перагаворваліся адна з адной, перакідвалі склады і злучалі іх у імя: «Дзя-мьян». Так звалі маладога чалавека, які падвёз мяне раніцай на працу. І ўжо было лёгка думаць пра ўзаемнасць і палкую стому: цяпер я хацела гуляцца з кімнебудзь, як котка з мышшу, я магла сабе дазволіць вылізаць поўсць і выпусціць кіпцікі. І не заўважала, як стары хітры кот ладзіць для мяне пастку...

Увечары мы сустрэліся з Дзямьянам. Я адмовілася ехаць на аранжавым выкапні, і ён прыйшоў пешкі. Счакаўшы, покуль я спусцілася з прыступак працоўнага будынка, ён рушыў па праспекце. Я ледзь паспявала, не ведаючы: што прымушае ісці за ім, але не супраціўляючыся і не разважаючы неслася подбегам, гледзячы на мужчынскія ногі, — звышхуткасць не дазваляла падняць галаву без боязі спатыкнуцца. Але ў нейкі момант я адчула, як у глыбіні прачынаецца настальгія даўно прамінулага матрыярхату, абуджаючы кволую раз'юшанасць; спынілася, засопшыся. Мой бажок зрабіў яшчэ колькі крокаў. Ягоны слых аказаўся чуйным. Ён вярнуўся да мяне і спытаў:

— Стамілася?

Я ўдзячна кіўнула. І вось цяпер мы ішлі побач. Дзямьян прытрымліваў мяне пад руку; як плыткія рыбкі, мы віравалі ў натоўпе. Праз колькі хвілін ён павярнуў у завулак і спыніўся ля кавярні. Толькі ў ідылічным прыцішаным святле я ўся затрымцела з таго, што нарэшце мы засталіся сам-насам. Цяпер можна аддыхацца і ўважліва разгледзець новага знаёмца.

— Вы і зараз без трусікаў? — запытаў ён, інтымна нахіліўшыся. Шчокі мае запалымнелі. Значыць, у нейкі момант ён павярнуў галаву, я была не зусім асцярожнай, калі рабіла гэта ў ягонай машыне. Мне трэба было падняцца і сысці, але я чамусьці прашаптала:

— Не, я ў абед купіла іншыя.

Ён не засмяяўся, не зірнуў іранічна, а неяк строга і па-дзелавому кіўнуў. Мы сталі змоўшчыкамі, і за гэта я была поўная ўдзячнасці. Пэўна, мы былі раўналеткамі: ён сказаў, што закончыў універсітэт і зараз вучыцца ў аспірантуры. Звонку — разняволены, фланэлевая кашуля — у такіх мужчыны падобныя на мяккіх плюшавых звярынак, з якімі ўсе дзяўчаткі спяць у дзяцінстве, і, мусіць, з таго я адразу ж адчула да яго давер. Зверху на кашулі два гузікі

былі расшпіленыя, і мне захацелася прыціснуцца вуснамі да цёплай шыі — акурат побач са скураным ключыкам, які звабліва вісеў на тонкім шнурку. На руцэ ў Дзямьяна я ўгледзела тоўстую скураную бранзалетку. Дзіва, але ўпрыгожанні выглядалі на ім натуральна, не надаючы жаноцкасці. Калі некаторыя мужчыны вешаюць галовы жывёл у сваіх дамах, дык чаму б не павесіць на сябе сувенір са скуры тых жывёл?

Я пачала азірацца. Мяне ахапіла пачуццё нечага даўно знаёмага. Дзямьян позіркам паказаў на стол: перада мной паставілі сок і пірожнае.

— Я куплю цыгарэты, — папярэдзіў, каб я не кінулася следам, як толькі ён устане. Я прасачыла поглядам: высокі, моцны, мускулісты — смутак цнатлівых дзяўчат. І тут жа выкрэсліла са свайго жыцця Сымона, адваката, шлюб, а з дрэўка белага сцяга зрабіла крыж. «Не буду ні пра што шкадаваць, нават калі нічога не атрымаецца з Дзямьянам», — сцвердзіла сама сабе, каб потым не расчароўвацца. Але адчула лёгкі ўкол у сэрца, калі ён зноў падсеў побач і выцягнуў з пачака цыгарэту.

II

Я не сказала, што мой шэф меў галерэю. І акрамя таго, што я працавала сакратаркай, на мне былі абавязкі прысутнічаць на кожнай прэзентацыі, а перад тым — весці перамовы з некаторымі мастакамі. Шэф лічыў, што мой густ адпавядае ягоным канонам.

Два дні пасля сустрэчы з Дзямьянам прайшлі досыць сумна: мы не бачыліся. Ён сядзеў у лабараторыі ці ў бібліятэцы, дзе змалёўваў і апісваў жыццёвы цыкл рэтравіруса. Я запомніла гэтую назву з-за прысутнасці ў ёй любімага слова. На трэці дзень я з'ехала дадому папалудні: пераапрануцца перад доўгачаканай прэзентацыяй. Я збіралася застацца на другім плане, паводзіць сябе так, каб не справакаваць пытанні знаёмых заўсёднікаў: «Чаму ты сёння адна? Ці не захварэў Сымон?»

> *— Нічога не зробіш, — запярэчыў Кот. — Усе мы тут трохі без клёку ў галаве — і ты, і я.*
> *— Адкуль вы ведаеце, што я без клёку? — спытала Аліса.*
> *— Безумоўна так, — адказаў Кот. — Іначай як бы ты тут апынулася?*

Я ўпершыню была на прэзентацыі без Сымона. І амаль адразу ж апынулася насупраць Фаіны Шлейль — даўняй сяброўкі шэфа.

Яна заўжды апякала яго, і мне таксама даставалася крыху ўсеўладнай любові ўладальніцы пульхнай таліі і забаўна-вялікіх грудзей. Кожны раз яна падкрэслівала сваю прыналежнасць да арыйскай расы мізэрнай колькасцю спіртнога і неверагодна таннай закускі. «Wie in der Heimat»,* — казала яна і закатвала вочкі. Закускі былі надзіва прыдатнымі, а спіртное дакуплялі ў бары, які месціўся ў канцы залы. Там, у адрозненні ад der Heimat, было ўсё.

Апярэджваючы яе цікаўнасць да маёй сям'і, я на ўсялякі выпадак запытала, ці падабаюцца ёй карціны? Я сама ездзіла да мастака ў Клічаў.

— Што? Карціны? — перапытала яна, нібы я хацела даведацца: які рахунак яна выставіла І. І. за гэты вечар. — Як заўсёды. Мілыя.

Я бачыла, якім уважлівым становіцца яе погляд і інстынктыўна пачала шукаць новую тэму. З'яўленне І. І. з двума келіхамі шампанскага я ўспрыняла як выратаванне. Ён даў мне келіх і пацягнуў за сабой. Не ведаю, ці не са шкадобы я абула лакавыя туфлікі без абцасаў. Удзячнасць шэфа я адчула шостым пачуццем. І. І. расправіў плечы, у постаці з'явілася царская веліч. Уся світа азіралася нам услед: дырэктар банка, апостал-пісьменнік, некалькі дзелавых людзей, блізкіх да мэрыі, і пасол замежнай дзяржавы. Царок вырашыў даць аўдыенцыю ўсім адразу наведвальнікам. Пры гэтым мастак з Клічава і пара-тройка ягоных сяброў выглядалі рыхтык разгубленымі анархістамі.

> *— Скажыце, калі ласка, куды мне адсюль ісці?*
> *— А куды ты хочыш трапіць? — адказаў Кот.*
> *— Мне ўсё-адно... — сказала Аліса.*
> *Тады ўсё-адно, куды ісці, — заўважыў Кот.*
> *— ... толькі б трапіць куды-небудзь, — патлумачыла Аліса.*
> *— Куды-небудзь ты абавязкова трапіш, — сказаў Кот. — Трэба толькі досыць доўга ісці.*

Фаіна палічыла сябе абдзеленай увагай і памкнулася за намі. Яна заўжды хацела быць усюды. Застаючыся гады чатыры ва ўдовах, кабета марыла калі не ажаніць І. І. на сабе, дык уладкаваць ягонае жыццё. Відавочна, паміж імі была сувязь, але я ніяк не магла вызначыць характар гэтай сувязі...

Я стаяла побач з дырэктарам банка і апісвала яму нішчымнае жыццё мастака, убачанае на свае вочы, сцвярджаючы тым самым, што калі б не гэтыя абставіны, цана на карціну была б значна вы-

---

* Як на радзіме! (*ням.*).

шэйшай. Я разумела абсурднасць таго, што геніяльныя творы нараджаюцца толькі ў галечы. Банкір згодна ківаў галавой, праз маску знявагі і пагарды праглядаўся ледзь бачны бляск сквапнасці: карціна яму падабалася. Калі б І. І. схацеў, дык загадаў бы апісваць вартасці карцін адных балбатлівых хлопчыкаў; хлопчыкі гэтыя працавалі ў галерэі, мяне ж аддавалі ім на дапамогу ў дні прэзентацый: І. І. даплочваў, а я мела магчымасць набываць кнігі па мастацтву і займацца самаадукацыяй... Ужо быў засведчаны рух да змены: банкір па-новаму тарганўў падбароддзем і крыху змяніў тон. Месца знявагі заняла спачувальная цярплівасць да майго палкага, але асцярожнага аповеду. Я заўважыла рух — І. І. працягнуў руку за пустым келіхам. Тут жа адбылася замена, мае пальцы сціснулі крыштальную ножку. Я запытальна азірнулася, але шэф ужо адышоў і размаўляў з апосталам, які стаяў у атачэнні служкаў і німфаў. Адтуль чуўся смех, і мне захацелася кінуць незгаворлівага чыноўніка і далучыцца да вясёлай кампаніі. Але для гэтага мне не хапала аднаго: подпісу на разліковым білеце ці хаця б абяцання заплаціць.

Мой шэф аж ззяў ад задавальнення цалюткі вечар. Ён быў вядомым дзялком і на ягоныя запрашэнні адгукалася салідная публіка. Нарэшце банкір пагадзіўся набыць карціну. Я пераможна зірнула на І. І. і накіравалася да мастака, але патрапіла ў чэпкія рукі Фаіны і была змушаная нейкі час далікатнічаць з купкай маладых людзей, якія жлукцілі шампанскае ды паглядалі шалёнымі вачыма на неабдымны бюст. Фаіна называла мяне «дзіця», у яе тоне чулася спачуванне, досыць штучнае, каб падацца шчырым. Але І. І. і гэтым разам па-гаспадарску вызваліў мяне.

— Аліса, ёсць кліент. Яго прывёў прафесар...

І. І. назваў прозвішча. Удзячнасць і расчараванне апанавалі мяне, і, каб дамагчыся раўнавагі, я вырашыла выпіць больш звычайнага. Віноўнік мерапрыемства па-ранейшаму стаяў у куце. Пэўна, ён нават не дакрануўся да спіртнога.

І раптам удзячнасць ператварылася ў стому, расчараванне — у суцэльны адчай, а ў спалучэнні яны набылі падабенства з вірусам. Вірусам, які вылечвае толькі адзін сродак, — каханне. Мне ж давалася магчымасць хіміятэрапіі — піць да моцы божай.

З новым пакупніком я размаўляла нядоўга, ён захацеў бліжэй пазнаёміцца з мастаком, мы знайшлі яго ўжо ў бары... Мы пілі кактэйлі адзін за адным; я чула, як за спіной гудзеў рой, але не паварочвала галавы. І. І. застаўся ў зале. Наш новы суразмоўца займаўся значнай, але невыразнай справай кшталту: памочнік намесніка па культурных сувязях, супрацоўнік інфармацыйнага аддзела. Ён адразу ж прапанаваў мастаку наладзіць выставу без

пасрэдніцтва І. І. Але не знайшоў праявы належнай цікаўнасці; памочнік па культуры не ведаў, што ўжо існуе кантракт, які на бліжэйшыя гады не дазваляе мастаку прымаць ніякіх рашэнняў без згоды І. І. Мне захацелася ўзненавідзець шэфа за падабенства з турэмшчыкам, але я не змагла выціснуць з сябе нават кроплі абурэння. Калі я выкажу І. І. усё, што зараз думаю, то згублю прывілеяванае жыццё: паездкі на таксі, дарагія кнігі, гарбату з Палесціны і праявы іншых бесклапотных, але дарагіх сэрцу падзей. Але, здаецца, шчаслівы час заканчваўся — я пачала задумвацца: дык хто ж я на самой справе — сакратарка, мастацтвазнаўца, антычная статуэтка ці бедная дурніца? Колькасць выпітага пацвярджала — апошняе. Хаця лепш бы мне суцяшаць сябе, гледзячы ў люстра; я хацела належаць да дзяцінства чалавецтва — да антычнасці.

— Твой шэф увесь час сочыць за табой, — гэта мастак. Я адмахнулася ад яго слоў, рукой зачапіла келіх, ён гучна грымнуўся аб падлогу. Мне стала смешна. Несапраўдны кліент адсунуўся, але працягваў з цікаўнасцю назіраць. І. І. спыніўся разам са сваёй світай. Фаіна памкнулася да мяне. Я адчула, што гатовая расплакацца, як дзіця; нешта ўва мне хвалявалася: даўкае і казытлівае адчайнае адначасова. Я падняла вочы на мастака, ён шчыра зайздросціў. З усіх прысутных мне быў бліжэй гэты местачковец, беспрытульны і адзінокі ў святочныя для яго хвіліны. Што ён хацеў сказаць — не ведаю. Яго апярэдзіла Фаіна.

Не памятаю як, але значна пазней я апынулася ў чужым доме, на канапе і, абкладзеная падушкамі, бездапаможна балбытала пра мужа, які кінуў мяне, з-за чаго цяпер, як сляпому цуцыку, даводзіцца блукаць па жыццёвай пустэльні ў пошуках чужых слядоў, якія час ад часу ўсё-ткі трапляюцца. Балазе, Фаіна нічога не распытвала — спадзеючыся на шчырую адкрытасць пьянаватай жанчыны, — іначай бы я расказала пра Дзямьяна і недарэчны выпадак у машыне... Не ведаю, ці клалася спаць гаспадыня, але калі я прачнулася, яна сядзела побач. Зазваніў тэлефон; Фаіна каротка некаму адказала, пры гэтым уважліва паглядзела на мяне. Як высветлілася, мяне чакала неверагодна хвалюючая сустрэча з абураным шэфам. І нават не здзівіла тое, што ён захацеў мяне бачыць у выхадны. У галаве круцілася фраза: «Вольналюбівая на рэтравірус». Блазнота! Я папрасіла аспірын і прыняла яго, як асуджаная на смерць. Фаіна глядзела стомлена і скрушна. Яна была зусім не старая — гадоў сорак, сорак пяць. Але магла быць маёй маці. Праз паўгадзіны адбылася першая сустрэча з І. І. у нязмушанай хатняй абстаноўцы.

III

— Прабачце, але я не зразумела: падарунак на дзень ненараджэння? Што гэта такое?
— Падарунак, які табе дораць не на дзень нараджэння, вядома... Значыць, так: трыста шэсцьдзесят чатыры разы на год ты можаш атрымаць падарункі на дзень ненараджэння...

Першае, што я памкнулася зрабіць, — сысці, знайсці якое-небудзь надзейнае прыстанішча: згубіцца ў шэрагу бязлікіх манашак ці заснуць навечна на гліняным бачку этрускай вазы. Але з першых слоў І. І. ува мне прачнулася прага жыцця. Шэф размаўляў са мной, гледзячы ўбок, і некалькі хвілін я адвольна вывучала ягоны, злёгку прымяты, стомлены твар. Я забылася, што ён усеўладны, упэўнены, дзейсны і энергічны: зараз ён быў падобны на ветэрана, які зняў медалі, каб лішні раз не нагадваць пра няўмольную адлегласць пакаленняў. І ўжо я была гатовая суцяшаць яго, як матуля. Калі розум і падмануў мяне, то ненаўмысна; зрэшты, вінаватай павінна была пачувацца я, а не гэты стомлены чалавек. Тады з чаго ён размаўляў са мной тонам правіннага дзіцяці, калі прапаноўваў богведама якія падарункі, — а я ўспрыняла іх як належнае, заслужанае?

— Аліса, я магу вызваліць вас ад сакратарскіх абавязкаў. Я ведаю вашу прагу да навукі і ўменне завязваць знаёмствы сярод мастакоў. Калі б вы падвучыліся, з вас атрымаўся б неблагі мастацтвазнаўца. Цяпер, калі вы вольная... калі ў вас шмат вольнага часу, — паправіўся І. І., — вы зможаце вучыцца. Гэта ў інтарэсах нашай фірмы.

Я сядзела чырвоная і расчуленая. Фаіна паслужліва выйшла, каб прынесці нам шыпучую мінералку. Потым, узгадваючы гэтую сцэну, я не знайшла фальшы ні ў вінаватасці І. І., ні ў паслужлівасці Фаіны, хаця менавіта гэтае і павінна было насцярожыць.

Я прывяла сябе ў парадак, і мы ўтрох паехалі абедаць у Траецкае. Гэты раён падаваўся мне букалічным, і я з задавальненнем аддала б перавагу чаму-небудзь больш значнаму, але зразумела, што гэтым выбарам І. І. падкрэсліў сваю талерантнасць. Мы размаўлялі як партнёры; я згубіла асцярожнасць, што, зрэшты, уласціва маладым жанчынам. Ці не лепш было сядзець дома — ускудлачанай, панылай на непрыбраным ложку, — і трэсціся за тое, што жыццё мінае, — у той момант, як свет выглядаў трывалым. Фаіна паабяцала падшукаць для мяне курсы ці прыватных настаўнікаў. Яна далікатнічала, падсоўвала мне шакалад і лёды. У гэты момант мяне цікавіла магчымасць пазбавіцца ад сакратарскага стала і разам з тым застацца нічым не абавязанай І. І. Пасля нядоўгіх

разваг я паведаміла шэфу, што згодная паспрабаваць. І. І. нават не прыхоўваў задаволенасць.

— Аліса, вы павінны з'ездзіць у Сухумі. Я вырашыў выставіць Рэваза.

— Джавані?

— Так. Я перагледзеў каталогі і вырашыў, што ён нам падыходзіць.

Я ўзрадавалася. Рэваз мог бы стаць мне сябрам, але пакуль што нас звязвала ліставанне і званкі; выставіцца ў галерэі І. І. было за гонар. А я магла б стаць пастаянным агентам І. І., бо дагэтуль была толькі аматаркай. І калі дзякуючы таленту і адукацыі ўдасца заняць больш сталае месца ў фірме, то мне дазволяць заключаць здзелкі. А гэта прамая выгада ў грашах. Магчыма, да сарака я змагу займець сваю маленькую галерэю.

— Я паеду.

— Гэта трэба зрабіць хутка. Я хачу, каб ён падрыхтаваў работы праз месяц. Ты праглядзіш і адбярэш.

Я не звярнула ўвагі на тое, што са мной пачалі гаварыць на «ты».

— Гэта стане святам для мінчан. Калі ў лістападзе будзе кепскае надвор'е, мы зможам заманіць да сябе буйствам фарбаў і падорым людзям кавалачак лета!

— Ты правільна зразумела. Збірайся. У панядзелак закажаш білеты. Тры дні табе хопіць?

— Тры дні?

Гэта быў неверагодны падарунак. І. І. адпраўляў мяне на тры дні! І калі ў Абхазіі цёпла, я змагу паплаваць у моры.

Мы дапілі кактэйлі і выйшлі на вуліцу. Я глядзела на шэфа, сумеўшыся ад здзіўлення. Ён нагадваў Санта-Клаўса.

— Я хачу, каб ты купіла сабе кветкі. Досыць пачувацца няшчаснай. Жыццё не закончылася з адыходам мужа.

Ён упершыню адкрыта загаварыў пра гэта. І. І. рэдка быў шчодры. Ён не выказаў жадання, не параіў, а загадаў, і я разгубілася. Тады І. І. сам зайшоў у кветкавую краму і выйшаў адтуль з букетам дзіўных садовых руж сорта «Пікадылі». Мяне песцілі, як маленькую дзяўчынку, і калі б мне адразу не ўдалося заціснуць нервы ў пругкі камяк, Фаіна разам з І. І. атрымала б новую порцыю слёз — расчулена-ўдзячных. Шэф перакінуўся некалькімі фразамі з Фаінай і пакінуў нас. Мы развіталіся нязмушана і цёпла. Спасылаючыся на справы, мне ўдалося выправіць Фаіну дадому. Я знайшла тэлефон-аўтамат і набрала нумар Дзямьяна. Покуль круціўся дыск, я зрабіла тое, што не павінна была рабіць: успрыняла дабрадзейнасць шэфа за кошт сваіх талентаў, заганяючы чарвячка ў сярэдзіну яблыка сумнення.

IV

У панядзелак я замовіла два білеты да Сухумі; адзін з іх за кошт фірмы. Мне ўдалося ўгаварыць Дзямьяна ляцець разам. І мы аніколькі не шкадавалі. Нас пасялілі ў пансіянаце; за сценамі, як горны паток, — цурчэў, віраваў і пырскаў — незнаёмы гвор. Мая кватэра — два невялікія пакоі, абстаўленыя ў спартанскім стылі (у штодзённай барацьбе самалюбствaў мы з Сымонам забыліся на дабрабыт); вузкія вокны выходзілі ў двор, у краявід у стылі Пікасо, дзе толькі ўверсе злева можна было намацаць вачыма кавалачак неба — раўнадушнай мінскай прасторы, незавершанай і пустой — засталася далёка, як бы па-за часам. Там зараз пуста, няўтульна і толькі пяшчотныя, ружова-жоўтыя «Пікадылі» ў адзіноце абсыпалі пялёсткі на стол.

Мы правялі тры цудоўныя дні ў Абхазіі. Снедалі, сустракаліся з Рэвазам, пілі найлепшую каву прама на вулачках горада. А па вечарах заставаліся адны, да стомы займаліся каханнем і бясконца размаўлялі. Нам было добра, але час ад часу я заўважала сум і адлучанасць Дзямьяна. Здавалася — ён хацеў сказаць нешта важнае, значнае, чаго баішся зараней. Мая падсвядомасць улоўлівала і асэнсоўвала недасказанасць, але не дазваляла задумвацца, інтуітыўна аберагаючы жывую крохкую істоту, што нараджалася ў сэрцы. Мне падабалася лашчыць ягоныя валасы, мяккія і густыя, колеру восеньскай саломы. Я хацела валодаць ім, валодаць да канца, зачыніць саламяны куфрык скураным ключыкам, стаць пры ім пакаёвым цэрберам і гаўкаць на кожнага, хто наважыцца падысці. Але пры гэтым цяжка заставацца на роўных. Я павінна была скарыстаць высновы, зробленыя пасля няўдалага шлюбу: свет трымаецца на роўна-свабодных. Не ведаю: ці змагла б пражыць, калі б Дзямьян павысіў на мяне голас?.. Перад адлётам ён сказаў мне:

— У цябе сумны выгляд. Ты не хочаш вяртацца?

— Я не хачу развітвацца з пальмамі і морам. Суцеш, скажы, што мы зможам вярнуцца сюды летам.

— Магчыма, гэта здарыцца летам. Пастарайся не прывыкаць да мяне.

Ён нічога больш не тлумачыў, нас запрасілі на пасадку.

Мы прыляцелі ранкам. У Мінску ішоў дождж. Дзямьян злавіў мне таксі, а сам паехаў аўтобусам. Пасля трох вечароў і начэй, праведзеных са мной у ложку, ён спадзяваўся, што здолее выветрыць пах і ўспаміны кахання, каб вярнуцца да маці больш цнатлівым, чым ад'ехаў. Я не пакрыўдзілася на яго і праз усю дарогу ў таксі перажывала салодкую стому, якая здавалася мне неверагодным падарункам. Падарункам ад І. І.

...У першую ж хвіліну, як з'явілася на працы, я адчула, як мяне праймаюць дрыжыкі. Змена клімату і тое, што я не надзела кофту, калі выйшла з самалёта пад дождж, давала ўсе падставы для ангіны. Я паказала І. І. усё, што прывезла, — новыя здымкі, буклеты, ліст ад Рэваза. Ён перагледзеў і застаўся задаволены. Да гонару майго шэфа, ён ніколі не рабіў адбор карцін па здымках і прымушаў сваіх агентаў насамперш прыдзірліва аглядаць кожную працу. Мы так загаварыліся пра будучую выставу, што прапусцілі абед. Хаця мне заўсёды здавалася, што абед для І. І. — святы абавязак; рэдка якія справы адрывалі яго ад стала ў гэты час сутак. Мне здавалася, што І. І. больш прыдзірлівы і засяроджаны, чым звычай; чым болей праходзіла часу, тым менш я знаходзіла на ягоным твары даверлівай цеплыні, якая з'яднала нас на другі дзень пасля апошняй прэзентацыі. Што гэта — І. І. перастаў пачувацца бацькам ці я правінілася перад ім?.. Нарэшце перамена была патлумачаная:

— Ты ездзіла па сур'ёзнай справе. Маладзён мог пачакаць цябе тут.

— Але ж я зрабіла ўсё, што ад мяне патрабавалася.

— Ты магла гэтыя тры дні абысціся без яго.

Я губляла цярплівасць. Як? Я ўжо прызвычаілася да думкі, што Дзямьян аніяк не зможа замінаць у працы. Ён дапамог забыцца на Сымона і вывеў маю душу з лабірынту хаатычных пачуццяў. Хіба магла я адмовіцца ад яго ці папрасіць чакаць сябе, калі не мела над ім улады? Да таго ж мы ніколі не абмяркоўвалі з І. І. прыватнае жыццё! І скуль ён ведае пра юнака? Я блыталася ў здагадках.

Увечары мы сустрэліся з Дзямьянам і я падзялілася з ім сваім недаўменнем. Мы доўга размаўлялі, кпілі адзін з аднаго, спрачаліся, абмяркоўвалі паводзіны майго начальніка.

— Ты кажаш, ён упэўнены, што ты падобная на старажытную багіню?

> *«Гэта, напэўна, той самы лес, — раздумвала яна, — дзе няма ніякіх імёнаў і назваў. Цікава, няўжо я таксама згублю сваё імя? Мне б гэтага не хацелася! Калі я застануся без імя, мне адразу ж дадуць іншае і, верагодна, якое-небудзь жахлівае!..»*

— Ён хоча замовіць мой партрэт у лепшага мастака, каб мець у калекцыі Юнону.

— Чаму Юнону?

— Захапляецца старажытнасцю.

Я ўзяла кнігу, якая ляжала побач (незадоўга перад тым я знайшла гэтыя радкі), і з тэатральнай узнёсласцю прадэкламавала:

Город древний стоял — в нем из Тира выходцы
жили,
Звался он Карфаген — вдалеке от Тибрского
устья,
Против Италии; был он богат и в битвах
бесстрашен.
Больше всех стран, говорят, его любила Юнона.*

— Яе звалі царыца багоў, дачка Сатурна і жонка Юпіцера. Скажы, ты на свае вочы бачыў Рым?

— Не.

— Партрэт зробяць у лепшых традыцыях старажытнасці.

— Там будуць хімеры і гарпіі?

— Хто?

Дзямьян рассмяяўся.

— Яны таксама жылі ў тыя часы. Так сведчаць паданні.

Я засмяялася за ім, на імгненне ўявіўшы сябе ў прамінулай вечнасці побач з пачварамі. Мы ўжо даўно размаўлялі лежачы, але раптам Дзямьян прыўзняўся і асцярожна, нібы абагаўляючы, пачаў цалаваць маё цела. Гэта кранула мяне больш, чым прапанова І. І. пакінуць мой нежывы, бездухоўны твар нашчадкам, няхай сабе і ў вобразе Юноны. Пад імем Геры яна апекавала грэкаў, а я — маладога мужчыну, які ненавязліва мог замяніць для мяне цэлы народ. Мы патрэбныя былі адзін аднаму зараз — трапяткія, сасмяглыя, імклівыя і жывыя. За хвіліну насалоды мы б з лёгкасцю ахвяравалі вечным жыццём. Я больш не адчувала ў ім суму, мой вясёлы хлопчык лёгка ўзышоў на прыгожы, светлы, гуллівы Алімп і блазнаваў ад здзіўлення... Мы салодка застагналі разам...

— Табе трэба было заняцца жывапісам ці гісторыяй, — зашаптала я пасля працяглай паўзы, — ці хаця б археалогіяй, — гэта так рамантычна.

— Багіням таксама пагражаюць вірусы, — падсумаваў ён і застаўся да раніцы.

V

Спазненне на працу было памылкай. Шэф расчыніў дзверы кабінета ў чаканні майго прыходу. Ён зрабіў усё, каб замест эйфарычнай бязважкасці я адчула баязлівасць; у адначассе я перастала быць жвавай, несур'ёзнай, раскаванай. Я прымушала сябе паверыць І. І., калі ён казаў, што абавязаны клапаціцца не толькі пра

---

* Вяргілій. Энеіда.

маю адукацыю, але і пра мой далейшы лёс... маё шчасце, нарэшце... Спускаючыся з паніклай галавой з вышыняў Алімпа, перакрэсліўшы свой твар на будучых палотнах, я паступова ператваралася ў маленькую сакратарку дзелавога чалавека — кабінетную актрыску з вільготнымі вачыма. Магчыма, за тысячы кіламетраў ад Мінска з вачэй соннай Шэран Стоўн скаціліся незразумелыя слёзы. Іх усмактала пульхная амерыканская падушка... Я была такая засмучоная, што не заўважыла, калі дазволіла І. І. распараджацца сваім лёсам.

Аднойчы на працу заехала Фаіна і з дазволу шэфа павезла знаёміцца з выкладчыкамі. Неўзабаве я пачала займацца па дзве гадзіны амаль штовечар; адпачывала толькі па выхадных, але і гэтыя дні прымушала сябе аддаваць кнігам, энцыклапедыям, даведнікам і альбомам. Раз на тыдзень са мной займаліся філасофіяй і латынню. Спачатку я была ў захапленні, потым пачала супраціўляцца, але тое, што ператваралася ў ens entium*, патрабавала ў працэсе станаўлення поўнага падначалення і прызнання першаасновай раскрыццё ўсіх маіх талентаў. Нібыта мяне прызначылі кіраваць імперыяй. І тое, што мае далёкія продкі не паходзілі з Месапатаміі**, не мела для І. І. аніякага значэння.

У адну з нашых нячастых сустрэч Дзямьян запытаў:

— З-за ўсяго гэтага ты пачуваешся больш шчаслівай?

— Шчасце ў тым, каб любіць рабіць тое, што я павінна рабіць.

Я не заўважыла, як перайшла на афарызмы.

— А потым? Што будзе потым?

— Потым я закончу курс эканомікі, збяру трохі грошай і адчыню сваю маленькую галерэю.

Дзямьян зірнуў так, нібыта пачуў немаведама якое глупства.

— Твой І. І. вучыць цябе за свае грошы, каб атрымаць канкурэнта?

Я пакуль не думала пра гэта.

— Ну-у, — разгублена адказала я, — гэта робіцца ў інтарэсах фірмы. Ён атрымае адукаванага спецыяліста, у нас не працуюць дылетанты.

— Каму яшчэ ён даў магчымасць атрымаць адукацыю з ягонай кішэні?

— Такога не ведаю. Але ж ты не можаш казаць, што я не маю таленту, — я пакрыўдзілася.

— Магчыма, ён ведае цябе лепш.

---

* Думаючая істота (*лац.*).

** Згодна з Бібліяй, першапачатковай радзімай габрэяў была Месапатамія.

Рэўнасць — яна заўжды пазнавальная; на імгненне я ўявіла І. І. голага, на маім ложку, і мне стала брыдка і смешна адначасова. Ніякай праявы сексуальнасці ў ім не існавала.

— Ты па-за канкурэнцыяй, — я правяла кіпцем па Дзямьянавай далоні, там, дзе прырода пазначыла перарывістую і нядоўгую лінію кахання.

— Атожылак апошні, званнем цар,
да ўшанавання звыклы, да фанфар,
душой трымціць на троне, як трысціна,
і ў той бязвольнасці несамавітай
рука паўзе з пурпурных аксамітаў
у вір ілюзій, голых мар.*

— Вельмі мілыя вершыкі, — сказала Аліса задумліва, — але зразумець іх цяжкавата.
(Ведаеш, ёй нават самой сабе не хацелася прызнавацца, што яна нічога не зразумела.)
— Прымушаюць разважаць — хоць я і не ведаю пра што... Адно зразумела: нехта некага тут забіў... А, можа, і не...

— Гэта?..

— Рыльке. Але неістотна... Падумай, што ён хоча ад цябе?

Праз колькі дзён па дарозе дадому я наведалася ў бібліятэку і знайшла ў томіку Райнэра Рыльке верш, які цытаваў мне Дзямьян. «І цар самотны ў грыдніцы пустой...» — гэты радок больш падыходзіў да вобраза І. І., створанага з наівам запешчанага прыёмыша. Магчыма, праз выпадковае натхненне І. І. знайшоў кропку апірышча і зрушыў з месца зямлю. Зямлю, на якой стаяла я.

Я паспявала процьму спраў: працавала, вучылася, разважала пра мастацтва з выкладчыкам, які хварэў на еўрапацэнтрызм, і з філосафам, настойлівым гегелеўцам. Яны абодва мелі добрыя стасункі з І. І., але Сабковіч — мой памагаты ў філасофіі — з задавальненнем даводзіў, што Біблія, якую на працягу стагоддзяў лічылі арыгінальным тварэннем старажытных габрэеў, мае адзнакі шумерскіх міфаў і паданняў.

— Праўда, і еўрапейская культура, — дадаваў ён, — абавязана не Грэцыі, як гэта лічыцца, а менавіта шумерскаму народу.

Я пакуль не магла ўцяміць: ці маецца на ўвазе перыяд узнікнення еўрапейскай культуры пасля напісання Біблії і руху хрысціянства, ці з часоў з'яўлення першых рас на зямлі.

---

* Р. М. Рыльке. Цары. Пер. В. Сёмухі.

— А як доўга ў вас ішлі заняткі? — спытала Аліса, намагаючыся змяніць тэму размовы.
— Гэта залежала ад нас, — адказаў Як бы. — Як усё зойдзем, так і закончым.
— Зойдзеце? — здзівілася Аліса.
— Заняткі чаму так называюцца? — патлумачыў Грыфан — Таму што на занятках мы ў нашага настаўніка розум займаем... А як усё зойдзем і нічога яму не пакінем, адразу ж закончым. У такіх выпадках яшчэ кажуць: «яму розуму не займаць...» Зразумела?

Я пачала разумець, як шмат часу згублена на спрэчкі з недалёкім чалавекам — маім былым мужам. І не зважала на тое, што ён меў права выказаць мне той самы папрок. Калі шлюб не ладзіцца з першых дзён — ведайце, што ў клетках кватэр шчыруе вірус: з хітрай тактыкай, невядомай навуцы, ён разбурае жыццё, робячы вас імпатэнтамі духу, параноікамі пачуццяў, скалечанымі істотамі, што згубілі сваю мову — мову еднасці, разумення, кахання...

Прамінуў верасень, заканчваўся кастрычнік. У канцы месяца прыляцеў Рэваз. У галерэі рыхтаваліся да адкрыцця экспазіцыі. Адпаведна рэкламе, усе чакалі чагосьці незвычайнага. Мы, супрацоўнікі фірмы, хадзілі ўзнёсла-заклапочаныя. Мае думкі, дзелавыя якасці, памкненні належалі фірме ў асобе І. І.

Мы перазвоньваліся з Дзямьянам, але часцей пераносілі сустрэчы, бо, нібыта з-пад зямлі, раптоўна з'яўлялася Фаіна і знаходзіла неадкладныя справы для мяне, а калі іх не было, займала час доўгімі і незразумелымі размовамі. Гаварыла яна са мною інтымна-загадкавым тонам. Не ведаю — з чаго — пышнацелая кабета навязвалася ў сяброўкі: у абед яна залятала ў мой кабінет і цягнула мяне на выставы, у парк, у кавярні — каб, далібог, не прыйшло ў галаву распарадзіцца вольным часам самой. Яна вышуквала патрэбныя мне кнігі, ездзіла для мяне ў бібліятэку...

— Дзіця, скажу вам па сакрэце, летам І. І. вырашыў узяць вас у Палесціну. Многія б хацелі апынуцца на вашым месцы, — упэўнена заявіла яна і адступіла на крок, каб ацаніць рэакцыю. Я заставалася спакойнай, ad absurdum*. Мае паводзіны здаваліся ёй дзіўнымі, яна не разумела, як успрымаць раўнадушны погляд цнатліва-лазуркавых вачэй. Паступова я прызвычаілася да яе прысутнасці, яна перастала замінаць. Наадварот, рабілася незаменнай. Цяпер Фаіна магла пазваніць позна ўвечары і я ўжо асцерагалася — невядома з якой віны — быць не адна: я дакладвала ёй пра ўсё,

---

* Да абсурду (*лац.*).

што паспела за дзень... Мае бацькі загінулі рана, выхаваннем занялася бабуля, прафесар батанікі. Цяпер і яна была далёка. Я пацалавала яе ў апошні раз тры гады таму, у чэрвені, у пятнаццаць гадзін. А праз хвіліну над ёй зачынілася вечка труны. А Фаіна вяртала мяне ў сям'ю, дзе за правіннасць — каралі, за поспехі — хвалілі. Я намагалася набыць значнасць у яе вачах.

Аднойчы мы заседзеліся ў яе дома, я пераказвала свой сон, дзе перапляліся рэальнасць і фантазіі: нібыта я апынулася ў садзе сярод залатых апельсінавых дрэў і ведала, што гэта рай, населены людзьмі і жывёламі, я бачыла іх прыгожымі і вясёлымі — яны жылі ў згодзе, не ведаючы хвароб і пакут. А размаўлялі паміж сабой на незразумелай мове, іх алфавіт складалі толькі галосныя. Мяне правялі да ўзгорка, спавітага лозамі. Побач, за кустоўем, пасвілася белая карова. Усё прыпыніла рух. Толькі пах мускусу, апельсінаў і дыму. Я павярнула галаву — да мяне набліжаўся І. І. З другога боку прама на нас вялі белую карову. І. І. трымаў у руцэ галінкі Euonymus, брызгліны, праз кволае эліпсоіднае лісце звісалі выспелыя плады.

Перад сабой я ўбачыла дровы, складзеныя для кастрышча, да іх падвялі няшчасную жывёліну. Карова глядзела рахманымі, разумнымі вачыма і нат не рыкнула, калі па маўклівым загадзе І. І. у яе шыю ўвайшоў нож. Яна ўпала знясілена і грацыёзна. Я працягнула рукі. І. І. зрываў плады брызгліны і са смехам кідаў у мае далоні: ярка-чырвоныя кроплі з чорнымі вочкамі насення...

— Oh, Gott! Wie rätselhaft!*

У гэтую хвіліну пазванілі ў дзверы. Фаіна вярнулася з І. І. Шэф выказаў захапленне з таго, што мы праводзілі вечар разам: дзве жанчыны гавораць пра вечнае пад сімфонію Баха. Ён зірнуў на нас паблажліва; сустрэча, хутчэй за ўсё, была запланаванай, і я не магла знаходзіцца ў іншым месцы. Фаіна адразу ж прымусіла мяне пераказаць сон І. І. Шэф слухаў уважліва, гледзячы ў падлогу, але ў хвіліну, калі ён зірнуў прама на мяне, я паспела пабачыць у ягоных вачах пераможны бляск...

— Брызгліна? — запытаў ён. — Не магу ўявіць, як яна выглядае.

Я апісала знаёмае з дзяцінства кустоўе (больш за 200 відаў, размнажаецца насеннем, плады з ванітоўнымі і слабіцельнымі ўласцівасцямі, выкарыстоўваецца ў медыцыне...). Ён пацікавіўся: адкуль я ведаю батаніку? Давялося ўзгадаць бабулю. І. І. з Фаінай пачалі спачуваць, распытваць і абмяркоўваць мой лёс, не зважаючы на слабы пратэст з майго боку. Спадары прысяжныя мелі намер вызначыць ступень майго дачынення да залы суда. Паступова я

---

* О, Божухна! Як загадкава! (*ням.*).

перастала прымаць удзел у размове і слухала, як яны разважаюць пра маю знаёмку — Алісу. Мая шчаслівая — для іх — згадка пра бабулю пазбавіла ад неабходнасці пераводзіць словы ў рэчышча тлумачэння таемных падзей.

> *Аліса цярпліва чакала, покуль вусень не зробіць ласку зноў звярнуць на яе ўвагу. Хвіліны праз дзве Вусень выцягнуў кальян з роту, пазяхнуў раз-другі і пацягнуўся. Потым ён споўз з грыба і схаваўся ў траве, кінуўшы Алісе на развітанне:*
> *— Адкусіш з аднаго боку — падрасцеш, а з іншага — зменьшышся!*
> *«З аднаго боку чаго? — падумала Аліса. — З другога боку чаго?»*

«...На самой справе калі я буду паводзіць сябе, як належыць, то змагу стаць незаменным спецыялістам у фірме І. І., мне будуць дадзены правы... ускладзены абавязкі... праз некалькі гадоў мы зможам адчыніць некалькі новых філіялаў... калі захачу ўзначаліць адзін з іх... ці застацца тут... І. І. павінен будзе калі-небудзь пакінуць месца надзейнаму чалавеку, каб мець магчымасць кантраляваць вольнай часінай».

Я назірала за зменамі, якія адбываліся з Фаінай, яна ўспрымалася як сяброўка шэфа і мая апякунка адначасова. З даваральных размоў я даведалася, што Фаіна даўно і старанна наведвае нейкі закрыты клуб; І. І. таксама праводзіць там некалькі гадзін на тыдзень. І ў хуткім часе я буду дапушчана туды...

Навязлівасць несапраўдных родзічаў пачала выклікаць раздражненне. Я сабралася сысці, тады І. І. схапіў мяне за руку і сказаў, што гатовы патлумачыць сон. Мае начныя фантазіі рэдка бываюць сюжэтнымі, яны больш падобныя на карціны імпрэсіяністаў: твары, геаметрычныя фігуры і ніякага зместу.

Па словах І. І., я бачыла рытуал прынясення ахвяры ў гонар рымскай багіні. Кесару — кесарава... Юнона прымае толькі белых кароў. За поспех і перамогу! Што быў мой сон: argumentum ad hominem* ці argumentum ad rem?** Хто мог закласці ў мозг дзею, пра якую я нічога не ведала? І ці праўда, што ўсё існае — выпадковае? Я ўзіралася ў твар шэфа, шукаючы ў затоеным бляску габрэйскіх зрэнак адказ на свае пытанні.

---

* Доказ, разлічаны на пачуцці таго, каго пераконваюць (*лац.*).

** Аргумент, заснаваны на абставінах справы (*лац.*).

VI

Я прыехала дадому, зварыла моцную каву і пачала разбіраць кнігі. Мы пераехалі ў гэтую кватэру з Сымонам адразу ж пасля бабулінай смерці, і з таго часу я не корпалася ў бібліятэцы, якую беражліва і ахвярна збірала мая ганарлівая і разумная бабуля. А я памятаю многія з кніг яшчэ з часоў дзяцінства, калі мы з бацькамі жылі ў невялікім доміку з садам... і зараз было так настальгічна: падносіць да вуснаў кубак, нібы для таго, каб лавіць у яго светлыя слёзы, рабіць маленькія глыточкі і ў лёгкім памяшальніцтве перабіраць тамы, якія месціліся, як ім хацелася: у два, а то і ў тры рады пакладзеныя адна на адну кнігі, некаторыя з іх упрыгожвалі махры старых, пажоўклых закладак.

Паступова мае рухі станавіліся хаатычнымі. Я пачала забывацца, якую мэту пераследуе розум, прымушаючы рукі здымаць, перабіраць, адкрываць, перагортваць старонкі... Зрокава выхопліваліся нейкія словы, радкі; верылася, што адно-адзінае слоўца вызначыць ступень маёй разгубленасці, стане прыбежышчам спалоханых думак. Я размаўляла з аўтарамі праз цемру неўразумення — усё адно, што перакрыквацца праз рэчку ў моцны туман. Толькі пры гэтым мой язык прытрымліваў дробную манетку. Для Харона...*

Словам услых, скажоным тэхнікай, падаўся званок тэлефона. Я кінулася на гук.

— Аліса, ты абяцала пазваніць. Дзе ты была? — спытаўся ў мяне чалавек, які жыў побач, у маім горадзе; я чула голас, а ягонае прывіднае цела блукала тумановым берагам, адкуль вось-вось-вось-вось вярнуўся мой цень. Я трымала трубку і шаптала: «Мі-лы... Мі-лы...», — паасобку ставячы склады, нібы толькі вывучыла зямную азбуку.

— Што здарылася, Аліса?.. Ты чуеш мяне?.. Я зараз прыеду. (Мі-...) ...лы.

> *— Не ведаю, адказала з сумненнем Аліса. — Мне чамусьці не хочацца, каб мяне бралі ў палон. Я хачу быць Каралевай.*
> *— Ты будзеш ёй, калі пяройдзеш праз наступны ручай, — сказаў Белы Рыцар. — Я правяду цябе да ўзлеску, а потым вярнуся назад — такі ў мяне ход!*

---

* Лічылася, што Харон, які перавозіць душы памерлых праз раку падземнага царства, бярэ з іх плату, для чаго памерламу клалі ў рот манетку.

Дзямьян прыехаў усхваляваны, увесь час узіраўся на ўчынены мною пагром: на стале, фатэлях, на падлозе ляжалі кнігі. Ён не мог супакоіцца, а я незразумела з чаго пачала размаўляць з ім адрывіста і цвёрда, але тон выдаваў кволасць і скруху. Мы абодва разгубіліся. Мне раптам забажалася павесьці Дзямьяна за сабой, прымаць рашэнні і задаваць пытанні з настойлівасцю, вартай школы І. І. Я хацела кіраваць тым, каго не прыручала. І з чаго бачна, што Дзямьян застанецца са мной назаўсёды? Слова «назаўсёды» мела акрэсленасць у будучым, адпаведна маім жаданням і патрэбам. Аказваецца, Аліса не змянілася, хаця мела горкі вопыт. Аліса — аматарка горкага, кіслага, салёнага, вострага. Я.

— Ты зусім не такая, — казаў Дзямьян з другога кута пакоя.

— Ты больш не кахаеш мяне? — першы раз паміж намі было вымаўлена слова «кахаю», але й тое з адмоўнай часцінкай.

— Ты ведаеш, што патрэбна мне. Але хто адмаўляе ў сустрэчах — я ці ты?

Ён меў рацыю, часцей за ўсё я спасылалася на занятасць; усе пачуцці мы даверылі прывіднаму дроту, працягнутаму між намі... І ўрэшце рэшт я б не здзівілася, калі б аднойчы знаёмы голас у трубцы сказаў: «Аліса, вы.. (не згодзіцеся: павячэраць са мной; паведаміць, калі будзеце вольныя на гэтым тыдні; пазаймацца са мной сексам...).

— Я абяцаю табе, што буду знаходзіць больш часу...

— Для новых заняткаў? Ці для таго, каб пазіраваць мастаку?

Ён не забыўся на абяцанне І. І. зрабіць мой партрэт. Я выглядала расчуленай. Значыць, яго кранала тое, што мы рэдка бачымся. Да таго ж Дзямьян пераняў мой тон, а я была з тых, хто аддае ролю кіроўцы, як толькі яе ў мяне адбіраюць.

— Нячулая ты. Хто табе патрэбны?

— Я хачу быць чыстай.

— Немагчыма быць чыстай, маючы заганы.

— Чаму, чаму ты думаеш, што я няшчырая ў жаданні быць разумнейшай?

— Скрытнасць утрымлівае другіх на адлегласці ад нас. Твая ахоўніца — скрытнасць! Ты агольваеш душу. Не перада мной, я б не змог цябе пакрыўдзіць.

—?!

— Мяне трымаюць на адлегласці ад цябе. І ты дазваляеш гэта рабіць.

— Я?!

— Да мяне прыязджала твая сяброўка... прыяцелька. Яна ўпэўнена, што стаіць на варце тваёй душы.

Я разгубілася. Што патрэбна было Фаіне ад майго мужчыны?

— Яна міла даводзіла мне канцэпцыю выхавання бязгрэшнай дзевы, новай багіні. Праўда, узяла з мяне слова не перадаваць

табе нашу з ёй размову, але я магу выказаць тое, што думаю... Можа, я імкнуся туды, куды не дапускаеш ты? Скажы.

— Нічога не разумею, — у мяне пачыналася ціхая істэрыка.

— Скуль ведаць? Яна сказала: «Hallo!»* харошы, разумны хлопчык, вандэр-вон ад нашай багіні.

— Не можа быць. Я звычайная жанчына. Такіх сотні, тысячы!

— Ты вельмі прыгожая, Аліса... Бедная мая дзяўчынка.

Я наогул адмаўлялася нешта разумець. Нехта ведаў пра мяне нешта неверагоднае, амаральнае ў сваёй таямнічасці. Калі зірнуць на ўсё гэта са сцяны непамыснай уяўнасці, то можна падумаць, што шэф хоча атрымаць маю ўвагу — увагу! — нават купіць яе праз залішнія клопаты пра маю будучыню. Можа, мая прыгажосць — капітал, у які калекцыянер укладвае грошы?.. Але ці не прасцей прапанаваць шлюбны пярсцёнак, каб зразумець, што не мае ніводнага шанцу?

— Ах! — вызінулася змяінае джала ўздыху. Я ўзгадала пра закрыты клуб. Што яны робяць там? Дзе наогул ён знаходзіцца? Падалося: зараз я зразумею, што ліхаманкава шукалі мае рукі і вочы, калі адна за адной ляцелі на падлогу кнігі.

Чаму І. І. ведаў адгадку майго сну і здзівіўся толькі Euonymus, якое ўзнікла як папярэджанне (яму, ім, мне?) ад якогасьці старонняга назіральніка.

— Бабуля!

Усё выйшла з-пад кантролю, я падала ў хаос, які не мог, не павінен быў узнікаць на мяжы XX і XXI стагоддзяў.

> *«Хай... паспрабуюць прыйсці сюды за мной! Звесяць галовы ўніз, пачнуць клікаць: «Падымайся, любачка, да нас!» А я на іх толькі пагляджу і адкажу: «Скажыце мне спачатку, хто я! Калі мне гэта спадабаецца, я падымуся, а калі не — застануся тут, пакуль не ператваруся ў каго-небудзь іншага!»*

VII

З зацятасцю Дзядала будаваў І. І. свой лабірынт. Я апынулася ў ім выпадкова, з маўклівай згоды Фаіны. Яна павінна ведаць першапрычыну. Мне застаецца зрабіць выгляд, што нічога не адбываецца, каб самой знайсці выйсце. А раптам мая вучоба станецца Арыядніным клубком?

---

* Прывітанне! (*ням.*).

— Ва ўсім гэтым ёсць прастата, — запэўнівала я Дзямьяна. Мы гаварылі з ім ужо дзве гадзіны, то перакрыкваючыся з процілеглых кутоў кватэры, то седзячы побач, як ахопленыя парывам галубы. Вакол нас расцякаліся флюіды то загадкавасці і знямогі, то абурэння і палу. — Менавіта спрошчанасць не дазваляе мне бачыць вар'яцкасці. Прастата не гняце.

— Таму ты не задумваешся, што адбываецца вакол.

Ізноў! «Адбываецца», — гэтае слова нечакана робіць мяне прысутнай у тэатры абсурду, удзельніцай самастойнай тэатральнавідоўнай дзеі: сацыяльна-побытавай драмы, псіхалагічнай трагедыі, камедыі, якая сягае да вытокаў ахвярных рытуалаў... Я была наіўнай ад нараджэння, непрактычнай і ўзнёслай... І вартай шкадавання. Мяне шкадаваў Сымон, калі спрабаваў паставіць на камяніста-халодную зямлю хатняга побыту. І. І. таксама пашкадаваў: нейкі час я стаяла на пастаменце ягонай незразумелай ахвярнасці, адкуль назірала за акаляючымі, што з вышыні падаваліся мудрымі, вясёлымі, вытанчанымі, — характарыстыкі, уласцівыя музам: я летуценіла прэзентацыямі, піла шампанскае з мастакамі, разважала пра Гамераўскае ўспрыняцце прыгажосці з маладымі паэтамі, якія натхнёна чыталі вершы ў дзень адкрыцця выставы Рэваза. Фаіне часам удавалася замяніць малую колькасць бутэлек і закусак духоўнай ежай... Юнона ў дэсянёвай квецені чаляднікаў: хіба гэтыя людзі, іх майстэрства, мастацкія ці аратарскія здольнасці не прыслужвалі маёй душы, абуджаючы прагна-эгаістычныя пачуцці? Адзіна ненатуральным у гэты перыяд было тое, што І. І. ніводнага разу не прапанаваў легчы з ім у ложак. Пакуль?.. Вось толькі побач са мной быў прагматык, які захапляўся мікробамі і вірусамі — гэтымі хімерамі чалавечых арганізмаў, а ў вольны час мог узнёсла цытаваць адмысловыя вершаваныя радкі. Мяне яшчэ чакала знаёмства з ягонай маці — апантанай перакладчыцай паэзіі. Дзямьян аб'ехаў з бацькамі (высокі чын у паветранай авіяцыі і выкладчыца) усю Еўропу... У чым я хацела ўбачыць праявы шкадавання мяне Дзямьянам?

— Чаму твая рамантычнасць знайшла выйсце ў гэтых... вірусах? Ты хочаш стаць ратавальнікам роду чалавечага? — дапытвалася я, каб неяк адцягнуць думкі ад напружанага разгадвання загадак.

— Вірус, — тлумачыў Дзямьян, — мае магчымасць жыць і развівацца толькі ў якім-небудзь целе, арганізме. Усё, што мае вірус, — адно генетычны код, змешчаны ў структуры малекулы нуклеінавай кіслаты, якая, бы жамчужына, спіць у бялковым футарале. Але дзівіць тое, што гэтае нябачнае стварэнне мае памяць, закладзеную звыш, — ідэю аб стварэнні сабе падобных... Ніхто не ведае, чаму — не маючы ні рэсурсаў, ні магчымасці, — вірус прымушае працаваць на сябе клетку.

Ён казаў доўга і многа: незразумелыя тэрміны, вопыты лабараторных даследванняў, — а я ведала, што ніколі не змагла б зацікавіцца гэтым усур'ёз. Дурніца-клетка, падначаленая хітраму вірусу; усё проста, як свет: адзін — кіруе, другі — падначальваецца.

— Бачу, табе нецікава.

— Спрабую зразумець.

— Мая вера — гэта вера ў тое, што шчасце чалавецтву дасць прагрэс навукі. Так казаў Паўлаў. І я згодны з ім.

— Але ты мог быць добрым літаратуразнаўцам, вандроўнікам, паэтам — кім заўгодна. Чаму?..

— Я дам табе адказ. Але потым. — Я ўжо заўважала, што як бы спакойна ён ні казаў пра навуку, якой займаецца, але паміж ім і навукай існуе шчыльная сувязь; сувязь, якую па нейкіх прычынах хаваюць ад мяне.

Пэўна, я выглядала незайздросна. Дзямьян перапыніў лікбез, нахіліўся да мяне і пацалаваў ў вусны. Раніца зазірала ў вакно: уверсе, у левым шкляным куце, сумавала шэрае мінскае неба.

VIII

Мой нядаўні псіхоз пераходзіў у сверб цікаўнасці. Я лавіла кожнае слова І. І., любы намёк. Загадку Сфінкса разгадаў мужчына, але і жанчынам давялося даць правільны адказ на многія загадкі жыцця.

Я пазваніла Фаіне, каб дамовіцца на сустрэчу; яна адразу ж запрасіла прыехаць, і мне прыемна было думаць, што яе насцярожылі інтанацыя і рашучасць, з якімі я размаўляла па тэлефоне. Я хацела сустрэчы на нічыйнай тэрыторыі. Так мы апынуліся ў кавярні.

— У нас мала часу, Фаіна. Мне трэба ехаць на заняткі.

— Мы можам сустрэцца пазней... іншым разам.

— Што з І. І.?

Я вырашыла не цягнуць і пайшла ў наступ. Але ў дубовыя вароты таямнічасці я пастукалася не бервяном упэўненасці, хаця і спадзявалася, што трымаюся за яго, а танюткім прутком наіву. Фаіна пачула стук і стаілася.

— Фаіна, скажы мне, што адбываецца? Навошта я патрэбная шэфу?

Яна ўбачыла маю адзінокую атаку без войскаў і гармат.

— Ён прапанаваў табе нешта... інтымнае?

— Не, але гэта і здзіўляе.

— Што здарылася? — спытала яна, як толькі Каралева змоўкла, каб набраць паветра ў лёгкія.

— Вы ўкалолі палец?
— Яшчэ не ўкалола, — сказала Каралева, — але зараз укалю! А-а-а!

Фаіна слаба пасміхнулася. Яна паклікала афіцыянта і замовіла нам каву. Яна рабіла першыя глыткі ў задуменні, пэўна, рашаючы: што я павінна ведаць.

— Я разумела, што ў нейкі момант ты пачнеш задаваць пытанні. Але ні я, ні І. І. не маем на мэце злое. Табе не хочацца вучыцца?

— Навошта?

— Можа, такім чынам І. І. запаўняе твой час, каб ты не пачала шукаць новых адчуванняў і забаў. У тваім узросце лёгка стаць ахвярай.

— Ён не хоча, каб я сустракалася з мужчынамі?

— Магчыма, — няпэўна заявіла Фаіна.

— А Дзямьян? Вы ж ведаеце, што ў мяне ёсць Дзямьян.

— Мая задача — дапамагаць І. І., а не адпуджваць тваіх каханкаў. Ты сама вырашыш — хто табе больш патрэбны.

— Ты хочаш сказаць, што І. І. і я... што ён чакае ад мяне...

— І. І. не чакае тваёй удзячнасці, — гэтая фраза прагучала занадта з'едліва. Але Фаіна збавіла тон. — І не папросіць яе. Проста будзь з ім больш пяшчотнай... Калі мы разам, ён называе цябе Юнонай. Паспрабуй прабачыць яму гэта.

Прабачыць? За што? За слабасць кахання, угодлівы парыў? Смешна, але я палічыла сябе мацнейшай, чым была. Я выйшла расчуленай, з адчуваннем, што не змагу абвінавачваць І. І. лёгка, без болю. Сум Фаініных вачэй запэўніў, што яна мела рацыю, калі казала, што І. І. не чакае ўдзячнасці ад свавольнай маладой жанчыны. Ён толькі хоча, каб я вучылася і... была побач?

...Я павінна была гэта прадбачыць. Як толькі ёй удалося заспакоіць мяне, я забылася на ўсе астатнія пытанні, якія цялёпкаліся ўва мне... плюсь-плюсь... плюх-плюх... як качкі на лістападаўскай Свіслачы, зацягнутай тонкім лядком... Ішлі апошнія дні выставы. Мы стаялі з Рэвазам на набярэжнай і гучна смяяліся, гаварылі адзін аднаму розныя прыстойныя глупствы. Я пабегла ад яго наперад, а ён імчаў па набярэжнай і смяяўся. Запыханыя, мы паселі на лаўку. Ён нахіліўся, паправіў пасмачкі маіх валасоў і пяшчотна пацалаваў у куточак вуснаў... Ад'язджаючы, Рэваз запрасіў нас з Дзямьянам да сябе... калі выспеюць апельсіны... Ізноў адчуць сябе сярод залатых дрэў? Як у сне?

...Разглядаючы шэфа, седзячы з ім дзень у дзень побач, я пачынала разумець мізэрнасць і непрыстойнасць сваіх прэтэнзій, здагадак і прадчуванняў. Наноў паміж мной і Дзямьянам узнік фальш; як толькі я перастала баяцца І. І., дык адразу ж даверылася яму.

Мая arbiturum liberum* зноў залежала ад шэфа. Ён падоўгу стаяў ля стала, размаўляў са мной пра мастацтва і будучыя пераўтварэнні ў фірме; шафёр вазіў нас абедаць за горад, ва ўтульны рэстаранчык... Аднойчы І. І. завёў мяне ў дарагую краму і купіў футра. Мае слабыя пратэсты былі рэзка перапынены.

З-за гэтага футра мы ледзь не пасварыліся з Дзямьянам. Ён злаваўся ўвесь вечар.

— Ты не павінна была браць такі падарунак!

Асляплёная, я разумела толькі адно: ужо дзве гадзіны ў шафе вісіць лісінае футра, а я паспела засумаваць па ім. І калі б мы не сустрэліся зараз з Дзямьянам, то я, пэўна, любуючыся серабрыстай поўсцю, размаўляла б з футрам, як з жывой істотай. Папрокі Дзямьяна прымусілі мяне расплакацца; ён так апантана пераконваў, што я пагадзілася выправіць глупства. Нечакана Дзямьян схапіў мяне і зацягнуў на ложак. Наша гульня была больш падобная на барацьбу. Ён шаптаў мне словы, нібы вымаўляў закляцці; на імгненне я спужалася. Жах апанаваў волю. Але ў стогнах экстазу я адчула боль ягонай душы і адразу ж разняволілася, разбураючы на імгненне сцяну розуму. Мы аддаліся адзін аднаму з ранейшым імпэтам і шчырасцю.

Уначы, прачнуўшыся ад смагі, я выслізнула з нагрэтага ложку, і, праходзячы ля шафы, прасунула руку ў прачыненыя дзверцы, каб намацаць мяккую поўсць футра, якое годна і незалежна чакала мяне...

IX

Я прачнулася, упэўненая ў неабходнасці тэрмінова прыняць нейкае рашэнне. Дзямьян салодка і цнатліва ўсміхаўся маёй падушцы. Праз хвіліну ён адплюшчыў вочы. Я апраналася, назіраючы за ім, ён прыцягнуў мяне да сябе. За вакном самотным анёлам застыла воблака. Спачатку яно ўзіралася ў бетонныя гмахі, жалезныя слупы цьмяных ліхтарняў, маўклівыя вежы кранаў на новабудоўлі, голыя дрэвы, а потым пачало засыпаць бязмоўны горад пяшчотнымі камячкамі першага снегу. Я нібы адчула іх дотык на сваім целе і тое, як яны раставалі пад пацалункамі Дзямьяна...

Каб зрабіць прыемнае каханку, я надзела палітон. І. І. быў здзівіўся, але нічога не сказаў. Праз паўгадзіны, калі я згатавала яму гарбату, ён усё-ткі папытаў:

— Аліса, вы саромеецеся маіх падарункаў?

Я шчыра прызналася, што гэта не спадабалася майму сябру; я нібыта адразу перайшла з аднаго інтымнага свету ў другі, дзе не

---

* Свабода волі, вольнае рашэнне (*лац.*).

прынята было хлусіць ці хавацца... А калі прымала пусты кубак, І. І. узяў маю руку і пяшчотна пацалаваў у далонь.

— Крыўдна?

— Не ведаю.

— Пазвані Фаіне, хачу, каб мы схадзілі ў тэатр.

Тое, што ён не прапаноўваў застацца сам-насам нават сярод публікі, выклікала самотную ўдзячнасць, падобную на боль пры выцягванні стрэмкі.

— Толькі не кажы, што аддасі грошы за футра. Я не вазьму, — дадаў І. І. Яшчэ ўкол. Пэўна, я павінна была пакахаць І. І., прыгледзецца да яго больш уважліва, узгадаваць і песціць цёплыя ўдзячныя думкі, а замест гэтага я ўслухоўвалася ў біццё свайго сэрца і назірала, як плаўна-ціхмяна лятуць за вокнамі белыя камячкі. Калі мы з І. І. лічылі сябе сябрамі, дык нашае сяброўства можна было назваць засмучона-датклівым.

Праз дзень я сядзела ў ложы опернага паміж Фаінай і шэфам. Да пачатку спектакля мы паспелі незласліва абгаварыць знаёмага банкіра, аднаго вядомага архітэктара і прыма-балерыну. Жарты І. І. былі трапнымі, мы з Фаінай ціха пасмейваліся. У перапынку да нас падсеў Барыс Альховіч — ссівелы зубр беларускай мастацкай школы. Гэта быў высокі, хударлявы чалавек з абаяльнай усмешкай. Ён адразу ж мне спадабаўся. Я бачыла ягоныя творы на выставах. І. І. пазнаёміў нас. Альховіч уважліва прыглядаўся да мяне, потым узяў за падбароддзе і павярнуў да святла. Калі не звяртаць увагі на ўладныя рухі, якія нібы ўзвышалі і аддалялі яго ад усіх, ён мог здацца забаўным... Неразуменне робіць з сяброў ворагаў. Я ўжо лічыла сябе сяброўкай І. І., бо магла падарыць яму разуменне і шчырае спачуванне; і калі Альховіч прызначыў час з'явіцца ў ягоную майстэрню, каб пачаць працаваць над партрэтам, я згадзілася. Мая згода мела адценне звароту пазыкі: калі не я, не маё цела, дык хоць партрэт. Перапынак закончыўся, сцішылася гамана, з аркестровай ямы пачуліся першыя гукі. А ў маёй галаве гучалі словы Фаіны, сказаныя мне на вуха: «Лепш быць няшчасным, чым самазадаволеным». Чаму яна выбрала такі момант? Ці не таму, што я пачала спачуваць І. І.? А мо таму, што ад шкадавання да несупраціўлення адзін крок?

— *Ведаеш, адна з самых сур'ёзных страт у бітве — гэта страта галавы.*

Маё жыццё стала яшчэ больш дэзарганізаваным. Я лётала ад працоўнага стала да кабінета акадэміі, дзе мяне чакаў мастацтвазнаўца, прафесар Шымко; Сабковіч прызначаў мне сустрэчы на філасофскіх вечарынах ці проста дома, дзе, пахаджваючы ў цёп-

лым халаце і хатніх пантофлях, разважаў пра зыходнае становішча філасофіі Гегеля, які рэальны свет прапаноўваў прымаць як праяву нейкай ідэі... У рэдкія вольныя хвіліны я званіла Дзямьяну, ён заязджаў за мной на аранжавым «масквічы», каб адвезці ў бібліятэку ці музей. Мы яшчэ займаліся каханнем, але рэдка, і нібыта паміж справамі. Ён цярпеў мае невыносныя істэрыкі, перапады настрою і выхвалянне новымі ведамі. Я разважала пра разумныя рэчы з разумным выглядам. Але ці адчувала да канца сэнс таго, што казала?.. Калі ў другі раз я прапанавала пазнаёміць яго з Альховічам, ён адмовіўся. Нашы з Дзямьянам адносіны сталі падобныя на гульню: мы лавілі адзін аднаго і хаваліся адзін ад аднаго... Пры гэтым І. І. ненавязліва заставаўся побач. Ён нічога не дамагаўся, што яшчэ больш узвышала яго ў маіх вачах. Мне спадціху даводзілі, што я таленавітая, разумная, вясёлая, шчырая і добрая. Мой эгаізм пры гэтым не згадваўся. Я адчувала гордасць, што магла даць задавальненне па-за межамі інтымных адносін чалавеку, які таемна мяне кахаў. І. І. пачаў ездзіць у майстэрню, дзе Альховіч шчыраваў ля мальберта. Шэф сціпла ўладкоўваўся ў куце і назіраў за намі. Статуэтка, загорнутая ў блакітны атлас, ляжала на скураной сафе, але пры гэтым разважала аб паходжанні сапраўдных каштоўнасцей мастацтва і філасофіі, якія атрымалі першапачатковае развіццё ў Еўропе. І не заўважала, што разважаю, як Шымко.

> *— Ах, як я рада, што нарэшце тут! Але што гэта ў мяне на галаве? — усклікнула яна і баязліва схапілася рукамі за нешта цяжкае, што абручом ахапіла галаву. — І як яно сюды трапіла без дай прычыны? — спытала Аліса, зняла з галавы загадкавы прадмет і паклала сабе на калені, каб лепш разгледзець. Гэта была залатая карона.*

Іншым часам мы пачыналі давяральна размаўляць з І. І., не зважаючы на прысутных.

— Ты мяняешся. Хутка пачнеш пазбягаць мяне.

— З-за чаго?

— Мае паслугі нельга расцягнуць у часе.

— Вам надакучыла апякаць мяне?

— ...Мы мяркуем пра сябе па магчымасці здзейсніць у будучым нашы жаданні, планы. А іншыя мяркуюць пра нас па тым, што мы паспелі зрабіць. У нас мала часу.

Ён адказваў не зусім зразумела, загадкава, але я баялася паказацца недасведчанай.

— У якой стадыі адносіны з маладым чалавекам?

І. І. меў на ўвазе Дзямьяна. Я паціснула плячыма.

X

За некалькі дзён да Новага года І. І. падвёз мяне ўвечары дадому. На развітанне ён пацалаваў маю далонь і адвярнуўся, хаваючы твар. Я выйшла з машыны і адразу ж заўважыла знаёмы «масквіч». Дзямьян чакаў мяне, хаця мы не дамаўляліся аб сустрэчы. Ён стаяў ля пад'езда на холадзе, у лёгкім палітоне колеру мокрай травы, у дваццаці кроках ад мяне. Я ішла павольна ў футры, якое мне пасавала, прыпол рытмічна разлятаўся, робячы кожны крок грацыёзным. Я пачувалася вольнай, прыгожай — ізноў на вяршыні, а ён — мой хлопчык больш не з'яўляўся там; магчыма, знайшоў новы прыстанак — планету ў прасторы, куды не зазіралі яшчэ ні гук, ні святло. Калі так, дык ягоная планета называлася Сум ці Адлучанасць... Ён адчыніў дзверцы машыны і запрасіў сесці. Мы былі побач: маўклівыя, нерухомыя. З прыёмніка гучала джазавая музыка. Няхай Дзямьян лічыць І. І. маім каханкам, няхай я пазбягаю сустрэч з ім, але ж я запэўніла сябе, што магу дазволіць сабе вольныя паводзіны: без тлумачэнняў і нечай згоды. На імгненне я разгубілася: Дзямьян не патрабаваў прызнанняў, не высвятляў адносіны. Гэта магло пазбавіць мяне перамогі. Я адважылася:

— Што здарылася? Чаму ты маўчыш?

Замест адказу Дзямьян завёў матор. Мы ехалі доўга: спачатку па асветленых перадсвяточнымі агеньчыкамі вуліцах Мінску, потым збочылі на загарадную трасу, палі змяніліся лясным масівам.

— Феерыя яшчэ не пачалася?

— Што маецца на ўвазе? Куды мы едзем?

— Далей ад І. І.

— Ён добры і шчыры чалавек. І ніводнага разу не зрабіў мне балюча.

Я памылялася. Нават думаць пра І. І. станавілася балюча: непраяўленыя пачуцці выклікалі шкадаванне, а я нічым не магла дапамагчы яму. Хіба адрачэннем. Тым самым я пакідала Дзямьяна сярод прадметаў не першай неабходнасці, хаця падсвядомасць падказвала мне, што існуе толькі адзін сапраўдны свет — свежы, здаровы, святочны, ненавязліва-светлы: кахаць маладога мужчыну, млець у ягоных руках, звіваць, засынаючы, на палец вільготна-начную саламяную пасму валасоў, дыхаць гарачым водарам целаў і маліцца... прасіць... каб Бог не пакінуў нас.

— Табе засталося прайсці толькі некалькі крокаў, — сказаў ён. — Спусцішся з горкі, пяройдзеш ручаіну — і ты Каралева! Але ты пачакаеш і памахаеш наўздагон? — дадаў ён, пабачыўшы, што Аліса не можа дачакацца, калі пераскочыць праз ручаіну, што аддзяляла яе ад запаветнай мэты. —

Я цябе доўга не затрымаю. Як убачыш, што я даехаў да павароту, махні мне хустачкай. А то я баюся зусім падупасці духам.

Мы ўсё яшчэ ехалі невядома куды.

— Я стаміўся чакаць...

— Мне шкада...

— Гэта я шкадую.

— Дык згубі мяне... назаўсёды.

— Я не маю на гэта часу.

Здалося: я чула нешта падобнае. І. І. таксама спасылаўся на час. Чаму яны размаўляюць загадкамі? Я адчула сябе ахвярай; паспрабавала злавіць спачувальны позірк, але, гледзячы на цвёрды, зацяты, варожы профіль, пачала абараняцца:

— І. І. мне як бацька, ён старэйшы ўдвая. Так атрымліваецца, што ён дапамагае. Гэта выклікае павагу! Ты не маеш права раўнаваць, і я...

Пачалася блытаніна: ні тон, ні разгубленасць ужо не выклікалі даверу.

— Ягоныя паслугі небескарыслівыя!

— Прашу цябе: дай мне спакой!

— Ты гэтага хочаш?

Я прамаўчала. Дзямьян так рэзка павярнуў руль, што я стукнулася аб шкло. Гэты боль быў меншы за боль магчымага хуткага растання, але мне не хапіла разумення. Я заплакала. Дзямьян гнаў машыну на гранічнай хуткасці.

— Спыні, — загадала я. — Спыні!

Мой крык мог напалохаць каго заўгодна. Я выскачыла з машыны і пабегла ў бліжэйшыя купкі дрэў. Дзямьян застаўся ў «масквічы». Мае нетрывалыя, няўпэўненыя крокі рэзка перапыніліся: я ўпала на зямлю, на вільготнае белае прасціралда і завыла няўтрымна, шалёна. Розум перастаў існаваць, усё — толькі эмоцыя. Я плакала, выла, перакатвалася па снезе, хапалася рукамі за кволыя галіны кустоўя, шукаючы паратунку ў хаатычных гуках і рухах...

— Што з таго? — сказаў Труляля. — Усё адно ты яму толькі снішся? Ты ж не сапраўдная!

— Не, сапраўдная! Сапраўдная! — крыкнула Аліса і заплакала.

— Слязьмі справе не дапаможаш, — заўважыў Труляля. — Пра што тут плакаць?

— Калі б я была не сапраўдная, я б не плакала, — сказала Аліса, усміхаючыся скрозь слёзы: усё было так недарэчна.

— Спадзяюся, ты не думаеш, што гэта сапраўдныя слёзы? — спытаў зняважліва Труляля.
«Я ведаю, што ўсё гэта глупства, — падумала Аліса. — Неразумна з-за гэтага плакаць?»

Дзямьян знайшоў мяне праз колькі хвілін, дастатковых для таго, каб вярнуўся спакутаваны розум.

— Аліса! Аліса! А-а-лі-і-са-а...

Я глядзела ў ягоныя напалоханыя вочы, поўныя жалю, ціха ўсхліпвала і прасіла: «Не кідай мяне», — нібыта ад гэтага залежала жыццё.

— Што ты кажаш, у мяне не хопіць мужнасці кінуць цябе, мілая мая дзяўчынка. Я так кахаю...

Мы ішлі назад па адбітках нашых слядоў — па заечых петлях адчаю, абодва мокрыя і знясіленыя. Але яшчэ не было мне дадзена зразумець, што больш за ўсе пачуцці я люблю боль: каб смылела душа і выдзіралася на волю; нават у сумнеўным будзёным спакоі наканавана шукаць мне гнюсных стрэмак, загнаных у сэрца. І з кахання Дзямьяна, са шчырых пачуццяў выплаўляць мне залатыя іголкі болю...

— Калі табе кепска, заўжды еш скабкі, — сказаў Кароль, на ўсю моц працуючы сківіцамі. — Іншага такога сродку не адшукаеш.
— Праўда? — здзівілася Аліса. — Але можна пырснуць халоднай вадой ці даць панюхаць нашатыр. Гэта лепш, чым скабкі!
— Ведаю, ведаю, — адказаў Кароль. — Але ж я сказаў: «Іншага такога сродку не адшукаеш!» Іншага, а не лепшага!

Пры дадзеных абставінах толькі я адна магла выратаваць сябе, дастаткова было адмовіцца ад апекі І. І. У горшым выпадку гэта азначала згубіць працоўнае месца, грашовую незалежнасць, сувязі і вопыт — знаёмыя шэфа бачылі ўва мне ягоную памочніцу, уцёкі без дазволу набылі б значэнне здрады. Я баялася адказнасці — вось у чым трэба было прызнацца Дзямьяну. Замест гэтага я вырашыла перачакаць.

— Калі хочаш, я пераеду да цябе. Мы маглі б жыць разам.

Ён кахаў мяне і я заахвочвала яго, канчаткова заблытаўшыся ў пачуццях. Спасцігнуць сябе можна было толькі праз рашучыя дзеянні, а я рабіла глупствы і не збіралася іх аналізаваць, — як безадказнае амёбнае стварэнне.

XI

У маім настроі зноў адбылася перамена. Пасля спусташальнага прыступу эйфарычнай істэрыі я замкнулася ў сабе. І на нейкі перыяд перастала адчуваць цікаўнасць да працы. І. І. запрасіў мяне ў кабінет, каб уведаць ступень маёй абыякавасці. Я размаўляла з ім ураўнаважана-суха. Тонкія доўгія пальцы шэфа бясконца перабіралі паперы, упершыню ў ягоных вачах я ўбачыла драпежны бляск. Я не хацела спрачацца, але І. І. перастаў стрымлівацца, ён ужо гучна папракаў.

— Дзе твая ўдзячнасць? І хто табе дазволіў не прыходзіць да Альховіча?

Я паспрабавала запярэчыць, схлусіць.

— Я ведаю ўсё, што ты мне зараз скажаш! Мне патрэбна Юнона.

У гэты момант ён быў не гняўлівым, але блізкім і зразумелым сябрам, а ганарлівым самадурам. Навошта яму я, калі ён можа задаволіцца партрэтам? Я паднялася з крэсла.

— Ты куды?

— Фатаграфавацца. Я зраблю для вас здымкі, толькі пакіньце мяне ў спакоі!

Увечары дазванілася Фаіна; пэўна, яна званіла цалюткі дзень, але я гуляла па горадзе. Каб адагрэць ногі, я зайшла ў нейкі шынок і падсела да незнаёмага мужчыны. Ён быў малады, плячысты і вясёлы. З таго, што побач быў універсітэт, ён прыняў мяне за студэнтку.

— Збегла з лекцый?

Я не імкнулася пераконваць. Ён назваў сваё імя і запрасіў у госці. Я была стомленай, каб некуды ісці.

— Тут недалёка, — запэўніў мужчына. — Мы можам паслухаць файную музыку. Я набыў новыя дыскі. — Ён выцягнуў іх з кішэні. — Ты любіш музыку?

Мне трэба было заехаць дадому, наліць поўную ванну гарачай вады і ляжаць, покуль пена і вада не выпараць горкі прысмак. Маё маўчанне зразумелі як згоду; раптам мне самой захацелася пачувацца сапраўднай студэнткай — трохі волі, трохі шалапутнасці, крыху разбэшчанасці, а ўсё астатняе — прагная цікаўнасць. Мы выйшлі з кавярні разам. Ён схапіў мяне за руку і пацягнуў за рог будынка. Я адчула моцныя абдымкі, убачыла зблізку свавольныя чорныя вочы і сама працягнула насустрач вусны... Магчыма, ува мне загінула выдатная выляжанка: я паводзіла сябе, як цнатліваразбэшчаная школьніца. Не ведаю, наколькі праявілася мая разбэшчанасць, але я адчувала шчаслівае ўзбуджэнне, узгадваючы смак незнаёмых вуснаў. Без сумневу, мужчына з цыганскімі вачыма слухае музыку не адзін. Але без Алісы.

Варта было, каб нехта пасмяяўся з мяне, выказаў некалькі з'едлівых кпінаў, што прывяло б мяне ў раўнавагу. Але ні Дзямьян, ні І. І. не зразумелі б гэтага ўчынку: я не павінна была бадзяцца па танных шынках.

— Каго ты сустрэў па дарозе? — спытаў Кароль Ганца...
— Нікога, — адказаў Ганец.
— Чуў, чуў, — сказаў Кароль. — Гэтая маладая асоба таксама яго бачыла...

...Фаіна папрасіла мяне неадкладна прыехаць, але атрымала адмову. Мне трэба было пайсці ў ванную, прыняць душ і пачысціць зубы. Замест гэтага я залезла пад коўдру і заснула. У выдатнай парыжскай сукні...

Яна стаяла перад вялізнымі дзвярыма з аркай, над якой вялікімі літарамі было напісана: «КАРАЛЕВА АЛІСА»... Аліса доўга грукала і званіла, але ўсё дарма...
— Дзе прыдзвернік? — абурана пачала яна. — Чаму ніхто не падыходзіць да дзвярэй?
— Да якіх дзвярэй? — спытала Жабяня...
— Як гэта «ніхто не падыходзіць да дзвярэй»? — перапытала яно. — Ты ж да іх падышла?

Мне сніўся Храм, культавае месца квадратнай формы, да яго вяла доўгая лесвіца. Я стаяла ўнізе, мужчыны і жанчыны кіраваліся да мяне. Усе яны былі ў доўгіх белых адзеннях. Далёка за Храмам святлела — пачынаўся дзень. Нехта, прытрымліваючы мяне пад локаць, прымусіў падымацца па прыступках. Праз роўныя адлегласці з правага і з левага бакоў лесвіцы стаялі невысокія граніт-ныя слупы, якія аказаліся пастаментамі. На кожным з іх залатымі літарамі былі высечаны імёны на невядомай, але зразумелай у сне мове. У снабачанні я ведала назвы ўсіх рэчаў, паказаных мне... Я чула за сабой крокі: па бясконцай лесвіцы разам са мной падымаліся людзі. У нейкі момант я зразумела, што чую толькі крокі двух-трох чалавек, а не мноства, як раней. Паспрабавала азірнуцца, але той, хто падтрымліваў, не дазволіў. Я ішла ўверх, пачуваючы холад і жар адначасна, па твары цяклі кроплі задушлівага поту, вочы зліпаліся. Станавілася млосна, але ўладныя рукі падштурхвалі. На верхняй прыступцы адразу сціхлі апошнія крокі і знік мой праваднік, — я азірнулася. Храм стаяў на ўзвышшы, але наколькі высока — невядома, бо ўсё паглынаў

туман: і наваколле, і бляклае сонца, і лесвіцу, па баках якой уладкаваліся на пастаментах адзінаццаць стодаў, чые жыцці сціхлі ў мармуровых складках адзення.

Невядомая сіла скіравала мяне наперад. Я апынулася сярод масіўных калон, перад уваходам у Храм. На вялізных мармуровых плітах, выкладзеных адмысловым узорам, убачыла бліскучую купелю з вадой. Туман паволі абвалакваў усё, што мелася побач: уваход, калоны, мазаічныя пліты... Я распранулася, зайшла ў ваду і адразу ж адчула палёгку. У сне маё цела і стома былі фізічнымі, вада — халаднаватай, асвяжальнай, кроплі — гучнымі, серабрыстымі. Я змыла з твару пот, акунулася ў ваду з галавой і, разняволеная, сцішылася на некалькі хвіляў.

Сонца падымалася вышэй, туман пачаў адступаць. Я выйшла з купелі і, не здзівіўшыся, надзела белую столу і серабрыстую палу, што ляжалі на месцы скінутай сукні. Туман адразу ж набыў ліловатае адценне і я ўбачыла птушак; спачатку — характэрны шоргат крылаў, потым — дзесяткі бялюткіх галубоў праляцелі над галавой: у рэдкія аблокі, у прастору. Усё мела значэнне і рэальнасць. Я падышла да дзвярэй, але Храм аказаўся зачыненым. Тады я рушыла назад, спускаючыся па лесвіцы не баязліва, а спакойна і годна — як пасвячоная ў тайну, разгадка якой чакае наперадзе; і шэра-малочныя каменныя прыступкі захоўвалі рэха адзінокіх крокаў і першабытны спакой. Я дакранулася да фігуры на пастаменце — яна на самой справе аказалася зробленай з мармуру. Як і раней, сон працягваўся ў бела-чорна-серабрыста-ліловатых адценнях, але раптам — на адным з узвышшаў зрок выхапіў каляровую пляму: там велічна стаяў у зырка-шчодрым апярэнні паўлін. Ніжэй было выбіта на розных мовах адно імя. Залатое «Сатурнія»* належала той, што адсутнічала, даслаўшы замест сябе птушку. Паўлін нечакана саскочыў і марудна-рухава пайшоў побач. У адзін гук зліліся шалахценне хваста і палы — мы спускаліся адначасна-залежна.

* * *

...Некалькі дзён я разважала над разгадкай сну; так і карцела звярнуцца да І. І. , памятаючы, з якой лёгкасцю шэф патлумачыў значэнне першага снабачання: белую ахвярную карову і чырвоныя пырскі брызгліны. Тады мы доўга разважалі пра культ ахвярапрынашэння і ўздзеяння сноў на лёс чалавека, пра веру і залежнасць; тады ж я адчула ў І. І. не толькі ўсёведанне, але і збянтэжанасць... Што зараз будзе непадуладна ягонаму чаканню, які воб-

---

* Згодна са старажытнарымскай міфалогіяй, Сатурнія — Юнона, дачка Сатурна і жонка Юпіцера.

раз стане неспадзяваным? Хто гэтым разам даслаў папярэджанне і ў чым яно?..

На працы І. І. моўчкі хадзіў ля мяне; здавалася — ён употайкі назірае, але не падганяе падзеі. Я інстынктыўна змагалася з цікаўнасцю: баялася адчуць залежнасць — праз дзівосныя сны — ад звышнатуральнай, пазачалавечай сілы.

Я падзялілася з Дзямьянам, мы праводзілі паралелі; заінтрыгаваныя, спрабавалі пабудаваць доказ на інтуіцыі і тых магічных дробязях, якія выцягвалі з памяці. Дзямьян быў схільны прыпісаць мне ціхае вар'яцтва ад «абагаўлення», я ж хутчэй бачыла тут гіпноз. Дух зазнаваў неспакой, але, дзякуючы намаганням розуму, — яшчэ не страх, бо страх заўсёды чакае зла.

І як свята часовага разняволення — І. І. пазнаёміў мяне з Паўлам Рудым, беларускім мастаком з Парыжу. Павел нарадзіўся ў Віцебску, вырас і вывучыўся на Беларусі, але эміграваў, жадаючы занесці сваё імя ў элітарны свет мастацтва Захада. Ён не згубіўся на чужыне дзякуючы волі, нахабству і славянскай упартасці, ягоныя партрэты нагадвалі па стылю велькіх майстроў, блізкіх сэрцу французаў: Манэ, Рэнуара, Каралюс-Дзюрана. Ён высмейваў сучасных мастакоў і параўноўваў іх з акушэркамі, якія здаровых чалавечых немаўлят шляхам вівісекцыі ператваралі ў пачвараў для забаўкі перанасычанай публікі.

— Самых дасканалых жанчын стварыў Радэн. Вы толькі зірніце, — казаў Павел, калі я разглядала альбом, прывезены з Парыжа.

— Навошта тады жанчына, калі ёсць мармур?

— ...з якога можна выразаць лепшую ў свеце? Не, Аліса, гэтыя скульптуры даказваюць, што вытанчанасць і зграбнасць існуюць наяве, не як прыдумка, а як рэальнасць. Варта пільней прыгледзецца: яна можа быць эканомкай і дачкой селяніна, як Мары-Роз*, але ж толькі сапраўднаму мастаку ці скульптару дадзены талент перанесці жанчыну праз стагоддзі, захаваўшы яе прыгажосць і непаўторнасць.

— Шчасціць тым, хто сустракае вялікіх.

— Ці тым смяротным, хто грэецца ля прыгожых. Пакуль мае творы будуць натхняць суайчыннікаў на пошукі ідэальных твараў, я сам буду атрымліваць асалоду побач з вамі.

Мастак сядзеў, трымаючы маю руку ў сваіх далонях. Ён не спрабаваў паказаць сваю прыхільнасць, не спакушаў і не даваў абяцанняў на магчымыя сустрэчы — толькі часта смяяўся, фантаніруючы жэстамі, фразамі, перасыпанымі французскімі слоўкамі. Пэўна, такое пачуццё ўласціва эмігрантам у першыя хвіліны сустрэчы з роднай зямлёй: экстаз і захапленне.

---

* Жонка Радэна.

— Bon sens* падказвае мне, што я буду вялікім беларускім мастаком.

І. І. пазваніў ў галерэю, дзе ішла падрыхтоўка да выставы Паўла Рудога. Усё было абгаворана зараней, а зараз мастак хацеў убачыць на свае вочы залу. Яны з'ехалі, мне засталіся толькі званкі, факс і альбом Радэна, пакінуты ў падарунак. Мармуровыя вочы маіх адналетак глядзелі сумна-заглыбленым позіркам, які не дадзены быў аніводнай жывой жанчыне...

XII

Мы сустрэліся з Фаінай праз тыдзень яе адсутнасці. Яна вярнулася з Індыі і цяпер мерала пярэстае сары, расфарбаванае паўлінавымі вочкамі. Фаіна пачувалася нязмушана-вясёлай і адкрытай; мы размаўлялі як сяброўкі, што сустрэліся пасля вакацый. Я дапамагала ёй абкручвацца ў празрыста-тонкую тканіну і пераказвала апошнія навіны, сярод якіх самай цікавай для яе стаўся мой сон. Яна паабяцала знайсці тлумачэнне і пакінула мяне начаваць. Пэўна, яна вызваніла І. І., бо хутка той з'явіўся з тортам — спакойны, ураўнаважаны, але з нейкім дзіўнаватым выразам твару.

За гарбатай мяне прымусілі пераказаць сон, я ўзгадвала новыя і новыя падрабязнасці: туман, птушкі, кволае сонца, «Сатурнія»... Яго зацікавілі толькі птушкі.

— Галубы? Гэта знак. У які бок яны ляцелі? Справа ад Храма ці злева?

Мне прынеслі паперу, і я намалявала — так, як памятала, план: лесвіцу, будынак, купелю.

> *— У такім разе, — абвясціў Дадо, — я прапаноўваю прыняць рэзалюцыю аб неадкладным роспуску сходу з мэтай прыняцця самых экстраных мер для найхутчэйшага...*
>
> *— Кажыце па-чалавечы, — сказаў Арляня Эд. — Я і паловы слоў не ведаю? Ды і вы самі, па-мойму, іх не разумееце...*
>
> *— Я хацеў сказаць, — пакрыўджана вымавіў Дадо, — што трэба наладзіць Бег па коле.*

— Птушкі наляцелі так хутка. Здаецца, справа. І што значыць «Сатурнія»?

---

* Цвярозы розум, разважнасць (*франц.*).

— Ты прынесла добрую вестку. Арнітамантыя* праз сон!.. Ты — абраная.

Ягоны голас гучаў узнёсла. Я паціснула плячыма, але нічога не адказала, каб не расчараваць І. І. Калі ў каго і было ціхае вар'яцтва, дык у майго шэфа. Але пакуль што ягонае захапленне (ці вера?) не раздражняла мяне і я гатовая была падыграць, каб толькі зразумець сваю спрычыненасць да ўсяго, што адбывалася. Ён запатрабаваў паабяцаць, што ўсе сны, а таксама дзеі, якія пададуцца мне неардынарнымі, я павінна буду адразу ж пераказваць яму. Нічога няма лягчэй, чым згадзіцца, калі выкананне залежыць толькі ад цябе самога...

> *— ...як бы мне хацелася трапіць у Залюстрэчча! Там, напэўна, шмат розных цудаў! Давай гуляць, нібы мы туды можам прайсці! Раптам шкло стане тонкім, як павута, і мы зробім крок праз яго! Глядзі, яно папраўдзе растае, як туман. Прайсці скрозь яго цяпер зусім не цяжка...*

— Прыйдзе час, калі адплюшчацца вочы. І народ, народжаны пад Сатурнам**, атрымае боскую дачку, як сваю: яна падкажа шлях да Ісціны, да вызвалення, верне згубленыя Веды і дапаможа нам, сынам вялікага Бога самім стаць багамі, не пакутуючы на зямлі. Мы знайшлі сваю Юнону, сваю Сатурнію...

Я зразумела. І. І. не баяўся напалохаць, ён «пасвячаў», шчыра верачы, што я ўжо гатовая стаць той, кім ён бачыць мяне. Мяне трохі насмяшыў нечакана-спалоханы позірк Фаіны — так глядзяць на хворых... ці на тых, хто адкрывае таямніцу чужаку. Зрэшты, кожны мае права вычварацца — калі ён Асоба і нешта значыць у гэтым жыцці. Vivere militare est — жыць, азначае змагацца. Не мае розніцы: за што змагацца, калі гэтай барацьбы патрабуе ваш ratio*** альбо spiritus****.

Я не пыталася пра *шлях*. Зрэшты, мне было цікава; старажытная містэрыя на новы капыл. Дзямьян меў рацыю: нехта будзе ўдзельнічаць у рытуалах, але не акторы і актрысы, а сапраўдныя зямныя багі — народжаныя так зарана... ці так запозна. Меланхалічна і трохі гнятліва: трапіць у дзіцячую казку, у іншасвет... у Залюстрэчча. Я магу скарыстаць часовае памяшальніцтва сталага ча-

---

* Птушкагаданне па палёце і крыку птушак, іграла вялікую ролю ў старажытным Рыме.

** Габрэі.

*** Розум (*лац.*).

**** Дух (*лац.*).

лавека; магу патэлефанаваць у лякарню; магу пасмяяцца і знікнуць; магу... Я маю дзесятак варыянтаў, і адзін з іх — авантура.

— Вось бачыш, ты нават не здзівілася.

— Гэта таямніца?

— Для нас — не.

— А Дзямьян?

— Ён не ўдзельнічае. Тут вызначаем мы.

Я праглынула «мы», бо за гэтым словам ішоў загад на абмежаванне свабоды, забыўшыся на тое, што Фаіна спрабавала адштурхнуць Дзямьяна менавіта тлумачэннямі, хай сабе і цьмянымі.

> *— Та-ак, — працягнуў Кантралёр і злосна зірнуў на Алісу. — А дзе твой квіток, дзяўчынка?..*
> *— На жаль, у мяне няма квітка, — спалохана сказала Аліса. — Там, дзе я села, не было касы...*

Штосьці прыспешвала І. І., іначай ён не адкрыўся б так раптоўна, пакідаючы яшчэ здагадкі і недаказанасць, але знікала прыцягальная сіла таямніцы; падалося, што адказ я ведала зараней, калі згадзілася пазіраваць Альховічу, калі чула «Юнона», калі сніла сябе... Я ведала! Бо седзячы ў бібліятэцы, я ўжо вышуквала ўсё, звязанае са свавольнай багіняй: помслівай, жорсткай, ганарлівай і прыгожай, якая мела розныя найменні — Гера, Люцына, Манета... Прасцей было думаць, што менавіта з-за апошняга імя І. І. вяртае багіню: жывы талісман удачы, шацунак праз забабоны*.

Зрэшты, вінаваты не І. І., а я, бо, адчуваючы двухсэнсоўнасць, дазволіла яму не кідаць надзею на працяг і завершанасць. Псіхалогія — мая таямнічая любоў, а не прага дасканалай вяршыні Алімпа. І мае ўцёкі ад Дзямьяна — чысцюткая псіхалогія, як і нашыя адносіны: суцэльны эгаізм двух здаровых людзей.

...Пад самюсенькі Новы год Альховіч закончыў працу над партрэтам. Мне дастаўся авянечнік — такія ўскладваюць на галовы новаспечаных «міс», калі яны перамагаюць на конкурсах; на карціне я была ў ім. Я болей не пазбягала І. І. — нейкая пачварная сіла прыцягвала нас. Дзямьян, напэўна, кляў маю ціхую пакорлівасць, але цярпеў, адно намагаючыся выцягнуць мяне ў кавярні ці на выставы, — у дні, калі туды зазіралі толькі выпадковыя наведвальнікі. Я маўчала пры ім, баючыся шакіраваць, падацца смешна-несур'ёзнай, гэткай жа вар'яткай, як і шэф. Мы абмяркоўвалі ягоную ву-

---

* Манета — (*лац.* дарадчыца) адно з імёнаў Юноны. У Храме Юноны на Капіталійскім узвышшы чаканіліся манеты. Адсюль сучасная назва «манетны двор».

чобу, мае заняткі, зрэдку — нашыя планы, яшчэ радзей — «укамянелыя ў мроі і слёзы»* асабістыя пачуцці.

— Пакінем усё за намі.

— Усіх?

— Вядома. Нас чакаюць адкрыцці.

— Выпадковасці?

— Зазначаныя выпадковасці, прымхі мінулага.

— Бессэнсоўнасць?

— Папраўдзе, так.

— Абыякавасць?

— Не.

Дома я перагортвала кнігі і неяк вытрусіла засохлае лісце: бабуля любіла перакладваць старонкі травой, кветкамі, лістотай, асабліва пад восень. Праз гадзіну быў завершаны навагодні падарунак Дзямьяну: з папараці, стакротак і браткоў — пад шклом — фларыстыка, кавалачак лета, былога шчасця і самаадрачэння, і чырвоная стужачка — кропелька яшчэ кахання...

XIII

У вечар Новага года мне пазваніла незнаёмая жанчына і назвалася Дзямьянавай маці. Яе голас гучаў напружана і крыху стомлена. Яна сказала, што Дзямьян хворы і хацеў бы мяне бачыць. Зразумела, ён не зможа да мяне прыехаць...

Праз гадзіну я ўжо сядзела ў іхняй утульнай кватэры. Дзіўна, але, пераступіўшы парог, я адразу ж перастала пачуваць сваю віну — за недарэчную хваробу ў не менш недарэчны дзень. Сталая жанчына — маці майго каханка — выглядала стомленай, але не часовым стамленнем, бо мела вечна пакутлівы, цярплівы выраз твару. Нібыта яна выношвала хваробы сына ў сабе — зараней, абы не зазнаў ён пакут.

Яе званок напалохаў мяне, і я, не вагаючыся, не азіраючыся, заглыбілася ў сцішнавата-цьмяную плошчу пакояў, пакуль не спынілася ля светлай плямы: бледнатвары Дзямьян прытуліўся ў пухнатых белых падушках і слаба пасміхаўся. У парыве шкадобы, адначасова хаваючы збянтэжанасць, бо невядома з чаго ўзгадалася выснова, якую аднойчы ў адпаведным настроі я прымярала да сябе: «памры, пакуль цябе лашчыць жыццё»,** — я апусцілася на калені, адчуваючы спіной, як расчулена глядзіць на нас кабета.

— Што з Дзямьянам?

---

* Радок з верша «Бурштын» Г. Булыкі.

** Публілій Сір.

— Не хвалюйцеся.

— Яму кепска. Што з ім?

— Ужо лепш. Доктар дазволіў яму застацца дома. Ён хацеў сустрэць Новы год з вамі...

Жанчына замаўчала. Доктар? Значыць, гэта сур'ёзна... Я нахілілася, мае вусны даткнуліся да знаёмага твару: шчокі, бровы, вусны, — снег з ледзь чутным пахам позніх канвалій.

Я засталася з ім. Незадоўга перад тым, як настала апоўнач, Дзямьян заснуў; мы з Адэлаідай Вінцэнтаўнай апынуліся ў вялікім пакоі за сумна-святочным сталом. Паміж намі ў паліваным збанку стаялі яловыя лапкі, упрыгожаныя цацкамі і запаленымі свечкамі. Мы адкаркавалі шампанскае і паціху смакавалі шыпучы напой. Я бачыла яе на фоне кніг, як іншых бачыш на фоне гор — чорнабелы фотаздымак з даўняй вандроўкі. Апранутая ў някідкую блузку са стаячым каўнерыкам, уся як чаргаванне цёмнага са светлым, яна была толькі дадаткам да святочнага стала, кніжных паліц, яловых лапак, паўтораная ў каляровых шарыках, як недарэчная задума мастака. Гаварылі мы няшмат, слухалі прыцішаную музыку (яна любіла Вагнера, якога я не разумела), пілі шампанскае і ўпотайкі разглядалі адна адну.

Яна сказала, што ўсё здарылася нечакана: прыступ, сэрца, непрытомнасць... За ціхім цурчаннем слоў, як за нежаданнем пераказваць, за пакутлівасцю напаміну, — хавалася яшчэ нешта: значнае слова, медыцынскі тэрмін — што заўгодна; тое, што мела значэнне для яе і тлумачэнне для мяне. Я цярпліва чакала. У дванаццаць гадзін я зазірнула да Дзямьяна: ён адплюшчыў вочы і намагаўся ажывіць-пагнаць ток крыві — вышэй, да шчок: ён шчыпаў твар, кусаў вусны, цёр сківіцы. Я ціха паклікала:

— Дзямьян...

Ён працягнуў рукі.

— Аліса.

Гэта было невыносна; мы спляліся — лёгкія, бы ветрык, гнуткія — як лаза: героі, апетыя старажытнымі... Я заўжды зайздросціла паэтычнаму дару Вялікага Усходу. «За ту отдам я душу, кого покину вскоре, За ту, кого я помню и в радости, и в горе, За ту, кому велели, чтобы со мной рассталась. За ту, кто, убоявшись, ко мне забыла жалость...» — сэбнаязыкі Маджнун*, будучы герой разнамоўных песень, сімвал вечнай крыніцы кахання, крыніцы, якая жывілася водамі арабскіх, персідскіх і турэцкіх спеваў... і нараджалася, і звінела, і лагодзіла слых лірыка, поўная вытанчанасці,

---

* Маджнун — «што звар'яцеў ад кахання», арабскі паэт, які жыў у VII стагоддзі. Гэтае імя стала хадзячай назвай: так называюць вернага закаханага, ахопленага невылечным жаданнем, пачуццём.

яркай вобразнасці, тэмпераменту, гнуткага рытму і гармоніі гукапісу, — паўнаўладны спеўны пачатак Ізраіля. «Пячаткай мяне пакладзі на сэрца сваё, пакладзі на рукі, як пярсцёнак...»*

— Здаецца, гэта доўжыцца вечнасць. Табе лепш?

— Усё, як раней: без часу і месца.

— Як трэцяе неба, як рай?

— Мне лепш, калі ты побач.

Ізноў мы абрыналіся ў пачуцці — тыя, без наймення, — калі былі сведкамі свавольнага сухумскага сонца, палкай смагі яднання і шчаслівых паўз небыцця, правалу... Тысячы тысяч жанчын сядзяць ува мне адразу, бо немагчыма адначасова шкадаваць сябе і пачувацца салодка-задаволенай... Можна і ў пакутах знайсці насенне радасці; мы былі побач, — але ўваходзілі адзін у аднаго глыбей, чым праз фізічнае яднанне... пакуль адзін з нас пакутаваў...

XIV

Святы закончыліся. На працоўным стале мяне ціхамірна чакаў кошык, у сярэдзіне, на яловых лапках ляжалі спелыя, колеру падсохлай крыві, паўднёвыя гранаты. Я не ведала: хто спрычыніўся да падарунка, але палічыла, што І. І. у кабінеце не было, на ягоным стале ляжала разгорнутая кніга. «Не будзь вельмі праведным і не надта мудрым — нашто табе жахацца?»** — было падкрэслена алоўкам.

Я вярнулася да сябе, пачала разбіраць пошту, у большасці — калядныя віншаванні. Зазірнуў Сабковіч.

— Брава, мілая. Вы добра ўладкаваліся, — ён агледзеўся і падмігнуў мне. — Чым мы тут займаемся?

Нечакана я ўбачыла яго іншым: добры, але крыху зацёрты палітон, і штаны, выцягнутыя на каленях, — пацвярджэнне таму, што прас не дакранаўся да іх некалькі дзён, і шалік — як скінутая змяіная скура: бясколерны, абкручаны абы-як. Да таго ж аказалася, што Сабковіч хворы на ангіну: праз колькі хвілін ён выцягваў насоўку і хлюпаў у яе.

— Як я вам зайздрошчу: цёпла, утульна.

Спроба пажаліцца. Я пажартавала:

— Не шкадуйце пра чужыя ўдачы. Кесару — кесарава...

— Ат, разумная нягодніца, — мусіць, ён лічыў, што ў ягоных вуснах гэтае вызначэнне прагучала як хваласпеў. — Няпраўда, што Бог пароўну дзеліць. Дзесяць запаведзяў, — Сабковіч пера-

---

* З «Найвышэйшай песні Саламонавай». Пер. В. Сёмухі.

** З «Кнігі Эклесіяст».

ключыўся на адну з любімых тэм, — гэта адно, але ж габрэйская філасофія ў чыстым выглядзе — не для майго духу. Хай нашчадкі Ізраіля выконваюць волю свайго нацыянальнага Бога, а мы паглядзім, як іх аддзячыць Іегова.

— І. І. ведае вашы погляды?

Сабковіч азірнуўся, ягоныя рукі нервова прабеглі па гузіках на адзенні. Ён даваральна нахіліўся:

— І. І. казаў што-небудзь аб прэміях... — заўважыў маё неразуменне і дадаў: — Святочных падарунках? Я захварэў, не змог прыйсці перад святамі...

Я пасміхнулася: філосаф не саромеўся выглядаць жабраком. І я нічым не магла дапамагчы, але Сабковіч, здалося, не заўважыў майго іранічнага выразу твару: ён спрабаваў сцвердзіцца, даказаць прыхільнасць да мяне — праз просьбу і шчырасць, калі наважыўся дзяліцца са мной сваімі поглядамі.

— Хай Іегова вартуе габрэяў, а мы... мы павінны скарыстаць...

Сабковіч не закончыў фразу, у дзвярах з'явіўся І. І. Ён павітаўся з намі і пайшоў у кабінет. Сабковіч — за ім.

> *— Прашу вас... — пачала Аліса.*
> *— Не папрашайнічай, — сказаў Кароль строга. — Прыстойныя людзі гэтага не робяць!*
> *— Я проста хацела сказаць: «Прашу вас, патлумачце мне гэта, калі ласка». Як гэта: адзін бяжыць туды, а другі — адтуль? Я не разумею...*
> *— Але ж я й кажу табе: у мяне іх два! — адказаў нецярпліва Кароль. — Адзін на пасылках, а другі — на пабягушках. Абое рабое: адзін жыве, а другі хлеб жуе!*

Не ведаю, чым скончылася іхняя сустрэча, мяне хвалявалі іншыя праблемы — зацягненая хвароба Дзямьяна: я спрабавала датэлефанавацца, але трубку не здымалі...

Увесь дзень на працы я ўзгадвала нашу апошнюю сустрэчу, навагоднюю ноч, што так узрушыла і расхвалявала нас абодвух. Я вярнулася да старога пачуцця — да закаханасці, і адчула палёгку, а першапрычынай з'явілася толькі мая шкадоба.

— У рэшце рэшт, — адказвала я ў тую ноч на слабую ўмешку Дзямьяна. — Ты цудоўна разумееш, што паміж мной і І. І. няма і не можа быць нічога... ніякай фізіялогіі...

— Я веру, — адказаў ён. — Ты такая прыгожая; кожны мужчына марыць, каб ты належала яму.

— Я нікога не правакую, — даводзіла я. — Ты стаўся першым патрэбны мне.

— Усё па згодзе. Я не магу даць табе болей, чым ёсць.

— Ты не патрабуеш ахвяраў.

— Я спалучаю боль і радасць... Я хацеў бы завезці цябе ў Партугалію. Зімой.

— Навошта?

— Ты ўбачыла б на яве залатыя сады. І я быў бы побач.

— Залатыя сады?

— Так, зімой апельсінавыя сады выглядаюць залатымі.

— Сустрэнемся ў залатым садзе.

Ці азначала гэта: «Мы будзем шчаслівыя... потым»? Магчыма...

Я ледзь дачакалася заканчэння працоўнага дня і, падхапіўшы кошык, пабегла: разгубленая, прыгаломшаная, маўклівая і віноватая; мяне пераследаваў погляд І. І., у ім выразна бачыўся папрок.

На мой званок ніхто не выйшаў, суседзі анічога не ведалі. Я разгубілася. У таксоўцы яшчэ так-сяк трымалася, але дома кінулася ў слязах на ложак. Кошык, пастаўлены абы як, перакуліўся, і чырвоныя шары гранатаў рассыпаліся па пакоі.

— І усё-ткі тут вельмі адзінока, — з сумам вымавіла Аліса. Варта было ёй падумаць пра сваю адзіноту, як дзве буйныя слязы пакаціліся па яе шчоках.

XV

Удзень, па абедзе, я пайшла на выставу незнаёмага мне эстонскага мастака. Амаль гадзіну я правяла ў невялічкай зале ля бранзавата-шэрых, меланхалічных работ, адухоўленых хіба прысутнасцю на іх самотных выяў адзінокіх людзей. Яны падаліся фотаздымкамі з майго будучага жыцця. І я яшчэ больш спрычынілася да безвыходнасці... Звароты-званкі па-ранейшаму заставаліся марнымі. На рабоце мяне чакала Фаіна.

— З таго часу, як цябе ведаю, ты не выглядала горш. Што здарылася?

Яна запытала так спачувальна, што ў мяне ўзнікла жаданне падзяліцца, перадаць сваё хваляванне ёй; але для таго, каб прымусіць яе хвалявацца, трэба маўчаць, і я маўчала.

— Аліса, ты эгаістка.

— Яна так любіць свае перажыванні, што не жадае дзяліцца імі з людзьмі, якіх хвалюе яна сама, — голас І. І. здаўся глухаватым. Я азірнулася; ён стаяў за спіной: ціхі, незаўважаны, з'едлівы. Я ўбачыла, як торгаюцца жаўлакі пад скуламі; худы, жаўтлявы твар, зморшчынкі, выразныя бялкі ў чорнай аблямоўцы вееек і пранізлі-

выя зрэнкі. Нешта няўлоўнае: вечна пакутлівы выраз, уласцівы толькі адной нацыі на зямлі, праявіўся на хвілю і зрабіў яго больш безабаронным, чым я... і больш чалавечным, бо мне адразу ж забажалася зрабіць яму балюча... Я няўпэўнена вымавіла:

— Не ведаю... што з Дзямьянам... дзе ён.

Фаіна адразу ж праявіла спагаду, нібыта абараняючыся ад горшага, выслухоўвання жаночай істэрыкі — паніхіды па іншым абранніку. І. І. вярнуўся ў кабінет. Мяне доўга суцяшаў спачувальны голас Фаіны... Супакоеная, я адважылася распытаць, ці не ведае яна, што І. І. зрабіў з маім партрэтам? Вітаючы змену настрою, Фаіна пачала па-свойму тлумачыць:

— Я лічыла, што ты зразумела. Матэрыялізацыя думкі, якую ён выношваў.

— Надта лёгка. Сэнс?

— Не думаю, што гэтаму надаецца большае значэнне, чым тваёй прысутнасці. Ён баіцца згубіць цябе.

— Ён, — мяне палохала слова, якое я наважылася выказаць уголас, — ...кахае?

Яшчэ не пачуўшы адказу, я сцялася, баючыся, што разбураю апошнюю перашкоду паміж намі, бо лепш пачувацца наіўнай, недалёкай, чымся вось так — адбіраць надзею, нібы ставіць сябе вышэй.

— Не адказвай, не трэба.

— Ты запытала. Магчыма, ён не каханне баіцца згубіць, а сэнс існавання.

— Так значна?

— Ён жа ад цябе нічога не патрабуе. Так?

Мне хацелася шчырасці: вычарпальнай, самаадданай.

— Чаго хоча І. І.? Поўнага валодання, падначалення? Забыцця... суцяшэння... праз маё цела?..

Я апусціла вочы долу, каб не пабачыць рэакцыю Фаіны. Душэўная стома патрабавала тлумачэнняў, якія б задаволілі мяне. Я сядзела нерухома, напружаная, нібы выконвала толькі мне вядомы рытуал, пры якім дазволена катаваць і мучыць.

Хвіліну доўжылася маўчанне, і калі я зірнула на Фаіну, яна ўжо была гатовая да новых пытанняў; толькі кропелькі поту на невысокім роўным ілбе выдавалі хваляванне...

> *— ...А вось яшчэ прыклад на адніманне. Адбяры ў сабакі костку — што застанецца?*
> *Аліса задумалася.*
> *— Костка, вядома, не застанецца — бо я яе адабрала. І сабака таксама не застанецца — ён пабяжыць за мной, каб мяне ўкусіць. Ды і я, вядома, таксама не застануся!*

— Значыць, па-твойму, нічога не застанецца? — спытала Чорная Каралева.
— Пэўна ж нічога.
— Зноў няправільна, — сказала Чорная Каралева. — Застанецца сабачая цярплівасць!

Праз дзве гадзіны я сядзела ў машыне І. І., бяздумна назіраючы, як павольна апускаецца бэзавы прымрак на дамы і перакрыжаванні, на шэры гарадскі снег і рухавых мурашак-людзей. Мы ехалі ў таямнічы закрыты клуб, дзе збіраліся такія ж, як мой шэф. Ці не там я павінна буду памяняць бліскучы авянечнік, хай сабе ўпрыгожаны падробнымі каменьчыкамі, на вянец з лісця алівы? А posteriori*... У той момант, калі ўсё здавалася блытана-невырашальным, мяне спакусілі магчымасцю кінуцца з вяршыні эгаістычнага «я» ў прастрань пад назвай «невядомасць».

XVI

— Хіба гэта лухта? — сказала Каралева і паматаляла галавой.
— Чула я такую лухту, побач з якой гэта разумная, як тлумачальны слоўнік!

Мы спыніліся ў цёмным завулку перад прыватным домам; веснічкі зашчэпленыя, вокны не асветленыя. Я адчула, як за крысо футра чапляецца страх і цягне мяне адсюль. Усё было міжволі і хуткасна; не было часу падумаць; І. І. расхінуў варотцы, заехаў у двор... Мая існасць чакала загадкавых рэчаў, якія б падказалі, як далёка мы зайшлі ў нашай нерэальнай гульні ў прывідных багоў і багінь. У доме было надзіва пуста: ні свечак, ні стодаў, ні міфічных лічбаў на сценах. Я абышла святліцу, І. І. ссунуў фіранку, якая хавала не вакно, а... мой партрэт. Шэф сеў да стала, што стаяў пасярэдзіне пакоя. Я ўладкавалася на крэсле.

— Дом належыць вам?

— Як і ўсё, што знаходзіцца тут.

Магчыма, ён меў на ўвазе і мяне, бо я сядзела тут жа.

— Тут займаюцца спірытызмам?

— Не.

— Праводзяць месы?

— Ніколі.

— Што яднае тых, хто прыходзіць сюды?

— Яна.

---

* Залежны ад вопыту, на аснове досведу (*лац.*).

І. І. паказаў галавой у бок Юноны. Сітуацыя ўсё менш нагадвала казку. І усё-ткі, калі я ўявіла, як купка незнаёмых людзей разам з І. І. схіляюцца перад партрэтам, — скажу шчыра, не стрымалася і засмяялася. Шэф злосна зірнуў, але нічога не сказаў. На самой справе карціна атрымалася выдатная: паглядная маладая жанчына ў бліскучым авянечніку, абвінутая ў празрыстую тканіну, азірала нас звысоку, — незалежна і годна. Калі б я не ведала, як ішла праца — у спешцы і мітусні, з філасофскімі развагамі і жартамі, — я б і сама ўспрыняла яе — у шыкоўнай раме на сцяне, асветленай крышталёвым бляскам лямпачак, — як шэдэўр. Алісе хацелася здавацца наравістай, а не падуладнай.

— Ах, як шыкоўна! — выгукнула Аліса. — Я ніколі не думала, што так хутка стану Каралевай.
І, памаўчаўшы, строга дадала (яна любіла сябе пад'юджваць):
— Але вось што я вам скажу, Ваша Вялікасць: не варта вам качацца тут на траве. Каралевы павінны паводзіць сябе з годнасцю!
На гэтых словах яна ўстала і прайшлася па лужку, напачатку зусім скавана, збаяўшыся, каб не ўпала карона з яе галавы, але потым смялей, супакойваючы сябе тым, што вакол нікога не было.
— Калі я папраўдзе Каралева, — падумала Аліса ўслых, — з цягам часу я навучуся з ёй абыходзіцца!

— Хто верыць у яе?

— Мы.

На хвілю я ўзненавідзела сябе за тое, што згадзілася прыехаць сюды. Ніхто не збіраўся тлумачыць больш, чым вядома.

— Вы стваральнік новай рэлігіі?

І. І. маўчаў. Ён прымружыў вочы, падалося, што яшчэ крыху, і я стану вартаўніком карціны і таго, хто заснуў. Я паднялася і пачала мераць крокамі пакой, намагаючыся рухамі прыцягнуць увагу шэфа. Я спрабавала казаць пра недарэчнасць сітуацыі і маёй ролі ў прыватнасці, адчуваючы пры гэтым, як раздражнёна гучыць голас, калі я імкнуся выглядаць раўнадушна-спакойнай. Мяне апанавала разгубленасць. Я наблізілася да стала. І. І. увесь час назіраў за мной праз прымружаныя вочы, раптам ён замармытаў: «...не палохайся страхаў начных, ні стралы, што ўдзень ляціць, не бойся мору, што ў цемры крадзецца, заразы, што ў полудзень пустошыць...»*

---

* З псалма 91.

Калі ён нагнятаў сітуацыю, хацеў заблытаць мяне, — дык гэта яму ўдалося. Можна было прымусіць сябе збегчы, але жаночая неўтаймоўная цікаўнасць і вера ў чалавека як разумную істоту не дазволіла праявіцца слабасці, хаця ўсярэдзіне нешта трымцела і танютка скуголіла. Для самаабароны засталося адно — злосць.

— Мы верым... мы лічым... мы... мы... А самі трымаецеся за такіх людзей, якія і вас, і вашу нацыю не-на-ві-дзяць!

— Сабковіч?

— Так!

Я сумелася. І. І. нечакана падлавіў, зрабіў здрадніцай незалежна ад жадання. Ён ужо сядзеў, нахіліўшыся наперад, і з цікаўнасцю глядзеў мне ў вочы. Я сабралася ў камяк, спрабуючы выправіць сітуацыю, калі ён прамовіў:

— Не хвалюйся так. Я ўсё ведаю.

— Тады навошта... — я не дагаварыла. Сумная камедыя працягвалася.

— Што ты думаеш пра існаванне парных супрацьлегласцяў? Жыццё нагадвае ківач: туды-сюды, узад-уперад.

— ...усё двухадзіна? — я ўзрадвалася, паколькі гэта вызваляла мяне ад іншых тлумачэнняў.

— Двухадзіна: дабро-зло, дух-плоць, воля-неабходнасць, смех-слёзы, мужчына-жанчына. Сабковіч выдатна разумее гегелеўскую дыялектыку, што ўсё у свеце адбываецца шляхам прымірэння супрацьлегласцяў, калі дасягаецца ідэальная раўнавага...

— Што шукаеце вы?

— Раўнавагі. Толькі калі я прывяду ўсе сілы сваёй істоты да сутнасці ідэальнай раўнавагі, тады я змагу ўзвысіцца да багоў. І вырашыць лёс майго народа.

— Але ці магчыма?.. І што значыць Бог у вашым разуменні?

— Я магу паводзіць сябе прыстойна, быць цывілізаваным мысліцелем, а магу быць, як раз'юшаны звер ці вар'ят. Але, калі мне ўдасца спалучыць усё гэта разам, я — Бог.

— Як? — я збаялася свайго крыку і прашаптала: — Як?

— Магчыма, праз саюз мужчыны і жанчыны, своеасаблівую магію, якую прызнавалі і старажытныя. Мой унутраны шал павінен быць ураўнаважаны, а жаданне — спраўджана!

Падумалася: «Ну вось, мы разам, адны. Варта яму ўстаць і працягнуць руку, як ён адразу ж дакранецца да мяне. І атрымае дзвюх Алісаў! Ці Юнонаў? — я блыталася. — Адну — пад ім, з заплюшчанымі вачамі і гідлівым выразам твару, другую — над ім, жорстка-насмешлівую, пераможна-маўклівую». Прайшлі хвіліны. І. І. па-ранейшаму сядзеў ля стала. Я засмяялася.

— З чаго ты смяешся?

— А вам не смешна? Ані?

— Твой смех выдае нервовасць і хваляванне. Я не збіраюся цябе гвалціць. Мая жанчына павінна таксама імкнуцца да раўнавагі.

Словы прагучалі груба, я замаўчала. Праўдай было тое, што ён не дамагаўся і не прапаноўваў правесці эксперымент. Усярэдзіне заварушыўся чарвячок расчаравання: клуб — фікцыя, і памкненне І. І. — фікцыя. А я ўжо ўяўляла, як прыйдзецца адбівацца і клікаць на дапамогу. Нас ахінала абыякавасць, як горад — заўсёдная гэтым часам — ноч.

XVII

Праз колькі дзён вярнуўся Дзямьян. Адсутнасць ён патлумачыў ад'ездам па сямейных справах. Убачыўшы яго — жывога, здаровага, — я расчулілася і расплакалася на ягоным плячы. Як пры першай сустрэчы, на ім была фланелевая кашуля, на шыі — скураны ключык... Ноччу я прачыналася не адзін раз — запэўніцца, што Дзямьян побач, і мая паніка недарэчы: увесь час сніліся жахі. Нібы адчуваючы гэта і аберагаючы ад іх, Дзямьян сціскаў мяне ў абдымках мацней і мацней, пакуль я не раздымала ягоныя рукі і не цалавала — пяшчотна і ціха ў куточкі вуснаў, скроні, лоб...

Раніцай, збіраючыся на працу, я адчула, як ненавязліва Дзямьян спрабуе ўтрымаць мяне; гэта было прыемна і шчымліва.

— Больш ніколі не з'еду ад цябе, — сказаў ён і нарэшце вызваліў мае пальцы. Я нахілілася да яго і моцна пацалавала... А па дарозе ўяўляла: як ён спіць, пацягваецца, мацае рукой вакол сябе ў пошуках Алісы. І адчула, як моцна прывязалася да яго.

...Калі мы былі з ім сляпымі, то рухаліся дагэтуль насустрач адно аднаму. Атрымаўшы адначасова дзве маленькія таямніцы: ягоную хваробу і няпэўна патлумачаны ад'езд ды маю прывідную далучанасць да загадкавага клуба, — мы знаходзілі нешта больш пэўнае ў сведчанні маладосці і жыцця... Мне больш не было сумна ў гэтым сумным свеце, дзе праяўляліся на роўных маніякальная прага пакутаў і таямніц, шкадоба і цікаўнасць...

Дадому я вярнулася не адна. Дзямьян гатаваў вячэру, і потым, седзячы ўтрох за сталом, мы завялі інтэлектуальную размову з нашым госцем Паўлам Рудым. Ён адлятаў назаўтра. Па нейкай стоенай змове, якую заключылі нашы сэрцы, мы з Дзямьянам вялі гутарку нямых: рухамі, поглядамі ў той час, як алавяныя салдацікі слоў збіраліся ў войскі і выстройваліся на стале, гатовыя, незалежна ад нас, у любы момант заключыць мірнае пагадненне ці распачаць бой.

— Цялесная абалонка — вось што стрымлівае дух. Мы створаны, каб атрымліваць максімальную асалоду.

— Ад чаго?

— Ад свайго стварэння.

— Праз разуменне?

— Каб адчуць прыналежнасць да Творцы?

— Атрымліваецца, шчасце спазнае раб.

— Калі належаць Творцу, — гэта рабства, значыць, нішто іншае не адухоўлена больш, чым рабства.

— А вашы карціны — рабства духу, волі, розуму?

— Я раскрываю дасканаласць. Я выпраўляю сябе праз несуадноснасць паміж «я» вонкавым і «я» ўнутраным.

— А як можа выправіць сябе злачынца, забойца? Праз пакаянне?

— Таксама праз разуменне еднасці з Тварцом.

— Значыць, так заўгодна Богу?

— Думка: выразаць з мармуру жанчыну і зарэзаць яе — мае адзін корань. Стварэнне і разбурэнне — не розныя з'явы, проста супрацьлеглыя. Штуршок — адзін.

— Мы ўсе нявольнікі штуршкоў?

...Дзямьян стаяў побач са мной і выглядаў стомленым і неспакойным. Мы ўжо стаміліся разважаць, думаць. Павел адчыніў фортку. Марознае паветра ўварвалася ў пакой. Надыходзіла ноч.

— Люблю зімовую ноч. Мне здаецца, яна нагадвае, як далёка да Парыжу. А такое паветра, — ён глыбока ўдыхнуў, — вяртае ў дзяцінства, калі грэўся ля грубкі і марыў пра чужыя гарады... пра будучую настальгію... Мяне яшчэ ўведае свет, — веру сам і вас хачу запэўніць.

Мы разлілі апошняе віно; келіхі запоўніліся чырвоным.

— Я з тых, хто падзяляе ісціну: прыгажосць выратуе свет, — падсумаваў Павел. — За Алісу.

Наша мірная развітальная дамова набыла лірызм. Алавяныя салдацікі разбілі бівак і палеглі спаць.

— Запамінаю голас Ваш прыязны...

Каб у крыві маёй квітнелі астры...

Кроў — гэта ваза, што не мае дна.*

Павел зірнуў на Дзямьяна і ўсміхнуўся.

— Пакідаю вас на самоце. Дзве цёплыя чыстыя кроплі на гнойнай язве планеты... Усё словы... словы.

Ён сышоў, пакінуўшы нам здзіўленне і вытанчаны пах дарагога французскага адэкалону.

...Сярод ночы я прачнулася і была ўзрушана не так Дзямьнавай прысутнасцю, як адчуваннем прамінулай раўнавагі і шчасця ў мо-

---

* Радкі з верша Л. Дранько-Майсюка «У Вашым голасе квітнеюць астры...»

мант злучэння цёплага знаёмага дыхання блізкага чалавека з маім сном, з дзіўным, але патаемна-чаканым новым снабачаннем...

Гэтым разам я апынулася ў Храме. Мусіць, быў дзень, сонечныя промні зазіралі праз квадратны праём даха, але асветленай заставалася толькі сярэдзіна вялікага памяшкання: вакол панаваў дым. Я азірнулася: за калонамі варушыліся цені, якія сведчылі аб прысутнасці жывых істот. Я зайшла за бліжэйшую калону, але нікога не пабачыла... Падлога была выкладзена з чатырохкутных барвовых мармуровых пліт, якія аблямоўваліся чорнымі і залатымі прожылкамі. З аднаго боку я пабачыла ўзвышэнне, на якім мусіла стаяць Багіня ці Бог: у залежнасці ад таго, каму быў прысвечаны Храм. Па баках на высокіх мядзяных падстаўках гарэлі свяцільнікі. Агонь у іх з'явіўся раптоўна, як толькі мой позірк выхапіў іх з агульнага інтэр'еру. Гэтак жа нечакана з'явіўся алтар. Загучала музыка; ігралі нябачныя музыкі на незнаёмых інструментах: гукі былі звышнатуральныя і з-за таго невытлумачальныя. Я наблізілася да ўзвышэння, мінула тры прыступкі і адчула трымценне. Гукі ўзмацніліся, з-за калон пачалі выходзіць людзі: простае старажытнае адзенне, скураны абутак, тонкія раменьчыкі якога шчыльна апляталі ногі да лытак. Справа і злева ад мяне спыніліся чатыры чалавекі: па два з бакоў; у руках яны трымалі палаючыя паходні. Відавочна са мной нешта адбывалася; цела адчула дотык іншага адзення; нябачныя рукі змацоўвалі пурпуровую тканіну залатымі сушпілкамі ў форме паўлінаў, іх вочкі і хвасты ўпрыгожвала каляровая эмаль. Хітон лёг прыгожымі складкамі, дакрануўшыся да падлогі. Галаву сціснуў авянечнік... Перада мной спыняліся людзі. Я падняла руку, далонь абцяжарыў спелы гранат. Першая жанчына апусцілася на калені. За ёй — наступная. Яны працягнулі насустрач мне рукі і нешта загаварылі мілагучнай і незразумелай мовай. Аднекуль збоку набліжаліся іншыя жанчыны ў каляровых столах і хітонах, у неглыбокіх куфрах яны неслі... скуль ведаць, што было там?.. але нешта неабходнае для будучай дзеі. Музыка гучала мацней і мацней; тыя, хто стаяў на каленях, маліліся ўголас, спявалі і хісталіся; ва ўсім — экзальтаваная значнасць. Я пачала адчуваць, як нямеюць рукі, ногі, — нібыта праз колькі хвілін, калі не адбудзецца нешта велічна-наканаванае... прызначанае звыш... я знямею, скамянею... і пачну сачыць за падзеямі вечна-засмучоным поглядам абыякавага стада.

Раптам я ўчула дыханне: лёгкі, знаёмы ўздых, і ў той момант, калі чужыя рукі невысокага чалавека выцягвалі з тканіны сушпілкі, я пазнала габрэйскія вочы, а ў імгненне, калі абрынулася долу пурпуровая пала, — прачнулася...

XVIII

Раніцай я гатовая была расплакацца. І. І. не аказалася на месцы; з Дзямьянам я не падзялілася начной явай. І да таго ж у сне не было ніякіх папярэджанняў, — да прыкладу, пладоў брызгліны, якія я патлумачыла звышнатуральным знакам бабулі. Калі я зрабілася палонніцай вар'яцкага свету І. І., дык па сваёй волі, дапускаючы пранікненне ягонай псіхікі ў сваю млявую пакорлівасць. Пікантны скачок з рэчаіснасці ў свет чужой веры і магчымасць царавання ў ім сведчылі пра маю абранасць. Кім і для чаго? Галоўнае было разабрацца ў сабе і дрыжаць ад прадчування.

Я не верыла ў магію, але прымала яе існаванне, не малілася Богу, але верыла, што свет створаны ім. Мяне цікавіла старажытнасць, паколькі мы былі нашчадкамі; няўдзячнымі прышэльцамі... Я гатовая была прыняць удзел у містэрыі, калі гэта стане просьбай аб дараванні: за ўсё кепскае, што здзейсніла чалавецтва. І калі Іегова абраў габрэяў аднойчы, дык чаму не можа абраць іх яшчэ раз?

І. І. з'явіўся ў другой палове дня і адразу ж павёз мяне ў галерэю. Там ішла звычайная мітусня, як у дні, калі вывешвалі новую экспазіцыю. Нас, а дакладней І. І., чакала групоўка маладых людзей, сярод якіх вылучалася адна дзяўчына: у рысах яе твару было нешта азіяцкае, вытанчанае, незалежнае. Доўгія чорныя валасы падалі звілістымі змейкамі, там-сям упрыгожанымі каляровымі стужачкамі. Убачыўшы нас, моладзь запрацавала больш актыўна. У іхніх рухах, жаданні спадабацца, быць зразуметымі і прынятымі, я не адчула залежнасці; мне адразу захацелася сказаць нешта прыемнае, абнадзеіць. Работы вымушалі лепшага, мой густ пратэставаў, але, незразумела з чаго, мне выпала роля вырашыць лёс выставы маладой мастацкай суполкі.

— Аліса, вам падабаецца? — я даўно перастала звяртаць увагу на тое, што шэф па-рознаму звяртаецца да мяне: часам на «ты», часам на «вы». Я адчувала, што ён незадаволены, але сказала «так» і на хвіліну спужалася, што І. І. пачне ўшчуваць мяне, як малую, якая не спраўдзіла надзей.

Але ён адмахнуўся: «Хай будзе так», — і паклікаў дзяўчыну. Ён называў яе па імені, з чаго я зразумела, што яны знаёмыя, хаця ніколі не бачыла яе раней. У Ангеліны было армянскае прозвішча, што, аднак, не засцерагло яе гены: яе маці аказалася беларускай, бабуля — асірыйкай, дзеда ж пахавалі ў Іерусаліме. Мовячы, яна расцягвала словы; няўпэўнены спеў гукаў прыцягваў так, што пад канец размовы я сама трапіла ў пастку і некалькі слоў вымавіла нараспеў. Яна паказала свае працы; нешта касмічнае: біблей-

скія сюжэты, выкананыя ў стылі сюррэалізму. І. І. з'ехаў. А мы селі на падваконне; хлопцы развешвалі карціны, мянялі іх месцамі, чаплялі на вольныя шнуркі. Нехта ўключыў магнітафон, музыка ў стылі нью-эйдж: пяшчота, памежжа адчаю і нястрымнай сталасці; жаданне быць зразуметым, але не да самага канца...

Ангеліна запрасіла да сябе ў госці, яе бацька быў кандыдатам фізіка-матэматычных навук; але зараз ён займаўся тым, што складаў гараскопы. І. І. часта сустракаўся з ім. Я дала згоду як-небудзь наведацца да іх.

Пазней я патэлефанавала дадому, але Дзямьяна яшчэ не было, і я вырашыла заехаць да Фаіны. І. І. ужо быў там, падалося — мяне чакалі зараней, яшчэ да таго, як зазвоніць тэлефон і я выкажу жаданне прыехаць.

— Аліса здаволілася Парнаскім таварыствам і вырашыла наведаць бедных родзічаў? — Фаіна іранічна пасмейвалася з мяне, паблытаўшы паэтаў з мастакамі*, яна чакала тлумачэнняў і ліхаманкава зазірала ў вочы, увесь час намагаючыся нешта падаць-прыняць: келіх, падушку, шалік.

— Вы бачылі сон? — напрамкі спытаў І. І., і я перастала хавацца. Мая маўклівая згода толькі паказала ступень іхняй нецярплівасці і ўсёведання. Эксперымент працягваўся: загадкавы, як позірк у Залюстрэчча, хісткі, як пустая захлыстка.

> *— ...Выдатны атрымаўся жарт, праўда? Шкада, што не ты яго прыдумала.*
> *— З чаго гэта вы ўвесь час прапаноўваеце мне свае жарты? — спытала Аліса.*

— Вы верыце ў астралогію?

Я цягнула з адказам. І. І. не перапытваў. Фаіна, відочна пакрыўджаная маім нежаданнем адказваць, абурылася:

— Хто не верыць у астралогію?! Трэба быць зусім неразумным, каб не адчуваць уздзеяння планет на жыццё чалавека. Гэта пацвярджаюць касмічныя законы. Закон кармы...

— Я чытала пра закон кармы. Што прымушае спрычыняць мяне да вашай філасофіі ці рэлігіі?.. ці як вы там называеце сваё вучэнне...

Я ізноў ірванулася да пачатку, да рысы «старт». Нечакана для сябе зазлавалася, падобна што тут, у гэтай зале, вырашаецца жыццёвы шлях даверлівай жанчыны, і гэтым дваім ужо загадзя вядомы канец. І. І. праігнараваў як маю непаслядоўнасць, так і мой гнеў.

— Ты хочаш ведаць больш, чым ведаеш?

— Хачу.

---

* Парнаскае таварыства лічылася таварыствам паэтаў.

— І пакутуеш з таго, што не ведаеш... для чаго веды?

— Так.

— Наша сапраўднае багацце — пакуты, яны ўзвялічваюць нас, уздымаюць да дасканалых.

— Вы казалі, што хочаце змяніць лёс свайго народа. Дык тлумачце яму свае мэты, урэшце — пакутуйце за яго!

— Праяўленыя пакуты выклікаюць жаданне пакараць... Вы носіце крыжык?

— Так. — Пад каўнерыкам на залатым ланцужку вісеў невялічкі стылізаваны крыжык.

— Здыміце. Крыж — сімвал ганьбы і прылада катавання. У старажытным Рыме на падобных слупах крыжавалі рабоў. Вы ведаеце, што першыя хрысціяне не шанавалі крыжа?

«Я ў іхняй уладзе. Зараз Фаіна падыйдзе, расшпіліць каўнер і сцісне маю шыю, а І. І. у гэты момант схопіць за рукі», — думалася мне. Але яны сядзелі, не варушачыся, сур'ёзныя інквізітары, бледныя вар'яты. Напружанасць атмасферы выратавала па-змоўніцку: мы — адно, мы — утрох — абраныя... Адно адным?

— Ты па-ранейшаму сустракаешся з... маладым чалавекам?

— Так, але ён нічога не ведае... Амаль нічога.

Я зірнула на Фаіну і перавяла погляд на І. І. Ён быў спакойны, сабраны, суцэльная спагадлівасць. І сум. Мая дзёрзкасць знікла; магчыма, ягоная ідэя не зможа ўвасобіцца і даць вынік, пакуль мы з Дзямьянам злучоныя, знітаваныя цеплынёй ранішніх дотыкаў.

— Я павінна выбіраць?

— Нарэшце, — з палёгкай уздыхнула Фаіна.

— Супакойся, — І. І. заўважыў, як панічна замітусіўся мой погляд.

— Мы павінны быць шчырымі адно з адным, — мы пераглянуліся. І. І. цягнуў паўзу. — ...Зрэшты, я думаю, што гэта не прычына, каб панікаваць.

Ён ізноў доўга маўчаў, я сцялася ў чаканні, — напаўіранічным, напаўсамотным: што прыдумалі, каб раз'яднаць двух закаханых?

— Не нервуйся, — нарэшце падсумаваў І. І. — На ўсё свой час.

— Я бачыла сон.

Доўгачаканым і зараней вядомым прызнаннем мне хацелася адцягнуць увагу ад галоўнай таямніцы: нашых з Дзямьянам адносін; але там, дзе я бачыла пячоры і скалы, для І. І. была раўніна, над даляглядам якой штодня падымалася каменнае сонца, асвятляючы мёртвыя стоды, пакінутыя даўно прамінулымі пакаленнямі.

— Ты была ў Храме?

— Так.

— Значыць, ужо хутка...

Што прыспешыла начное відовішча, што зрабіла блізка наканаваным? Мне хацелася ведаць адгадку; зрэшты, я з самага пачат-

ку пагадзілася (сама з сабой) удзельнічаць у гульні, бо не ведала яе правілаў, у спадзяванні, што ў рашаючы момант змагу дыктаваць свае ўмовы...

— Я хачу ведаць, што адбудзецца хутка...

— Я не ведаю ўсяго, што ты бачыла.

Наўрад ці паверылася ў ягоную шчырасць. Але была яшчэ адна сведка гульні, якая надзіва цярпліва чакала і званка, і майго з'яўлення тут.

Я сядзела ў некаторым аддаленні ад І. І., адлегласць паміж намі не перавышала двух метраў. Да гэтага я не імкнулася адкрыта глядзець на яго, але, — як толькі рашыла пераказаць апошні сон і засяродзілася на дакладнасці перадачы падзей і адчуванняў, — нашы позіркі сустрэліся. Я пачала пераказ, упершыню так падрабязна разглядваючы твар шэфа: завостраны нос, выразныя, сухія вусны, крыху абветраныя скулы і далікатныя вейкі... Ён не варушыўся, нічога не казаў, і паступова мая ўвага сканцэнтравалася на ягоных зрэнках, непамысна ад мяне знітавалася... на імгненне здалося, што я не змагу адвесці ад яго позірк, — і адразу ж забылася...

Я расказвала, але словы паступова расцягваліся, маючы сэнс, набывалі яшчэ і даўжыню... і сказы ўжо не вымаўляліся цалкам, а дзяліліся на дзейнікі і выказнікі, адасоблена стаялі прыкметнікі, набыўшы ў маім замаруджаным уяўленні колер, тады як іншыя часціны мовы — смак. Я пачала спатыкацца на прыназоўніках: «пры» — як кропля лімону на язык... «на» — кавалак зялёнага яблыка, заціснуты горлам...

Колькі гэта доўжылася? Не ведаю, але памятаю бясконцыя крокі за спіной; Фаіна хадзіла ўзад-уперад упэўнена і аднастайна. Адным з маіх апошніх адчуванняў на той момант была ціша, дотык цёплых пальцаў; мая рука, акуратна падтрыманая пад локаць, бязвольна прыўздымаецца і гэтак жа бязвольна апускаецца...

XIX

Я прачнулася са спакойнай усмешкай — нібы з ёй спала ўсю ноч, — з адчуваннем свежасці і бадзёрасці ва ўсім целе, з яснай галавой. З таго, што адбылося ўчора, памяталася не сітуацыя і здзіўленне, а сітуацыя і цеплыня. Мне было прыемна думаць пра І. І., нібы я прачнулася ў доме дзяцінства, а за спіной спакойна дыхае бацька...

Вусны ў Алісы расцягнуліся ва ўсмешцы, і яна сказала:

— А ведаеце, я заўжды была ўпэўнена, што адзінарогі — проста казачныя пачвары. Я ніколі не бачыла жывога адзінарога.

— Але ж цяпер, калі мы ўбачылі адзін аднаго, — сказаў Адзінарог, — можам дамовіцца: калі ты будзеш верыць у мяне, я буду верыць у цябе. Згода?

Калі дагэтуль існавалі ўва мне варожасць і недавер, дык іх паглынула пяшчота — невядома з чаго яна апанавала мяне, — і вось гэтае пачуццё цеплыні ці пяшчоты пачало пераследаваць самасць: самаразважлівасць, самароздум. Я не прыкладала ніякіх намаганняў, каб пазбавіцца гэтага адчування. Я нарадзілася дарослай у новай сям'і.

Мой прыліў далёка сягнуў за пазначаную рысу берага, і з нейкага моманту я зноў перастала разумець абурэнне Дзямьяна тым, што адбываецца са мной, з маімі пачуццямі, з нашымі адносінамі. У каторы ўжо раз ягоная прысутнасць набывала выпадковасць. Час нашага з ім кахання быў пазначаны кіўком маёй душы, але настолькі непрадказальнымі былі ягоныя рухі, што стрэлкі гадзінніка маглі спыніцца, а складаны механізм — зламацца...

Аднойчы ў размове я прызналася Дзямьяну, што пэўна ведаю пра ўменне І. І. карыстацца гіпнозам. Гэта ўстрывожыла яго болей, чым я думала. Упершыню Дзямьян зрабіў спробу адштурхнуць мяне ад І. І. праз адвечна славянскую непрыязнасць да габрэяў... Ён кпіў з іх святыняў-сімвалаў, якія няшчасны народ узнёс вышэй за храмы, вышэй за Іерусалім*.

— Прабач мне, Аліса, але ж ты хрысціянка, ты носіш крыжык, — мне адразу ж прыгадалася, як здзекліва і зласліва, кароткімі фразамі лаяўся на гэтую стылізаваную адзнаку веры І. І. — Ты можаш не верыць у Бога, але калі цябе спытаюць: «Верыш?» — ты папраўдзе адкажаш, як многія: «Храм Божы наш у душы». Скажы мне: ты калі-небудзь молішся?

— Так, — не задумваючыся, не разважаючы, я пацвердзіла. — Калі цяжка, я звяртаюся да Бога.

— Да якога Бога, Аліса? Да Хрыста ці Творцы?

— Проста да Бога... Я чытала Біблію!

— І калі ты, як нармальны чалавек, дапускаеш існаванне Бога, значыць, ты дапускаеш існаванне раю.

— Рай — гэта калі людзям добра, калі яны кахаюць адзін аднаго; я веру, што мы нараджаемся не аднойчы, і павінна быць месца, дзе душы жывуць перад новым увасабленнем... У раю мы з табой будзем больш кахаць адзін аднаго, — я спрабавала жартаваць.

---

* Маецца на ўвазе: абразанне, субота і ачышчальнае апусканне ў мікву.

— Так, мы будзем блізкімі; усё, што я не змагу даць табе тут (Дзямьян указальным пальцам тыцнуў уніз), — я дам табе там (палец паказаў угору). Абяцаю, што зберагу сваю пяшчоту і любоў для цябе. — Ён горка пасміхнуўся. І раптам іранічна і зло засмяяўся ўголас.

— А ці ведаеш ты, — тлумачыў Дзямьян, калі смех сціх, — як будзе выглядаць твой І. І. у нашым раю?.. Ён выйдзе з кушчаў у паласатым адзенні талес-цыцас, накінутым на хламіду, на ягонай галаве будзе ярмолка, а вакол восем свечак, якія будуць гарэць кожную суботу. А ў руках, — чуеш мяне? — ён зацісне райскі яблык і пальму пакутніка. І мы з табой абавязкова зразумеем, ХТО гэта, бо з-пад адзення будзе тырчаць penis circumcisus!

У невытлумачальным захапленні ён паказваў рухамі, як адцягваюць і абразаюць плоць.

— Навошта ты мне гаворыш усё гэта?

— Каб ты перастала захапляцца сваім шэфам. І наогул, я хачу, каб ты кінула працу... ці знайшла іншую.

Магчыма, згадзіўшыся на авантуру — дазнацца заканчэння эксперымента, — я перастала валодаць сваімі жаданнямі, але нават у тым выпадку, калі мая воля яшчэ здольная падштурхнуць да прыняцця рашэнняў, — засталася шчырасць у разуменні аднаго: я не змагу існаваць без карцін, без мары пра невялікую галерэю, дзе пахла б алеем, дзе б вечаровы прамень праз немудрагелісты вітраж клаўся на пазалоту рам і спакойна засынаў, прыгрэты штучным цяплом дасканалага асвятлення. Я думала вобразамі, паэтызуючы свет колераў і адценняў, надаючы ім рэальныя формы, тады як той, хто на самой справе лепш за мяне разумеў паэзію, ператвараў паэтыку думак у de omnibus...*

— А калі ты не кінеш працу, будзеш прыслужваць І. І. і дачакаешся нарэшце той прэзентацыі, калі табе давядзецца сыграць Юнону, — кім ты будзеш далей? Няўжо не разумееш, што табе ніколі не адвядуць ролю месіі — іначай цябе б не маляваў Альховіч. Іудзейства адмаўляе маляваныя вобразы багоў.

— Але І. І. адыйшоў ад іудзейскай веры!

— І знайшоў сваю веру ў табе?

Мае шчокі запалымнелі, як ад удару. Застаючыся сам-насам, я перастала жадаць рэалій; учынкі і абавязкі набылі сэнс часовай адзнакі, закончанасці; найвышэйшая завершанасць павінна была з'явіцца пасля таго, як мой розум і воля пазбавяцца прыналежнасці *мне* і разам з тым набудуць усеабдымнасць, касмічнасць. Калі І. І. быў вар'ятам, я паступова вар'яцела з ім. І даравала сабе гэта.

---

* Пачатак выразу De omnibus dubitandum (*лац.*) — сумнявайся ўва ўсім. Галоўны пункт філасофіі Дэкарта, які лічыў сумненне адзіна правільным метадам пазнання.

— Аліса, — нечакана пяшчотна Дзямьян пагладзіў мае валасы. Голас яго быў сумным. — Калі б ты ўважліва слухала і паспрабавала зразумець мяне, я б знайшоў новыя аргументы. Яны ёсць у разумных кніжках, я прачытаў некаторыя з іх. Але ты перастала разумець і мяне, і такіх, як я... нармальных, — апошняе слова ён вымавіў мякка, нібы баючыся пакрыўдзіць.

— А я якраз думала: навошта вам пастка? — сказала Аліса. — Цяжка ўявіць сабе, што на Конях жывуць мышы...
— Цяжка, але можна, — адказаў Рыцар. — А я не хацеў бы, каб яны па мне бегалі.
— Справа ў тым, — працягнуў ён пасля маўчання, — трэба быць да ўсяго гатовым. Вось чаму ў майго Каня на нагах бранзалеты.
— А гэта нашто? — пацікавілася Аліса.
— Каб акулы не ўкусілі, — адказаў Белы Рыцар...

— Мы не павінны давяраць гэтай нацыі, — Дзямьян з надзеяй зазірнуў мне ў вочы. — Я казаў, што яны ўкрыжавалі Хрыста і ўжо з гэтага хрысціянскі менталітэт не можа быць аб'яднаны з іхнім.
— Я не праявіла ані цікаўнасці, ані якой-небудзь бачнай рэакцыі.
— І яны лічаць, што свет створаны толькі для таго, каб выбраныя маглі абрэзаць кавалачак тканкі; ахвярапрынашэнне чалавечай плоці. Вось іхняя ісціна па Талмудзе, іхняя змова з невядома якім Богам...

Я скрывілася; усё гэта перастала мяне цікавіць... можа, з таго часу, як І. І. доўгім і ўніклівым позіркам засілкаваў мой погляд... можа, у тую хвіліну, як Дзямьян асцярожна засумняваўся ў маёй нармальнасці...

— Прыгледзься да І. І., — давяральна працягваў апавядаць юнак. Для пэўнасці ён узяў мае рукі ў свае. — Хіба ты можаш заўважыць у ім мужчыну?.. Ён такі ж, як і ягоная нацыя: жонкападобны, з тонкім голасам і нервовай капрызлівасцю.

Нечакана для сябе я паматляла галавой у знак нязгоды, хаця І. І. сапраўды меў адзнакі тонкай нервовай натуры, пры жаданні іх можна было прыняць за жаноцкасць. Дзямьян павысіў танальнасць, ягоны голас набыў новае пераможнае адценне:

— Яны ніколі не былі стваральнікамі! Гэта бабіна племя, і месца яму — сметнік... Яны будуць цыраваць, майстраваць і перарабляць, перашываць і складаць рэцэпты, яны як... вірулентны вірус, — Дзямьян не знайшоў іншага, больш рэзкага аргумента. Але, скіраваўшы развагі ў добра вядомае рэчышча, пераканаўча даказаў: — ...Інфекцыйны вірус, які ўваходзіць у клетку і падначальвае яе сабе, прымушае працаваць на сябе, штампаваць усё новыя і

новыя копіі і, рабуючы, стварае легіёны сабе падобных. А для таго, каб загінула здаровая клетка, дастаткова нават не цэлага віруса, а толькі ягонай нуклеінавай кіслаты... У твой мозг зараз пранікла вар'яцкая філасофія шэфа, і ты падначалілася ёй. Але... можа, лепш бы ты спала з ім! Лепш бы ты нарадзіла дзіця!

Усё ўва мне страпянулася. Упершыню за доўгі маналог я адчула сувязь з акаляючым, у маім розуме яшчэ засталася дзірка-праём, праз якую бачыўся рэальны свет; скураны ключык адамкнуў замок, прымацаваны да саламянага куфра, у старадаўні міфічны лабірынт скокнуў выратавальны клубок...

Я ўявіла дзіця — не мела значэння, сын гэта ці дачка, — жывое, пульхнае, ружовашчокае, — і ў імгненным балючым жаданні займець яго ўзнікла разуменне відочнага клопату, будзённых рэалій жыцця — усяго, што вяртала мяне *назад*.

XX

Наступныя тыдні нічога не змянілі ў маім жыцці, я па-ранейшаму клалася ў ложак з Дзямьянам, нашы адносіны цяжка вытлумачалі мы самі... У нейкія хвіліны мне патрабаваліся высілкі, каб прыпомніць, што чалавек, які знаходзіцца побач, доўгі час з'яўляецца для мяне блізкім. Я глядзела, як ён спіць, а ён, патрывожаны позіркам, адплюшчваў вочы і ўсміхаўся, і калі б не гэтая ўсмешка, лёгка падавалася б, што побач са мной невядомы жывы арганізм, пад сумніўным уплывам якога я перастала карыстацца кантрацэптывамі... Але насланнё мінала, і хвіліннае недаўменне яшчэ не выклікала абуральных слёз і ўздыхаў расчаравання.

А ў той дзень, калі Дзямьян знік і не вярнуўся ні ноччу, ні ўранні, я надзіва лёгка прагнала імпульсіўны сполах, каб зачыніцца ў ракавіне спакою. Але ў канцы другіх сутак нашай нястрэчы зняла трубку і набрала нумар Адэлаіды Вінцэнтаўны. Жанчыны з цярпліва-пакутным выразам твару не было. Я фізічна адчула, як адгукаюцца рэхам у пустых пакоях настойлівыя і адчайныя званкі...

У чарговым знікненні каханка мелася перавага: цяпер можна было не спяшацца дадому, не настойваць на адмене заняткаў з прафесарам Шымко, не адмаўляць у сустрэчах Сабковічу; да апошняга я адчувала прыязнасць і сімпатыю, узрошчаную на дражджах спачування. Заняткі мастацтвазнаўствам з прафесарам не былі такімі частымі, як напачатку; ці то выкладчык пажаліўся І. І. на маю бяздарнасць, і шэф вырашыў зменшыць затраты, ці насамперш у адукацыю была закладзена ідэя адцягненасці: паблажлівае падтакванне мне і адвольнае сузіранне разважлівага спакусніка, кранутага прарока...

Гэтыя настаўнікі амаль ніколі не разважалі пра дабрачыннасць памкненняў І. І. даць мне веды; мая роля была азначана зараней: падштурхнуць да разваг пра вытокі еўрапейскай культуры, пазнаёміць з узорамі лепшых майстроў і рамеснікаў... Спецыфічнасць старажытнай Іудзеі, палітычны саюз з Рымам, як і шматлікія войны, пераканаўча трывожылі мозг, помслівыя ноткі ў голасе Сабковіча набывалі адваротную сувязь: мне стала лягчэй ненавідзець непрымальнікаў ідэі абранасці... Друз хаатычных разваг і прыхаваныя жарынкі нянавісці яшчэ не запалілі знішчальнае кастрышча, але час працаваў супраць цнатлівай разгубленасці, рыхтуючы завяршальную драму. Я ўжо чакала, калі І. І. пазнаёміць мяне з наведвальнікамі клуба; зерні месіянства ўзыходзілі на полі, узараным аднадумцамі.

Яшчэ не мінула тыдня з дня знікнення Дзямьяна, як я навучылася лёгка адпрэчваць разважлівыя кпіны Сабковіча... Аднойчы мы сядзелі з ім у маім кабінеце, супрацоўнікі даўно разышліся па дамах. Я адчувала халодную пэўнасць, падтрымку сцен і накіраванага прыцемненага святла; стоеную моц ва ўтульнай позе і цвёрда пастаўленых нагах, непахіснасць, падмацаваную ўласным фанатызмам...

— Аліса, ты не задумвалася, што можна заблукаць не ў трох, а нават у дзвюх соснах?

Я стаілася, спрацавала логіка непрыняцця, адмаўлення чужой спробы закрануць інтымнае, непрыналежнае нікому і, можа, непадуладнае самой сабе.

— Для гэтага спатрэбяцца ўмовы: цямрэча і парушаная псіхіка.

— Можа й так. Але чалавеку немагчыма ператварыцца ў месію... без... — Сабковіч не дагаварыў; ягоны погляд і чуйны слых нібы намацвалі, якой будзе рэакцыя. Але я засяродзілася на светлаценях. Ад цьмянага святла ліхтарняў можна было лёгка адгарадзіцца, — варта толькі захінуць фіранкі, але мне прыемна было назіраць, як вільготныя лютаўскія прысмеркі паступова ператвараюцца ў ноч.

— Хочаш, — зноў цвёрда загаварыў Сабковіч, — я заглыблюся ў гісторыю?.. Былі намеснікі багоў на зямлі, але гэтую ролю ім дало грамадства. А звышроля?.. Калі ласка, Калігула. Ён патрабаваў тых жа адносін да сябе, як і да Бога, а каб не сумняваліся — каму служыць, — з'яўляўся перад народам з атрыбутамі Юпіцера ці Нептуна.

Зацята-настойліва філосаф спрабаваў злавіць мой позірк, але гэта яму ніяк не ўдавалася, мо з таго ў голасе з'яўляўся нечаканы запал:

— Рымскі Антоній быў так захоплены ўсходнімі культамі, што аб'явіў сябе Дыянісам, а Клеапатру — Ісідай. І пакуль краіна

рыхтавалася да вайны, гэтыя зямныя багі пацяшаліся ды забаўляліся... Небяспечныя гульні.

— Значыць, усё гэта мне не саснілася, — сказала пра сябе Аліса. — А, магчыма, усе мы снімся камунебудзь яшчэ. Не, хай ужо тады гэта будзе мой сон...

Мне хацелася надаць нашай размове зусім іншы накірунак, тым больш, што міні-лекцыя пагражала ператварыцца ў незапланаваны іспыт. І разам з тым мне хацелася ўдзельнічаць у размове: выслухваць і мець права адказваць.

— Вы хрысціянін? (Сабковіч паціснуў плячыма.) Да нядаўняга часу я лёгка назвала б сябе хрысціянкай. Колькі часу я працавала побач з І. І., і ніколі не задумвалася: *якія* мы з ім вернікі? Калі б ён прытрымліваўся іудзейскай веры — я б не надала значэння адрознасці. Мяне не цікавіла сама *вера*.

— Гэта натуральна. Народы — а я маю на ўвазе хрысціянскія народы, — могуць паблажліва ці грэбліва адносіцца да габрэйскай нацыі і пасмейвацца з тых праяў, якімі яны адасабляюць сваю веру ад іншых, але ж... Мы можам секчы галіны, але ніколі не спляжым дрэва, бо ствол веры нашых супляменнікаў вымкнуў з таго ж кораня. Таму, пэўна, і не капаем глыбока: засохне іхняе дрэва — загіне і наша.

Сабковіч зноў ненадоўга замаўчаў, нібы чакаў, калі я спытаюся пра што-небудзь. Але, не дачакаўшыся, працягнуў:

— Дарэчы, Гегель у так званы франкфуртскі перыяд сур'ёзна разважаў пра новую міфалогію, пра абнаўленне мастацтва і рэлігіі. Ён, безумоўна, супастаўляў антычную свабоду і прыгажосць з нямецкай рэчаіснасцю, і ягоная свядомасць прагла перамен. Ён чакаў рэвалюцыі, але «эпоха нараджэння» прамінула, не прынесла жаданыя плады, і вялікі філосаф перастаў быць прадчувальнікам. Ён заглыбіўся ў інтэлектуальнае сузіранне... А я ўсё яшчэ веру ў новую міфалогію.

— Вам знаёмая... філасофія І. І.?

— Так.

Кароткі адказ нічога не патлумачыў, а мне хапелася ведаць: ці дапушчаны Сабковіч да таямніцы і наколькі я далёка ад яе.

— ...у агульных рысах... Аднойчы І. І. прызнаўся, што на яго мела ўплыў адна мая даўняя публікацыя. Я захапляўся грэчаскай і рымскай культурай і паспрабаваў упісаць замкнёны статычны космас старажытнасці ў сусветную гісторыю. Новае вогненнае кола... Нехта павінен быў запусціць яго з гары.

Ён нечакана ласкава зірнуў на мяне.

— Я павінен быў прадбачыць памкненні тых, хто шукаў шляхі ў зямлю Запаветную. Іх генетычная памяць захавала рымскую акупацыю, а матывы пакутніцтва патрабуюць узнагароды: новага Іерусаліма, новай улады... Іх месіянізм больш містычны, чым праяўленая містыка ўсіх астатніх народаў.

— Значыць, вы верыце ў іх абранасць?

— Незалежна ад таго: хачу я гэтага ці не. Я, дарагая Аліса, рэаліст. Мала хто здагадваецца асэнсаваць гісторыю, як я. Яны заваёўвалі чалавецтва не фізічна — ім гэта не дадзена, а праз ідэі. Аддалі на распяцце Хрыста — і паўсвета заваявалі рэлігіяй. І тут ужо не да разваг: што ад *гэтага* меў народ? Ці зайшоў гэты шлях у тупік? Калі ласка — новая ўспышка, новая эпідэмія, новая рэлігія. Як жыд і антысеміт... Дзіўнае спалучэнне, ці не так? І разам з тым тыповае, — Сабковіч рэзка нахіліўся і кінуў гэтыя словы мне ў твар. Як ворагу кідаюць камяні... — Ужо ў наш з вамі час Карл Маркс праз тыя ж месіянства і абранасць прапанаваў зрабіць Новым Ізраілем рабочы клас. І ягоную задачу выканалі!

— Падпарадкаванне?

Чамусці гэтае слова вымкнулася з вуснаў, хаця хвілю таму я і не думала пра нешта гвалтоўнае, прымусовае.

> *— Такая была навальніца, такая навальніца! Ты нават не можаш уявіць такога?.. Частку даху знесла, і ў дом набіўся гром. Ён раскатваўся па ўсіх пакоях, пазбіваў сталы і крэслы. Я так спужалася, што забылася на ўласнае імя.*
> *«У такую хвіліну я б і не спрабавала яго ўзгадаць! — падумала Аліса. — Навошта яно?»*

— Самаадрачэнне?

Сабковіч моўчкі падышоў да вакна, за якім загусцела цемра; я сачыла за адлюстраваннем ягонага твару на шкле і з лёгкім непакоем успрымала змены, што адбыліся за кароткі прамежак часу: ад пакорлівай абыякавасці да ўзнёслай гардыні. Сабковіч расправіў плечы, нібы адчуў, што за ім назіраюць. А потым павярнуўся да мяне і цвёрда, упэўнена паглядзеў у вочы.

— Мне падабаецца ідэя І. І.

Я з сумам дадала:

— Нават нягледзячы на тое, што ён... габрэй?

— Новы міф ёсць новае абуджэнне. Калі не можна іначай, мы — мы! — самі пяройдзем у дзяцінства і дадзім чалавецтву шанц самастойнай сталасці. Замест таго, каб памерці, яно пачне сталець!

Патрэбна была закончанасць, яскравы лагічны вынік.

— Вы... вы верыце ў Юнону?

— ...скажам так: я адзін з ідэйных заснавальнікаў новага Храма, будучы нямы сведка ініцыяцый...

— А вашы ранейшыя кпіны з габрэйскай філасофіі і... — я не знаходзіла аргументаў. — І голыя сцены так званага клуба, вашага, як вы сказалі, новага Храма...

Мне хацелася пераказаць тое ўражанне, якое засталося ад яго нага прыходу сюды адразу пасля навагодніх святаў. Але спрацаваў інстынкт шкадавання... што наогул я ведала пра яго?

— Кпіны? А вы часам не здаецеся сабе смешнай? І хто забароніць мне рабіць выбар? Хай гэта прыстасаванства... Ты правільна зразумела: я дапушчаны ў клуб. Але гэта яшчэ не Храм.

Было над чым задумацца.

— Чаму раней вы ніколі не гаварылі са мной *так*?

— Не было дазволу.

— А зараз?

Ён кіўнуў галавой, я зразумела, што прайшла нейкі пэўны этап і вытрывала праверку. Цяпер я магла лёгка і бяспечна блукаць у сваіх дзвюх соснах.

XXI

Дзьмуў моцны вецер, на кухні гучна ляснула фортка. Я падхапілася з ложка і падбегла да акна. У паветры мітусіліся брудныя мухі, выбіраючы кірунак, куды ўпасці-прысесці, але парывы ветру не давалі прыстанку, выхоплівалі, выдзьмувалі іх са шчылін. Унізе, пад вокнамі, гойдаліся чорна-шэрыя галіны дрэў. Цьмяна гарэў начнічок за спіной... Калі б у гэты момант мне дадзена было звыш кінуць абыякава-хуткі позірк сюды, я б адзначыла гарманічнае лунанне трагічнай постаці ў акне на скрушна-мігатлівых хвалях куламесы. Ex abrupto* парыў ветру шпурнуў у мой бок нейкі цёмны камячок, маленькае цельца цопнула ў шкло і паляцела ўніз, захацелася ўбачыць, куды яно ўпадзе, і, шчырая ў жаданні быць патрэбнай некаму, мітусліва і хутка я адчыніла акно. Адразу ўсю мяне ахапіў холад, ад ледзянога позяху сцяліся-здубелі ногі, пакрыліся дрыжыкамі аголеныя рукі, але, трымаючыся за падваконне, я нахілілася ўніз, на волю... Не адразу мой погляд выхапіў чорную кропку ў лілавата-шэрай начной прасторы, мокрыя мухі сляпілі прымружаныя вочы, здалося — халодная рука сціснула горла — так цяжка стала ўдыхаць паветра. Але ён быў побач, на адлегласці нейкіх двух метраў, калі мы ўбачылі і адчулі адно аднаго. Што сталася шчаслівай віной: цёплае паветра блізкага жытла, светлая пляма начніка ці надзея на спачуванне жывой істоты?

---

* Нечакана (*лац.*).

— але птушка, перасіліўшы супраціўленне ветру, уляцела ў мой пакой.

Я знайшла яе — мокрую, змерзлую, амаль нежывую. Вакно і фортка на кухні былі ўжо шчыльна зачыненыя, я захінулася ў таўсматую коўдру і спрабавала адагрэць кволае вераб'інае цельца, усё хукала ў дзюбку, у зацягнутыя празрыстай плевачкай вочкі. Скурчаныя лапкі драпнулі далоні, я раскрыла рукі і ўбачыла сухую галінку, невялічкую частку неверагодна далёкага папярэджання, існасць адважнай гульні, заахвочвальны позірк у якую гарантаваў непасрэдны ўдзел у містэрыі... Euonymus, кароткае, не больш за два сантыметры, разгалінаванне, засушаны мяшочак з чорным памерлым вочкам насення; згадка пра двор, засаджаны кустоўем: брызгліна, барбарыс, парэчкі; чырвоныя гронкі, кроплі ягад, кроплі крыві ад скабак і парэзаў, вясёлы гвалт. «Алі-са-а-а!» Бабуля выйшла на ганак, кліча маладым, гучным голасам...

Я азірнулася. Ніхто не стаяў побач, палохаючы сваёй прывіднасцю. Толькі марудна адаграваліся ногі, плечы. Мой добраахвотны палоннік заварушыў крыльцамі і адкрыў дзюбку. Птушыны гук застаўся ў танюткім горле; гэткі ж чаканы і рэальны, як сухая галінка, зберажоная невядома дзе і кім... мае ненавязлівыя сведкі духоўнага звышнатуральнага свету, свету, куды не можа сягаць зямная матэрыяльная навука... Усё патанула ў глыбінях свядомасці, і толькі скрозь усеабдымны, пераможны сон з цёплага ганку дзяцінства не стамлялася клікаць сваю ўнучку ладная сіваватая жанчына...

Ёй адказалі толькі адзін раз: сіплае «а-а», птушыная галосная выперхнулася з горла істоты ў імгненне адыходу ў смерць.

Самае дзіўнае было ў тым, што дрэвы не беглі, як трэба было чакаць, ім насустрач; як ні імчаліся Аліса і Каралева, яны не пакідалі іх ззаду. Пэўна, Каралева прачытала яе думкі.

— Хутчэй! Хутчэй! — закрычала яна. — Не размаўляй!

Але Аліса і не думала размаўляць. Ёй ужо здавалася, што яна ніколі ў жыцці не зможа вымавіць ні слова, — так яна задыхалася, а Каралева ўсё крычала:

— Хутчэй! Хутчэй!

І цягнула яе за руку.

— Далёка яшчэ? — з цяжкасцю вымавіла нарэшце Аліса.

— Не яшчэ, а ўжо! — адказала Каралева...

Я прачнулася і адразу ж заўважыла побач, на падушцы, мёртвае цельца. Смерць напалохала мяне, невядома з чаго зрабіла віна-ватай. Я выцягнула кошык, у якім некалі прынесла дадому спелыя гранаты, высцеліла дно ватай і асцярожна пераклала туды пакорліва-кранальны камячок. Часовая хованка ад жыццёвых стыхій, позні прытулак, дарэмныя слёзы...

Я зразумела, *што* перашкаджала спакойна перажыць з'яўленне і адыход начнога пасланца, непакой ахапіў розум, непярпенне — цела; мне абавязкова трэба было пазваніць і даведацца: што адбываецца з Дзямьянам. Але мае званкі так і засталіся рэхам; нумара лабараторыі, дзе працаваў мой юнача, я не ведала, як і назвы гэтай лабараторыі. Магчыма, у гэтыя хвіліны аранжавы «масквіч» спыняўся ля будынку аспірантуры. Мая разгубленасць не знаходзіла выйсця, апошнім часам усё цяжэй і цяжэй станавілася дзейнічаць лагічна, прадказаць парыванні душы не магла нават я сама. У нейкую хвіліну я любіла Дзямьяна, у іншую — не магла існаваць без прысутнасці І. І. Але зараз я хацела суцяшэння.

Ужо седзячы на рабоце, прадчувала, як нарэшце вызваню Дзямьяна і прызначу сустрэчу прама тут, ля кабінета І. І. Я прымушу яго раўнаваць, крычаць на мяне і марудна падымуся, іранічна пасмейваючыся, але стану так, каб яму было зручна ўдарыць мяне па шчацэ. Драма, бура эмоцый — сведчанне плыні, дарэмная мара пасрэднай недавучкі... Я развярнула крэсла і ўтаропілася ў акно; непагадзь даўно сціхла, але ў глыбіні душы я адчувала, што ніяк не магу сагрэцца.

З палону роздуму мяне выхапіў мяккі дотык жаночай рукі. Фаіне давялося нахіліцца праз стол, каб дацягнуцца да мяне, нашы погляды сустрэліся, здалося, я бачу спачувальную пяшчоту і разуменне ў яе вачах. Адразу ж захацелася падзяліцца трывогай, разгубленасцю, пацягнуцца, як да матулі, і плакаць, паклаўшы галаву на пульхныя грудзі. Напэўна, Фаіна зразумела маё жаданне і, апярэджваючы падзеі, па-змоўніцку ціха загадала:

— Збірайся.

«Куды?» — спыталіся вочы, але з ног ужо былі скінуты элегантныя туфлікі і рукі ліхаманкава нацягвалі боты, затым футра. Некалькі больш-менш цёплых папярэдніх дзён я насіла палітон, але цыклон прынёс новыя халады.

— Пайшлі! — сказала Фаіна і не вымавіла больш ні слова, пакуль мы не ўладкаваліся ў яе апошнім набытку. «Пежо» ішоў лёгка, плытка ўпісваўся ў павароткі; і калі прайшло палахлівае недаўменне, я пагадзілася, што Фаіна добра выглядае за рулём.

— Я купіла яе на мінулым тыдні. Табе падабаецца?

Мне хацелася верыць, што яна паклікала, каб выхваляцца дарагой машынай і ўменнем ездзіць на ёй, але драпежна-арыйскі вы-

раз твару выдаваў нешта прытоенае, гнятлівае. Вакол нас мільгалі дамы, машыны; дарогі мянялі кірунак, міналі знаёмыя кварталы, будынкі, перакрыжаванні. Мы выехалі за горад, а я яшчэ не ведала сакрэтна-змоўніцкай мэты, і толькі калі за намі зачыніліся жалезныя вароты і збоку застаўся бетонны плот і невялікая шыльдачка з надпісам «AMBULANCE», — я здагадалася і ў неймаверным спакоі сціснула пальцы так, што бледна фарбаваныя кіпцікі балюча ўвайшлі ў далоні, і без пытанняў, цвёрда рушыла за Фаінай, добра ўсведамляючы, хто я і куды іду.

Бальнічны двор, спецыфічны пах і працягласць калідораў, белая палата — усё гэта выглядала знаёмым шызафрэнічным светам вядомага мастака, але на той момант я не магла прыгадаць яго імя. Мае плечы ахінуў бальнічны халат, я прытрымала яго рукой і адным крокам уступіла ў найнерэальнейшы свет чалавечай безнадзейнасці. Я не адразу заўважыла высокую сухаватую жанчыну, якая паднялася з шэра-халоднага зэдліка, саступіўшы тым самым мне месца, я не заўважыла сам рух, мая ўвага сканцэнтравалася на нязграбнай ляльцы, поўнай старонняй адвагі, кахання і разгубленасці. Калі ён глядзеў на мяне — доўга і неадрыўна, — я сама сабе падалася феяй, чараўніцай, чый заканамерны прыход гарантуе здзяйсненне жаданняў. Але я не магла падаць пакутнаму верніку ніводнага знака, якім адорваюць напрыканцы чакання. Толькі нахілілася і пацалавала яго ў вусны, халодныя і мокрыя, як расталы снег.

Яго рукі, гладкія, моцныя рукі не сашчапіліся за маёй спіной; іх рух быў рухам бяссільных вен, утаймаваных грубымі катаваннямі іголак і жгутоў. Маладое дужае цела прафесійна спавілі бінтамі; нядаўнія парэзы і бінты ўмела закрылі бледна-блакітнай коўдрай; белае і блакітнае — гэтыя два колеры назаўсёды забіралі ў мяне Дзямьяна, даючы ўзамен вечна саладкаваты пах, блізкасны паху мора, калі б можна было адчуць у ім свежасць... Ён так і памёр: нерухома, маўкліва, хутка-марудна, паступова згасалі супраціўленне і надзея ў шырока расплюшчаных вачах, знаёмых зрэнках. Сіплы птушыны дыфтонг выйшаў апошнім уздыхам у той момант, калі Аліса правальвалася ў непрытомнасць.

І яны імчаліся так хутка, што, здавалася, слізгалі па паветры, зусім не дакранаючыся нагамі зямлі, пакуль нарэшце, калі Аліса ўжо не мела сіл, яны нечакана спыніліся, і Аліса ўбачыла, што сядзіць на зямлі і ніяк не можа аддыхацца.
Каралева прытуліла яе да дрэва і ласкава сказала:
— А цяпер ты можаш трошкі адпачыць.
Аліса здзіўлена азіралася.

— Што гэта? — спыталася яна. — Мы так і засталіся пад гэтым дрэвам? Няўжо мы не скрануліся з месца ні на кроплю?
— Вядома ж, не, — адказала Каралева. — А ты чаго хацела?
— У нас, — сказала Аліса, з цяжкасцю пераводзячы дых, — калі доўга бяжыш ва ўсю моц, абавязкова трапіш у іншае месца.
— Якая марудная краіна! — сказала Каралева. — Ну а ў нас, ведаеш, даводзіцца бегчы з усяе моцы, каб толькі застацца на тым жа месцы!..

XXII

Памятаю: я адплюшчыла вочы ў нейкім одуме, не ўсведамляючы дзе знаходжуся, з тупым болем у патыліцы. Сэрца білася роўна, але, сціснутае ў шчыльны камяк, адасоблена стукалася ў тканкі грудзіны, у жгуцікі мышцаў і вен. У першыя хвіліны прытомнасці чамусьці яскрава адчулася самастойнае існаванне тройцы — душы-розуму-сэрца. Я павярнула галаву ў марным намаганні сфакусіраваць погляд: усё расплывалася, чэзла; але, стомленае хвілінным напружаннем, сінхронна склалася ў адно былое трохадзінства. Новая перадышка сталася часовым выратаваннем: я правалілася ў бяспамяцтва-сон.

А калі канчаткова апрытомнела, быў дзень; мяне абудзілі галасы, дзіньканне шкляных прадметаў, рухі. Свет ізноў набыў матэрыяльнасць: ложак, зэдлікі, халаты, блакітна-белыя сцены. Побач са мной сядзеў незнаёмы мужчына — доктар, за яго плячом лунала ўсмешка шкадавання і прыязнасці. У вачах І. І. паблісквалі жарынкі самазадавальнення, магчыма, таму ўсмешка ўспрымалася без прыналежнасці да асобы. У першыя хвіліны напружанага ўзірання сама сабой узнікла пяшчотна-сумная згадка: мы з бабуляй сядзім у палісадніку, пад намі расцеленая коўдра, на каленях у мяне — любімая кніжка, я чытаю ўслых, і разам мы смяемся з чашырскага ката, гэтага бесклапотнага раз-губ-ляль-ні-ка ўсмешак... *Калі ты ў гэтую ж хвіліну не выправішся, я цябе пасаджу туды, у Залюстрэчны дом. Ну, што на гэта скажаш?*

Я паспрабавала нешта сказаць, але доктар пакруціў галавой: «не, не трэба, потым», хвіліну моўчкі трымаў маё запясце, потым так жа моўчкі ўстаў і выйшаў з пакоя. Яго месца заняў І. І... За маёй спіной знаходзілася вакно, я ўбачыла адлюстраванне двух аднолькавых міні-вакенцаў у зрэнках шэфа, калі ён ледзь-ледзь

нахіліўся. Я інстынктыўна працягнула рукі, шчыры рух, які пры іншых абставінах можна было б палічыць за рух пяшчоты. І. І. упэўнена абхапіў два вялікія пальцы маіх рук, сціснуў іх у сваёй далоні, увесь час прагна ўглядаючыся мне ў твар; нарэшце, намацаў кропку — чорнае зерне ў правым воку, утаропіўся ў яго і больш не адводзіў погляд... Розум ужо не пачуваўся бадзёрым, але, прымаючы чужыя імпульсы, намацваў мяжу, прыхаваны шлях, дзверы, дазволены крок — усё разам: у звышнатуральны пачуццёвы свет.

І гэты свет — копія зямнога, фізічнага, але створаны з больш тонкага, празрыстага матэрыялу, выклікаў у мяне ўпэўненую прыязнасць і адчуванне бясконцай злітнасці з тымі, хто быў там побач, і з тым, што адбывалася вакол.

Знаёмы, аднойчы бачаны пакой набыў асэнсаванасць: праз прысутнасць рэчаў, людзей, перасоўванні, чаргаванне прасторы, цемры і святла, праз стыхію зладжаных дзеяў, інстынктыўнае жаданне быць значнай, міжвольна-разняволенай, палкай... Нехта прашаптаў: «Першае сакавіка, матраналіі»*, — я ўбачыла знаёмую дзяўчыну з азіяцкім тварам, але не памятала ні яе імя, ні адкуль ведаю яе, адразу ж наўмысна-ліха ўклалася ў другое вуха: «лекавед шабес»**, і засакаталі вакол: «Першае сакавіка, у гонар суботы... у час стварэння Адама...*** усім братам, што пакутуюць са слепаты Ізраілевай... будзе корань Іесееў, і паўстане ўладарыць народамі... лекавед... у разгубленасці шукацьме ўласны твар, пакуль не народзіцца...»

Ніяк не складаліся, не мелі формы словы, не акрэслівалі сэнс таямнічыя галасы, не было прамежкаў паміж думкамі; плытка ліліся вакол мяне чужародныя гукі. Але пачулася сапраўдная музыка, класічныя акорды набіралі моц; напаўпразрыстыя выявы па чарзе знікалі ў розных напрамках (выходзілі ў шматлікія дзверы, хаваліся за фіранкамі?). Перада мной стаяў стол, раней схаваны ад погляду мітуслівымі ўдзельнікамі містэрыі. На белым абрусе чатыры падсвечнікі з чатырма запаленымі свечкамі кожны, ля стала — чатыры жанчыны, адна з іх дакладна Фаіна Шлейль, але я не пазнаю яе, як не пазнаю прысутную побач з ёй дзяўчыну-мастачку. У азіяцкіх вачах запал, ірдзеюць шчокі, вільготныя пульхныя вусны прамаўляюць: «Імёнамі прамаці габрэйскага роду: Сара, Рэвека, Рахіль, Лія (кожная з жанчын паўтарае адно імя), імёнамі анёлаў-служкаў сёмага легіёну, чые найменні вядомыя прароку зямному... даць новы пачатак роду і насадзіць... і стварыць... і памножыць...»

---

* Штогод святкаваліся рымскімі жанчынамі 1 сакавіка ў гонар Юноны Луцыны.

** У гонар суботы (*яўр.*).

*** Паводле Талмуда, лічыцца, што Адам быў створаны 1 сакавіка.

Адначасова Фаіна, цела якой прыкрываюць празрыстыя складкі тканіны, бярэ бязважка-поўны графін і налівае чырвоную вадкасць у круглую шклянку. З цёмнай прасторы да яе набліжаецца І. І., таксама прыбраны ў старажытнае адзенне. Ён гаворыць, але пакуль нягучна; левай рукой І. І. асцярожна бярэ шклянку і ставіць яе на далонь правай рукі, і тады я разумею, што ягонае цела і рукі звернуты да мяне: неіснуючай, прысутна-нямой, далёкай.

Усе мы, палоннікі адзінай магічнай сілы і канцэнтрацыі волі, выяўляем вакол нябачныя воку плыні энергіі, узмоцненыя колерапачуццёвым уяўленнем. Поле гэтай энергіі замкнёна на сціплай прысутнасці невысокай хударлявай істоты, далёкага нашчадка семені Ільдабаофа, які зараз чытаў сваю малітву перад... партрэтам Юноны.

— Даю табе хвіліну на роздум! — сказала Чорная Каралева. — А мы пакуль вып'ем за тваё здароўе! ...І ўсе госці тут жа выпілі, хоць і трохі дзіўна: хто насунуў сабе на галаву куфлі, нібы каўпакі, і злізваў тое, што цякло па шчоках, хто перакуліў графін з віном і, дапаўшы да рога стала, піў усё, што лілося на падлогу...

— Ты павінна сказаць удзячную прамову, — сказала Чорная Каралева, зірнуўшы спадылба на Алісу.

— Мы цябе падтрымаем, не турбуйся, — шапнула Белая Каралева...

Аліса паслухмяна ўстала, хаця сэрца ў яе пахала-дзела.

— Я паднялася,

«Заклінаю вас, Кафрыэль ці Касіэль, Машатаі і Серакіэль, анёлы моцныя і магутныя, з імёнамі Аданаі,

каб выказаць вам сваю ўдзячнасць, — пачала Аліса. І тут яна сапраўды адарвалася ад падлогі і паднялася на некалькі дзюймаў у паветра...

— Беражыся! — залямантавала Белая Каралева...

Аданаі, Аданаі, Эйе, Эйе, Эйе, Асім, Асім, Асім, Кадас, Кадас, Кадас, Іна ці Іма, Іна ці Іма, Садаі, Іа, Сар, — Тым, хто стварыў стагоддзі і нас, і спачывае, каб мы маглі ў будучым стагоддзі атрымаць узнагароду, абяцаную імёнамі анёлаў-служкаў сёмага легіёну, у прысутнасці Бааэля — анёла вялікага і магутнага.

— Зоркай Сатурна, пад якой нарадзіўся народ мой, дачкой Ягонай і вышэй пералічанымі імёнамі заклінаю цябе, Кафрыэль, хто

старшынстве ў гэты дзень, прыйдзі мне на дапамогу... дай раўнавагу абраным... дай ім зямную прастору... дай ім чужую Багіню, хай народзіць месію... «бо каханне, як смерць — моцнае, рэўнасць — як пекла — лютая, стрэлы яго — стрэлы вогненныя; яно — полымя непагаснае...»*

Я выходзіла з летаргіі, з трансу, з эфемернага сну, паступова надаючы ўвагу фізічным катэгорыям: балючым колікам у руках і нагах, аняменню і ледзь адчувальнаму сутаргаваму торганню нерваў у вялікіх пальцах, нядаўна выпушчаных з палону рукі І. І. Я ўжо адчувала ягоны подых, блізкі і цёплы, адрозніла глыбокі ўдых, і калі ён моцна падзьмуў мне прама ў вочы, у пераноссе — я апрытомнела і, разумеючы марнасць іншай цікаўнасці, спытала:

— Чаму ты выбраў мяне для здзяйснення сваёй рэлігіі... бо гэта рэлігія?

— Яна будзе рэлігіяй, як ты народзіш сына. Мы дадзім яму веды, вернікаў і фанатыкаў; ён будзе месіяй новага зямнога царства габрэяў... Хто такі муж Марыі, якое месца адведзена яму ў гісторыі?.. Маё каханне зрабіла цябе багіняй, у сіле майго пачуцця, нібы ў мікле, ачысціліся твой розум і цела... Дом наш дагэтуль пусты, і шукаюць мае супляменнікі: якому Богу маліцца; хто яго бачыў, які ён?.. Аднойчы мы аддалі чужынцам нацыянальнага Абароncу, і ён за тое пагарджае намі... Удзячныя хрысціяне надалі яму элінскую знешнасць, павесілі абразы ў храмах і назвалі сынам Божым.

— Людзі намалююць новага месію, і дадуць яму імя.

Мне патрэбна было супраціўленне: малая адзнака маёй прыналежнасці да іншай псіхалогіі, волевыяўлення адзінага боства... *Калі бог бясконца ласкавы, дык які сэнс нам яго баяцца? Калі ён бяспрэчна мудры, навошта нам трывожыцца за свой лёс? Калі ён усёвідушчы, нашто паведамляць яму пра нашыя нястачы і стамляць яго нашымі малітвамі? Калі ён усюдыісны, нашто ўзводзіць яму храмы? Калі ён уладар усяго, нашто дзеля яго прынашэнні і ахвяры? Калі ён справядлівы, то як можна лічыць яго здольным дакараць істоты, якія ён стварыў са слабасцямі?.. Калі ён разумны, дык ці можа ён злавацца на сляпых, якім даў свабоду без разважнасці?***

— Але якім будзе сімвал тваёй веры?

І. І. асцярожным рухам прыўзняў маю галаву, падцягнуў да сябе ланцужок і расшпіліў маленькае вечка.

— Мы аддалі свайго Бога. Але сімвал застаўся нам. Яны адмовіліся ад яго самі, спрабуючы адгарадзіцца з нечаканым набыткам, і паставілі сваю пячатку: крыж. Сімвал рабаўніцтва.

---

* З «Найвышэйшай песні Саламонавай». Пер. В. Сёмухі.

** П. Гольбах. Сістэма прыроды.

І. І. трымаў мой ланцужок на далоні, але, драпежна пасміхнуўшыся, імгненна выцягнуў руку ўперад, ланцужок павіс, прытрыманы двума пальцамі, па рабрынках звёнаў саслізнуў на падлогу залаты крыжык.

XXIII

Пазней я даведалася, што, згодна з воляй І. І., правяла ў лякарні суткі; у нядзелю раніцай Фаіна забрала мяне да сябе. Там з'яўлення Алісы чакала сціплая чорная сукенка з незнаёма-мяккага матэрыялу.

Яшчэ некалькі гадзін таму прывабная медыцынская сястра была сведкай эмацыйна-палкіх рыданняў і істэрычных усхліпаў. Ёй удалося пераканаць мяне сціхнуць толькі тады, як быў зроблены ўкол, і маё цела і розум зноў сталі бязвольнымі. Яна пачакала яшчэ колькі часу, потым выцягнула з кішэні халата нататнік і ручку і пачала задаваць бясконцыя пытанні. Памятаю, мяне здзівіла бязглуздае: цыкл менструацый і якімі кантрацэптывамі я карыстаюся... У гэты момант нейкая згадка пра боль штурхнула ў горла ўсхліп, але прысутнасць чужога надакучлівага чалавека не дала яму вырвацца, паступова ўва мне атрафіраваліся ўсе пачуцці, і толькі машынальна мозг дасылаў адказы на пытанні... Перад ад'ездам з лякарні гэтая ж медсястра ізноў увяла мне ў вену ін'екцыю. Увесь дзень і амаль ноч я правяла ў здранцвенні, падкурчыўшы пад сябе ногі, хаатычныя вобразы і ўрыўкі фраз перашкаджалі думаць, разважаць. Я адмаўлялася ад ежы і не адчувала смагі. Час ад часу ў галаве праносіліся каляровыя шары, ад іх набрыняў чэрап, размякчаліся косткі і выпускалі блякла-бліскучыя шары ўвыш: да столі, вышэй, вышэй... А вочы бачылі рэальныя абрысы прадметаў, якія ніяк не жадалі мяняць прапорцыі і трохмернасць, — пэўна, каб двайнік ува мне не здагадаўся пра вар'яцтва.

І. І. не было ў гэты дзень, прынамсі, я не памятаю ягонай постаці сярод здакучных рэчаў; а ў панядзелак Фаіна прыбрала стомленую істоту ў чорную сукню і адвезла ў крэматорый. Там ужо знаходзілася маці Дзямьяна. Яна не ўбачыла ў маіх вачах спачування — адно дзікі боль; мы сталі адасоблена. Мае пачуцці, сканцэнтраваныя і закратаваныя ўсярэдзіне сэрца, ніяк не маглі вырвацца на волю. Я шкадавала Адэлаіду Вінцэнтаўну, шкадавала яе сына, але болей за іх мне было шкада сябе... праз тое прадчуванне, што калі-небудзь мне будзе выстаўлены неаплатны рахунак, а маё жаданне плаціць з гэтай хвіліны адхілялася.

— Абмахніце яе, — сказала з трывогай Чорная Каралева. — А то ў яе ад разумовага напружання пачнецца гарачка!
І яны пачалі абмахваць яе галінкамі і не супакоіліся да таго часу, пакуль Аліса не папрасіла іх перастаць, бо валасы ў яе зусім раскалашмаціліся.

У памяшканні фірмы мітусіліся нейкія людзі. І. І. выглядаў заклапочаным, ягоная ўзбуджанасць перадалася прысутным. Яны гучна перагаворваліся. Я адчула пах кавы; на маім месцы гаспадарыла незнаёмка. Пабачыўшы мяне, дзяўчына падхапілася і, сарамліва пасміхнуўшыся, выйшла з пакоя. Дзверы ў кабінет І. І. былі разнасцежаныя, мы колькі хвілін углядаліся адно ў аднаго. Шэф узяў са стала стосік папер і ўпэўненым крокам скіраваўся ў мой бок... «Нічога не здарылася, ні-чо-га», — паслухмяна пульсавала венка на скроні. Сам лёд не быў халаднейшы за маю душу.

— Аліса, сёння надзіва шчаслівы дзень. — Словы спатыкнуліся... Чужое полымя, падобнае на бясшкодныя іскрынкі бенгальскіх агнёў, не выплавіла ані кроплі з ільда. — Я атрымаў ліст ад нашчадка Івана Леанідава*, яны згодныя прадаць некаторыя малюнкі.

І. І. расклаў перада мной каляровыя здымкі. На малюнку з залатым шарам і пагадай мы абодва затрымалі погляд.

— Табе падабаецца? Бачыш: не праект, не чарцёж, але акварэльная мара архітэктара... Ну вось, — ён папляскаў мяне па руцэ, — хутка мы будзем у нашым Горадзе Сонца.

Слабая ўсмешка; мяне не трэба запэўніваць: я гатовая ісці ў гэты — згодна з фантазіяй стваральніка малюнка — бледна-блакітна-белы горад, рахітычна-пустэльны пад дыскам іржавага, штучнага свяціла.

— Яму сніцца сон! — сказаў Траляля. — І як ты лічыш, хто яму сніцца?
— Не ведаю, — адказала Аліса. — Гэтага ніхто сказаць не можа.
— Яму снішся ты! — закрычаў Траляля і ад радасці запляскаў у ладкі. — Калі б ён не бачыў цябе ў сне, дзе б ты тады, цікава, была?
— Там, дзе я ёсць, вядома, — сказала Аліса.

---

* Рускі архітэктар, гады жыцця 1902—1959, амаль 20 гадоў працаваў над праектам Горада Сонца. Многія графічныя малюнкі гэтага праекта захоўваюцца ў архіве сям'і архітэктара.

— А вось і памыляешся! — запярэчыў з пагардай Траляля. — Цябе б тады зусім нідзе не было! Ён проста сніць цябе ў сне.

— Калі гэты вось кароль раптам прачнецца, — пацвердзіў Труляля, — ты адразу ж — фю! І патухнеш, як свечка!

І мы ляцелі ў наш горад суботнім ранкам! Там стаяў пусты Храм, і ў натомленым чаканні бадзяліся вакол яго паслухмяныя вернікі; іх будзе большаць год ад году, яны будуць прыслужваць Ёй, апяваць шчадроты і ласку яе Сына... пакуль не пройдуць стагоддзі і не знойдзецца новы бог, і не возьме сабе імя *Таго, Хто ачомаецца ад вечна доўгага сну ў гэты момант* і прымусіць заспанага Бога служыць людзям.

І будзе Бог літасцівы, бо не здолее напачатку разабрацца, хто каму служыць. Калі ўдала правесці гульню, спрытны смяротны зможа заняць чужое месца на Алімпе. Глядзі, не спі, покуль нехта падрабляе пропуск; выйграе той, сведкамі боскасці каго будуць тысячы і тысячы вернікаў...

— Не дачакаўся лета, — спачувальна паскардзілася Фаіна. «Магчыма, гэта будзе летам. Не прывыкай да мяне», — даўняе папярэджанне Дзямьяна.

— Графік змяніўся не па нашай волі, — адказаў ёй І. І. — Я гатовы быў чакаць... ён памёр раней, чым прызначылі дактары. Ніхто не вінен, спадчыннасць. Адно мяне ўсцешвала — ён не мог мець дзяцей.

Я сядзела ў крэсле самалёта ўся ў чорным, струнката і бледнатварая; размова не дзейнічала на мой мозг: размягчаны да стану губкі даўняй ін'екцыяй ці глыткамі цёмнай даўкай вадкасці, якую час ад часу прымушала піць Фаіна, — ён, здаецца, здрабняў, пераціраў-перамешваў словы і толькі тады ўсмоктваў, спажываў... Я разумела, што так не павінна быць, але свядомасць, зацягненая плёнкай абыякавасці, прымала невыносны набытак у сябе, не аддаючы нічога назад, усе адно як твань...

У багажным аддзяленні сярод чамаданаў і пакункаў стаяла акуратна загорнутая карціна, і толькі тры чалавекі з тых, хто ляцеў гэтым рэйсам, ведалі ёй сапраўдную цану, цану, якую просяць толькі Багіні. Зямная жанчына Аліса ўжо прынесла ёй сваю ахвяру, цяпер чарга вольнанаёмных і тых, хто сам захоча паверыць...

— Паслухай, Кіці, давай вызначым, чый гэта быў сон!.. Разумееш, Кіці, сон гэты сніла альбо я, альбо Чорны Кароль. Вядома, ён мне сніўся, — але ж і я яму снілася! Дык чый жа гэта быў сон?

...У той ненаўмысна-доўгі панядзелак гаротна-спакойная Аліса па волі І. І. апынулася ў клубе. Сакавіцкі змрок ахінуў навакольле, падсвечаны аднаколерна-бязлікімі ліхтарнямі, у іх святле горад здаваўся ўрачыста-стомленым, але не жывым і не святочным.

І. І. дапамог мне выйсці з машыны і завёў у дом. Нам насустрач рушылі Фаіна Шлейль і мастачка Ангеліна; такія ж выразы твараў я бачыла ў гіпнатычнай яве. Падалося: Фаіна нахіліла перада мной галаву, дый Ангеліна хавала погляд, — гэта азначала, што мы перастаем быць на роўных. Я азіралася. Увесь інтэр'ер цэнтральнага пакоя (як і іншых, пра што я даведалася пазней) быў зменены...

— Ты застаешся з імі, — загадаў шэф. — Цяпер яны будуць апякаць цябе.

> *— Не, гэта проста смешна! — ускрыкнула Каралева. — Няўжо ты не разумееш, дзіця...*
> *Яна адразу ж насупілася і чамусьці замаўчала, потым падумала хвіліну і рашуча перамяніла тэму.*
> *— Як ты магла сказаць: «Калі я папраўдзе Каралева...»! Якое ты маеш права так называць сябе? Ты не Каралева, пакуль не здасі іспыт на Каралеву! І чым хутчэй мы пачнем — тым лепш!*

Дзверы замкнуліся, і я не бачыла аж да чацвярга, каб праз іх хто-небудзь уваходзіў. Апека жанчын паступова станавілася невыносная; мацней і мацней адчуваўся ціск непатрачанай, нявыпушчанай, усёпаглынальнай энергіі крыку; з кожным днём, з кожнай хвілінай той крык свідраваў мікроны прасторы, і, не ўтрыманы загадам мозга, апускаўся ўніз праз сэрца, страўнік, жоўць і вантробы... ягоны ціск быў такім моцным, што пачынаў балець ніз жывата і я курчылася пад сваімі партрэтамі. Дзесяткі іх — рэпрадукцыі і копіі вядомых і невядомых майстроў — віселі на сценах.

— Паглядзі, — казала мне Ангеліна. — Вось Рубенс... а гэта Голцыус (у другім месцы гэта маглі быць Тусэн і Куапель)*. Як ты свецішся на гэтых палотнах!

Адмаўляючы законы старажытных прыёмаў малявання, твар і цела Юноны набывалі падабенства з сучаснай хударлявай маладзіцай. Не трэба было глядзецца ў люстэрка: я пазнавала сябе ў кожнай рабоце. «Юнона ўпрыгожвае пяро паўліна вокам Аргуса», — паўтарала я за Ангелінай і пыталася:

— Табе не здаецца, што Рубенс ніколі б не выбраў такую мадэль для сваёй карціны?

---

* Усе ўзгаданыя мастакі звярталіся ў сваёй творчасці да міфічнага вобразу Юноны.

— Дзіва што! І. І. загадаў выправіць. Яны ж не маглі бачыць цябе.

— Ты ва ўсё гэта верыш?.. Чаму ты прымаеш удзел?

Дзяўчына неахвотна адказвала, цьмяна і недакладна; ці то яна не ведала адказу, ці баялася, што нехта падслухае нас, ці проста была дурнічкай, якая іграе пасрэдную ролю, спадзеючыся на выпадковае «брава».

— А гэта Ластман і Цьепала... «Ахвярапрынашэнне Юноне»... І. І. сказаў, што вам таксама будуць прыносіць ахвяры.

Мне было наканавана выслухваць блюзнерства дзвюх жанчын, бязглуздзіцу, якая аднак цешыла слых. Боль, што не быў з разраду фізічнага — сціхаў на няпэўны час, і тады я намагалася запомніць літары, іерогліфы, знакі, якімі некалі пазначалі адну прастору злітнасці зямлі і паветра, атаесамлялі адну Багіню, надаўшы ёй шмат імёнаў і функцый. Ангеліна дапамагала мне і ў гэтым.

— Калі мы жылі ў Палесціне, я мела магчымасць вучыць арабскую мову. Многія знакі на гэтых сценах мне знаёмыя... А на той сцяне надпісы зроблены на іўрыце...

Яна тлумачыла з выглядам знаўцы, радасная, што знайшла непадробна зацікаўленага слухача; пакуль аднойчы я не заўважыла, як яна падглядае ў сшытак і напаўголаса завучвае азначэнні. Але калі мяне перастаў цікавіць працэс пазнання, аказалася, што я запомніла большасць сімвалаў і вызначэнняў. Фінікійская Цініт, Феронія з Капены і Тарацына, этруская Уні, грэчаская Гера... Яна раўніва займала месцы нябесных жанчын розных народаў, з дымам ахвярных жывёл да яе вушэй даляталі ліслівыя, пераважна лагодныя імёны-эпітэты: Луцына, Саспіта, Руміна, Манета, Фульгура, Сатурнія, Календарыя... «царыца», «светлая», «што выводзіць дзіця на свет», «ваяўнічая», «дарадчыца»... Але ж многія знакі засталіся нам незразумелыя. Паступова я сама пачынала адносіцца да сябе з патаемнай увагай, я заўважала, што мой погляд часцей і часцей спыняецца на аголеных частках намаляванага цела, і мне хацелася тут жа скінуць адзенне і параўнаць: ці так добра я выглядаю. І ў той час, як паміраў-прытупляўся мозг, спелілася і распускалася пажадная кветка любові; у тыя хвіліны, калі маё цела курчылася пад пранізлівымі колікамі, так жа, як і ў хвіліны адчайна халодных доўга-бяссонных начэй, — я адчувала ля похваў мяккі, ашчадны дотык і цёплы, салодкі подых у патыліцу. У пяшчоце Ангеліны не было нічога бруднага, насцярожлівага і, пэўна, калі б мы засталіся сам-насам на доўгі-доўгі час, я б змагла даць ёй цнатлівую любоў сястрынства... аддаць чыстую радасць духу той, што гатовая была кахаць маё цела, той, што знудзілася ў цярплівым чаканні.

Кінутая ў нязвыклыя ўмовы, я павінна была абудзіцца, сканцэнтраваўшы ў сабе энергію: напружанне цікаўнасці і ведання, эстэцтва і вульгарнага плагіяту, разважлівага розуму і заўзятай цягі, духоўнага і плоцевага, волі і нявольніцтва, любові і абыякавасці; я павінна была ўвабраць і прымірыць, перажыць і авалодаць супрацьлегласцямі... Калі б падчас унутранага суперажывання ў замкнёныя дзверы ўвайшоў хітра-ціхі Сабковіч, мне б удалося шляхам разважлівых парываў прывесці яго да высновы, што мы каханкі, любыя дзеці эмоцый, якія ўдала пагарджаюць інстынктамі. І ў нашых новых адносінах ён знайшоў бы жывое пацвярджэнне гегелеўскай дыялектыцы аб прымірэнні супрацьлегласцяў і ўзвышальна-пераможным выніку.

Але я любіла, і частка гэтага пачуцця належала Фаіне, хаця яна й не ведала пра тое. Мне падабалася глядзець на яе ўсупор і заўважаць, як схіляецца галава, апускаюцца плечы, — не пакорлівая, а свяшчэнна-трапяткая энергія даходзіла да маёй сутнасці. Яна была гаспадыняй гэтага дома, але, паклаўшы аднойчы дары на ларарый*, яна ўбачыла абарончы дух, зматэрыялізаваную юнону**... Калі мой погляд падаваўся ёй назолым, яна брала графін, наліваla з яго даўкую, барвова-карычневую вадкасць у тонка-рыфлёную шклянку і працягвала мне. Я так любіла Фаіну, увесь свет, усіх, што не здольная была ёй адмовіць.

— Сочыва выдатнае, — настойвала Каралева.
— Дзякуй, але сёння мне, на жаль, не хочацца.
— Сёння ты б яго ўсё адно не атрымала, нават калі б вельмі захацела, — адказала Каралева. — Правіла ў мяне цвёрдае: сочыва на заўтра! І толькі на заўтра!
— Але ж заўтра калі-небудзь будзе сёння.
— Не, заўтра ніколі не бывае сёння. Хіба можна прачнуцца ўранні і сказаць: «Ну вось нарэшце і заўтра»?

Увесь гэты час мы зусім мала елі: ягады, садавіна, зрэдку — гародніна і келіх чырвонага віна перад сном. Аўторак, серада і чацвер пачаліся для мяне ў гэтым доме, куды не дасягала свежае паветра і лагоднае вясновае сонца. Вокны былі зароблены так

---

* Хатні ахвярнік, дзе стаялі статуі рымскіх багоў — ахоўнікаў хатняга ачагу; месца, дзе сям'я чытала штодзённыя малітвы.

** У старажытнасці: дух-ахоўнік і абаронца жанчын, што спадарожнічаў ім усё жыццё; дух-абаронца мужчын называўся «геній».

шчыльна, што хутка я перастала б дзяліць суткі на дзень і ноч, і ў момант вышэйшага напружання, калі няможна было адрозніць блазнавата-шчаслівую радасць ад скрушнага болю, а слёзы ад вар'яцка-смяшлівых стогнаў, — Аліса ўзышла на ахвярнік жарсці...

XXIV

Мяне абудзіў рух, патрабавальныя пальцы знайшлі торчык грудзей і лашчылі іх, потым рука пабегла ўніз, пад спіну, я адчула вільгаць кашулі, калі яна датыкалася да цела. Я баялася гэтых дотыкаў і усё ж чакала іх. Мой міжвольны рух напалохаў смелыя ў прагнасці пальцы, рука стаілася; Ангеліна марна спрабавала выраўняць дыханне. Я адчула напружанасць яе цела, сваю сарамлівую распятасць, звярыную неспатольнасць вуснаў і ўлонняў... я застагнала і, сонна пацягваючыся, нібы незнарок, павярнулася да яе. Маладая жанчына адплюшчыла вочы і пасміхнулася так шчыра, што ўсё астатняе адразу ж здалося гульнёй, плодам уяўлення. І калі б інтуіцыя не падказала, што хутка ўсё будзе адбывацца па маім жаданні... я б сама падставіла ёй вусны. Усе хуткаплынныя змены, што адбываліся ў маёй душы, адгэтуль неслі больш нікому не належнае, нікому не падпарадкоўнае значэнне... Мы яшчэ колькі часу ляжалі побач, утаропіўшыся адна ў адну, засяроджаныя кожная ў свой свет.

— Сёння, — з гэтым словам Ангеліна падхапілася.

— Сёння, — з гэткай жа значнасцю зазірнула ў пакой Фаіна.

Яны абедзьве зрабіліся нервова-ўзбуджанымі. Іх чаканне ўвайшло ў багадайную глебу: усё ўва мне задрыжала ад жадання і немагчымасці прыспешыць падзеі.

Фаіна не дазволіла мне прыняць душ, як было дагэтуль, а правяла ў невялічкі пакойчык, большую частку якога займала квадратная ванна-басейн; над кожным яе вуглом узвышалася прымацаваная фігурка — невялікая копія антычнай статуі. На каленях адной з іх, цярпліва ўсмактаўшыся ў багадайныя грудзі, сядзела дзіця, ягоную галоўку падтрымлівала рука маці, другая рука скіроўвала смокчык у рот малому. Над галавой усёведнай быў прымацаваны німб... Іншыя фігуркі мне спадабаліся больш: яны не мелі боскае дзіця на руках і не былі яшчэ засяроджана-абыякавымі.

— Я не бачыла гэты пакой.

— Ты і не павінна была яго бачыць... раней часу.

Фаіна забрала ў мяне чорную сукенку, якая адна з матэрыяльных рэчаў нагадвала пра той свет, скуль я прыйшла (тут іншых

рэчаў мне не давалі, калі не ўлічваць начную кашулю). Яна падтрымала мяне пад локаць, спачатку я падымалася, а потым спускалася па жалезных прыступках у ваду: цёмную, бы густа настоеную на зёлках, цёплую і духмяную. Пятая фігурка ў ачышчальнай купальні. Я не баялася, што злая мачыха кіне мне жабу на грудзі, з чаго я б зрабілася брыдка-непрыгожай; у гераіні сучаснай казкі не было адзінаццаці братоў; Алісе быў даспадобы паўлін і зязюля*...

Я выйшла з вады, знешне абмяклая і лагодная, усвядоміўшы, якая свежа-саладкаватая мая скура, як прыемна пахнуць мятай валасы. Фаіна тут жа загарнула мокрае цела ў кужэльную прасціну і ненастойліва-мякка прымусіла сесці на нізенькі зэдлік. Яна дастала аднекуль нажніцы і, нягледзячы на слабы пратэст, пачала падразаць мае пазногці. Яна так шчыравала, што некалькі разоў зрабіла балюча, я здзіўлена ўскрыквала. Яна пачала з вялікага пальца правай рукі і закончыла мізінцам левай...

— Мы з табой адной веры.

Яе дзеянні не мелі ніякага значэння a prima facie**; я спрабавала ўлавіць сэнс, супаставіць, але ўвесь час узвышанае сутыкалася з юдаічным, і толькі ў нейкі момант можна было засяродзіцца на адзінасутнасці з'яў. Нарэшце прыйшла Ангеліна, абкручаная ў пакрывала на манер старажытнай вопраткі, сабраўшы чорныя прамыя валасы ў высокі хвост і адмыслова падкалоўшы частку з іх набок, яна ператварылася ў панадную жрыцу, мілую прыслужніцу. Я тут жа заўважыла перамену — яна хацела, каб яе ацанілі. У руках Ангеліна трымала грэбень і пук заколак і адразу ж заняла маімі валасамі. Мае пальцы з падрэзанымі да самых кончыкаў пазногцямі, з-за чаго падаваліся лёгкімі і чужымі, бязважка адпачывалі на закрытых прасцінай каленях.

> *— Нічога не разумею, — працягнула Аліса. — Усё гэта так заблытана!*
> *— Проста ты не прывыкла жыць у зваротны бок, — лагодна патлумачыла Каралева. — Спачатку ва ўсіх злёгку кружыцца галава...*

Дзве жанчыны завялі мяне ў пакой, дзе дагэтуль мы начавалі з Ангелінай, і ўладкавалі на ложку, падклаўшы для зручнасці пад спіну падушкі. Ангеліна пакінула круглае люстэрка з доўгай ручкай, і я магла колькі заўгодна любавацца ўмела зробленай прычоскай: русыя пасмачкі скалолі і ўпрыгожылі серабрыстай стуж-

---

* Сімвалы Юноны.

** На першы погляд (*лац.*).

кай, абкружанай вакол галавы. На некаторы час мяне пакінулі адну; арыйская іудзейка Фаіна і сапфічная азіятка вярнуліся ў пакой, дзе была ванна-басейн.

Калі мне надакучыла гульня з люстэркам, я звярнула ўвагу на дробна спісаныя паперкі, што адным ражком вытыркаліся з-пад падушкі. Ад мяне чакалі, што я іх прачытаю, і я тут жа выцягнула іх з хованкі. Гэта быў не сам тэкст, а ўрывак. Сказ пачынаўся на сярэдзіне. Для мяне падкрэслілі зараней. «Скажу яшчэ тайну: у прыродзе чалавечай схаваны нібы падлог, і на гэтай *падробнасці* чалавечай істоты заснаваная цяга палоў, шал, каханне. Менавіта: душа кожнага чалавека мае не той пол, як яго цела, а цела мае іншы пол, чым душа. Таму кожнаму чалавеку не патрэбна ягонае цела, ён — кідае яго, намагаецца ад яго пазбавіцца (аддае жанчыне праз злучэнні); а шукае іншага цела, дакладней, яго душа шукае свайго цела; *радзіны* сабе, сваю *ўласнасць* у целе іншага пола. Гэтыя пошукі мы і называем ці назіраем як «каханне», а момант знаходкі называем палам, салодкай радасцю*... Для дасягнення прымірэння паміж супрацьлегласцямі павінна быць дасягнута ідэальная раўнавага... У прыватнасці, гэтая тэорыя супрацьлегласцяў і іх раўнавагі выражаецца ў сексуальнай сферы. Яскравы прыклад развіцця шляхам прымірэння супрацьлегласцяў заключаецца ў саюзе мужчыны і жанчыны (двух супрацьлегласцяў), які прыводзіць да нараджэння новага жыцця — з'яўлення дзіцяці**... Палавыя збліжэнні лічылі святым актам іудзеі, сіра-фінікіяне, вавіланяне, егіпцяне, сімвал веры якіх быў пазначаны праз абразанне...»

Я не стала хаваць паперкі; бутафорыя; адзінаццаць лебедзяў маглі стаць адзінаццаццю алавянымі салдацікамі, што нецярпліва стукаліся ў скрынку маёй інтуіцыі. Нехта падагравaў ваяўнічасць, ператвараў пакорлівасць у мітуслівы шал, ненажэрнасць: хацелася гучных эмоцый, барацьбы. Напружанасць павялічылася, узмоцнены ўнутранай энергіяй, заварушыўся пахаваны адчай-крык...

— Ён тут, — урачыста паведаміла Фаіна, калі вярнулася ў пакой. Яе адзенне таксама выдавала сцэнічную старадаўнасць. — Зараз пачнецца.

За ёй увайшла Ангеліна, яна прынесла блакітна-серабрыстае адзенне і лёгкія скураныя сандаліі — якраз па назе. Разам яны здзейснілі акт пераўвасаблення: мяне апранулі ў прыгожы плашч-пакрывала, асцярожна, з пашанай уклалі вакол цела складкі, з галавы знялі стужку і ўздзелі бліскучы авянечнік, падобны на той,

---

* Урывак з твора В. Розанава «Юдаізм».

** З кнігі Р. Кавендзіша «Магія Захаду».

у якім я пазіравала Альховічу... Унізе заварушыўся боль, я прагла, каб ён прабіў гэты містычны спакой... вырваўся...

* * *

Перада мной стаяў І. І., ён быў варты шкадавання, але ён быў амаль Бог; ягоны погляд адразу зачараваў, прыцягнуў. Мяне прывялі дзве жанчыны ў старажытным адзенні і паставілі насупраць мужчыны; вочы на хвіліну заплюшчыліся, я не валодала эмоцыямі, але зноў валодала болем. Фаіна не злучыла нашы рукі, не аддала нас у абдымкі адзін аднаму. Паміж намі стаяў стол, а на ім — парцалянавая міса з садавінай і адзінюткі кубак. І. І. узяў яго, але не адразу паднёс да вуснаў. Спачатку ён выцягнуў руку і нахіліў, каб частка вадкасці (пэўна, там было віно) сцякла на падлогу.

Фаіна і Ангеліна адрэпетаванымі жэстамі выбралі з місы вінаград і гранаты, з непадробнай значнасцю перанеслі іх у мармуровае прыстасаванне, падобнае на фантанчык для пітва; але яно стаяла пад партрэтам Юноны і аказалася ахвярнікам. Пахуча-млявы дымок падняўся ўгору. Зрокава я ўспрымала ўсё як належнае, мае вочы амаль не міргалі, былі шырока адплюшчанымі, ці не так глядзела з Алімпа ўніз сапраўдная багіня, за што празвалі яе «вірлавокай»?

Мы стаялі насупраць; мы трымцелі, нібы нашыя целы вось-вось будуць аддадзены дыбе ці плёткам з жалезнымі кіпцюрамі; мы ўзвышаліся і забіралі адзін у аднаго надзею; кожны з нас у гэты момант валодаў першапрычынай і кожны грэбаваў існасцю, пакрысе выпускаючы на волю нястрыманага духа-чалавека, але звера.

Ён адвярнуўся ад мяне і скіраваў свой зварот няўзрушліва-маляванай:

— Заклінаю вас, святыя анёлы, імёнамі: Кадос, Кадос, Кадос, Эсшэрсі, Эсшэрсі, Эсшэрсі, Хацім, Хацім, Іа — уладальнікам стагоддзяў, Канцін, Жаім, Канік, Анье, Кальбар, Саббак, Бэціфай, Альнаім... Анёламі-служкамі шостага легіёна... імем зоркі Юпіцера, вышэйшым стваральнікам усяго... іх сілай і магутнасцю... дай праз каханне з гэтай жанчынай сына, новага Саула*... ты, хто старшынствуе ў гэты дзень... ты, хто можа схіляць волю жанчын... о вялікі Сахіэль... падпарадкуйся мне, бо каханне Юноны зробіць мяне роўным яе мужу Юпіцеру... роўным твайму гаспадару, о Сахіэль!

Ён усё гаварыў і заклінаў то пагрозліва, то ўмольна, сум і захапленне чаргаваліся ў ягоным голасе, смех і слёзы; але ўжо суладна гучала ціхая музыка, і прыцемненае святло пачало пералі-

* Першы ізраільскі цар (*бібл.*).

вацца колерамі вясёлкі, не хацелася думаць пра deux ex machina*, пра своечасовае знікненне жанчын-сведак...

Ён павярнуўся да мяне, падышоў: юдольнік беспрытульнасці, напоўнены спагаднасцю і семем, усеабдымны сузіральнік; ягоная пастава выяўляла пажаднасць, ён сціснуў мяне ў абдымках, і я адчула, як уздыбіўся жэзл, на які сам Усявышні паставіў пячатку, калі рабіў свайго першачалавека**, адчувала рукі, якім удалося зняць вопратку, яе лёгка-лёткае ападанне; бясконцае расхінанне ўлоння, слодыч раптоўнага ўдару, роўнага ўдару маланкі, што прасякае сусвет; выспельванне плоці — спажыў для абраных вясельнікаў; жарсць, неспатольнасць; узмоцненасць гартаванага ціску, невыносна-пякучага болю душы, далучанай да Кахання і трагедыі Смерці; пешчанае сукрытым аратаем плоднае «янь»; апраменьванне, выбух КРЫКУ... да самюткага дна... семя праб'е дарогу... хай прарасце семя з семені; салодка-духмяная самана-поўненасць, спеласць сакавіта-крывавых зерняў гранату — пад нашымі вуснамі нашых укусаў... боль ад рабрыны стала пад ягадзіцамі; лагодны струменьчык па аслаблых нагах; апатыя міласэрнасці; наканаваная ні-ко-лі-не-спа-толь-насць...

А над галовамі дзіўных каханкаў лунаў-расцякаўся пераможны крык, падвоены сумессю ізамарфічных супрацьлегласцяў: зліццё чалавечага «я» з вышэйшым неўсвядомленым, пасрэдніцтва з'ідэалізаванага пачуцця на магічна-развітую волю; піск чакання, напоўненага сабой, і цярплівы спакой усёведання; бескантрольная самазаглыбленасць і скіраваная засяроджанасць; эгаістычная абранасць, жаданне верыць у пераменлівасць светапарадку і — магія дзеля спасціжэння ідэальнай раўнавагі — распрацаваная сутнасць кахання. Усё дзеля ГЭТАГА КРЫКУ... Вырвалася, узляцела адно з сямі целаў Алісы на мармуровы слуп, бачаны ў сне, — празрыста-сляпучае ад юдаічнай пазалоты поту-семені-пацалункаў, перамяшаных са слязьмі і энергіяй жарсці... Апусцілася на каменную падстаўку, расправіла антычна-ашчадлівым жэстам складкі плашча, уладна зацісnула скіпетр рука ды павярнулася годна галава, калі сядала на верхавіну скіпетра птушка-зязюля,*** і вочка яе выглядала рыхтык як эліпсоідны плод euonymus.

---

* Лац. прымаўка, літаральна: «бог з машыны»; азначае нечаканы выхад са складаных сітуацый, абставін; у антычнай трагедыі такі выхад узнікаў дзякуючы з'яўленню нейкага боства; акцёр, што выконваў ролю бога, апускаўся на сцэну пры дапамозе своеасаблівага механізма.

** Згодна з яўрэйскай легендай, Адам быў створаны абрэзаным.

*** Згодна з легендай, Юнона не згаджалася зрабіцца супругай Юпітера, і тады той ператварыўся ў зязюлю, выклікаў буру і прыляцеў да ног багіні. Ахопленая шкадаваннем, Юнона адагрэла мокрую і халодную птушку на грудзях, пасля чаго бог прыняў свой звыклы выгляд. Юнона, на якую падзейнічала такое своеасаблівае прызнанне ў каханні, стала жонкай Юпітера.

* * *

Суботнім ранкам мы ляцелі ў Іерусалім. Самалёт плыў насустрач сонцу, ягоныя промні залацілі белабокія аблокі, наш шлях праходзіў праз сукупнасць белага і блакітнага. Сузіранне гэтых колераў паслухмяна вярталі мой розум да згадкі-дрымоты, да журботнага бачання юначага аблічча, урошчанага, як барэльеф, у жорсткае сэрца, і, пераможанае вялікасцю двух колеравых спалучэнняў, напаўнялася сэрца спагадным веданнем, што

з усіх цудаў, якія бачыла Аліса ў сваіх вандраваннях па Залюстрэччу, яскравей за ўсё яна запомніла гэты. Праз шмат гадоў гэтая сцэна так і ўзнікала перад ёй, нібы ўсё гэта здарылася толькі ўчора: лагодныя блакітныя вочы і мяккая ўсмешка Рыцара, сонца на закаце заблыталася ў ягоных валасах, асляпляльны бляск даспехаў, Конь, які мірна скубе траву ля яе ног, цуглі, што звесіліся на шыю Каню і чорны цень лесу ззаду. Яна запомніла ўсё, усё да драбнюткіх драбніц, як запамінаюць карціну, што ўразіла ўяўленне.

«Іслач», 1994, 1996



ПА ВУЗКАЙ ДАРОЗЕ Ў ЦЕСНУЮ БРАМУ

Усё праходзіць.

І вось ты сядзіш аднойчы, ахопленая пачуццём гідлівай пэўнасці: «мяне ванітуе ад вас...», заглыбляешся ў гэты стан, патанаеш-застываеш, як вішня ў бела-пастэльным жэле; вішня, што пражала не адну гадзіну і паспела пусціць сок: размыты абрыс, млявыя пражылкі; незаспакоенасць.

Ложак у гатэлі...

Інтуітыўныя збегі ад сябе.

Што вырашыў дзень растання? І ці быў ён на самой справе? Ты ж так не думаеш? Урэшце, зараз ты ўжо не думаеш так.

Дарога заняла два доўгія дні, дзве бяссонныя ночы... бясконцыя мытні, бясконцыя прыпынкі... калі цягнік заганялі ў непрыстойна-голы, брудны пейзаж, дзе лёгка разумелася вызначэнне *сметнік Еўропы...*

Калі розум намацаў гэты выраз, яна прыўзняла галаву ад казённай падушкі і абыякава зірнула ў вакно. Усё той жа бруд каля рэек, два-тры змарнелыя сабакі (адзін з іх, скурчаны, звычна і гучна клацаў сківіцамі, намагаючыся дастаць блох, іншыя паглядалі ў бок семафораў, якія ніяк не хацелі даваць сігнал на адпраўленне; і толькі раз-пораз звыкла-жаласлівым рухам сабакі паварочвалі галовы і пазіралі на закрытыя вокны вагонаў, каб ізноў адвярнуцца ў бясконцым чаканні).

З затоенасцю сабакаў ляжалі на паліцах пасажыры, гатовыя паслужліва падскочыць пры першым з'яўленні тых, хто адзіны ў дадзенай сітуацыі меў права на пытанні.

— Наркотыкі? Зброя?

Загад «Ваш пашпарт» гучаў як з'едлівае пытанне: «Вы яшчэ маеце пасведчанне сваёй асобы?» Нібыта час ссылак і лагераў не скончыўся для Еўропы разам са знікненнем сацыялізма з шостай часткі кантынента.

Калі бяжыш вось так — бяздумна, амаль бязмэтна, не толькі мытнікам ты можаш падацца падазронай. Пра што ён думае, загадваючы табе выйсці з купэ ў вузкі калідор да акна, каб параўнаць твой твар з фотакарткай у дакументе? Разгубленасць і адчай робяць цябе надзіва падобнай да сябе. Ты з палёгкай адчуваеш паблажлівасць чыноўніка ў форме, не здзівіўшыся нават ягонай

манеры трымаць руку на тваім плячы; ты стаіш надта блізка, каб нешта выправіць.

І толькі праз доўгі-доўгі прамежак часу, калі цягнік рушыць, ты са шкадобай падумаеш пра адсутнасць душа: так хочацца змыць дотык!

У Мінску застаўся твой дом, які ты, па сутнасці, яшчэ не паспела адчуць домам; усё чужыя куты, абавязкі быць ахайнай і ашчадна карыстацца святлом. Сувеніры — як намаганне зрабіць утульным чужое жытло, — зніклі, згубіліся на працягу гадоў ці былі проста выкінутыя... А твой пусты дом знудзіўся ў чаканні цябе.

Плыннасць часу адчуваецца не тады, калі жывеш, а тады, калі пачынаеш аналізаваць сваё жыццё. Нават змена дня і ночы ў цягніку не сведчыла пра бег часу. Рух існаваў па-за табой, адлучанасць, стома, сон... і не пакутлівае ляжанне на ложку ў гасцёўні пасярод чужога горада сведчыла пра рух. Першыя дні знаходжання тут не прынеслі яснасці, пэўнасці, толькі разгубленасць затаілася і саступіла месца падазронасці. Хіба што ўжо не чыноўнікі, а ты сама мела права задаваць сабе пытанні.

Але час адказваць на іх яшчэ не настаў.

...Што зробіш, калі ў нас не было дома?

— Я? Так. А ты?

— А я?.. Не...

Унутраны дыялог, сведчанне пра андрагіннасць, пра зліццё супрацьлегласцяў, якія не былі з таго ў раўнавазе. Нас па-ранейшаму было дзве. Адна пыталася, другая не ведала адказу, бо «не» вызначалася нерашучасцю, нявырашанасцю.

Дарогай у мяне з'явіўся спадарожнік. Ззаду засталася першая ўкраінская мытня; не хацелася ізноў чуць характэрны ўкраінскі акцэнт. Прыцемкі за вакном далі магчымасць прыкінуцца незацікаўленай, соннай. Мужчына расклаў рэчы, пакінуўшы на століку пластыкавую бутэльку з напіткам і кніжку. Потым прысеў моўчкі. Ён пасядзеў колькі хвілін і выйшаў. Я чула, як грукнулі дзверы ў тамбур.

Ізноў накапілася стома, звычайны стан, характэрны для доўгай дарогі.

Чаму я не ўзяла білет на самалёт? Ужо даўно была б на месцы. Але з таго, што ніхто не ведаў пра маё з'яўленне там і не чакаў мяне, было ўсё адно, калі прыехаць. Па сутнасці, я не мела ніякіх спраў, адно — інтуіцыя... Мусіць, я прыснула, бо калі адплюшчыла вочы, незнаёмец ляжаў, выцягнуўшыся на сваёй паліцы. Яму было нязручна, ногі даставалі да дзвярэй купэ, а галава была высока ўзнята. Я пазнала ледзь чутны пах тытуню, адразу ж з'явілася

жаданне паліць. Спадарожнік не варушыўся, але не спаў, ляжаў з прымружанымі вачыма.

Існым быў толькі сінхронны грукат пад намі.

Усё засталося ззаду. І нават той, хто парушыў маю адзіноту, належыць мінуламу. Бо выйдзе на нейкай станцыі і, падхоплены плынню свайго жыцця, знікне для мяне назаўсёды.

Яшчэ ніколі не даводзілася мне бегчы так нечакана, так раптоўна і так самаўпэўнена належаць будучыні. Жыццё цягнулася трыццаць гадоў і ў адну хвіліну засталося ззаду, у волкіх ранішніх прыцемках Мінскага вакзала, дзе высокі маладжавы мужчына спрабаваў прыхаваць разгубленасць і ўсё імкнуўся затрымаць расстанне апошнімі цнатлівымі дотыкамі. Вера ў наканаванасць рабіла жанчыну рашучай, спакойна-пагрозлівай і ўзнёслай. Ён адчуў яе ўцёкі, яе незразумелую засяроджанасць, пагардлівую ваяўнічасць і моўчкі саступіў, калі яна рушыла ў вагон.

Смяротная стома.

А ці бывае смяротнай надзея?.. Я дала яму надзею на шчасце і знікла.

Ён заўважыў, што я не сплю, і павітаўся. Ён быў падобны і не падобны да ўкраінца.

— Как вас звать?

— Вольга.

— Олга.

Мы ехалі ў Сафію: ён — дадому, я — у нікуды. Ён збіраўся правесці адпачынак з сям'ёй, ужо два гады, як ягоная фірма адкрыла філіял на Украіне, нешта звязанае з хлебапрадукцыяй (я не запамінала — усё неістотна). Мы былі раўналеткамі, магчыма, існавала розніца ў пару гадоў; мяне гэта не цікавіла. Я выцягнула пачак цыгарэт і прайшла ў тамбур. Амаль адразу ж туды заявіўся і ён. Мы не былі суайчыннікамі, і сталася неабавязковым тлумачыць сваю няветлівасць. Яшчэ ў мінулым жыцці я стамілася ад прысутнасці людзей, і зусім не падумала пра тое, што гэтая дарога вымусіць цярпець нахабнае ўварванне чужынцаў, перагляд рэчаў, загаднае: *ідзі сюды, на святло*! (з невыносным акцэнтам, але так зразумела!), уладны цяжар чужой рукі на плячы і богведама што яшчэ. Я прагла спакою. А ён спрабаваў распавесці пра сваю работу, пра эканамічную сітуацыю, пра нахабства чыноўнікаў і хуткае набліжэнне новых сустрэч з памежнікамі. Я разумела не ўсё і больш маўчала, удыхаючы дым, які станавіўся едкім і рэзкім у закрытай прасторы тамбура. Яго звалі Асен, як аднаго з балгарскіх цароў, але я не ведала: нашто мне ягонае імя, калі ў мяне не ўзнікае пытанняў. Каб хоць штосьці зрабіць, я прайшлася па вагоне да месца, дзе вісеў расклад. Бліжэйшы прыпынак... Мытня... Гадзіны

нерухомасці... Некалькі пасажыраў, пяць ці шэсць на ўвесь вагон, і мы з Асенам у прамежкавай прасторы. Свет забыўся на нас. Нас заўважылі б толькі тады, калі б здарылася крушэнне... Рэдкія агні за вакном зніклі — я адгарадзілася ад свету шчыльным дэрмацінам, чорным, як і ноч за пыльным шклом.

Ціхмянае сядзенне ў гатэлі. Снег за вакном. Трыццатае сакавіка. Словы, якія нараджаюцца хутчэй, чым фразы, фразы, больш складаныя, чым думкі. Сарока ўладкавалася на вершаліне сасны, торгае хвастом, на адным узроўні з маім паглядам. Пяты паверх. Снег... Калі сачыць за рухам сняжынак, заўважаецца сінхроннасць, заканамернасць... Вільготныя згусткі падаюць з галін, гучна ўсмоктваюцца ў асфальт, расплываюцца. На дварэ плюсавая тэмпература. Падаюць... Характэрнае шалахценне, галіна трэцца аб галіну, калі саслізгваюць крохкія снежкі. Я чую, як спальваецца цыгарэта. Гукі за вакном не парушаюць цішыні... Я падаю, каб сутыкнуцца з цвёрдай вільгаццю, асфальтам, набрынялым шэравата-мі разводамі ападкаў, снег мяняе колер, абураецца ўціску чужога прадмета, рассоўвае баразёнкі пад гарачай плоццю. Цела апякаюць халодныя брудныя пырскі, пара шкляных вачэй, у якіх цягнецца палёт спалоханай сарокі. А вакол — дробныя кроплі рассыпанай спелай вішні.

Ізноў цыгарэта... Я стаю ля парэнчаў на адкрытай пляцоўцы балкона, цела — проста пад маім паглядам — яшчэ курчыцца: эфект светлаценяў ад узмоцненага руху мокрых пуховак; дворнік вынес шырокую драўляную рыдлёўку, ахайна скрабе дарожку, пракладзеную для прагулак. Я ўжо ведаю, што дарожка абкручваецца вакол будынка, заварочвае за кут, а адтуль скіроўвае свой тонкі змяіны хвасток у парк, які ўначы папраўдзе здаецца лесам... Там ціша, там прагульваюцца хатнія сабакі. Вольныя ж сабакі будзяць мяне раніцай, гучны брэх сутычак дасягае з боку блізкіх дамоў і замкнёных пад'ездаў. Сабакі тут маюць свае застарэлыя звычкі. Дворнік ужо паспеў расчысціць месца пад маім балконам. Па-ранейшаму падае снег... Я запальваю новую цыгарэту. Папярэдняя працягвае дыміцца ў папяльніцы.

Раніцай мяне ўразілі лапікі зялёнай свежай травы і беласнежны сувой вакол са слядамі сабак і птушак. Я пакінула побач адбіткі сваіх ботаў.

Калі б непадалёку праходзіў чалавек, мы абавязкова б павіталіся, паківаўшы галовамі, — *добър ден*! — як два незнаёмыя суайчыннікі, знітаваныя надта раннім шпацырам... Я гуляла бязмэтна і досыць доўга, пакуль не пачала пазнаваць маршрут: бульвар Віташа, Ракоўскі, царква Аляксандра Неўскага. Час замкнёных сладкарніц і адчыненых цэркваў. Загледзеўшыся на засяроджанасць

жана-строгую жанчыну, я прайшла за ёй на гукі ўрачыстай музыкі. Крыпта, раз на месяц канцэрты для аматараў старасвецкай музыкі. Іконы і паўкруглыя скляпенні, выдатная акустыка; маладыя жанчыны з галасамі анёлаў. Мне захацелася агледзець падсвечаныя іконы, але ўсе сядзелі; нехта азірнуўся. Я села побач... У паўзе, пад воплескі, прыўзняўся кампазітар, пажылы яўрэй, перад тым капэла выканала «Яўрэйскія песні з лагера Аўшвіц» (калі верыць вядучай). Увесь час, колькі я слухала, мяне ўсупор разглядалі крыху раскосыя вочы славянскага маляванага Бога. Каб не сустракацца з ім поглядам, я заплюшчвала вочы, і тады перада мной з'яўляўся мужчына ў цёмным адзенні, шэрыя скулы торгаліся, вусны варушыліся, дастаткова было зірнуць на яго, каб ведаць, што ён казаў — у той момант, калі цягнік зрушыўся, і вакзал разам з самотным мужчынам марудна паплылі назад...

Што я раблю тут, у незнаёмым горадзе, я, жанчына, якая прагне вясны?

Наступным разам ён падыходзіць да мяне хутчэй, годна, але ўсё-ткі я заўважаю змену рытму; *една чаша кафе, имате ли цигари, добре, мерси, мерси*; ён ветліва пасміхаецца, спрабуе пажаліцца на надвор'е, ён ведае, што я не ўсё разумею, але ківаю, таксама ветліва і на ўсё адказваю: *добре*. Я для яго чужаземка. Мне сумна. Ён разумее мой сум і прыносіць чыстую папяльніцу. Ад прасторнай залы мяне адгароджвае высокі мяккі фатэль колеру сухіх водарасцяў. Перада мной, на століку, кубачак кавы (я адчуваю пах), апошні выпуск газеты «*Стандарт*», далей — штучны садок, скурчаныя камлі і кароткія ствалы дрэўцаў, якія на волі не выцягнуліся б вышэй. Мне ўтульна побач з шырокімі кволымі лістамі пластмасападобных раслін... Я прашу яшчэ кубак кавы, але венскай, і пакуль мяне абслугоўваюць, разгортваю газету... *Папа Іаан-Павел II цалуе ногі дванаццаці служкам падчас службы ў Ватыкане; ураган у Еўропе, ад якога загінулі дзесяткі людзей; беларускі прэзідэнт дэпартаваў рускага журналіста; 39 сектантаў-самазабойцаў у ЗША шукалі райскае жыццё праз каметy*... Пра крушэнне цягніка ніякіх звестак, хаця мінуў тыдзень, роўна сем дзён з таго часу, як знікла жанчына, чыё плячо хвіліну абмацваў нейкі памежнік; каб жа ён ведаў, што прыглядаецца да памерлай! Але ў яго не было ніякіх прычын падазраваць яе ў самагубстве.

Непрыемнае адчуванне ад двух кубкаў кавы нашча... хутчэй заглыбіцца ў горад, выпаўзці з інваліднага крэсла колеру сухіх водарасцяў... вытаргнуцца ў будзённсць дарагіх вітрын, засяродженасць прахожых, штурханіну жабракоў... Першая ж дзвярная ручка сведчыць пра маё існаванне ў гэтым свеце, укол статычнага разраду, намагаюся заходзіць толькі ў тыя дзверы, якія маюць пластык шыкоўных разнастайных ручак, усё часцей трапляю ў дара-

гія магазінчыкі, дзе няма пакупнікоў, дзе мяне сустракаюць надзвычай ветліва. Азіраюся: адно й тое, адно... і тое... стома.

Вечар... Разгортваю падручнік балгарскай мовы, куплены на кніжным развале. Малюнкі расказваюць пра наведванне пошты, сведчанне, што я магу напісаць ліст і кінуць яго ў *пощенската кутия**. Замест гэтага п'ю аспірын... Са мной нічога не адбываецца, я не памятаю адраса жанчыны, якая аднойчы сарвалася з месца, каб рушыць у дарогу... За маім акном горад з колькасцю насельніцтва, як і Мінск, хіба што з іншым геаграфічным становішчам. Сафія ў агнях... З усіх бакоў горы (я бачу толькі частку); я на гары, сярод снежных сумётаў, на мне шчыльныя акуляры, каб абараніць вочы ад сонца і снежнага пылу (сонца гэтай парой не бывае), я здымаю іх і адразу падаю ў снег, бо ездзіць на лыжах не ўмею, і ўжо наўрад ці калі давядзецца навучыцца. Звяры, калі яны ёсць, ладкуюцца нанач, птушкі (іх я таксама не чую) спяць, і я засынаю разам з імі... Сплю доўга і неспакойна, каб падхапіцца нарэшце з прыгаломшаным шэптам «ма-ма»... На мне мокрая кашуля — хоць выціскай, вільготныя валасы... Ізноў прымаю таблетку, здымаю мокрае адзенне і перакочваюся на край ложка, здаецца, там яшчэ засталося сухое месца. Халодна, балкон адчынены, не хапае сіл падняцца, і я пакутую, спрабуючы перапыніць дрыготку цела, падкурчваю ногі самотным эмбрыёнам у чэраве тумановай Сафіі... Мяне будзіць гвалт, гэтым разам сабакі зусім блізка, яны ўпэўненыя: самы час нарадзіцца. За ноч снегу пабольшала, балкон накрыты пульхным марозным кілімам, ступаю на яго басаножі з ціхім скігатаннем бягу ў душ пад гарачую ваду... Аднойчы я вывучу мову і звычкі, каб упэўнена зайсці ва ўстанову, дзе пацвердзяць маё права жыць сярод сабе падобных... Я тут...

Сёння я размаўляла з афіцыянтам. Акрамя мяне, наведнікаў не было. Я папрасіла яго прачытаць тэкст з падручніка (пра пошту), і ён падсеў за столік. Я замовіла яму кавы... Ён загаварыў пра бліжанне НАТА на ўсход (не ведаю, забаўляла яго гэтая тэма ці палохала); *а ваша краіна*?

Я не ведала. «У мяне можа не быць краіны, наш прэзідэнт далучае яе да Расіі...» «Эльцын... — пацвярджаў ён і таксама не разумеў мяне... *Така дожива до пролетта на скрито място, да няма звярове, да няма врагове...*»**

— Хутка вясна? — спытала я.

---

* Паштовая скрыня (*балг.*).

** Так дажыве да вясны на скрытным месцы без звяроў, без ворагаў... (*балг.*).

Ён засмяяўся і адшпіліў з цёмнага піджака сваю марценічку*, каб падарыць мне. Заканчваўся сакавік... Калі я пабачу ластаўку, я закіну марценічку на дрэва.

На вуліцы, прама ля мяне, спыняецца аўтобус. Заходжу, прабіваю квіток і еду (*нехубово*, — скажа кантралёр, адбіткі кампосцера зусім з краю; *нехубово*, — згаджуся і паеду далей). На канечным прыпынку даводзіцца перайсці ў пластыкавую кабінку, якая вязе мяне на Віташу, наверх. Кабінка гойдаецца, я ўскрыкваю, ніхто не чуе, знізу застаюцца дрэвы, яны ў звыклым маўчанні прасочваюць шлях падвешаных на канатах кабінак. Людзі ўнізе не падымаюць галоў, яны занятыя сабой і сваімі дзецьмі, якія вучацца катацца на горных лыжах. Калі вы нарадзіліся тут, вы мусіце ўмець ездзіць з вяршыняў... Далей дарогі няма. Я выходжу, здымаю з шыі ядвабную хустку і абвязваю вакол галавы. Лёгкі палітон выдае выпадковасць майго з'яўлення тут. Каб жа была апранута адпаведна, я б паспрабавала дабрацца пешкі да *Капитата*; яго вяршыня застаецца справа ад мяне (згодна з указальнікам). Злева, амаль на той жа адлегласці — *Чорни връх*... Снег пад нагамі прасядае, я купляю чорныя лыжныя акуляры ў нейкай гандляркі, якая расклала свой тавар ля станцыі канаткі. Яна робіць сур'ёзны твар, пакуль я прымяраю акуляры. Недарэчнасць, я ведаю, але адлічваю грошы і адыходжу. За спіной смяюцца дзеці, абарочваюся, іх сабака таксама смяецца. Хутчэй, бегчы! Але мае крокі няспешлівыя, павольна і мякка пружыняць ногі ў вільготных ботах...

Чыноўнік не прыме мяне. Я блытаюся ў займенніках і не змагу напісаць заяву. Хіба што прыкінуцца нямой, каб не адказваць на пытанні, але ён пакладзе перад сабой чысты аркуш і ручку, яму будзе цікава даведацца пра мяне. Я надзену чорныя лыжныя акуляры перад сціплымі дзвярыма адміністрацыйнага будынка і рашучым крокам зайду ў кабінет. «Вы працуеце інструктарам?» — папытае ён і здзівіцца пастэльным колерам адзення, якія падкрэсляць яркую барву абведзеных вуснаў. «У мяне няма працы, — скажу я. — У краіне крызіс, работу цяжка знайсці». — «Ідзіце дадому». — Ён так і не зразумее маёй просьбы, і не даведаецца, што дома ў мяне няма...

У гатэлі я набіраю нумар тэлефона, маўчанне, трэск, потым доўгія гудкі. Ніхто не падымае трубку; але ж я тут, і кватэра пустая, ніхто не меў права зайсці туды без мяне. Нават той, у каго былі ключы. Але ён застаўся на вакзале, растварыўся ў люмінісцэнт-

---

* Сувенір, зроблены па традыцыі з нітак белага і чырвонага колеру, які 3 сакавіка ў дзень бабы Марты дораць адзін аднаму і прышпільваюць на адзенне.

ным святле, яго шчокі колеру золку торгаліся ледзь-ледзь, скрыўляліся — праз прызму вільготнай кроплі ў маіх вачах; невядома з якой прычыны на золку ўзыходзіла бледна-зялёнае сонца, з-за чаго тыя, хто праводзіў цягнікі (нямыя рыбы за вагонным шклом), шырока вырачыўшы вочы, блыталіся ў бетонных водарасцях бурых ліхтарняў і адплывалі задам... задам... Толькі падводныя лодкі жалезных цягнікоў паспяхова вырываліся з гэтай прасторы на захад.

Горы ізноў не ратуюць сафіянцаў ад хмар. Ападкі ўзмацняюцца, вяршыні пакрываюцца новым снегам; усю ноч я чую, як абрынаюцца з дрэў вільготныя камякі. Закрытая цемраддзю кутоў, абыякава назіраю за нашэсцем святла, няпрошанае, яно пакрысе адцяняе прадметы: стол, лямпу на ім, два крэслы, банальную карціну (удзень на ёй можна бачыць горы, пакрытыя лесам), голыя ногі, уціснутыя ў цёплыя пашчы пантофляў, худыя доўгія рукі, пакрытыя пупышкамі (іх не бачна)... Бяру руку ў руку, пальцы імгненна сашчэпліваюцца, падымаю іх да твару, чую пах мыла, пах мяккі і несапраўдны, несапраўдны настолькі, што ён не можа сведчыць пра жывую плоць... Стаянне ля вакна знясільвае, апускаюся на кукішкі і, апынуўшыся ў куце, звінаюся ў рэч-мадэрн: пластык, гіпс, мармур, увянчаны міні-канструкцыяй звону, нябачны званар штомоцы разгойдвае гарачы язык. Мая ўпартая спроба дапамагчы яму заканчваецца глухімі ўдарамі; бум-бум-бум... Бунт перапынены, галава цэлая, толькі баліць ад стукання ў шурпатасць сцяны.

Прыйшла бабка-павітуха. «Які сон народзіцца?» — пытаю ў яе. «Многа», — адказвае яна і не ўдакладняе сэнсу. Бабка-павітуха сноў. Яна суцешліва кранае мае валасы і нахіляецца, каб прыкласціся сухімі вуснамі да палаючай шчакі. Ад яе сыходзіць спакой і плённасць. Павольна заплюшчваю вочы...

Гэты чалавек дапамагаў эмігрыраваць многім. Мы пазнаёміліся з ім мінулым летам у Варшаве, ён прыязджаў з нейкай місіяй па лініі ЮНЕСКА. Цяпер ён працаваў у Балгарыі. З таго часу я памятала ягоныя расказы, і адзін з іх — пра недарэчныя ўцёкі Алілуевай, дачкі Сталіна, сведкам якіх ён быў; не прыклаўшы да таго рук, толькі суправаджаў яе ў машыне на прыём да пасла Савецкага Саюза ў Дэлі. Гэта было яшчэ да таго, як Святлана, рабаватая і злосная — з яго слоў — кабета, аднойчы выйшла да веснічак пасольства, каб выклікаць таксі... Ахоўнік амерыканскай рэзідэнцыі смяяўся так доўга, захоплены ўпэўненай версіяй вар'яткі, нібыта родзічкі самога Сталіна, пакуль з ягоных рук не выслізнула на брук зброя; а Святлана Алілуева паспяхова вылецела ў Амерыку пад патранажам спецагента.

Святлана... У мяне таксама ёсць сяброўка, але твар яе гладкі і характар зусім не злы, і яна не марыць пра эміграцыю. Прынамсі, я не чула... Між намі ўсё нерухома. Толькі таму, што мы з ёй па розныя межы, як і з другой прыяцелькай, якая носіць футра з апосума... Ці ляжыць снег дома: там, дзе мёртвая ціша ў пустой кватэры, дзе паўднёвае млявае сонца ў гэтую хвіліну можа быць падобным на бурштын?..

Сведчаннем сур'ёзнасці прапановы і выдатнай магчымасці пераасэнсаваць факты былі дадзены мне некалькі імёнаў маіх суайчыннікаў, якія цяпер жылі па ўсім свеце. У нейкую хвіліну ён меў дачыненне да іх далейшага лёсу; а я ўжо сутыкнулася з ім. Выпадкова. Астатнія мелі імёны і прызнанне; я — толькі ўцёкі, яшчэ ў нікуды. З аднаго пачуцця ўдзячнасці я павінна была пазваніць яму, але таму, што шлях у невядомасць пачынаўся з афіцыйнай паперы, запрашальніка, у які было ўпісана яго імя, я працягвала сядзець, тупавата і ўважліва аглядаючы сцены часовага прыстанку. Калі б уліццё ў свет пачыналася з сонца, падобнага гэтым часам на бурштын, ці з мужчыны з тварам спалоханай рыбіны, ці хаця б з той, што ўзімку насіла футэрка з апосума, мне было б значна лягчэй... Значна. Але пад сонцам ішло звыклае жыццё: галубы рассоўвалі крыламі шэраватае, цяжкае гарадское паветра, няспешліва прабіраліся па знаёмых маршрутах трамваі, а людзі ішлі па справах, не задумваючыся пра Еўропу... Ці ім не дадзены выбар?

Хірамантыя, семантыка, алегарычнасць — бясконца паўтараю складаныя словы толькі для таго, каб заняць розум, прымусіць яго працаваць, пэўніцца, што магу думаць пра нешта іншае... Мая краіна рыхтуецца да афіцыйнага свята. Заўтра, 2 красавіка, павінны падпісаць ДАМОВУ АБ САЮЗЕ ДЗВЮХ ДЗЯРЖАЎ: Расіі і Беларусі. Свята аб'яўлена дзяржаўным яшчэ 5-га сакавіка, 6-га пра гэта напісалі газеты... Нават калі дамову не падпішуць, у святочным календары застанецца яшчэ адна чырвоная дата... Уключаю тэлевізар; мясцовую студыю не цікавіць лёс далёкіх суседзяў; да выпуску навін на першым расійскім канале сорак хвілін. Гэты канал яшчэ працуе, але няспешліва і інтэнсіўна ідзе пераарыентацыя грамадства, да часу канал лічыцца вольным; пакуль на яго адкрыта не прэтэндуюць, але ў нейкі момант на экране могуць з'явіцца замежныя дыктары... Чытаю прэсу, цяжка, са слоўнікам, шукаю тлумачэння сваім думкам, усё ўскосна, no comment...

Па-ранейшаму гуляю ў тыя гадзіны, калі не сяджу ў пакоі. Сабакі мяне прызналі за сваю, з кожным разам падбягаюць шпарчэй, ветліва круцяць хвастамі. Ім не дадзена ведаць, што мяне будзіць іхні брэх; але я не злуюся... Усе чакаюць цяпла, зіма зацягнулася. Дрэвы ў парках покаюць пупышкі, выпускаюць зялёныя лісты,

фарзіцыя набірае жоўты колер. Гандляркі кветкамі ветліва пасміхаюцца.

— Это русская, — гавораць яны, калі я падыходжу выбраць букет. Кветак так шмат, што я губляюся. Яны хваляць тавар.

— *Много хубово*, — адказваю я і выбіраю кволы гіяцынт. Цыганка ў брудным адзенні цягнецца за мной, я хаваю рукі ў кішэні, акуратна прытрымліваючы кветку. Гіяцынт патрабуе волі, ён надта пяшчотны, каб змясціцца ў вузкай прасторы, ён прагне святла.

Я падымаю яго да вачэй, каб палюбавацца. Цыганка застаецца ззаду.

Пачуццё няўпэўненасці. Здаецца, я жыву з ім гады. Але ж гэта смешна. Хто добраахвотна прызнаецца ў слабасцях?.. Часам я забываюся на яго, заводжу знаёмствы (як тады, у Варшаве), але ў адну хвіліну пачуццё вяртаецца, і мне больш нічога не застаецца, як клясьці сваю слабасць і прыналежнасць да жаночага полу. Мужчыны ў маіх вачах не выклікаюць даверу, але жанчыны пазначаны яшчэ горшымі якасцямі... У ролі мужчыны маё жыццё было б іншым: канцэнтраваным, з адказнасцю перад грамадствам... Я не ўмею здымаць цяжар расчараванняў, у хвіліны няўпэўненасці дазваляю рабіць гэта іншым. Мяне ж пачынаюць лічыць ненадзейнай, пустой і фанабэрыстай. Супраціўленне бессэнсоўнае: кожны жыве сваім.

Маё рашэнне быць да канца самастойнай не вытрымлівае крытыкі; у гатэлі на стале ляжыць запрашальнік. Вайна не аб'яўлена, можна атрымліваць насалоду ў час перамір'я, калі настойлівым з'яўляецца толькі голас голаду. На маім шляху адкрывае дзверы кітайскі рэстаранчык. Раскіданыя па ўсім свеце, яны здабылі славу ўменнем падслухоўваць нязмушаныя размовы палітыкаў і дыпламатаў... У мяне няма суразмоўцы. Заказваю ежу, не ўпэўненая: што давядзецца пакаштаваць. Прыносяць бамбук і грыбы, смак дрэва і соі... Супакойваюся. Кілішак ракіі, ён апякае, але дае цеплыню. Хочацца напіцца, але гэта ўжо прывілея мужчын.

Краіна, якая на працягу сямі апошніх гадоў намагаецца пазбыцца расійскай мовы, спакойна заяўляе пра набліжэнне голаду... Рускі Культурны цэнтр прымае знаёмых наведнікаў; я прыхадзень, але мне ніхто не здзіўляецца. Дырэктарка бібліятэкі, расчуленая маім выглядам, давярае мне кнігі са свайго кабінета; літаратура, што стаіць у агульнай зале, мяне не цікавіць, але «спісаць» кнігі ніхто не спяшаецца, імі карыстаюцца як і даўней; пратэставаць няма каму, хаця рускі літаратурны працэс тут амаль не назіраецца. *Довольствоваться малым* набывае прыкметы нацыянальнай прыналежнасці... Я гляджу на гадзіннік, чым перапыняю гаваркую

дырэктарку, развітваюся, але паспяваю прыняць запрашэнне на мерапрыемства — вечарыну, якая адбудзецца праз два дні.

— Приходите, — гаворыць яна, — вам будет интересно!

У мяне няма часу.

Яе час таксама абмежаваны.

— Мы ждем новые книги. Они должны скоро прийти. Вы еще вернетесь?

Яна не разумее сваёй зацікаўленасці, і таму яе прапанова вяртацца гучыць шчыра.

— Да, я обязательно приду, — упэўнена адказваю і насоўваю пальчатку на правую руку: мне давядзецца ўзяцца за жалезную ручку дзвярэй.

Манеўр з пальчаткай не заўжды абараняе ад статычнага разраду, але гэтым разам шэнціць.

— Валодзя! — крычу я і кідаюся праз клумбы і бетонныя агароджы, каб перахапіць мужчыну, апранутага, у адрозненні ад усіх, хто адпачывае, у чорныя джынсы і цёмны летнік. Ягоны — толькі што, імгненны прыезд выдаваў парасон, які ён збіраўся шпурнуць у траву; я заўважыла гэты рух і кінулася насустрач...

Мае ўцёкі не былі прычынай. Я з'ехала на два тыдні ў Палангу: мора, сосны, бурштын, кава на тэрасах... Мой ліст яшчэ быў у дарозе, а ён не хацеў чакаць і прыехаў сам. Як ён збіраўся мяне шукаць? Я зняла пакой у чыстым і ўтульным доме (вакол было шмат падобных прыватных дамоў) і зараз, невядома з якой прычыны, пацягнулася не на пляж, а ў бок аўтавакзала; іншага вакзала тут не было. Абцасы гучна стукалі па бетонных плітах, але вакол тупацелі дзеці, сінхроннасць і рытм гукаў не парушыліся; нечаканая сустрэча набыла будзённасць. Хіба магло быць іначай? Толькі ў згадках такія сітуацыі набываюць меладраматызм; у згадках, падмацаваных даўно прамінулым часам, яны атрымліваюць новае хваляванне і сэнс. Каханне памерла? Vivat!.. У маім пакойчыку на другім паверсе пахла свежаю шалёўкаю і нагрэтай смалой, за тонкай перагародкай корпаліся суседзі, такія ж аматары летняга адпачынку; мы знялі покрыва з ложка і паслалі яго на падлогу...

Я павінна была з'ехаць.

Ён не даваў мне шанцу.

Мы абое пакутвалі. Хаця прагна і беспадстаўна прыхоўвалі першапрычыну. Ці зразумела б я, калі б ён сказаў, што хоча кінуць мяне, каб пабачыць свет? Мы перасталі разумець адно аднаго.

Я не магла так доўга не званіць яму. Аднойчы наш агульны знаёмы прызнаўся, што бачыць у маіх адносінах з мужам адносіны труса і ўдава; ведаць, што я кахаю яго, было яму мала; але ён не

хацеў зразумець сваёй адказнасці за мяне. Рана ці позна павінна была наступіць адплата, і я была вінаватая не ў меншай ступені, чым ён. Бог пакуль не даваў яму шанцу прайсці праз духоўную здраду. І хаця я на самой справе была ўпэўненая ў пачуццях, часам мае прызнанні «кахаю цябе» былі змушанымі. Я адчула гэта, упарта вышукваючы прычыны не падыходзіць да тэлефона...

— Працэс закончаны, — аб'яўляе суддзя, у зале ўзнікае радасны шэпт, на задніх радах устаюць людзі. Усё. Можна ісці; але ж я шчэ не ведаю прысуду; занятая сваімі думкамі, я прапусціла самае галоўнае ў сённяшнім працэсе... Хто быў маім адвакатам, і ў чым палягала абвінавачванне? Каб атрымаць адказ, я паварочваюся на сваім месцы і пільна ўглядаюся ў таго, хто сядзіць побач. Мой погляд выхоплівае яго з дрымоты, дзве зморшчаныя далонькі, пакладзеныя крыж-накрыж на кіёчак, на выгляд, бамбукавы, пачынаюць трусіцца; кіёчак, заціснуты паміж старэчых каленяў, губляе раўнавагу і выслізгвае. Нахіляюся і прашу прабачэння. Нашы рукі сутыкаюцца ў паветры, да прадмета нашых намаганняў сантыметраў дваццаць. Спрабую выглядаць нязмушанай, але даверу не ўзнікае, стары марудна прыўздымаецца з лаўкі. Я раблю гэта хутчэй і шырокім крокам кіруюся прэч. На выхадзе з парку азіраюся: голы куст бэзу, пажылы мужчына ў сонечнай пляме, ён праводзіў мяне поглядам... Прыснуць у такі час занадта рызыкоўна, вакол яшчэ не растаў снег, сонечныя плямы прытульваюць старых падманнай цеплынёй. Калі б я не апынулася побач, ці змерз бы ён, незнаёмы аматар спаць навідавоку, выпускаючы сліну на падбароддзе, самотны верабей сафійскіх паркаў? Хоцькі-няхоцькі, а ён павінен адчуваць удзячнасць... На дварэ плюс чатыры. У такое надвор'е ніхто не мае шанцу беспакарана замерзнуць, але мне хочацца крохкага пачуцця перамогі... У той момант, калі абедзьве мае рукі занятыя цыгарэтай і запальнічкай, уздрыгваю ад нечаканага:

— Олга!

За маёй спіной стаіць Асен, я адчуваю гэта, але не паварочваюся; зала апусцела, а я не ведаю прысуду.

— *Как сте*? Как вы? — папраўляецца ён, і я працягваю яму руку, у якой перад тым трымала запальнічку.

— Ужо добра.

Ён не разумее падтэксту «ўжо», проста рады сустрэчы. Ён не адважваецца запрасіць мяне ў кавярню, і я раблю гэта за яго. Нас прымае «Лазана», утульная сладкарніца, пластыкавая ручка на ўваходзе, пластыкавыя сталы, папяльніцы, тут лёгка пачувацца нязмушанай. Выдатная кава, але я палю цыгарэту за цыгарэтай, хаця дыхаць і так цяжка; кожны наведнік лічыць сваім абавязкам паліць гэтаксама шмат, як і я... У горадзе поўна жанчын, якія ку-

раць; напачатку гэта здзіўляла, цяпер мы на роўных... Размаўляем. Паступова авалодвае меланхолія, я не ведаю, як пазбегнуць яе, пакуль суразмоўца не палічыў мяне няўважлівай; ратуе ўсмешка, на жаль, штучная. Забываюся, што здраджваюць вочы, іх выраз досыць яскрава сведчыць пра абыякавасць... Асен намагаецца перахапіць мой погляд, што нарэшце з цяжкасцю яму ўдаецца. Збянтэжанасць... Колькі я прабуду тут? Дзе, у «Лазане»? Я гатовая падняцца і сысці, але па-ранейшаму працягваю сядзець. Магчыма, прабуду да лета, ніхто не ведае пра тое, нават я сама. Пара расплаціцца, але мы не спяшаемся саступіць гэтую ролю адно аднаму.

Ён мой каханак, той, стары, якога мне аднойчы давялося пабачыць у парку. Яму патрэбная нянька, а я як найлепей падышла на гэтую ролю. У яго вялікая кватэра, два ўзроўні, карціны і кнігі, абавязкова... Я там жыву. Але калі мяне папрасілі — проста так (у нейкай размове я нахвальвала жытло: усходнія статуэткі, гадзіннікі незвычайных канструкцый, рэдкія выданні на рэдкіх мовах) — папрасілі азначыць пралёты, размяшчэнне пакояў, — я сумелася, і не змагла ўявіць, якой была тая кватэра... Па сутнасці, я заставалася шчаслівая там. Ці не з таго, што пакідала на пыльным глянцы прадметаў адбіткі пальцаў?..

Мне перасталі верыць. У адказ я пакінула давяраць усім, каго запрасіла. Госці жадалі музыкі, якая б падкрэсліла інтымнасць. «Яўрэйскія песні з лагера Аўшвіц» напапохалі б іх больш, чым немагчымасць уявіць кватэру, дзе прайшла частка майго жыцця. У нейкі момант я ўсвядоміла, што са мной не цырымоняцца, ніхто не патрабуе паўтарыць гісторыю прыгод; госці разняволіліся настолькі, што смела корпаліся ў маёй калекцыі дыскаў... Я хацела прынесці фотаздымкі, але зручны для гэтага час мінуў. Заставалася хадзіць паўз іх на дыбачках, каб незнарок не патрывожыць прысутнасцю... Гэта самая мілая краіна, дзе даводзіцца існаваць, бо толькі ў першую хвіліну цябе раўнуюць да ўспамінаў. Потым усё забываецца, і ты можаш стаяць на кухні, калоць лёд, але ціха, акуратна, зацiснуўшы тронак нажа сухім ручніком: у вялікім пакоі танчаць парачкі. Лёд узрываецца, вялікі кавалак выслізгвае з няўлежнага месца і падае на падлогу. Нехта з тых, разняволеных пяшчотай, хто застаўся ў танцы, уздрыгвае, каб мацней прыціснуцца да партнёра. Гэта жанчына. Яе блакітныя вочы з вільгаццю фіялкавых ранкаў прымружаны, нібыта яна рыхтуецца да пацалунка. І усё-ткі факт застаецца фактам, з-за няўважлівасці я выйду з кухні з нажом у руцэ (ручнік не прыкрывае лязо), але з'яўленне нікога не напалохае. Госці не звернуць увагі... Я хаджу на дыбачках, у цёплых шкарпэтках; іх мяккая цеплыня нагадвае мне пра сафійскі снег.

— Хто гэта? — спытае незацікаўлены госць, які прыйшоў на кухню дапамагчы зрабіць кактэйлі. Я сяджу за сталом перад пус-

тымі келіхамі, занятая здымкамі: жанчына ля каменных калон, якія нічым не выдаюць прыналежнасць да пэўнай цывілізацыі; група людзей ля царквы святой Петкі Самарджыйскай (жанчыну накрыў цень, царква хаваецца ў яміне падземнага пераходу); тая ж асоба ля кніг з іерогліфамі на вокладках. Іерогліфы зацёртыя часам, трэба мець лупу, каб убачыць іх...

— Олга, — абыякава адказваю я.

Госць разумее, што ў нейкі момант мы былі з ёй блізкімі. Ён пачынае верыць у гісторыю з нянькай, але не хоча абцяжарваць сябе развагамі. Нашто, калі можна прыціснуць блакітнавокую сяброўку і паблажліва пачувацца абаронцам?.. Олга не ўмее фліртаваць, чаго добрага пакрыўдзіцца, калі ён дазволіць сабе нявінны жарт.

Мы выйшлі з «Лазаны», дзе прабавілі паўтары гадзіны. Ягоны намер пабачыцца ўвечары ўсё яшчэ заставаўся прапановай; бледны гіяцынт, пакінуты на стале, так і не дазнаўся адказу. Тым не менш я ўзяла Асена пад руку, нібыта наша сустрэча была абгаворана зараней, паміж дзвюма паліцамі ў цягніку. Жанчына з трамвая ўважліва паглядзела ў наш бок. Жонка? Мой твар застаўся спакойным. Хацелася падняць руку і памахаць ёй. Трамвай прайшоў, каб спыніцца непадалёк. Выйшлі людзі, пяць ці шэсць, жанчына засталася... Мінуў поўдзень... Асен стаяў і працягваў запальнічку незнаёмаму хлопцу, які абагнаў нас, каб папрасіць агню. Мая рука ўсё яшчэ трымае яго за локаць, хаця я адчуваю жаданне прыбраць раўнадушна-чэпкія пальцы... Нечакана Асен змірыўся з бессэнсоўнасцю сітуацыі і, ідучы, працягваў разглядваць пыл на нашых ботах. Я згадваю прапанову: ён хацеў паказаць мне работы свайго сябра, выстаўленыя гэтымі днямі ў галерэі. Яшчэ ёсць час, але мы падбіраемся да вуліцы Лайаша Кошута, дзе, па сутнасці, і размешчана галерэя. Я не магу паверыць адразу, бо бачу магазінчык моднага адзення, але дом цягнецца ўглыб, за фасадам з шырокімі вітрынамі, застаўленымі манекенамі ў еўрапейскім адзенні, калі мінуць дзверы, ёсць дворык з дрэўцамі пад шкляным дахам. Магазін і галерэя суседнічаюць... З большай ахвотай я б стаяла зараз у кабінцы за сіняй шторай і назірала, як маладая кабета падладжвае на мне самашытую сукню. Адышоўшыся ўбок, кабета плясне ў ладкі і пабяжыць, каб праз імгненне прынесці вузкі шалік. Колеры супадуць, і мне давядзецца падумаць, перш чым апрануць старое адзенне...

Нас прадстаўляюць гасцям, хаця мой спадарожнік амаль усіх ведае ў твар.

— Это мой друг Асен и его любовница, — з лёгкім акцэнтам аб'яўляе гаспадар. Колькі гадоў таму ён вучыўся ў Маскве і захаваў любоў да многіх рускіх слоў. Фраза гучыць па-руску з-за па-

вагі да мяне. Я не бянтэжуся, анікалькі; у Мінску ў мяне таксама ёсць сяброўка, якая трымае галерэю, я ўжо ведаю, што рабіць, каб заставацца па-за ўвагай. Бяру келіх з мінеральнай вадой. Не так лёгка быць адной з іх... Асен стаіць, акружаны купкай знаёмых, яго пастава выдае палёгку, зрэдку ён кідае погляды ў мой бок. Пад намі не грукаюць колы, што, відочна, выводзіць нас з раўнавагі... З магазінчыка выходзяць апошнія пакупнікі, усе з пустымі рукамі; ніхто з іх не завітвае ў галерэю. Святло ў вітрынах патухла, кабета-мадэльер-прадавачка зачыняе дзверы на ключ і падымаецца па сходцах на другі паверх. Яна — былая жонка мастака, які ацаніў свае работы на дзвесце-трыста даляраў (я паспяваю вывучыць каляровыя ўклейкі пад кожнай карцінай, пакуль Асен трымае высокую шклянку ў атачэнні незнаёмых мне людзей), яе бацька вядомы архітэктар, які спраектаваў дом, дзе суіснуюць былыя сужэнцы... Мне радасна думаць пра іх адносіны, уяўляць, як кабета спускаецца ноччу ў галерэю, працягвае натыкацца на халодныя сцены, і плача... ледзь чутна... У яе знаёмы тэмбр голасу; я чула яго неаднойчы. На шкляны дах апускаецца ранак і шэрыя галубы. Бледны анёлак аднойчы таксама наведаўся, каб струсіць снег са стомленых крылцаў; боская істота шукала спакою і ціхамірнасці, але засяродзілася на перажываннях жанчыны... Кароткі дыялог: анёлак зляцеў, галерэя апусцела... Што іх чакала ў будучым: мастака і мадэльерку? Паўтор трагедыі?

Гэтая думка выклікала ўва мне спачуванне.

Галерэю зачынілі а дзесятай.

Навіны былі несуцешлівыя; яна пазваніла, каб сказаць, што прыехала, што ўжо тут. На другім канцы провада не выказалі здзіўлення, як, зрэшты, і радасці. Дамовіліся на сустрэчу ў сладкарніцы «Моцарт» (яна досыць добра вывучыла цэнтральную частку горада). Ён з'явіўся, калі на талерцы перад ёй заставаўся кавалак амлету (адзін долар за порцыю); яна не ведала, што з ім рабіць, і ў адну хвіліну паспрабавала праглынуць, але давялося вітацца з поўным ротам. Ёй не хацелася, каб яе прынялі за жабрачку... Азіраюся, нібыта не мела часу вывучыць інтэр'ер; на белых сценах вісяць карціны: Big Ben, Эйфелевая Вежа, безыменны канал у Венецыі, усё — у пастэльных тонах; яркія плямы — я і спадар за маім столікам. Дождж за вакном. Дзень, калі не думаеш пра вяртанне... Ён цікавіцца: што я рабіла так доўга пасля прыезду, намагаюся дапамагчы яму зняць сумненні, але да канца размовы застаюся няўпэўненай, што намаганні дасягаюць мэты. Апісваю дзень за днём, блытаюся ў датах, пераскокваю з адных успамінаў на іншыя. Ён хоча сысці?.. Замаўкаю, але вочы выдаюць ягоную цікаўнасць, і, натхнёная, з новай сілай апавядаю пра бяссонне ў

пустым нумары гатэля, не забыўшыся на сабак і іх прыязнасць. Мой знаёмы забірае мяне з сабой; мы едзем машынай у зваротным парадку: *Александър Стамболийски, Витоша, Стефан Караджа, Драган Цанков*, гатэль, парк (у якім мне падабаецца гуляць раніцамі), заварочваем у вузкі завулак, каб спыніцца ў незнаёмым месцы. Я ўпершыню бачу ягоны дом, кватэру, зусім не падобную на тую, дзе жыве стары з бамбукавым кіёчкам і іерогліфамі на вокладках пыльных кніг. Даведваюся, што ён жанаты. Гэта для мяне адкрыццё. Атрымліваю дазвол запаліць цыгарэту, але на кухні... Яны разышліся дваццаць гадоў таму, я не ведаю прычын, і жанчына на фотаздымку не дае мне ніякай зачэпкі. Адчуваецца, што яму прыемна расказваць пра дзвюх дарослых дачок, якія гадуюць сваіх дзяцей (не збіраючыся пры гэтым нікуды ад'язджаць). Ён гаворыць пра іх з такой цеплынёй, што нішто не можа пахіснуць маю ўпэўненасць: ён жанаты! І тым не менш аднойчы я здраджваю яму, калі набіраю нумар хатняга тэлефона. Мне адказвае мужчынскі голас...

Звыкла, хутчэй для сябе, чым для мяне, ён уключае тэлевізар: апошні выпуск навін. Час, адведзены на абед, закончыўся, яму трэба ісці, але ён затрымліваецца ненадоўга. У тыя хвіліны, калі мы сядзелі ў кавярні, у Крамлі адбылося падпісанне дамовы аб Саюзе дзвюх дзяржаў.

— Гэта адказ на пашырэнне НАТА, — каменціруе прысутны (ён заўважае слёзы ў маіх вачах).

— Гэта не можа з'яўляцца адказам на пашырэнне НАТА, — перабівае яго прадстаўнік дзяржДэпартамента ЗША...

Я веру таму, хто побач; ён ведае правілы палітычных гульняў.

...Увечары я назіраю, як у ягоным чайніку закіпае вада; дастаю два кубкі і акуратна стаўлю на стол.

— НАТА не можа прызнаць свае памылкі, ім не трэба было пашырацца на Усход.

— Чаму? Беларусь не ўяўляла для іх небяспекі.

— Пакуль заставалася незалежнай. У Эльцына (ён так і сказаў: «Эльцын», як той афіцыянт, з якім я пазнаёмілася), у Ельцына, — папраўляецца ён, — ёсць на руках толькі адна карта супраць праграмы пашырэння... Усё гэта ўяўляе небяспеку.

— А калі Украіна захоча ўступіць у НАТА?

Ён зірнуў на мяне з цеплынёй, так, як бацькі глядзяць на дзяцей, калі хочуць ухваліць іхнія ўчынкі.

— Цалкам верагодна... Процідзеянне ў выніку можа прывесці да трэцяй сусветнай вайны.

За вакном пачуўся перазвон, я не магла ведаць дакладна, як называлася царква. Навошта? Дзіўна было назіраць у святле таршэра, як рухаецца гаспадар кватэры: шукае акуляры, каб прачытаць ксеракопію нейкай паперы (службовая запіска ці расклад пе-

радач расійскага тэлебачання?), перакладае газеты («*Стандарт*», «*24 часа*», «Дума»)... Я сачу за ім, прымружыўшы вочы. Ён азіраецца, яму ў галаву прыходзіць думка, што я сплю, утульна ўладкаваўшыся ў крэсле, адкінуўшы галаву. Ён набліжаецца і нечакана для сябе праводзіць рукой па маім ілбе; гэта палохае яго, але ў пакоі няма верхняга святла; у той момант, калі ён падыходзіў, я сапраўды заплюшчыла вочы, а сведкаў больш няма, калі не ўлічваць жанчыну на фотаздымку.

Упершыню за апошнія дні я ні пра што не думала, дазволіўшы прымаць рашэнні іншаму чалавеку. У чужой кватэры мною авалодаў сон...

Тое няпраўда, што я здрадзіла яму аднойчы... Яго яшчэ не існавала побач, а я ўжо прыдумала яму пасаду і знешнасць; нашы адносіны не былі адносінамі блізкіх людзей: ён хацеў займець у маёй асобе жонку, але найперш сяброўку, афармленую афіцыйна за жонку. Ён быў дыпламатам высокага рангу, у гадах, нізкарослы, з німбам пуху на голым чэрапе, з разумнымі вачыма. Едучы ў грамадскім транспарце на работу, я сустракалася з ім позіркам; старасць надавала мужчынам агульныя рысы. І калі мне ўдавалася пазнаць яго — я пачынала прыглядацца, асабліва ў тыя моманты, калі вакол было няшмат людзей, ніводнага разу чалавек з такімі вачыма не адчуў збянтэжанасці. Асобныя рысы знітаваліся ў вобраз, і мне ўжо не трэба было хлусіць, калі давялося расказаць пра нашыя з ім адносіны.

Мужчына, які прыехаў да мяне ў Палангу, бо не змог прымусіць сябе дачакацца хоць нейкай вестачкі, больш не хацеў залежнасці. Ён пазнаёміўся з дзяўчынай, маладзейшай за яго на шаснаццаць гадоў, і перастаў адказваць на званкі. Я заставалася спакойнай да таго вечара, калі, натхнёная злосцю, прысела за столік на рагу Скарыны і Захарава: непадалёк засталіся дзверы, праз якія ён праходзіў на работу. Шоргат шын вакол плошчы, галасы шматлікіх людзей: і тых, што пераходзілі вуліцу, і тых, што, як я, сядзелі за столікамі, і буркатанне заўсёдных галубоў, і прысутнасць кавы ў пластыкавым кубачку, — не маглі паўплываць на рашэнне застацца надоўга.

Між тым пачало змяркацца, рабілася халаднавата, наведнікі змяняліся: на месцы гаманлівай моладзі з'явіўся паважны грамадзянін у акулярах, дзве размаляваныя маладзіцы саступілі месца п'янаватым хлопцам... а дзверы так і не адчыняліся, хаця я дакладна ведала, што ЯНЫ там...

Неверагодна, але кабета з бібліятэкі палічыла сваім абавязкам запрасіць мяне выступіць на вечарыне, прысвечанай Бэле Ахмаду-

лінай. Чым я выклікала яе давер, застаецца загадкай і сёння. Магчыма, яна адчула ўва мне трагічнасць, прыкмету славянскіх паэтак. Я не змагла ёй адмовіць...

Праз два дні нашай першай сустрэчы я сядзела ў зале Рускага Культурнага Цэнтра, дзе сабраліся балгарскія пісьменнікі, каб згадаць пра недарэчную — як заўжды ў такіх выпадках, — смерць рускага паэта Уладзіміра Сакалова; саракавіны таксама славянскі звычай. У мяне не знайшлося неадкладных спраў, інакш наўрад ці я трапіла б сюды. Усе гаварылі па-балгарску, толькі вершы і два рамансы прагучалі па-руску, на той мове, якая сведчыць пра належнасць да іншай моўнай культуры...

— Вам понравилось? — спыталася дырэктарка бібліятэкі, калі я шчыра прызналася, што здзіўлена і кранута іх жаданнем казаць пра чужога паэта. — Он умер в Софии («у Софьі», — сказала яна, з націскам на першым складзе, выдаўшы тым самым аднесенасць да тутэйшых), его вторая жена была отсюда. Ах, как жаль! Мы все знали его... дружили...

— Вряд ли в Москве сегодня почтили его память.

— Да, вряд ли, — згадзілася яна.

— Я тоже буду знаменитой...

Яна не выказала сумненняў і правяла мяне да выхаду.

Мяне заўважаюць: маладзён, саўдзельнік мясцовай эліты, аўтар палітычнага раману, у якім улада прадбачліва аддаецца «сінім»*; сціплы ўладальнік тэкстыльнай імперыі, былы міністр лёгкай прамысловасці краіны, даўні сябра Андрэя Луканава**, апантаны аматар жаночага полу (на ягоных фабрыках цяпер гаспадараць «сінія», што ўплывае на адносіны з жанчынамі); самотна-расчараваны мастак, жонка якога любіць плакаць начамі; сябра, які ўключае для мяне выпускі апошніх навін; стары з кіёчкам; юнак, якому спатрэбіўся агонь, калі я ішла з іншым... версіі множацца... я застаюся безудзельнай, бязмэтна туляюся ад будынка да будынка, блукаю між ліхтарняў, вымушаючы ўвесь картэж кіравацца крывымі лініямі, густа пракладзенымі чырвоным фламастэрам на папяровай карце Сафіі.

...Я назвала яго Разумнікам за тое, што ён ведаў больш, чым я патрабавала.

— Раскажы пра сябе ўсё, і пачні з дзяцінства.

Я клалася побач, каб пачаць узгадваць, і пакуль ён падымаўся, каб прынесці мне кубак з гарбатай («як смачна»; «бергамотавы

---

* Партыя, якая другі раз атрымала ўладу ў Балгарыі напачатку 1997 г.

** Вядомы балгарскі палітычны дзеяч, загінуў 2 кастрычніка 1996 г.

чай»...), я паспявала правесці класіфікацыю: што трэба ведаць, што можна, а што — недарэчы... Яго заўжды цікавіла тое, што недарэчы. Падобна, астатняе ён ведаў сам... Цнатліва ляжым гадзінамі (можа, яму трэба хлопчыкі?); Разумнік задаваў тон размовам, так што напрыканцы лёгка забывалася, што я паспела распавесці. Ці падазраваў ён пра існаванне мужчыны ў традыцыйна цёмным адзенні (з моманту майго ад'езду ён насіў толькі чорнае), які на маё «не» прымчаўся на вакзал: я бачыла, як ён выходзіць з таксі, горкае разуменне саўдзелу ў здрадзе...

— Разумееш, — мы перайшлі на «ты», — мне цяжка рашыцца...

Яго забаўляла эксцэнтрычнасць і непаслядоўнасць, уласцівыя той, што любіла ўцёкі, не разважючы пра наступствы: у коле ягоных зносін шал адсутны цалкам; на ланчах і кактэйлях кажуць кампліменты, але не заносяць іх у службовыя паперы: машыністкі перадрукоўваюць сухія размовы, у якіх толькі чыноўнікі бачаць прыхаваны сэнс; тым не менш «дакладныя» ўплываюць на развіццё міжнародных адносін.

Разумнік пачаў мне званіць, каб ставіць перад фактамі: у тры гадзіны ланч... паніхіда... сустрэча... нібыта штосьці змянілася паміж намі, і цяпер я патрабую: «Прызнайся ў чым-небудзь!» Па магчымасці ён водзіць мяне за сабой: мы ў гасцях, мы ў тэатры, у гарах, у балканскіх тунэлях... Ён глядзіць на будучае адназначна: яму трэба жонка, сяброўка, аформленая за жонку... У нейкі дзень жанчына з фотаздымка апынулася ў альбоме; яна пратэстуе, але ўжо не бачыць маёй салідарнасці: не ў маіх звычках корпацца ў чужых рэчах; суцяшаюся тым, што цяпер яна можа назіраць забаўкі ўнукаў: альбом захавае іхні час на памежжы мінулага.

Збіраю немудрагелісты скарб, каб ля нейкай брамкі спыніць машыну з шашачкамі (*О'К СУПЕРТРАНС*), — у гатэль! хутчэй!.. Дворнік з рыдлёўкай усё яшчэ саскрабае снег пад маім балконам. Драўляная рыдлёўка падае ў момант, калі таксі спыняецца ля ўвахода.

Я бягу.

Мая паспешлівасць апраўданая.

Я бягу.

Валодзя сядзіць ля тэлефона і чакае майго званка. Я амаль упэўнена ў гэтым. Тым не менш на званок ніхто не адказвае. Іду ў душ, каб скараціць чаканне... Цяпер звоняць мне. Не падыходжу: што можа рабіць жанчына ў нумары ў гэты час? Як толькі апарат супакойваецца, здымаю трубку... на тым канцы праваду, праз тры граніцы, ёсць нехта, каму неабходна пачуць мой голас. Плачу...

— Я прыеду. Я пастаўлю ўсё з ног на галаву, але знайду цябе...

Голас, які заўжды мяне палохае, у якім я адчуваю пагрозу, хаця мужчына размаўляе спакойна, нават пяшчотна. Прычыны майго

жаху тоящца глыбока; няможна ўявіць шпацыр у лес без яго (чаму менавіта ў лес — не ведаю, хаця магу паіранізаваць: «земную жизнь пройдя до половины, я заблудился в сумрачном лесу»); лес ці яшчэ лепей дуброва бачыцца мне ўлетку, з ветрыкам за спіной — дзе луг і малады сасоннік, я іду з кіем, як заўзяты грыбнік, але багацці айчыннай прыроды ў гэты момант мяне не цікавяць... птушкі пералятаюць з дрэва на дрэва, спалохана прашамаціць пад нагамі нябачная істота... заглыбляюся, але так, каб адчуваць вецер; мая дарога не мае канца, яна заўжды паварочвае і выводзіць назад.

...Мы так і не навучымся жыць паасобку.

Рэч у тым, што жанчына да таго, як зрабіцца Олгай, маніякальна любіць уцёкі. Гэты талент незаўважны, але той, хто кахае, ні з чога ні з якога пачынае адзнаначацца паводзінамі раўніўца: не дазваляе званіць у яго адсутнасць, стрымгалоў бяжыць следам, калі ў выхадны яна збіраецца ў магазін ці да сяброўкі... А ў момант, калі яна апраўдана ў ягоных вачах і атрымлівае нарэшце права быць сабой, жанчына сядае ў цягнік, каб у той самы дзень паспець прамінуць граніцу.

...Авечка, выпушчаная на волю; праз тыдзень яе брудны, спарахнелы хлеў падасца ёй раем. І яна пачне кідацца ў пошуках пастуха, шчаслівая толькі з таго, што далёка... недзе... яе могуць чакаць... і, можа, дазволяць вярнуцца, далучыцца да статку. Славянская душа не складаная, яна бяспечная, яе бунтоўная сутнасць не што іншае, як прыдумка прыгнечаных істот.

Сёння я ўпэўнена, што мне трэба застацца.

Ад мяне чакаюць пачуццяў, якіх быць не можа.

Я ведаю толькі адно: пачуццё бліжання ночы; яно не можа суцешыць нікога. Якімі брыдкімі здаюцца мужчыны, калі яны хочуць ведаць праўду... *ну, прызнайся, прызнайся ў чым-небудзь*... пакуль дзяўчо, маладзейшае на шаснаццаць гадоў, раскажа жаласлівую байку пра гвалтоўную блізкасць з першым мужчынам; і таму, што крыўдзіцель не ты, можна ўвайсці ў давер, стаць крыху героем, абаронцам цудоўнай паловы чалавецтва (такой бяды, што аднойчы дзяўчына дазнаецца моц тваёй поўхі; яна ўжо цябе палюбіць...).

Олга?

Я не бачу прычын, з якіх нас могуць прызнаць падобнымі; яна застаецца ў парку, з заплюшчанымі вачыма, а не выходзіць замуж за старычыну: пасля вянчання ён дорыць ёй бамбукавы кіёчак, новы, без адзінай драпінкі, з бліскучым паліраваным вяршком. Аматар усходніх традыцый нічога не ведае пра яе жаданне мець самурайскі меч, якім робяць харакіры... Мігценне агеньчыкаў царкоўных свечак узбуджае яго, яго пальцы ў той момант, калі яна

працягвае руку, набываюць пругкасць, ён адчувае раптоўную насцярожанасць з яе боку і паступова вяртае дрыготку ў старэчае цела. Яна прызнае свае хібы: легкаважнасць, няўважлівасць і шэптам просіць прабачэння; гэта няцяжка; дрыготкі палец ніяк не можа патрапіць у пярсцёнак; абодва шчаслівыя...

Я працягваю назіраць за імі збоку, не парушаючы гармоніі, але ў нейкі момант яны пачынаюць рабіць усё хутчэй, чым таго патрабуе абрад. Мне весела, я смяюся ў царкве, прысутныя пагрозліва азіраюцца...

— Выведите ее! (У рускай царкве гавораць па-руску.)

Выходжу...

Я прывыкла бачыць на вуліцах гандлярак семкамі, а тут на кожным кроку гандлююць кветкамі. Раблю паралель: на колькі букетаў хопіць маёй зарплаты дома, атрымліваецца зусім няшмат. Адчайна абвяргаю спакуслівае жаданне даведацца назву наступнай раскошлівай кветкі: прэтэндэнты на месца прыхільнікаў адной звар'яцелай служыцелькі рампы адсутнічаюць. Хто з іх бачыў мяне на падмостках?

Маё «ego» вартае любові аўдыторый: чуць мяне лічыцца за шчасце, бачыць зблізку — за гонар. У грымёрцы штодня з'яўляюцца новыя кветкі. Мой сябар — стары з пляшывай галавой, падразае слабыя галінкі, сашчыквае скручаныя лісткі і змятае пялёсткі ў ярка-жоўты пластмасавы савок. Ён носіць чорныя акуляры, павязка на рукаве пінжака і яго заўсёдная наяўнасць выдаюць на тое, што мой сябра сляпы, сляпы ўжо некалькі гадоў (з таго часу, як мы пазнаёміліся); мала хто з маіх блізкіх ведае, як яго завуць, але калі мы застаёмся ў грымёрцы сам-насам, ён чуе сваё імя, моўленае ўслых: Гантэнбайн*; яму падабаецца, як яно гучыць, і я звяртаюся проста так, без справы...

...Хлопчык пасярэдзіне плошчы, галубы злятаюцца на яго рукі; маё дзянінства не такое даверлівае. На вуліцы Лайаш Кошут за расчыненымі веснічкамі знаходзіцца рэтра-кавярня «Стары фаэтон», там папраўдзе і стаіць яго гістарычны арыгінал; здымак на памяць; пісьменнік няцвёрдым крокам сунецца па брукаванцы: у кавярні зачакаліся прыяцелі, адзін з іх — даведваюся дакладна, бо ён называе імёны, — мае знаёмых у Мінску, завязваецца размова... Ён можа прыехаць, але ні адна кавярня не звяжа нас выпадковай сустрэчай: бо ў мінскіх пісьменнікаў няма сталага месца спаткання. Набываю хранічны вопыт гультайства; разбэшчанасць свабоды... атрымліваю на памяць кніжачкі з аўтографамі; адсутнасць галосных абачліва заменена белымі вершамі, што выдаецца за

---

* Герой рамана М. Фрыша «Назаву сябе Гантэнбайн».

наватарства і еўрапейскі стыль. Мае мінчукі таксама любяць эксперыменты... Прахалода вымушае хаваць рукі ў кішэні, кніжкі знаходзяць месца ў сумцы, якая абцяжарвае левае плячо (за правым ніхто не стаіць; усумніўшыся — азіраюся). Чыноўнікі з беларускага пасольства завяршылі працоўны будзень; пасля просьбы прадставіць імёны літаратараў для тоўстага альманаха, які выйдзе праз некалькі месяцаў, яны падалі спіс добранадзейных аўтараў (ці ёсць там імёны тых, каго прыгадалі ў кавярні «Стары фаэтон»? мне няма да гэтага ніякага клопату), але збянтэжанасць, калі я праходжу ля будынка, дзе часова ўладарыць былы сталічны мэр, узрастае, а разам з ёй узрастае маё шкадаванне, што Эзоп ужо жыў і паспеў напісаць байку пра Фетыш, якому пакланяліся жабы... O tempora, o mores!

Надвор'е застаецца нетыповым для Балгарыі; я, сведка халоднай вясны, радуюся, калі чую па тэлевізары, што ў Мінску на два градусы вышэй. Навіны паведамляюць, што ўжо зняты з пасады памочнік расійскага прэзідэнта, нейкі Рурыкаў, адзін з тых, хто рыхтаваў саюзную дамову; пры падпісанні афіцыйны дакумент аказваецца скарочаным на 26 старонак: дзесяць з трыццаці шасці. Афёра, як старажытае божышча, паглынае сваіх дзяцей, каб, магчыма, выплюнуць іх пры іншым рэжыме.

Пад парывамі ветру ў прачыненае акно выслізгвае фіранка і надоўга застаецца там: на волі трапечацца белы цюлевы сцяг; ён нагадвае пра тое, што маёй краіне могуць спатрэбіцца сёстры міласэрнасці.

Удзельнікі ранішніх прагулянак трымаюць сабак на кароткіх павадках; іх насы казыча салодкі пах кагадзе прыгатаванай яешні: квартал абуджаецца. Насуперак дабрадзейным гаспадыням адкідваю коўдру, каб легчы ў ложак. Мой галоўны інтарэс у тым, каб выспацца і набрацца сіл. Я даведваюся тое, што даведваюся: дзе нас няма — лепей... Сябры, забыўшыся на школьную ісціну, мараць пра Новую Зеландыю і Аргенціну...

Прагну вярнуцца. Хачу ў сваю галечу, хачу быць жабрачкай па-свойму... Калі б у мяне быў каханак-мастак, я папрасіла б яго намаляваць мой партрэт і назваць: «Птушка перад выраем», каб цешыцца думкай пра магчымасць уцёкаў... Птушкі ў адлёце... галубы; імгненне вечнасці сашчыкнула з рудавата-барвовых лапак жалезныя кольцы; лісты пераносяцца сталёвымі іхтыязаўрамі, натрамбаванымі сучаснай тэхнікай.

Вы пішаце лісты?

Вам ёсць каму пісаць іх?

...Вянчацца — гэта думка прыходзіць і сыходзіць, а Бог не дае часу на роздум, нібыта спяшаецца. Што здарылася? У мяне адпа-

чынак! Анёлак, што прылятае аднойчы на шкляны дах сафійскай майстэрні, ужо злоўлены на гарачым: сочыць за мной. Хочацца падняцца да месца, пазначанага на карце як *Златни мостове*; але там снег, і я адганяю прагную думку, падахвочаную веданнем: у гарах няма крыўдзіцеляў, там усе вітаюць адзін аднаго, там можна сказаць «добър ден» з гонарам пакаральніка, як лёгка сустрэць за вялізнымі камянямі чужых анёлаў-ахоўнікаў: навошта браць на сябе не сваю карму? Для мяне існуе толькі адзіны мост, праз які можна прайсці беспакарана, — вузкі тэлефонны дрот; дя д'ябла! — ускрыкваю тры разы; з-пад ног выслізгвае котка, ніводнай чорнай плямы...

Падымаешся, каб трапіць у кватэру № 21, упершыню адмыкаеш дзверы сваім ключом, пераступаеш парог; ні адзін метр жылой плошчы не абдзелены тваёй увагай; уніклівае, гаспадарлівае абдумванне робіць тваю прысутнасць заканамернай, калі не сказаць неабходнай; прыкідваеш, дзе павінна ляжаць бульба (2-3 кілаграмы), а дзе цыбуля і морква... Прыносіш гародніну з рынку, які размяшчаецца за рогам суседняга дома, ахайна рассоўваеш усё па належных месцах, пры гэтым ужо марыш пра кветкі на падваконні (але няма ўпэўненасці, якім колерам ты аддасі перавагу); і ў адзін з дзён сядаеш за стол на кухні, далей ад акна, якое — без цюлю і гаршэчкаў — выглядае па-сірочы, шмат разоў прыкідваеш так і сяк: што можна змяніць, дадаць, выправіць; займаешся гаспадаркаю прагна і асуджана, упэўненая, што ўначы з панядзелка на аўторак, ці з аўторка на сераду, больш верагодна, з пятніцы на суботу цябе неспадзеўкі заспее званок.

— Хто там?

— Гэта я...

Падрыхтаваная пачуць гэты голас, падрыхтаваная да з'яўлення, але палохаешся, бо чаканню заўжды належыць будучыня, а для цябе надышло «зараз»...

Будзе яшчэ не так позна, і ты накінеш сваю лепшую кофту (гэта хутка), ты спяшаешся выйсці з кватэры, бо паспела сказаць «зараз выйду» таму, хто націснуў кнопку перамоўніка і чакае ля пад'езда, — шырокія дзверы з меднай ручкай замкнёныя; чужая тэрыторыя пад'езда прыпыняе твае крокі, ты не выклікаеш ліфт, а марудна спускаешся, каб мець час падумаць, ідзеш з асуджанасцю жывёлы, хіба што не равеш, чапляешся за нядаўна пафарбаваныя парэнчы ў надзеі, што ніхто гэтым часам не вернецца дадому і не расчыніць дзверы таму, хто стаіць перад уваходам з выглядам знаўцы старасветчыны: дом, у якім ты жывеш, з іншай эпохі (гранітныя блокі заканчваюцца на ўзроўні другога паверха, высокія вакаліцы, размаляваная лепка, — усё ў добрым стане, бо перад тваім прыездам дом паспелі адрэстаўрыраваць). Нарэшце, першы па-

верх, бетонная пляцоўка па той бок дзвярэй асветленая адмысловымі — у старым стылі — ліхтарнямі, праз матавае шкло бачны дом насупраць, частка вуліцы, якая павінна была б уразіць сваёй пустэчай, але не ўражвае, бо кожнае дрэва і кожны куст узнікаюць перад тваім поглядам пагрозлівымі сілуэтамі. Ты глядзіш па баках, а той, хто назваўся «я», ужо торгае медную ручку. З-пад масіўных дзвярэй цягне проймаю, і ты нарэшце паварочваеш ключ, каб прахалода прыняла цябе ўсю — цалкам; ад тугі ў спалоханых вачах да ўчарашняй дзірачкі на калготках (пра існаванне якой ты не ведаеш). Аматар архітэктуры раптам раскідвае рукі табе насустрач, і ты проста падаеш у іх, не маючы сіл ані плакаць, ані смяяцца. На адно імгненне вы абое паверылі, што твой ад'езд у іншы горад быў неабходны, каб падшукаць для вас жыллё, сямейнае гняздзечка, у якім можна будзе пачувацца шчаслівымі; а насамрэч шлях твой ляжаў на захад, з перасадкамі ў невялікіх гарадках, назвы якіх не засталіся ў памяці; дарога доўжылася датуль, пакуль ты не апынулася ў даволі мілым мястэчку, настолькі далёкім ад цывілізацыі, што адразу ж палюбіла яго, зачараваная ўсім: катамі, тоўстымі ад пяшчоты і агульнай увагі, немаўлятамі, падобнымі на задаволена-прыручаных звераняtаў, галубамі, цяжкімі ў палёце і з таго вымушанымі сядзець на гатычных карнізах ашчадна зберажонай культавай пабудовы, нарэшце, хатнімі гаспадынямі, якія шчасліва корпаюцца ў напоўненых зелянінаю кошыках на рынку квартала, дзе мясцовыя ўлады перад тваім з'яўленнем паспелі адрэстаўрыраваць раскошлівы дом-помнік. Сімпатыя ўзаемная: табе давяраюць, калі ты спрабуеш блытана тлумачыць, што згубіла багаж і крэдытную картку на сціплую суму — нішто не мае значэння ў вачах чыноўнікаў (катоў-галубоў-немаўлят-жыхароў) і гаспадыні, якая здае табе кватэру. Расчуленая, ты ставіш свечку ў царкве і ўпершыню за доўгі-доўгі перыяд спакойна засынаеш адна. Млявая разняволенасць доўжыцца да таго часу, пакуль не заканчваюцца грошы, але й гэта ўжо не турбуе, бо надыходзіць пэўнае веданне, што ўначы з панядзелка на аўторак ці з аўторка на сераду... будзе моўлена самотна «зараз выйду»...

Вы сядзіце ў кавярні насупраць *твайго* дома: ты і той, хто — прычына ўцёкаў; п'яце «Мерло от Сакар», 1987 года, маленькімі глыточкамі; мужчынская далонь накрывае жаночую, халодныя тонкія пальцы (каб афіцыянт не заўважыў іх дрыготкі); на цёмнай паліраванай паверхні стала сірацее ружовы бутон (калі кветку не паставіць у ваду, яна звяне); вы не размаўляеце, толькі плачаце абое, але так, каб ніхто не западозрыў вас у сентыментальнасці; сонны наведнік за суседнім столікам раптам прачынаецца, аднудзве хвіліны здзіўлена вывучае вас як парачку, паварочваецца і просіць паставіць ягоныя ўлюбёныя *стари градски песни*, яны зас-

мучаюць яго настолькі, што ён папраўдзе пачынае плакаць; вы хаваеце слёзы, вы маўчыце, вы маўчыце мацней — больш заўзята, чым да таго...

Нарэшце святло ў *тваіх* вокнах (адзінае ва ўсім доме) прыцягвае вас: начныя матылі — рукі сашчэпленыя, плячо ў плячо — крадком падымаюцца па шырокіх сходцах, каб праз якую хвілю заняцца любоўю. Суседзі адгароджаны тоўстай, па ўсіх правілах, гуканепранікальнай муроўкай, і цяпер вам не трэба слаць шлюбнае ложа на падлозе...

Вы зноў кахаеце адзін аднаго, бо час расстання надаў кожнаму з вас новыя рысы: пакутніцтва і святасці...

Ён расчулена заўважае свой фотаздымак на століку ля *твайго* ложка.

Упэўненыя, што набылі досвед, у якім вам няма роўных, вы пачынаеце новае жыццё ў старадаўнім доме...

Упэўненыя, што набылі досвед, у якім вам няма роўных, вы вяртаецеся назад, каб паведаміць сябрам і знаёмым, што скончыўся твой зацягнуты адпачынак і ты перапоўненая жаданнем выйсці на працу; або заняцца хатняй гаспадаркай, або не займацца нічым, а паспрабаваць свае здольнасці ў напісанні сентыментальнай кнігі, трылера для жанчын, бо — каханне a posteriori*, і ў той дзень, калі раман апублікуюць, у вашым доме збяруцца самыя блізкія з настойлівымі і шчырымі віншаваннямі і, ведаючы вашу даўнюю прыхільнасць, нехта абавязкова папросіць паставіць касету: *стари градски песни...*

Гісторыя паўторыцца наноў. У марах, успамінах, наяве — тое яшчэ не ведае ніхто з вас.

Ізноў Рускі Цэнтр, куды я заходжу на правах заўсёдніцы, таму што вячэрнія кавярні — не лепшае месца для самотных жанчын. У відэазале дванаццаць наведнікаў (разам са мной) чытаюць нямыя тытры, *тържествен език* агучвае голас Янкоўскага; складаны Таркоўскі: хлопчык з паголенай галавой трымае ў руках бутэльку з малаком, камера ловіць яго ў старым люстры, — кадр павінен займець новы сэнс; хроніка грамадскіх падзей, якія нагадваюць нам, дванаццаці, пра катастрофы. Тых, хто ў гэты час дома ці на вуліцы, катаклізмы не турбуюць. Цягне далучыцца да іх, вольных, покуль у зале гучаць таленавітыя вершы, *език* намагаецца перадаць іхні сэнс, рытм парушаецца стратай галосных; зручней ладкуюся ў крэсле. Сон сярод нешматлікіх гледачоў выглядае непрыстойна... Мяне чакаюць; звяраюся з картай, патрэбны дом за рогам, праходжу паўз ахоўніка, які сцеражэ пасольства пад паласатым сцягам; раблю выгляд, што не маю да яго ніякай справы; ён мне верыць і адварочваецца...

---

* На аснове досведу (*лац.*).

У гасцях дазнаюся, што былы міністр лёгкай прамысловасці доўгі час жыў у Парыжы, яму прыемна згадваць, што зараз цяжкі перыяд для ягонай краіны, ува мне ён бачыць прадстаўніцу вялікай дзяржавы («згубленыя тэрыторыі, падзел на суб'екты, няма апраўдання...») і, каб зрабіць мне прыемнае, ставіць касету з песнямі Шуфуцінскага; на настойлівую просьбу, адрасаваную паручыку Галіцыну, весела адгукаюцца наменклатурныя госці; графін на стале не пусцее, у нашых келіхах увесь час чырвонае віно... Мой розум бунтуе, мы размаўляем на дыялекце, адмыслова створаным для нашых зносін; кепскі настрой не ў пашане; складаныя словы вынішчаюцца адназначна, віно развязвае языкі. Прысутныя ўважліва слухаюць; Парыж яднае двух: гаспадара і аматара выпускаў навін; Разумнік пераносіцца з намі на rue Grenelle, дзе аднойчы цалуткі вечар у старым савецкім пасольстве ўладарыла Марына Уладзі: сукенка з аголенай спінай, грэцкі блакітны шалік з дзесяткамі звонкіх манет, абкручаных вакол галавы («жанчыны ўжо тады спрабавалі выказацца наконт яе знешнасці; зайздрасць, вядома...»), змена танальнасці, калі яны рука ў руку з Высоцкім пераходзілі з залы ў залу... Высоцкага ў нашай кампаніі любяць больш, чым Шуфуцінскага; «Валодзю любяць усе балгары», — з гонарам паведамляецца мне. За сваіх суайчыннікаў я адказаць не магу; зрэшты, гэта нікога не цікавіць. Наступныя паўгадзіны ласуюся сушанай японскай рыбкай, пакуль яе мініяцюрная акварыумнасць перастае здзіўляць. Мая сяброўка Святлана палічыла б, што гэтую рыбку лепш за ўсё запіваць цёмным півам, яна любіць марку «Леў»... Сярод ночы адплюшчваю вочы; арганізм хоча спаць, але вочы — у столь, слухаю сафійскіх салаўёў.

Усё гэта фікцыя, і паколькі мае права быць праўдай, маё разуменне праўды разбурана: я шкадую тых, каго давядзецца вучыць; у першы клас пойдуць шасцігодкі, дзеці, народжаныя да зліцця дзвюх славянскіх дзяржаў; паняцце «Еўразія» для іх яшчэ не даступнае, дома і ў садках яны даверліва спяваюць адзіны гімн яднання: «Калыханку». Але *Санта-Клаўс* з густой барадой і ў чырвоным адзенні ўжо дасылае бацькам паштоўкі-рэкамендацыі, якія вершы ён хоча пачуць на ранішніках; ініцыятыва аматара непрадказальных святаў падтрымана загадчыкамі раённых аддзелаў адукацыі. Нас ніхто не можа запэўніць, што на двары XX стагоддзе! Мы не маўклівая нацыя, нам проста не хочацца спрачацца з дрымучымі еўрапейцамі: яны адкрыта прызналі, што наша ўнутраная палітыка іх не датычыць... Памежныя дзяржавы адзываюць сваіх паслоў: на гэтым этапе развіцця мы становімся нецікавымі. Пазней яны салідарызуюцца з далёкім Захадам, каб распачаць кампанію хлусні, але нашы прыёмнікі будуць бязмоўнымі, і паклёп захлынецца сам сабою: каму захочацца павучаць дарма? Абараніцель-

ка-*матушка-глухая матрона* будзе занятая ўмацаваннем эканамічных сувязей з нашымі непрыяцелямі; цяжкасці стануць невырашальнымі, і мы прапануем новую дамову на новы саюз з тым самым партнёрам, паспеўшы, між іншым, вырашыць праблему правоў чалавека: праз высылку дысідэнтаў; нашы турмы поўныя, але не палітвязнямі, хіба што большае парушальнікаў закону аб мітынгах і шэсцях, але мы, астатнія законапаслухмяныя грамадзяне, паважаем сваю Канстытуцыю і смела асуджаем ненадзейных; гэта бачна па шматлікіх публікацыях у прэсе, часцей — па радыё, бо газеты дарагія і на вёсках даўно прывыклі давяраць радыёкропцы; мы не кладзёмся ў сямейны ложак, покуль не пачуем родны, знаёмы да болю голас Таго, Хто раскрывае нам новыя змовы; у спісе імён і сыны матухны, якая шукае ўжо дрын, бо субота, і *не высеку — не прощу*.

На жаль, грамадзян Сусвету выносяць з радзільняў іншых дзяржаў. Мая бабка-павітуха знудзела ў чаканні: ноччу Сафію асвятляюць агні, у пакоі на пятым паверсе светла, нават з заплюшчанымі вачыма...

Бяссонне не мучыць.
Сафію слухаць —
Забава прыўкрасная ад забаў.
Чуйна, таропка выструньвае ў вуха
Рэха прыблуднае дзікіх сабак.

Маё бяссонне...
Ранак у Сафіі.
Памяць паслужліва вяртае вобразы.

Мужчына і жанчына; яны тут, побач, апранаюць свае старыя ўсмешкі, накладваюць грым адзення, асабліва шчыруе жанчына: ёй яшчэ хочацца перамагаць і быць пераможанай; доўжыцца бясконцы дзень паасобку, але, калі яны ўвечары сустракаюцца дома ля тэлевізара, аказваецца, што дзень прамінуў незаўважна, а бясконца цягнецца вечар — вечар удваіх, калі трэба паказваць сімвалы ўвагі: прынесці гарбату, падаць газету, раскласці ложак. Каханне правяраецца па тым, хто першы скажа «дабранач»; рытуал пройдзены, можна смела паварочвацца і пашыраць сваю фантазію пошукам начных адмысловых ценяў на сценах пакоя; прычым цені на сцяне і столі значна адрозніваюцца, што пачынае непакоіць, і вы амаль штоночы параўноўваеце вобразы; пакудь адзін з вас не наважваецца далучыць да разгадкі сваю найдаражэйшую палову; высвятляецца, што вас хвалюе адна і тая ж праблема (о, дзякаваць Богу, гэта не падстава для сваркі!), вы зноў даверліва раскрываецеся і паварочваецеся насустрач (так зручней размаўляць), вы прызнаецеся досыць шчыра, што не памыліліся калісьці ў выбары партнёра; словы, якія раптам вяртаюцца з глыбіні гадоў, з

першых сумесных месяцаў, сведчаць, што можна быць шчаслівымі разам, але рэдка, вельмі рэдка... Нарэшце паразумеўшыся, вы прымаеце зручныя позы, каб паспець выспацца да таго, як зоймецца ранне...

Цікава, ці існуюць праблемы ў сям'і Асена?

Мінулым летам нашы адносіны з мужам зайшлі ў тупік. Наканаванне безвыходнасці было настолькі моцнае, што засталося адзінае: адмовіца ад няшчасця быць побач (якое, па сутнасці, пры нечаканай сустрэчы вызначылася ў нашай размове як «шчасце, але былое»). Трыумвіратам, канцом надзей на ўзаемнасць сталася з'яўленне новага пачуцця: рэўнасці, хаця мая сяброўка Святлана назаве яго самалюбствам. І будзе мець рацыю, бо любіць адно аднаго — гэта пэўнасць, любіць сябе — зусім іншае; кахаць, прапускаючы *праз сябе* — сваю душу, мары, памкненні, праз свой боль, нарэшце, — гэта выпрабаванне, амаль гераічны ўчынак. А рэўнасць — памежжа, ваганне; калі не ведаеш, каму аддасі перавагу — *сабе* ці *таму, хто адкрыты*, хто даверыўся твайму шчодраму «кахаю»... Але, пакрыўджаная аматарка аналізаваць, ты заглыбляешся ў стан, прызнаны за самалюбства; у стан, калі цалкам засяроджваешся на сваіх перажываннях, знітаваная з імі, як слімак з ракавінкай, урастаеш у гэты ахоўны дамок... покуль не пачынаеш разумець, што аднойчы не знойдзецца ні сіл, ні жадання скінуць яго... Падобна, ён адчувае тое самае, пакідае шкадаваць дзяўчыну, якой дасталася поўха... Твой раман завяршаецца, мой — толькі што распачаўся: не плакаць у падушку, а — уважліва прыглядацца да тых, з кім едзеш у ранішнім трамваі... Пакуль слова «прабачыць» (за ўсё кепскае, што было паміж намі!) — як гарант поспеху — не набывае ўзаемавыгодны, узаемадаверлівы, узаемараўназначны сэнс.

Цяпер усё можна цвяроза абдумаць. Узважыць. Выказаць папрокі. Падзяліцца надзеямі. Можна, зрэшты, працягнуць рукі насустрач. Абмяняцца званкамі; даведацца пра здароўе, пра справы — казаць вольна, спакойна, нібыта не было доўгіх званкоў з маўчаннем, маўчаннем, якое не датычылася нас абаіх, а толькі некага трэцяга...

На тэрасах Палангі прыемна чуць родную мову, рэдкасць, але гэта было на нашай памяці; як і больш значныя дзеі, якія былі пры нас, сведкамі якіх мы паспелі быць разам...

Новы партнёр? Верагодна. Новы ўзровень адносін; але раўналежнасць паміж вамі ўчарашнімі і вамі сённяшнімі выключана цалкам, прычым перавага аддаецца вам учарашнім. Каштоўнасці, па якіх вас ацэньвалі ў мінулым, сёння набываюць іншую вагу, вы губляецеся ад няведання, як паводзіць сябе з новымі знаёмымі, і ўжо не ўспрымаеце сябе як адзінку, як індывідуум. Спелы плод

сэрца наскрозь прагрызае чарвяк сумнення. Вы чакаеце інфаркту ці любой іншай хваробы з пасцельным рэжымам і аддаляецеся тым самым ад адказнасці за тое, што здарылася ў выніку вашай агульнай віны. Вы яшчэ спрабуеце даказаць: невінаваты; спрабуеце пераканаць сведкаў (шмат хто з іх ахвотна згаджаецца, але пры сустрэчах з апанентам робіцца прыхільнікам іншага). Усё дарма! Нішто не дае спакою, радасць прыносяць адно думкі пра самазабойства; яны палохаюць знаёмцаў, палохаюць настолькі, што ў іх выпрацоўваецца імунітэт трымацца на бяспечнай адлегласці. Іх месцы сустрэч перамяшчаюцца ў тыя кампаніі, дзе пра вас не ведаюць, дзе разважаюць на іншыя тэмы, далёкія ад суіцыду.

Праз шмат-шмат гадоў, упэўненыя, што вы яшчэ працягваеце кахаць адно аднаго (прычым пэўнасць узрастае прапарцыянальна пражытым гадам), вы абодва паміраеце ў розных гарадах (паміж імі пажадана мэць адлегласць у сотні тысяч кіламэтраў, але калі крыху меней — таксама няблага). Смерць прыходзіць уночы між двух будняў, а таму блізкія (калі яны яшчэ застаюцца) даведваюцца пра здарэнне не адразу... Суседзі, не здзіўленыя цішынёй (муроўка, старадаўняе майстэрства), а толькі доўгай адсутнасцю (за апошні час яны прывыклі бачыць вас у двары, на лаўцы пад кустом бэзу, які вы самі і пасадзілі), узламаюць масіўныя дзверы і, заціскаючы насы, як спелеолагі, прабяруцца ў пакой, каб адправіць тэрміновую тэлеграму; паперка з адрасам ляжыць на століку каля смяротнага ложа; стары фотаздымак побач з цыдулкай... За лічаныя хвіліны паведамленне пераадолее кіламетры адлегласці і дасягне адрасата, але... вы памерлі ў адну ноч.

Я хлушу, што не раблю іншым балюча, але ўсе вакол мяне пакутуюць; апраўданні выносяцца на ўсеагульны разгляд. Кепска, але ніхто не збіраецца пакінуць мяне ў спакоі: пра што ты думаеш цяпер?.. Ні пра што; перастаю думаць... На століку гатэля ў маім пакоі ляжыць зваротны білет. Трэба толькі паведаміць тым, хто застаецца. Той, хто чакае, ведае: збегчы ад сябе немагчыма... У апошні момант мне могуць прапанаваць працу ці білет на іншы рэйс, у іншую краіну. Развагі ўскладняюцца фізіялогіяй, дзве таблеткі аспірыну нашча яшчэ не паспелі надаць лёгкасці, галава — як абымшэлы камень, рухі замаруджаныя. Хроніка апошніх дзён завершыцца абдымкамі на вакзале; паводле злой іроніі, цягнік прыбудзе ўвечары, у той час, калі размытыя цені падкрэсляць прысутнасць чорных постацяў; жалоба скончаная! — крыкну ў адкрытае вакно, але ніхто не зразумее, хіба што нехта адзін, а можа... Рэдкая людская плынь выведзе нас да стаянкі таксі, мы сядзем у адну з машын, поўныя слёз і цалункаў, якія перарываюцца балючымі ўколамі: на маіх каленях спачываюць ружы.

Как хороши, как свежи были розы,
Твоей рукой мне брошенные в гроб.

Ты просіш расказаць табе ўсё, усё — ад пачатку і да канца («...прызнайся»), просіш так, як просяць паслугі, не забыўшыся пры гэтым пакласці маю руку на твае валасы; рука застаецца нерухомаю, і ты круціш галавой, імітуючы паглажванне:

— Скажы...

Паўза непрыстойна зацягваецца. Нічога не застаецца.

— Хочаш, я раскажу табе казку; казку... (занадта складаную, каб быць праўдай).

Сафія, сакавік-красавік 1997

РАСПУСНІЦА, альбо ЧЫРВОНАЯ ШАПАЧКА СА ШВАЛЬМШТАТА

Заглыбляцца ў любанскія лясы зусім не тое, што ў швальмштацкія, поўныя германскай суворасці, упарадкаванасці, нарманскай чысціні і адсутнасці пахаў. Выхаленыя лясы... перш чым заглыбіцца ў іх, трэба прайсці нардычны туман, нізкі, палеглы, казачны туман, які тоіць старасвеччыну, які звязвае мінулае з днём сучасным...

Улонне прыроды; хімічны дадатак атмасфернага ціску — адвечна прысутны восеньскі туман нямецкіх лясоў. Па тонкай сцежцы з кошыкам у руках бяжыць лесам дзіця жаночага полу ў святочных самавязаных панчохах, паверх трох пышных спаднічак — вышываны фартушок, на галаве — маленькая чырвоная шапачка, моцна прышпіленая да закручаных у гульку ільняных валасоў. Дзіця, ужо падлетак, даўгалыгі, нязграбны, рукі-пруткі і гострыя каленкі-лакаткі, але ўжо фармуюцца прапорцыі, і пад белай блузкай відавочна-шчодра набрыньваюць малочныя залозы. Яна стамілася ад хуткай хады, спяшаючыся па прызначэнні, раз-пораз дзіця абарочваецца (на ўсялякі выпадак, бо — лес, бо — адна!), яе вейкі нервова падрыгваюць; туман застаўся на ўзлессі, і адтуль, з туману, як, зрэшты, і з-за кожнай яліны можа скочыць насустрач калматы звер, якім пужаюць маленькіх дзяцей; звер, якіх шмат водзіцца ў Расеі і на Беларусі, але і ў Нямеччыне яны сустракаюцца. Бо той, пра якога расказаў казачнік, быў не апошні Воўк, што праглынуў бабулю і Чырвоную Шапачку.

Я не памятаю, на які час мы прызначылі стрэчу з Уладальнікам. І тое было неістотна, бо ніякай афіцыйнай сустрэчы мне не хацелася. Мы адракліся, выракліся адно аднога і з таго, што былі больш незалежныя, чымся раней, патаемна праглі спаткання. Але не на тое, каб кранацца рукамі і паглядамі, не на тое, каб зразумець новую сутнасць іншага, не на тое, каб зразумець, што час зрабіў з намі абодвума, і не на тое, каб дараваць. Немагчыма наблізіцца праз тоўшчу глупстваў і здрадаў, што мы перажылі, суіснаваўшы нейкі час разам, у адной, асобна ўзятай краіне, якая па-ранейшаму звалася Айчызна. Мой Уладальнік, сведка перабудовы і развалу Саюза, апантаны малады «нацыяналіст», як сервільная прэса на-

зывала такіх, як ён — адданых душой і сэрцам ідэі незалежнасці, прыхільнікаў свабод і дэмакратычнага ладу, — цябе разам з падобнымі на цябе зрабілі ворагамі сваёй айчыны; ды і як не зрабіць, калі аб каменныя лбы «простага люду» разбіліся ўсе лозунгі вашых кіроўцаў... «Мы вернем твае сімвалы», — абяцалі яны народу. Але што да адвечных сімвалаў тым, хто жадаў каўбасы і бульбы ад пуза? Што ім гісторыя, якую расцягнулі нахабныя суседзі? Народзе сцярпеў бы і не тое! Яму няўцям, што без гісторыі ён, нібы і не народ зусім. Праўда, гэтае зразумеў Адзін, які своечасова сялянскі розум і хцівасць скіраваў на тое, каб гандляваць Айчынай. Бо хто здолее ўзняцца супраць? — народ, які нібы і не народ, бо, атрымаўшы вольную, тут жа і падавіўся ёй... Вось мой былы юнак, не юнача — са зморшчынкамі на твары і рэдкай сівізной у барадзе і на скронях. Ён цяпер носіць кароткую бародку і цёмныя акуляры, з-за якіх амаль не бачна вачэй. Мы абдымаемся, як старыя знаёмыя, барада казыча маю шчаку, і я чую пах разгубленасці і вакзальнай мітусні, халодны пах адчаю і радасці, рэзкі пах адэкалону і айчыны, ледзь чутны пах яшчэ нечага, да болю знаёмага... сям'і, якой мы жылі калісьці разам.

Учора, калі Уладальнік прыляцеў у Берлін, усё задуманае яму здавалася магчымым; было халаднаватае сухое надвор'е і сэрца грэў фотаздымак, пакладзены ў кішэню курткі: на ім жанчына ў незнаёмым зялёным строі сядзела паперад бронзавага помніка ваўку і дзяўчынцы з кошыкам. Казачныя персанажы казачнай краіны, якую ўпадабала жанчына. Калі б пачуццё, падобнае на адчай, не праглядалася ў яе цудоўных вачах, яна магла б падацца нямецкай кабетай (у адпаведнасці з помнікам і архітэктурай на дальнім плане фотаграфічнага здымка). Гэты няўлоўны адчай даваў яму права на ноўшае ўварванне ў яе неверагодна чужое і неверагодна далёкае жыццё. З кім яна сустракаецца, на якіх прысутнічае імпрэзах; чым цікавіцца; па-ранейшаму любіць чытаць палітычныя раманы? Чаму мы апынуліся па розныя бакі, калі нас звязвала ледзь не стагоддзе савецкай гісторыі, піянерскай муштры, партыйнай рэчаіснасці, «дзевяноста дзевяць і дзевяць дзясятых галасавалі за...», «саўковасці», кароткай па часе барацьбы за незалежнасць, калі мітынгі станавіліся нормай, — усё гэта запоўніла нашыя гены, і гэтыя ж веды мы павінны былі шляхам цялеснага злучэння і боскага наканавання перадаць нашым дзецям... Ці не з таго ты так не хацела дзяцей? «Зноў усё мяняецца. Наш сын не зможа вырасці вольным», — сказала ты, калі я ўмольваў цябе падарыць мне дзіця і цалаваў твае калені, і ўлонне, і плакаў моўчкі, каб толькі ты не пабачыла і не пачула. «Грошы, — зноў жа сказала ты. — Нам не

хопіць сродкаў, каб пракарміць дзіця і вывучыць яго». Нібыта дзеці не растуць, як кветкі. А я не мог табе даць болей, чым... Зрэшты, я не мог табе даць анічога. Я траціў сілы на барацьбу, на абдумванне, разважаў і трызніў... І пры тым мы так часта марылі пра свет, у якім уладарыць справядлівасць.

Запознены мроіў пра лес. Ён ішоў вузкай вуліцай еўрапейскага горада. Ён хацеў бачыць еўрапейскай сваю краіну, бачыць, як спадарыня Еўропа ўвойдзе ў загадзя расчыненыя дзверы, здзіўлена зірне на сенцы, на свежамытую драўляную падлогу, якую ён сам з бацькам клаў шмат-шмат гадоў таму; госця прысядзе ў красны кут пад абразы і забудзе перахрысціцца. Тут усё гатавалася для падобнага выпадку: свойская бульба, і пражаная ялавічына, і яешня на сале, і гурочкі з градаў. Будучы хлапчуком, Запознены насычаўся пахам малой радзімы, ссаў прагна, як малако з матчыных грудзей. У яго былі добрыя настаўнікі па роднай мове і роднай гісторыі — ягоныя ж бацькі, «хадакі ў народ», якія за пэўным часам пацярпелі за свае погляды; так гарадскія апынуліся на вёсцы, дзе настаўнічалі. Лепшыя сябры Запозненага марылі пра горад — вялікі найцудоўны горад, куды варта было данесці новыя веды, іхнія амаль варожыя веды, бо ўлада не ўхваліць, бо ўлада не дрэмле, улада, якая ведае, як пазбавіцца ад рэвалюцыянераў і іхніх шалёных ідэй.

Бясконцае трызненне; Запознены перайшоў вуліцу, каб набыць газеты і правесці якую гадзіну ў кавярні за чытаннем тэкстаў, набраных чужымі, ледзь знаёмымі літарамі, прагна ўзірацца ў загалоўкі, вышукваючы родныя назвы: *сваёй* краіны, *свайго* горада, сваякоў... Ён меў права верыць у тое, што яшчэ не адной чы вядучыя газеты надрукуюць ягоныя здымкі, назавуць ягонае імя. Аднак часцей яму на вочы траплялася: *неафашысты; нацы, якія дзейнічалі на карысць чыстакроўных германцаў; новы выбух у Дзюсельдорфе, загінула дзевяць чалавек, у асноўным перасяленцаў-габрэяў, найбольш пацярпела цяжарная, ёй ампутавалі ногі і яна згубіла дзіця...* Ён для іх такі ж эмігрант, варты таго, каб быць знішчаным.

Каб не быць знішчаным, Запознены марыў пра лес, глухія паляны, бліндажы і блізкі бой. Ён марыў пра апалчэнні партызан, бо ягоная рэспубліка, маючы аднаго ваеннага на трох мірных грамадзян, валодала паспяховай тактыкай партызанскай барацьбы. У лес маглі сысці адзін з трох, другі — чакаў бы развязкі, заканчэння падзей, каб стаць на нечы бок. А трэці? Ён — інтэлігент, ахвярнік, адкрыта выкажа свае погляды, будзе схоплены ўладай за каўнер, будзе прыцягнуты да суду, і, спадзеючыся на справядлівы суд, у прысутнасці амбасадараў і еўрапейскіх наглядальнікаў атрымае напоўніцу: гады ў зняволенні.

Запознены замовіў каву з каньяком і сеў у пластыкавы фатэль. Мярзотнікі; ягоныя разлікі недарэчныя, больш ніхто не хоча ісці за ім, хіба што дзесятак непрымірымых і ўпартых, як ён. Ці можа ён даваряць ім, як раней? Што яны чакаюць: магчымасці з'ехаць у сытую краіну, атрымаць кавалак славы з-пад ягонага ценю ці чынавецкіх партфеляў ва ўрадзе Запозненага?

Ён пасміхнуўся сам сабе, сумна і горка; «чалавек, які не ўмее пасміхацца», — называла яго прэса. І нідзе, анідзе і ніколі просты народ не бачыў ягонае ўсмешкі, толькі суворыя вочы, вочы выкрывальніка і праўдалюбцы, вочы барацьбіта і смяротніка. І толькі на шлюбным здымку, змешчаным у апазіцыйнай уладзе газеце, ён пасміхаецца, калі можна сцвердзіць, што расцягненыя і крыху скрыўленыя вусны адлюстравалі пачуццё радасці. Ягоны шлюб — крок адчаю насустрач пажаданням таварышаў па партыі: бо так патрэбна народу... Як ён прыпазніўся з гэтым крокам; воўк, выгнаннік... так, адзінотнік, звер рыкаючы, самец, які наўмысна пазбягае зграі, бо зграя не хоча, каб ёй кіраваў вопытны мацёры. І што з таго, што ён ведае, дзе ў гэты момант бляе ягня, дзе торгаюць вушамі ікластыя сабакі, а дзе разбрыліся паляўнічыя.

Адкуль яна, хто яна? Неістотна. Знямога праступае на ілбе дробнымі кроплямі, мяккімі салёнымі кроплямі на загарэлым ілбе, алхімічны дадатак жарсці, кожная — як парцалян; празрысты парцалян, у якім злучаюцца спектры вясёлак, німб айчыны, ранішняя раса на сенажаці, Дадутка спелая, Дадутка ў пошасці, Дадутка-дабрадзейка, ахвотніца да мужчын, якія сягаюць у ейны ложак. Яна скіравала вільготны позірк на спальнае месца, доўгі, пранізлівы позірк, нібыта цешылася думкай: вось шанец дамагчыся пяшчоты, багацця, становішча; карысны разлік, якім пагарджаюць начытаныя рамантычныя паненкі. Яна не хоча тут жыць, у яе крыві бурліць сумесь прасталюдзінаў, «ад зямлі і сахі», але не здаровая сялянская закалка, а бросня, насычаная гарай, галечай, працаднямі і рабскім потам, што ўеўся і ў яе скуру. Яна плача над Ізаўрай, бо мексіканская рабыня паходзіць з багатага роду і ёй адкрыецца праўда, падобная на казку. А хто прапануе Дадутцы Сейшэльскія астравы, хто ў яе гонар складзе верш ці напіша карціну? У гэтай краіне неадаптаваных сялянскіх мігрантаў, соцень тысяч мігрантаў з гнілой крывёй не можа быць багацця для дурніцы, камп'ютэрнай наборшчыцы. «Касіў Ясь канюшыну, касіў Ясь...», логіка губляе сэнс, калі Ясь перасяліўся ў горад, у шэрагорад, лясны высотны масіў, дзе адмысловая фаўна і адметная экалогія. *«Усе на рэферэндум, усе на рэферэндум...* будзем абіраць вам новую краіну...»

Яна не зведала настальгіі па чырвоных гальштуках, па стройных піянерскіх шыхтах, рачоўках-прысягах; калі яна падрасла і

стала падлеткам, яе дзіцячы рай ператварыўся ў бардэль, Галівуд, кітайскі квартал, сумятню *(З трохдзённым рабочым візітам у нашай краіне пабывала кітайская дэлегацыя на чале... гэта першы афіцыйны візіт такога высокапастаўленага прадстаўніка...)*, трывіяльнае мяшчанскае пачуццё меры і прылікаў, што гарантавала адчуванне асабістай бяспекі, аднаасобнай бяспекі, шматмільённа-чалавечай бяспекі змянілася безбар'ерным усюдыісным асабістым уседазволам без памежжа і рысы, за якую няможна... ня-можна... можа, а...

«Вы, свінні, што вы зрабілі з маім юнацтвам? свінні, перад вамі былі насыпаны перлы, багацце, якім можна было надзяліць усіх, а вы стапталі яго ў бруд, бо вам мілейшы быў хлеб і цёплае сялянскае пойла з бацвіннем і лебядой», — хіба ж так скажа Дадутка? Яна выйдзе з душа, вытрэ мокры парцалян з цела і пойдзе на кухню, каб згатаваць ранішнюю гарбату.

Праз нейкія паўгадзіны маладзіца замкне кватэру, рушыць на прыпынак грамадскага транспарту, сядзе ў перапоўнены аўтобус і даедзе да працы; там у рэдакцыі газеты «Літаратура — мастацтва» ўжо сядзіць за суседнім камп'ютэрам яе каляжанка, плятка-рка, напарніца, суперніца, наперсніца.

«Рэвалюцыя непазбежная, кроў непазбежная», — разважае Запознены, які не змог прыйсці да ўлады, у прыдатны для яго час народ не пайшоў за ім. Народу не спадабалася тое, што ён не ўсміхаецца, ніколі не ўсміхаецца, а толькі абяцае вярнуць мову і сімвалы, «разабрацца» з тым і з тым... і ні слова пра хлеб. Ён прызываў народ думаць, з кім ён і куды ідзе, а народ думаў толькі пра хлеб. І працоўны клас, гегемон рэвалюцый, той самы шматтысячны, мільённы неадаптаваны сялянскі мігрант думаў толькі пра хлеб, бо час нібыта стаўся спрыяльным і для яго, — трэба толькі схапіць Бога за бараду і аддацца працы: хто не ўмее — чэснай, хто ўмее — нячэснай, але затым, затым крыху пазней, чым ні займайся, усё адно не заробіш... нават на хлеб; неадэкватная налогавая палітыка, дэнамінацыя, інфляцыя, курс валюты афіцыйны, курс «чорны», рост коштаў, а хлеб даражэе, даражэе, даражэе...

Запознены перастае піць каву, адсоўвае кубачак і дастае насоўку, доктар гістарычных навук, археолаг-аматар, сціплы рамантык і паэт выцірае ўзмакрэлы лоб, высокі лоб дзяржаўнага дзеяча. Зараз тры гадзіны дзесяць хвілін, дзень, нядзеля, ён не ведае, куды сябе падзець, хіба што пайсці ў офіс, які яму аплочваюць заходнія фундатары з фонда развіцця дэмакратыі ў асобна ўзятых краінах, як і ложак, на якім ён спіць разам з немаладой жонкай, як і прэсу, з якой ён «чэрпае» інфармацыю для разваг, як, зрэшты, і кубак чорнай кавы з каньяком... у офіс, каб занята-

ваць думкі, якія толькі-толькі прыйшлі ў галаву: усё тыя ж думкі, але ў новай інтэрпрэтацыі, дзе герой — ён, бо па-ранейшаму толькі ён здольны вызваліць сваю кінутую краіну ад «камуна-фашызму», пры спрыяльных абставінах, вядома... у офіс, і як толькі думкі занатуюцца ў словы і фразы, ён адправіць гэтую ўказалаўку *(рашэнні з'езда — у жыццё, палітінфармацыі; селектарны сход; адзіны палітдзень з сённяшняга дня ўведзены ва ўсіх абласных гарадах нашай маладой незалежнай рэспублікі)* факсам, націсне кнопку *(будучы ў адной з азіяцкіх краін, прэзідэнт суседняй з намі дзяржавы азадачыў не толькі прымаючы бок, але і сваю ахову; ён вырашыў пакатацца на лодцы; ахоўнікам давялося скочыць у іншую лодку, якая завіхлялася ад іхняй неспартовай масы і спартовай няўклюднасці; але з ядзерным чамаданчыкам, які моцна трымаў у руках адзін з ахоўнікаў, нічога не адбылося; так яны плылі па азіяцкай рацэ — прэзідэнт і ядзерны чамаданчык з праслаўтай чырвонай кнопкай)*; факс прыйдзе ў пакінутую, але незабытую краіну, каб запэўніць дзесятак яшчэ верных паплечнікаў, што ў іх ёсцека павадыр, які гатовы змагацца і за іхнюю будучыню таксама; замежная папера на роднай мове імгненна апынецца па прызначэнні, але перад тым паспяхова асядзе праз спецсродкі на спецпаперу спецслужб абедзвюх нядружных дзяржаў... Той, хто прагне дачакацца паўстання, мусіць чытаць свае казанні аднадумцам-партыйцам, а палітычныя заклікі — гегемону. Адзін быў скочыў на бранявік, і яго ўсе пачулі. А табе слабавата ўскараскацца на танк, танк, уліты ў цэмент, помнік 40-х гадоў, сімвал нязломнай барацьбы з германцамі?.. Хіба ты думаеш, што танк стаіць адно на цэнтральнай плошчы сталіцы? Ты памыляешся: па ўсёй тваёй краіне, вытыркаючы дулы, цэляцца чорнымі жоравамі, забітымі пылам, няпамяцтвам і павуціннем чорныя, рудыя, срэбныя, белыя, зялёныя, шэра-бура-малінавыя, свежапафарбаваныя танкі ля вёсачак, у якіх заднія хаты, старыя сялянскія хаты марудна з'язджаюць, забрыдаюць, заварочваюць у лес...

Тры гадзіны дзесяць хвілін, нядзеля, Швальмштат спіць, дакладней, робіць выгляд, што спіць, па добрай волі, а не па прымусе, не чутно барабанаў і труб, карычневыя юнакі, азіраючыся, ходзяць па вуліцах, яны не носяць форму Арміі выратавання, але яны ведаюць сваё прадвызначэнне. Іхнія дзядулі і бабулі служылі рэйху, знішчалі габрэяў і цыган, заваёўвалі краіны, вялікія краіны, о, вялікі народ, іхняе юнацтва было скіравана на служэнне аднаму чалавеку, і разам з тым — усёй арыйскай нацыі, яны балявалі ў Еўропе і клаліся на вечны спачынак, вечны, вечны, халодны спачынак у далёкай краіне, дзе габрэі, цыганы, татары, расейцы, кіргізы, абхазы і ненцы жылі як бра-

ты, трасца бяры іх, гэтых братоў савецкай краіны, столькі нацый, неверагодна, колькі было іх на самой справе, вартых комінаў Майданэка, і Саласпілса, і Хатыні. Забітыя працай мужчыны і жанчыны, тоўстыя і худыя мужчыны і жанчыны, сівыя-ссохлыя-сялянскія-ведзьмакі, іхнія брудныя дзеці з вялікімі ад жаху вачыма, падлеткі з вачыма, поўнымі помсты і ідэі пра будучае будаўніцтва светлай будучыні, будуць-будуць-яны-сведкамі-камунізму, адбудуюць свой рай на адной шостай частцы сушы...

«Віна, ты хочаш віна?» — папытаў Уладальнік. Калі піць, дык французскае, добрае, з аскомінай, французскае, час прывучацца да лепшых гатункаў, якіх на тваёй радзіме, мілы Уладальнік, заўжды бракавала. Ды і калі табе па кішэні было добрае віно, хіба што гарэлка — айчынны напой, хіба што шампанскае — канчатковы прадукт, апошняя стадыя перапрацоўкі, чыстай перапрацоўкі! — саспелых мясцовых яблыкаў. Сідр, вось што ты можаш сабе дазволіць, ліманад «Жыве краіна!», жыгучку, якая лезе з роту, не можа затрымацца ў страўніку, набітым салам, варанай бульбай, таннай смярдзючай каўбасой, большую частку якой складаюць *карысныя харчовыя дабаўкі*: соя, гарох, капуста і эмульгатары.

Ён замовіў віна ў прыцемку пасляпалудзеннай кавярні, дзе пілі піва швальмштаццы з простымі нямецкімі пачуццямі і простымі нямецкімі думкамі. Яны падымалі куфлі са светлым півам, весела гергеталі і падміргвалі, рудыя бюргеры, лысаватыя абывацелі, дабрадушныя бацькі сямействаў, бясколерныя бацькі сваіх карычневых дзяцей, якія ўмеюць ужываць наркотыкі і прагна сачыць за новымі тэрактамі ў межах сваёй краіны.

Віно, гэтая сумесь мелодый і фарбаў, густога святла і чырвонага пацалунку, цнатлівага цмокання маленькай дзяўчынкі ў чырвоным каптурку, рыхтык такой, як швальмштацкая Чырвоная Шапачка, але ў абліччы, нададзеным ёй французам Шарлем Перо; дзяўчына-падлетак, дзяўчына-незразумелаколькігадоў, што назірала за намі ад суседняга століку, нешта прамармытала, прагугнела-прагергетала, прыўзняла скручаныя ручкі і даверліва пацягнулася да нас. У яе былі вочы каровы, банальнае параўнанне, каровіны вочы з бялявымі вейкамі, пустыя, і ў той жа час у іх плавала каламутная рыбка розуму і разумення.

— Не глядзі недаўменна, яна з хефаты.

Тут такіх шмат; цэнтр сацыяльнай дапамогі — хефата, цэнтр жалю і ахвярнасці, *сирые, убогие и калеки, «ямщик, не гони лошадей, мне некуда больше спешить...»*, калекі, даўняты* і «цяжкія»

* Хворыя на хваробу Даўна.

падлеткі — усім хопіць месца ў хефаце, у школах хефаты, у майстэрнях хефаты, у сацыяльных дамах і кватэрах хефаты, у царкве хефаты.

— Здаецца, яе завуць Сільке (ці Зірке); хочаш, я цябе з ёй пазнаёмлю?

Ты адмоўна ківаеш галавой, ты не хочаш спасцігаць таямніцу ўбоства, недарэчнай памылкі прыроды-матухны, *за грахі дзядоў вашы-ы-і-іх;* і я распавядаю табе пра сістэму хефаты і сістэму дзяржаўнасці, сацыяльнай падтрымкі, пра пачварных жывых лялек, скелеты: скура ды косткі, якія раскачваюцца ў шаўковых гамаках пад сінім полагам у сінім-сінім пакоі, дзе мяккае святло і мяккая музыка, дзе зіхцяць лямпачкі, дробныя няяркія лямпачкі, на якія рэагуе дэбіл, якога прырода пазбавіла думак пра смерць, суіцыд і эўтаназію; расказваю пра дурненькіх і добрых вялікагаловых пінгвінаў, што шпацыруюць па цяністых вулачках недалёка ад сваіх сацыяльных дамоў (о, бачыў бы ты іхнія пакоі, паўнюткія кніг, здымкаў, фарбаў, кружэлак, сувеніраў і сучаснай тэхнікі), радуюцца кожнаму спадарожніку, кожнаму хадыку, імкнуцца павітацца з імі за руку, абняцца і нават пацалаваць у шчаку; суцэльнае братэрства, трэба толькі пасміхацца ім і ні ў якім разе — не пагражаць, не дражніць, не злаваць.

Мяккі клімат; гэтай восенню тут мяккі клімат, — пра гэтае ж разважаюць і рускія-немцы, немцы з Казахстана і немцы з Паволжа, і богведама з якіх мясцін былога Саюза; большасць з гэтых перасяленцаў, якія па сваёй ахвоце трапілі ў Швальмштат, працуюць у хефаце (там прасцей знайсці працу); *«ямщик, не гони лошадей...»*, «я ніколі не вярнуся, ніколі-ніколі, я жыла ў Ташкенце, затым у Тамбове, затым у Адэсе; дзе я толькі ні жы-ла-а; я ніколі не вярнуся, там хамы і п'яніцы, там галеча і смярдзіць сацыялізмам», — аднойчы сказала мне чарнявая таўставатая Зульфія (Земфіра? Зарына?).

— Вы адна прыехалі?

— Не, з сынам. Мне падабаецца; цяжка, але падабаецца; вельмі цяжка, усё незнаёма, але падабаецца...

— А сыну?

— Ён ходзіць у школу. Падлетак, ён ходзіць у школу.

— А сыну?

— Там шмат такіх, эмігрантаў, рускіх-немцаў, нават аднагодкі.

— А..?

— ...Ён пазнаёміўся з наркаманамі; ён зведаў, што такое наркотыкі; яго называлі «рускай свіннёй»...

— ..?
— ...ён вучыцца быць немцам.

Запознены баяўся смерці, смерць і забыццё палохалі яго раўназначна як краты і знікненне на радзіме, дзе знікалі і заўчасна паміралі палітыкі, банкіры, бізнесмены і журналісты. Ён баяўся стаць пакутнікам, але выбраў пакутніцкі шлях палітычнага знікнення і няпамяцтва па ім; ён не вытрываў, калі прэса, лаяльная да яго прэса перастала ім ганарыцца, і ён зазначыў: журналісты — ягоныя ворагі, сервільная прэса, купленая ўладай, горкія праўдалюбцы, што заўважылі бервяно ў воку, іуды-добраахвотнікі, якія здрадзілі нацыянальнай ідэі, а ён жа нёс ім святло, ім усім — святло ачышчэння, гэты прамывацель мазгоў і пастыр заблукалых душаў, аматар падпольных сходак і з'ездаў на чужыне, аматар мітынгаў і шэсцяў, прыхільнік роднай мовы, слаўнай гісторыі і забытых сімвалаў. Яму калолі вочы тым, што ён не хацеў перадаць сваё старшынства, саступіць месца маладым і гнуткім саратнікам з вопытам еўрапейскіх сходак, вопытам выступленняў у амерыканскім сенаце. Погань, гнілыя паганкі, мокрыя слізкія паганкі, смаўжы... вось што такое адступнікі, здраднікі, піаравы дзеці, што схацелі роўнай з ім славы, «...дзе яны і дзе я?» — думаў Запознены. І гэтая кабета, што згадзілася стаць ягонай жонкаю, новая дучэ, паплечніца па партыі, найноўшая Ева Браўн, згодная памерці з ім у эміграцыі. А яму б падышла Дадутка, такая, як Дадутка, — з моцна збітым целам, без мазгоў, адно — секс і маладосць...

Тры гадзіны дзесяць хвілін, нядзеля, Дадутка стаіць ля вакна, назірае, як імжыць дождж-грыбасей, дождж-макраступ, шэры сталічны дождж. Яе агортвае сум, і яна ідзе да тэлефона, каб набраць нумар Уладальніка. Яна амаль ніколі не робіць гэтага першай — набірае нумар Уладальніка; ён сам трывожыць яе званкамі, філасафічнымі гутаркамі ўначы, стогнамі пра каханне, пра апошняе каханне ў жыцці немаладога мужчыны. Дадутка азадачана, Дадутка захінаецца ў коўдру, мужчына не бярэ трубку і не падыходзіць да тэлефона. Што ёй думаць? Сёння такі прыдатны момант: яе муж-міліцыянт, муж-сужыцель, сужыцель-міліцыянт з плоскімі мазгамі ў прабітай (застарэлая траўма!) каробцы чэрапу сышоў на службу, сышоў на суткі, і яна не можа атрымаць асалоду волі... а было ж, о, як гэта рамантычна! — такі ж бязмозглы інтэлігент і о, выпадак, таксама з прабітай галавой (застарэлая траўма!) вазіў яе ў вандроўкі на машыне, купляў кветкі, здымаў гасцініцы ў розных гарадах, ён насіў яе на руках, разглядаў яе маладое дужае цела, загарэлае моцнае цела; ён сядзеў побач і трымаў яе руку; ён

сядзеў побач і заглядаў ёй у вочы; ён сядзеў побач і маляваў яе партрэты, прысвячаў ёй вершы; *у пошуках згубленага часу*. Яе вабіла прымітыўная сіла героя-каханка, героя-ўсёзнайкі, і яна суіснавала побач з ім праз сілу абставін, ад упартасці ці з-за простай цікаўнасці.

Яна ганарылася тым, што аднойчы ён зняў памяшканне кавярні непадалёк ад яе дома, каб яна магла адсвяткаваць дзень нараджэння ў коле аднагодак: размаляваных дзявок у кароткіх спадніцах і прышчавых юнакоў, якія не хацелі анічога ведаць пра родную мову, нічога — пра слаўную гісторыю і старадаўнія сімвалы. Ёй падабалася гуляць, гуляць з гэтым гнілым інтэлігентам у ягоную інтэлектуальную гульню: лёгкія, нібы выпадковыя дакрананні, таямнічыя абдымкі і скрадзеныя, сарваныя пацалункі, каб потым са спакойным сумленнем — о, хцівае раўнадушша і знявага, — бегчы дадому, дзе ўжо чакае сужыцель.

Ізноў смылела спіна, каторы дзень ныла, і знізу, ад похваў, падымалася цяпло, мяккае, дрогкае цяпельца, жывое і жыццядайнае цяпельца пранізвала лёгкім болем ніз жывата. Ён заўважыў мой бледнаваты твар і заўважыў ліхаманкавы раптоўны румянак на неафарбаваных сківіцах; музыка пачалася з *п'янісіма*, голас Марлен Дзітрых ці нечы, вельмі падобны на таямніча-пранізлівы-ўкрадлівы голас незраўнанай Марлен Дзітрых, загучаў у нямецкай кавярні. Ён гучаў надта ціха, каб мы маглі патануць у ім, маглі даць перадых адно адному, даць надзею на патаемную згоду змоўшчыкаў, на яднанне і... *выбачай, выбачай, я больш ніколі не вярнуся, ніколі... там хамы і п'яніцы, там галеча і смярдзіць сацыялізмам...*

Кава вызывае сэрцабіццё, сэрца-матор бухае напружана і пачашчана. Пошум у скронях, гэтая паганая нямецкая кава, паганая кава, звараная паганым немцам, пэўна, калі б вярнуўся 41-ы, ён стаў бы карацелем, ненавісным фашыстоўскім карацелем; чаму так? Запознены замовіў біфштэкс і зялёны гарошак, месца грамадскага харчавання, падобнае на свіран, на танны хлеў для студэнтаў і нямецкіх рабочых, месца для насычэння гегемонаў, дзе яны жаруць пражаную капусту і слізкі сыр, запіваючы свой просты нямецкі абед кіслым яблычным віном, брыдкім хатнім віном, танным, як іхняе простае жыццё; смярдзючая кухня, якая выклікае буркатанне ў страўніку і прымушае смярдзець, смярдзець, як апошнюю тухлую свінню. Запознены перайшоў са свайго месца ўглыб залы, доўгай і вузкай залы і ўсеўся на драўляную лаву за драўляным сталом. Афіцыянтка паставіла перад ім замоўленае.

Тры гадзіны дзесяць хвілін. Час спыніўся, час і не думаў ісці наперад, не думаў рухацца; час абцякаў ягонае цела — цела жывога чалавека, чыё сэрца тахкала напружана і часцей, чым зазвы-

чай; гэтая прыдумка, гэтая прага да ўпарадкавання і падпарадкавання прыроды, вечнасць, падзеленая на хвіліны і хвількі; Запознены сумна ўздыхнуў; чаму ён не ўзяў з сабой жонку? прыстойную жонку на прыстойны шпацыр; Еву Браўн, аддадзеную яму па ўсіх традыцыях і канонах, шчырую кабету ў апошнім саку, у заканчэнні цвіцення; ён не паставіў гэтае пытанне на галасаванне, ён ажаніўся і прапанаваў сябе ў прэзідэнты, але тыя, хто галасаваў бы «за», і тыя, хто сказаў бы «супраць», увайшлі ў іншыя дзверы; no exit.

Чаму ён не скарыстаўся правам ісці да канца, чаму ён сам наблізіў гэткі канец, ён палічыў сваю прысутнасць у краіне недастаткова важнай, ён дзейнічаў інтуітыўна са сваёй апазіцыйнай упартасцю, зыходзячы з палітычных прынцыпаў рэвалюцыянераў на эміграцыі, даўнейшых рэвалюцыянераў, якіх ён ненавідзеў і чыёй палітыцы не давяраў.

Чаму Бог не даў яму нарадзіцца тут, у краіне кіслай капусты і свежага піва, гарачых каўбасак, сідра і пагатоўнай ахвярнасці — хоць заўтра! — надзець падкаваныя боты, абы толькі Gott mit uns*. Ваяўнічыя готы, пасаромленыя гісторыяй готы, тысячы, мільёны смерцяў на чужацкай зямлі ў абдымку з забітымі салдатамі, закатаванымі жыхарамі, засыпаныя зямлёй, якая змяшалася з попелам спаленых вяскоўцаў: малых і старых; разам з іх вёскамі.

— Halt's maul!**

Я запомню, вы ўнесены ў спісы, і вы таксама, абмежаваны недалёкі германскі абывацель; няма нічога лепшага, як скласці «чорны» спіс, «чорны» спіс на прадажных свіней, свіней, якія здрадзілі ідэі, выйшлі з радоў ягонай партыі, пераназваліся новым рухам — без яго (!) на тое згоды.

Ён паглынаў гарачы біфштэкс, вялізны апетытны кавалак добра ўсмажанай мяккай свініны, і тая станавілася ўпоперак горла, ён нанізваў гарошак, які не меў для яго ніякага смаку, акрамя смаку травы, зляжалага сена, і слёзы наварочваліся на вочы, стыглі, пяклі нянавісцю і наканаваннем.

Пачатак на чацвёртую. Яшчэ ідуць навіны нацыянальнага канала... *зараз настаў час даць канкрэтны накірунак і ўзяць канкрэтныя абавязацельствы ў адносінах да пашырэння... таму што задача Еўропы — захаванне і ўмацаванне структур супрацоўніцтва, якія ўтрымліваюць перавагі разнастайнасці і незалежнасці, без абуджэння старога праклятця еўрапейскіх дзяржаў: ксенафобіі,*

---

* З намі Бог! (*ням.*).

** Заткніце сваю пашчу! (*ням.*).

кровапраліцця і вайны... Больш моцны, больш шырокі Еўрапейскі Саюз павінен стаць нашым прыярытэтам... Германія разам з іншымі краінамі-заснавацелькамі ЕС: Францыяй, Італіяй і краінамі Бенелюкса вырашае лёс новых членаў саюза; пытанне нумар адзін: уключыць краіны Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, а таксама краіны Балтыйскага рэгіёну... *інтэграцыя Еўропы з'яўляецца палітычным прадпрыемствам... вайну паміж членамі ЕС не толькі цяжка ўявіць, але й яна немагчымая...* Мая краіна, краіна Запозненага, краіна Дадуткі і Уладальніка ў ЕС не імкнецца. Яна будуе асобны, асабовы рэжым, рэжым калгасаў і планавай эканомікі, рэжым селектарных сходаў і паўнаўладных спецыяльных службаў.

Мужнасць пакінула мяне, я прывяла яго ў нумар свайго прытулку, хефацкага дома для будучых сацыяльных работнікаў і сённяшніх згубленых душ, сучасная ўстанова з амаль манаскім укладам, укладам простага чалавека, які хоча пазбавіцца, выбавіцца, і ў першую чаргу — ад сябе мінулага... Пра якую праўду ты дбаеш? Хто ты ёсцека? Ты таксама заблукаў у жыцці, як казачны герой у трох соснах; табе не трапляўся воўк? Не, тут ваўкі пагражаюць толькі Чырвоным Шапачкам, — так думаюць швальмштаццы на чале са сваім швальмштацкім збранзавелым ваўком... Свет сучасны падзелены на большасць і меншасць. Большасць жадае ўтрымацца на плыву, лісліва ўхваляе моцных гэтага свету і марыць перафарбаваць самюткую душу сваю ў колеры сучаснасці... А бывае, што меншасць, пафарбаваная ў колеры самай жахлівай хваробы — нянавісці, колеры крывавай чумы, — наносіць зверху афарбоўку «так думае большасць» і пралазіць наверх, да ўлады, і тады ўжо яна, меншасць, становіцца матэматычнай большасцю, бо з ёй — сіла і gott.

Дадутка, не Ларэлея, грузная маладая Дадутка, не тонкая рамантычная Ларэлея, спелая, юрлівая Дадутка, не народжаная ў старым вільготным палацы Ларэлея, ушчэрбная, недалёкая прасцячка-Дадутка спрабавала абвінаваціць мяне ў тым, што я скрала ў яе каханка, рыцара, які пісаў ёй лісты-балады... «...мае пачуцці падобныя на ўзрыў каметы... Бывай! Скажы: «Вітаю!..»

Мы стаялі адзін насупраць другога, сябры, ворагі, адзінадумцы, экс-супругі, старыя знаёмцы? Стаялі насупраць у маім пакоі, які хефата здавала па чарзе манашкам, вясёлым французскім студэнткам, эмігранткам, прастытуткам, уцякачкам з роднага дому, уцякачкам у пошуках шчасця, уцякачкам-небаракам, такім, як я, таксама... меншасць адасабляецца ад рэчаіснасці, не знаходзячы дастаткова слоў, каб праклясці рэчаіснасць пякельнымі фразамі, абвясціць ёй анафему; уцякае, каб наважыцца жыць у выдуманым свеце; у выдуманай прасторы...

Я не жыла мінулым, больш не жыла ім і не хацела згадваць, колькі болю прынесла твая прыхаваная таямніца, юрлівая таямніца адчаю і плоці, твае малюнкі і вершы, твае падарункі ёй: «Я нічога табе не вінен... не вінен... я не вартаўнік твайго душэўнага спакою. Хочаш спакою — ідзі ў манастыр...»; твае начныя званкі новай каханай; найноўшы сэрцаўедны шанец пачувацца юначам, свойская маладая «Вясна» на капыл Батычэлі; змоўшчыкі з класічнай драмы; фарысеі і фарысейкі... Vox angelica* праз доўгія-доўгія ночы і дні, голас анёлка фарысеяў вярнуў: *я кахаю цябе* (а дзе тваё: *зноў?*)... *толькі цябе* (ну дзе ж, дзе яно: *зноў?*). Яно чуецца праз сашчэпленыя вусны, яно тоіцца ў вачах і жаўлаках, якія торгаюцца пад сухой скурай... Ты атаясаміўся для мяне з народам, з масай, расцёкся і растварыўся ў масавасці і множнасці, перастаў быць адзіным, абраннікам, *як усе* — вось табе найменне.

Ты стаў народ. *Жыве краіна!* — было напісана на сценах дамоў, на павільёнах аўтобусных прыпынкаў, на бетонных платах, за якімі сцерагліся ад народа вайсковыя часткі. А што пра ўсё гэта думаў народ, народ-адкуль-твой-род, і што ты сам значыш — народ? Мо народ гэта тыя, што жылі як рабы і працавалі як рабы, і пры гэтым не маглі зарабіць на хлеб, каб пракарміць сем'і; ці мо народ тыя, што везлі з-за далёкае і блізкае мяжы заляжалы танны тавар, праўдамі-няпраўдамі змяншаючы на яго мытныя пошліны і дзяржаўныя пошліны, і д'яблу-ведама-якія пошліны, каб затым утрая даражэй прадаць кітайскі, турэцкі, польскі, карэйскі, падпольны, «самапальны» тавар, і зарабіць на хлеб, на хлеб і малако для дзяцей, на хлеб, малако, а можа быць, і на ікру для дзяцей, дзяцей, якія нарадзіліся пасля Чарнобыля; о, небыць, на якой мове трэба яшчэ сказаць пра масы?.. Наколькі спрэчна, што народ — гэта тыя, хто імкнецца ў дэпутаты, каб пісаць законы для астатніх, што народ — гэта чынавецтва, якое выконвае (ці не выконвае) тыя законы, што народ — гэта Адзіны і Непаўторны, Адзіны і Безграхоўны, Адзіны над народам і etc, без абмеркавання...

Сільке (ці Зірке) вярнулася ў свой пакой, дзе была файная мяккая мэбля, ложак, засцелены каляровай бялізнай, і тэлевізар, камп'ютэр і магнітафон для касетаў і дыскаў. З нядаўняга часу Сільке-Зірке палюбіла маршы, стройныя бравыя маршы, маршы строгіх, бравых маршыраванцаў, вясёлых і маладых удзельнікаў гарадскіх свят. Лепшыя нямецкія jungen** і лепшыя нямецкія mädchen*** шыхтаваліся на галоўным пляцы, апраўлялі мундзі-

---

* Голас анёла (*лац.*).

** Хлопчыкі (*ням.*).

*** Дзяўчынкі (*ням.*).

ры, правяралі: ці зашпілены бліскучыя гузікі, правяралі: як гучыць «до», а як «сі», і сіпелі ў трубы, дудзелі ў кларнеты, нецярпліва пастуквалі палачкамі па напружаных барабанах.

Р-а-а-зз! І ўсе рушаць, лепшыя дзеці граюць у лепшых школьных аркестрах. Пачнецца свята, выйдзе наперад герой дня, галоўны герой галоўнага ў ягоным жыцці дня — сябар Сільке-Зірке; яны жывуць на адным паверсе, іхнія пакоі раздзяляе тонкая сцяна, але яна і яднае іх, бо тоўсты сябар, з вялікай круглай галавой і тварам камбалы сябар дорыць Сільке-Зірке фотаздымкі: кожны раз новыя, кожны раз розныя, здымкі з гарадскіх святаў, дзе ён — шчаслівая рыба з круглай галавой — выконвае ролю капельмайстра. Горад так прызвычаіўся да яго, што не збіраецца сапраўднага капельмайстра ставіць паперад дурня, і не збіраецца пхаць таго ў каршэнь; *юродивы-ы-ый, бо-о-жий челове-е-че-е-е-к...* (уздыхае найноўшая немка Зульфія); божы чалавечак не ведае: за што такая ласка, чаму ўсе пасміхаюцца яму і пляскаюць у ладкі; ці захацеў бы ён ісці наперадзе вясёлых музыкантаў, калі б ведаў, што побач з царквой хефаты ляжаць у зямлі некалькі соцень сыноў і дачок з краіны юродзівых, краіны божых чалавечкаў, з краіны добрых пачварных рыбаў і не менш добрых страшыдлаў... Адны супляменнікі спяць, а тыя, што жывуць, свецяцца дабром і даверам, шчырай цікаўнасцю і даверам, прастадушшам і даверам, бо з самага нараджэння сацыяльныя работнікі кормяць іх важнымі пігулкамі з назвай *даверын*. Але здараецца, што зайздросны чарвяк выслізне з хворай падсвядомасці раней, чым пачне дзейнічаць даверын, і тады жыхарам асобных дамоў — тым, хто ходзіць і адслугоўвае сябе сам, і тым, хто ездзіць у інвалідных каляскаў, — пачынае здавацца, што не ўсё правільна ў іхнім жыцці, у ім нечага не хапае, нечага вельмі-вельмі важнага: родных, сям'і, дзяцей.

Сільке апошні раз зірнула на свайго бравага сябра ў мундзіры капельмайстра і з сапраўднай дырыжорскай палачкай (падарункі гараджан, шчырых гараджан, вясёлых гараджан, здаровых гараджан) і заплюшчыла вочы. Яна ляжала на ложку на свежых каляровых прасцінах, а яе сябар вісеў пад шклом, у жалезнай бліскучай рамцы пад шклом; зараз быў той момант, калі яна згадала, чым яны займаліся некалькі тыдняў назад, калі спрабавалі выказаць сваю прыязнасць адно да аднаго, так, яны распраналі і мацалі адно аднаго, і Зірке прадбачліва выкінула супрацьзачаткавыя пігулкі ва ўнітаз... *аддайце*, шапталі яе вусны... *дайце мне яго, дайце...* яе галава торгалася па падушцы, яе вусны шапталі толькі ёй вядомае закляцце, ці клятву, ці просьбу, ці плач, у той момант, як палец, доўгі чэпкі палец, мокры гнуткі палец казытаў похвы; *я хачу яго... дайце...* выпросталіся ногі, *о-о-о, ён мой, гэта маё дзіця...* ногі

падгіналіся ў каленях, палец сігаў у рот і, абсмоктаны, мокры й гарачы апускаўся ў здаровы ад прыроды орган.

Вялікі дыпламатычны Няўдачнік, аўтар дзвюх гістарычных кніжак, археолаг-аматар і так сабе сярэдні паэт Запознены ўвесь прапах чайнымі ружамі; ён выйшаў з таннай ядальні, стылізаванай пад сялянскую, *просты стол, здаровая кухня*, і павярнуў на Карлштрасэ; ён мусіў вярнуцца ў гатэль, дзе гэтым часам спадарыня Запозненая прымала душ перад тым, як пачаць збірацца ў тэатр. Яна — жонка палітыка, і як жонка збеглага палітыка, сяброўка неабранага прэзідэнтам палітыка, паплечніца нефотагенічнага палітыка, чые профіль і анфас, а найчасцей паўанфас з шырока адкрытым ротам з'яўляліся ў друку (твар героя газетных палос стаўся на кароткі час тварам нацыянальнага лідэра, шчаслівы адрэзак у гісторыі краіны, адрэзак надзеі і спадзяванняў на лепшыя змены), як авечка, якую ейны выдатны муж прынёс у ахвяру Гіменею, гэтая старая аўца збіралася яшчэ сыграць не апошнюю ролю на палітычнай сцэне. Упартыя намаганні Запозненага стварыць для нацыі новыя падмосткі палітычнага жыцця і навесіць заморскія фіранкі дэмакратычнай свабоды прывялі да таго, што яго абралі ў парламент, а разам з ім былі абраныя і ягоныя паплечнікі. Але ўлады падалося мала, ды й тая здалася такой мізэрнай, што калі каго-небудзь з гэтай купкі парламентарыяў-наватараў крыўдзілі ўголас... *шосты мікрафон, прашу вас, шосты мікрафон...* дык яны пагатоў крыўдзіліся ўсе, нібы толькі таго і чакалі, апраўдваліся злобна і істэрычна, як дзеці, што ў запале бойкі губілі розум *...таварыш у заднім праходзе...* гістарычныя асобы, праваныя часам на трываласць, на «дабро павінна быць з кулакамі», на волю і славалюбства *...падрыхтуйцеся да выступлення.*

Водар чайных ружаў плыў уздоўж Карлштрасэ і Запознены рушыў на пах, які зрэдку здаваўся больш насычаным і салодкім, пасля чаго мужчына пачынаў азірацца ў пошуках уладальніцы стойкага, да болю знаёмага водару. Так пахлі некаторыя з жанчын на ягонай радзіме, некаторыя са знаёмых жанчын, вядома ж, ён не сентыментальны, але сэрца зноў пачало радасна біцца, узбуджана калаціцца, калі прыгадалася малое дзяўчо, падлетак, жабянятка з цыпкамі на руках, якое ён перастрэў, а дакладней, падпільнаваў, калі й сам быў уладальнікам пятнаццаці ці шаснаццаці ўласных год; дзяўчына выходзіла з лесу, крыху адстаўшы ад сяброўак, у ейным бідончыку было поўна ягад, і тут насустрач ёй выскачыў воўк, шэры звычайны воўк, воўк-Запознены, які клацаў зубамі і гырчэў, з такіх жартаў ужо даўно ніхто не смяецца, ды і якая тут пацеха? Дзяўчынка размахнулася бідончыкам, каб трэс-

нуць нахабнага звера, падлетка-вяскоўца, малога-дурнога, але бідончык выляцеў з рук і ў траве засталіся ляжаць чырвоныя маліны і чорныя ажыны. Дзеці сварыліся, але збіралі ягады, рагаталі, але збіралі, перабрэхваліся і збіралі, папракалі, збіраючы, назіралі, збіраючы, усе чакалі, збіраючы, покуль не сутыкнуліся нос у нос. І тады ён паспрабаваў пацалаваць яе, ружавашчокую Маліну, чарнабровую Ажыну, а яна, разахвочаная, смяялася прама ў вочы і калолася сваімі нябачнымі калючкамі, драпала па руках і пальцах кіпцюрамі.

Але не ягады выклікалі ў памяці ідылічны малюнак, а пах, пах чайных ружаў, пра якія на той момант ён нічога не ведаў. Да дзяўчынкі-ажынкі вярнулася бабуля, з далёкага-далёка чужая незнаёмая цётка, старая вядзьмачка з тытунёвай самакруткай і абшарпаным чамаданчыкам, валізкай пачварных кашчавых істот і водарам незнаёмай вёсцы парфумы *«з самюткай Масквы, шчаслівай сталіцы шчаслівейшай у свеце дзяржавы»*, і богведама якім шляхам трапіў флакончык залатой вадкасці ў зморшчаныя, натруджаныя рукі «несправядліва рэпрэсаванай» сялянскай кабеты. Пах — усё, што засталося ў спадчыну ўнучцы «самай шчаслівай краіны», вясёлай Ажыне-Маліне, будучай калгаснай даярцы, будучай жонцы ўвесь час п'янаватага вясковага механізатара... Ён аблiваўся потам, хіба ўнушаць страх — ягоны стыль прапаганды? Хіба народ павінен баяцца і... яго? Дык як, народ, вінен? ён баіцца?.. страшыцца кожнага, абцяжаранага ўладай.

Запознены прайшоў міма гмаха, над якім шчыравалі будаўнікі, фасад будынка прадбачліва ахінала сетка, шчыльная, як ахоўная матэрыя новаўзведзеных і не адкрытых шчэ манументаў; ён уцягнуў носам паветра, але нічога не пачуў і рушыў далей у пошуках прывіда, старадаўняга выкапня, які схаваўся ў покрыве паху...

Яна стаяла, Тонкая Бананавая Скурка, на скразняку, на скрыжаванні ў чаканні зялёнага святла. Міма яе ў модных бліскучых аўто, камфартабельных прэстыжных аўто праязджалі спадары краіны: міністры і дыпламаты, члены бундэстага і главы карпарацый, урадавыя служачыя, чыноўнікі, вайскоўцы, бюргеры з бюргершамі, усе гэтыя паўльбанкі, фрыцышпрыцы, жалезныя петэры, адчайныя гансы, усе — дабрадзейныя грамадзяне, што спяшаюцца правесці ці ўжо завершыць свой выхадны дзень.

Бананавая Скурка толькі мела выгляд наіўнага стварэння, свежая і маладая, нібы заранак цывілізацыі, яна магла шмат чаго распавесці пра саму цывілізацыю і вынікі прагрэсу: чорная скура прымушае хутчэй прайсці шляхам духоўнага сталення і ачышчэння. Тонкая вучылася ў лепшым еўрапейскім універсітэце; Бананавая Скурка вывучала гісторыю Еўропы і, у прыватнасці, гісторыю краіны, абвеянай ваеннымі міфамі, злую частку свету,

дзе хатнія казкі траплялі ў падручнікі сусветнай гісторыі, дзе старшы саветнік суда і вялікі ўмелец Драсельмейер і ён жа — прыдворны гадзіннікавых спраў майстар і цудадзей Хрысціян-Эліас Драсельмейер з Нюрнберга* напачатку выступаў з трыбуны і пісаў першыя нюрнбергскія законы, а ўжо потым шчасліва пазбягаў судовай лавы ў тым жа Нюрнбергу, бо паспеў скласці галаву ў лясах, дзе даводзілася паляваць на самага хітрага звера — чалавека, які ўцякае ад смерці, карацеляў і вайны, на самага небяспечнага звера — чалавека, які імкнецца адпомсціць карацелям, смерці, вайне... ці не паспеў скласці галаву, а пераседзеў небяспеку ў бункеры, каб затым, зняўшы кляйно СС шляхам пластычных аперацый, аказацца на акупаванай саюзнымі войскамі тэрыторыі пад выглядам простага салдата, выканаўцы чужой волі, і з таго — непадсуднага... ці не паспеў адсядзецца, а ў апошні заключна-выключны момант шляхам дзівоснага пераўвасаблення набыў воблік салдата мышынай кавалерыі ці нават — мышынага караля з сям'ю каронамі на сямі галовах...

Каб жа ж бацькі Бананавай Скуркі на той момант, калі ёй было столькі ж, колькі зараз іхняму дзіцёнку — чорнай дзяўчынцы, не, смуглай афрыцы, жоўтаму сонечнаму суквеццю, — апынуліся на адну-адзінюткую хвіліну ў краіне ажыццяўлёных арыйскіх казак, іх адразу б *...у працэсе ліквідацыі...* а зараз сябры Бананавай Скуркі разважалі пра абавязак, абавязацельствы, віну, пра існую веру і веру ў існасць, пра страту тленнага зямнога шчасця і зноў — пра віну перад мінулымі пакаленнямі і чужымі народамі; менавіта гэтая прага белага чалавека аддаць даніну павагі нескароным і штурхнула смуглявую афрыку на спатканне, першае сур'ёзнае спатканне... *бразготкі і барабаны...* вось куды яна так спяшалася... *чырвонае віно і белы холад...* чаму так прыспешвала зялёнае святло, тупаючы няўсцерп тонкай бананавай ножкай... *пальмы і беркуты, акіян — калыска чалавецтва і свастыка сонца над ім, белы Маўр і чорная Дэздэмона...*

Што ты на гэта скажаш, дарагі? Ну прыйшоў ты сюды, а каб жа ж я гэтага не хацела, дык цябе б тут і не было. Але што б змянілася? Анічога! Маё пустэльніцтва скончылася, і схімніцтва скончылася, і нам цяпер не засталося ні кахання, ні сумеснай надзеі, ні эратычнага адчаю. Твой дух — мёртвы, і тваё інтэлектуальнае царства, і рамантычныя развагі пра будучыню — паныльыя і памерлыя. Ты ўяўляеш сабой разбураную сцяну, спярэшчаную знакамі даўнейшых прызнанняў і смелых, рашучых надзей; сведчанне заняпаду і пагібелі; *хочаш прылегчы? прылегчы, каб забыцца,* забыцца, што належаў гісторыі і сам ствараў гісторыю, калі разам з

---

* Герой казкі Э. А. Гофмана «Шчаўкунок і Мышыны Кароль».

іншымі хадзіў у мудрагелістых шыхтах, малалюдных напачатку, а затым больш шырокіх, больш масавых, і ў гэтым страшным узвелічэнні забывалася пра простае прызначэнне кожнага... *Запо-зне-ны!* гукаў натоўп, і тады наперад выходзіў чалавек і шалёна крычаў у мікрафон, і лаяў, і лаўся, і абяцаў лепшае жыццё пад новымі штандарамі, якія тут жа (дзе спадціху, а дзе — з гонарам) даставаліся і па-сірочы палыскаліся над натоўпам.

Так было задоўга да таго, як Запознены стаў дэпутатам, і так жа ж было пасля таго, як дэпутацкі мандат страціў былую сілу і недатыкальнасць, што даваў яго ўладальніку *(новыя законы, новая Канстытуцыя)*, і Запозненаму зноў давялося ісці ў масы.

Ты даваў Запозненаму, а разам мы даваралі адно аднаму, а пазней (як, зрэшты, і большасць з тых, хто стаяў пад штандарамі) нас спасцігла расчараванне. Упартае і легкадумнае жаданне заўжды знаходзіцца ў апазіцыі прывяло да таго, што Запознены пачаў змагацца з аднадумцамі: з тымі, каму ён раздаваў партфелі «ценявога» кабінета ўлады, і каму ён толькі абяцаў пакаштаваць пладоў ад свабод і дэмакратыі, і каму адводзілася роля маўкліва-га памяркоўнага электарату... усе яны праз пэўны час пачыналі сумнявацца ў палітычных і дыпламатычных здольнасцях лідэра, сумнявацца ў нязменнасці абранага ім курса, сумнявацца ў ягоных чалавечых якасцях.

На кароткі час сімвалы Запозненага набылі дзяржаўнасць, іх замацавалі ў Канстытуцыі, каб павесіць над будынкам парламента; яны належалі ўсім — сябрам і непрыхільнікам, суайчыннікам і суграмадзянам, вайскоўцам і спецслужбам, рабочым і прэзідэнту.

І што рабіў у гэты час ты, даражэнькі? Валодаў. Валодаў маімі душой і целам, банальная праўда, якую змацоўвала будзённасць; патрэбнасць перастаць змагацца, а: *узвялічваць, будаваць, ствараць, знаходзіцца ў пошуку прыгожага, гармоніі* і пры тым — у канчатковым выніку не рабіць нічога, між іншым, процізаконнага! «Гэта — вераб'і, — дэкламаваў ты, — гэта хвоі, лес, сядзіба, дом (якога нам не давялося пабудаваць)...» Мы зноўку скіравалі погляды на адвечныя каштоўнасці: агонь, ваду і дарогу. Забыўшыся на катарсіс і тлумачэнні філосафаў, што ачышчэнне аказвае высакароднае ўздеянне толькі праз трагедыю...

— Дадому! — цягнулі мы адно аднаго ў розныя бакі, але не ў розныя бакі свету, нашая краіна падавалася краінай працвітання, здабытай самастойнасці, дужай трываласці перад акуламі бізнесу, пазбаўленай варожага бяздушша, партыйнай чэрствасці, спекуляцыі на ідэях, ідэалах і курсах валют. І вось тут нас перастрэла расчараванне...

...Расчараванне перастрэла Запозненага, калі ён зразумеў, што кабета, якую давялося абмінуць, пахне зусім не чайнымі ружамі і

не ружамі наогул. «Занадта многа фанатызму пакладзена на тое, каб знайсці няўлоўнасць, — думаў палітык-эмігрант. — Занадта многа ўтрапёнасці, нястрыманасці. Але, зрэшты, так заўжды...»

І вось ніхто іншы, як я, ужо тут, у ракавіне засмучонасці, на роўнядзі надта прыгожых, абсыпаных расой і ўхутаных туманамі пейзажаў, дзе вас кліча наперад і падганяе свойская раскоша ўпарадкаванасці і парадку; вы аддаеце перавагу чорным хмарам, якія засталіся за спіной? цёмныя хмары грукацяць і страляюць маланкамі: яны таксама клічуць, завуць, але глуха і... Мяне ванітуе ад пакорлівай падатлівасці сыноў краіны хмар і дажджоў. Я аддала перавагу таму, каб знікнуць з гэтай краіны, вандраваць з памяццю пра цябе. Той, хто не гатовы кінуць выклік, не гатовы цярпець, рызыкуе ўпусціць свабоду.

Маленькая дзяўчынка Чырвоная Шапачка, дзяўчынка-падлетак, поўная разнастайнай цікавасці, цяперашніх і будучых супярэчнасцяў, часовых сімпатый, трапна-гарэзлівых слоў, дурных прадчуванняў і боязі, апаслівай меланхоліі, бессэнсоўных пытанняў, мудрагелістых думак, *тут не да жартаў*, абачлівых уздыхаў, жадання эмоцый, слепкіх эмоцый, безлічы эмоцый, эмоцый насупор, эмоцый наніштo; прыцягальна-непаслухмяная казачная гераіня, спакуслівая: ідзе і адлічвае час, *колькі чалавек загіне ў краіне Х, калі адлегласць паміж А і Б роўная лесу...* у цёмным-цёмным лесе хвоі стаяць ушчыльную, у цёмным-цёмным лесе стаіць хатка на курынай назе, а ў ёй Баба Юга ўвесь час прынюхваецца, ды й думае...

«...здесь пр-р-рус-с-ский дух, здесь Пр-р-русь-сь-ю пахнет!..»

...думае Запознены і пракрадваецца міма адчыненых дзвярэй у кавярні, міма афіцыянтак, прадаўцоў газет і замежных турыстаў, гэтых бессардэчных хадыкаў, якіх цікавіць толькі асабістая прысутнасць у асобна ўзятай кропцы адвольна выбранай еўрапейскай краіны; прадзіраецца праз чужыя бесклапотнасць і весялосць, пазбягаючы глядзець на дарагія вітрыны, пазбягаючы спакойна думаць пра сябе, людзей, горад і вечаровы паход у тэатр разам з жонкай, добрай і мілай кабетай з простым тварам сялянкі, з дабрадушнай усмешкай і здаровымі пярэднімі зубамі; ён па-ранейшаму кіруецца на пах, спраецыраваўшы на ружовую карамельнасць сваё няўдалае (цяпер ён мог так сказаць) жыццё. Забыўшыся на Ажыну-Маліну (папраўдзе, дык ён і не згадваў пра яе); успаміны засталіся ў падсвядомасці, уклаліся школьнай матэматычнай формулай: *з пункту А ў пункт Б...*

— Калі я зараз жа не вярнуся ў гатэль, я не змагу патлумачыць доўгую затрымку.

— Калі я зараз не павярну ў гатэль, мне давядзецца карыстацца планам горада і даведнікам.

— Калі я не вярнуся ў гатэль, гатэль застанецца, і людзі застануцца ранейшымі.

— Калі я не вярнуся, дык застануся сімвалам блукання.

— Калі я не... — думаў Запознены, атаясаміўшы пах з публічнасцю, *ва ўсіх на вачах*, авальнай залай, дзе засядаюць усёзнайкі, *...час, калі апазіцыя і ўлада яшчэ размаўлялі паміж сабой...* вабнай кабетай, прыгожай кабетай, чый рот сведчыў пра красамоўства і эратычнасць, кабетай з іншай партыі і фракцыі, ён не наважыўся пакахаць адкрыта, хаця любоў да паэзіі і археалогіі вяла яго ў абдымкі жанчыны, *у панядзелак нас чакаюць гарачыя дэбаты* («д'ябал іх бяры!») *...змены ва ўрадзе...* і ён ужо меў непрыемнасці з таго, што падтрымаў кандыдатуру вабнай дэпутаткі на вакантны дзяржаўны пост, так-сабе-значнае-месца, але... яго злёгку падакаралі, каб адразу ж абвінаваціць у некампетэнтнасці і маладушшы; святая дэпутацкая недатыкальнасць, дэпутацкае крэда, дэпутацкія зайздрасць, славаблудства, прадажнасць; ён ператлумачыў свае словы, хутка адступіўся — і гэта сведчыла на ягоную карысць! — каб затым з крыху перакрыўленым збянтэжанасцю і халоднасцю тварам вітацца ў калідорах улады, на шырокіх парламенцкіх лесвіцах з кабетай, якая па-ранейшаму аддавала перавагу строгім чорным сукенкам, прыязнасці і парфуме з харакэрным пахам чайных ружаў.

Дзіва з дзівосаў! Хто верыць крумкачу, хто слухае крумкача з краіны дажджоў і маланак? Маленькае дзяўчо, якое спяшаецца заспець жывою бабулю? Стомленая ад свабоды і супакоеная свабодай жанчына, якая і сама спяшаецца стаць бабуляй — *я,* — каб дачакацца ўнучкі ў аўтэнтычнай чырвонай шапачцы, экспанаце, які множыць на малюнках-гравюрах-вышыванках і ашчадна захоўвае швальмштацкі музей..? Вартавыя капіталу ахоўвалі ўваход на зялёны лужок, дзе буялі кветкі, паркавы ансамбль, маёнтак, разнасцежаныя вокны, вялізная цяпліца; падагра; старому ўдалося скалаціць немалое багацце; кароль батанікі, кароль на пенсіі, ён кінуў дзяржаўную службу і знаходзіцца пад аховай; туман ахутваў вершаліны дрэў, калі я дабралася да раскошлівага лужка, націснуўшы перад тым кнопку званка ля адмыслова выкаваных жалезных варот.

«Тут нішто не нагадвае пра бомбу», — таямніча сказаў Шчаўкунок у драўляным плашчы, яго зачаравала злая суседка (а зусім не Мышыльда), прыгажуня-суседка, смяшлівая, але *«злая-злая,*

бо не кахала мяне і прымушала пакутваць», і няшчасны ўнук аматара жывой расліннасці шчыра распавёў пра сваё трагічнае каханне, якое ён спазнаў праз жорсткасць, беспачуццёвасць, бяздушнасць, кплівасць *(выйдзем у сад, фройляйн чужаземка...)*, абразы, хранічную нянавісць, хранічнае адабрэнне — ягонымі пакорлівасцю і адданасцю; *...яна рыхтык дзявіца з вокладкі часопіса для мужчын: паўнагрудая, дзёрзкая (паспрабуйце так раскінуць ногі, вам і не ўдасца!), прыспушчаныя панчохі, голыя лыткі...; ат, вы зусім на яе не падобны!?*

Чым ён не задаволены? Кожная зойме такую паставу, калі яе падахвочваюць вочы каханага: ніякіх махінацый, ніякага подкупу, несправядлівасць едзе на кані, які хрыпае, у чорным мундзіры, карычневым мундзіры, мундзіры колеру аліваў; людзям бездакорным баяцца няма чаго?..

Мы аглядаем мясцовыя славутасці: я і новы знаёмец, нас хапіла на некалькі дзён, усяго некалькі дзён, каб пажаліцца адно адному і пачуць у адказ спачуванне. Як хораша паразумецца з тым, каму нічым не абавязаны, і вось жыццё зноў здаецца вам добразычліва-прывілеяваным, добраўпарадкаваным, прыстойным, калі можна так драмаць у братэрскіх абдымках і не наважвацца працягнуць руку, каб...

Сіла, што валодае табой, Уладальнік, больш не сіла, хіба што яе памножыць на разгубленасць, адчай і неспадзяванку: хіба такой бачылася твая будучыня? Ты не застаўся з Дадуткай, Дадутка-прыхаць, дадутка-шал, дадутка-безнадзейнасць, бяссілле, бязлітасныя гады беспрыўкрасна аддзяляюць відавочнасць і *«ўсё скончыцца тым, тым і тым»* ад пажаднасці жадання і *«а можа нешта атрымаецца?»*; на полі бітвы ляжаць забітыя і параненыя, але гэта забітыя і параненыя твайго войска, Уладальнік. «Дадутка зірнула... Дадутка зрабіла... Дадутка хоча ў адпачынак», — і ты прапануеш ёй падарожжа, раскошу вандроўкі, і турбуеш яе раптоўнымі званкамі ў далёкім гасцінічным нумары. Хіба яна адна? Нашто ты звоніш, нашто прымушаеш падымацца з улежнага месца, спакуснай хвіліннай хованкі — мужчынскага цела, мужчынскіх абдымкаў...

Паветра электрызуецца, конікі трашчаць, як заведзеныя, месцазнаходжанне засакрэчана; парламенцкі дзяржсакратар трымае справаздачу ў міністэрстве эканомікі, ён апраўдваецца, але насядае, можа абвінаваціць: «...у выніку прадастаўлення Турцыі для выпрабаванняў нямецкага цяжкага танка «Леапард» узнік канфлікт... з'явіўшыеся ў апошні час публікацыі на тэму паставак нямецкай разведвальнай машыны «Фукс» у Аб'яднаныя Арабскія Эміраты не адпавядаюць рэчаіснасці...» На пергаментным тва-

ры дзяржсакратара не дрыжыць ніводзін мускул, ён дастае словы з вузкага роту, як дастаюць кінжал, вострае лязо, умелая аграпка, напамін пра вайну, што паробіш — *спадчына.*

Носьбіт інфармацыі — унук аматара батанікі, ён паказвае месца, дзе паўстагоддзя таму ўзарвалася бомба, накрыўшы дубы, стары маёнтак, дубы, аранжарэю, дубы, паркавую скульптуру— мармуровага анёлка, і, уявіце сабе: выбух паклаў стогадовыя дрэвы, аранжэрэя склалася, як картачны дамок, пахаваўшы пад сталёвай арматурай і бітым шклом усе гэтыя крокусы, фікусы, фінікі, гібіскусы, пальмы. Шквал ветру пашкодзіў маёнтак, разбурыў частку сцяны, мур, з якога скочыла ў старажытны Рэйн блакітнавокая Ларэлея; уявіце сабе, — працягваў ён, — калі дым, пыл і друз аселі (а прайшлі доўгія хвіліны, пакуль тое адбылося) у эпіцэнтры выбуху, у самюткай варонцы застаўся ляжаць анёлак... *Вы яго зараз пабачыце...* паркавы небажыцель — мармуровы анёлак, якога лёгка можна было сустрэць у старасельскіх, смаленскіх, рагачоўскіх, вялікадзяржаўных алеях, стаяў на пастаменце, гулліва аглядаючы нас з вышыні. Я пакланілася яму, як старому знаёмцу. А спадарожнік крыкнуў: «Паглядзі на Рэйн, гожы, славуты Рэйн! Хіба цябе не ўражвае ягоная веліч?»

Так-так, заканамернае развіццё падзей: выжывае *мацнейшы* і, акрамя таго, мне карцела знаходзіцца ў новым месцы, амаль свяшчэнным, куды не дасягае атрутная пара чалавечай незадаволенасці, чалавечай разлютаванасці і чалавечай жоўці, барацьба — прывілея жабракоў; не хочацца назаўжды заставацца ў краіне, дзе паветра пахне супам для маламаёмных, а большасць суайчыннікаў давяраюць радыё, як духоўніку, хаця ў эфіры пралюбадзейнічаюць супрацоўнікі сіраты, дзятдомаўца і гомасэксуаліста — галоўнага рэдактара нацыянальнай FM-хвалі. «Што новага вы нам скажаце? Вы сёння хто, гаспадзін Начальнік: дзевачка альбо мальчык? Свет вам падаецца жорсткім ці рамантычным, слашчавым; кашчавым; паскудным; цнатлівым?..» Дзяўчыне патрэбны ўпрыгожванні, танныя цацкі, ёй патрэбны шаўковыя панчохі і строі, яшчэ лепей — прыгоды, ёй бы хацелася паляжаць у ложку з сапраўдным мужчынам, падобным на прэзідэнта, дзяўчына падстаўляе свой зад і абапіраецца на круглыя калені, дужыя далоні, надта вялізныя, каб належаць прадстаўніцы слабога полу; шырокі ложак, вузкі праход і да т. п.

— Ты ўсё яшчэ раўнуеш?

— Не.

— Ты жывеш, памятаючы пра здраду, ты не можаш ад гэтага пазбавіцца?

— Лепей гэта была б здрада.

— Я не разумею: то раўнуеш, то сама кажаш, што здрада для цябе не мае значэння.

— ...Мае значэнне... Але лепей бы гэта была здрада.

— У нас нічога не было, я не спаў з ёй.

Так, ты не спаў. Толькі калі яна сварылася са сваім «параненым у галаву» міліцыянтам, мой муж браў яе за руку і заводзіў у гасцініцу, дзе здымаў нумар на ўсю ноч... ці некалькі начэй... дзён... Далібог, маладзіцы, якіх ратуюць ад узурпатараў у мэбліраваных пакоях, не дораць на памяць свае фотаздымкі...

Гэта занадта; усё магло скласціся іначай, але ўсё склалася своечасова для таго, каб не мець права на папрокі. Мы мроілі бяспечнымі адносінамі — і штодня набівалі свае сэрцы, як чучалы для гасцёўні, шротам абыякавасці, непрыязнасці, гідлівасці, стомы, спрэчкамі і звадамі, даходлівымі лозунгамі пра ўзаемадавер, узаемапавагу і нават сімпатыі адзін да аднога, дурні, — думалася абодвум; дурні, — але *працэс пайшоў, «сёння табе не ўдасца разыграць спектакль, я бачу цябе наскрозь...»*; усяго наабяцаюць; *хочацца верыць — не хочацца верыць; дакажы сваю добранамернасць; «я за дэмакратыю... а ты пра што?»*

Армія патрыётаў выходзіла тым часам на вуліцы, хаця справа не тычылася іх кар'еры, а толькі кар'еры іхніх лідэраў; гэтыя прайдзісветы зноў напярэдзе, яны зноў прадбачліва папярэджваюць: што будзе з кожным паасобку і з ўсёй краінай, калі яны, гэтыя суперпатрыёты, не прыйдуць да ўлады. «Ні адзін з нас, — крычэлі яны, — не хоча жыць за мяжой, мы толькі хочам, каб жыццё тут было падобнае на жыццё за мяжой». Так кляліся паэты і... ад'язджалі ў Амерыку выбіваць кілімы, заліваць гудронам дахі, спакушаць фрыгідных кабет з нацыянальных дыяспар; так кляліся палітыкі і, забыўшыся на народ, старанна даказвалі сваю грунтоўнасць на замежнай палітычнай сцэне, імітуючы асабістую значнасць, ідэйнасць і дзейнасць, ды хто толькі ні выказваў сваю прыхільнасць масам! — заўсёды прымітыўны рацыянальны эгаізм пераважваў, і народ выступаў за «не самых разумных, але ж сваіх», за навічкоў — местачковых балванаў, за старую гвардыю — былы партактыў, апаратчыкаў, цэкоўскую школу, сталёвыя мазгі (гэтыя не дадуць насміхацца над радзімай, яны ўжо ж гатовыя панавесці парадак!).

...Ты не там, ты не ў натоўпе. Ты перастаў давяраць лідэрам: левым, правым, камуністам, дэмакратам, ідэйным, рэлігійным, прадстаўнікам улады, прадстаўнікам апазіцыі. «Чым горай, тым лепей», — новы славянскі лозунг, створаны для рэспубліканскага карыстання, унутрыведамаснай чынавецкай парукі, маўклівага бунтарства рабочых і сялянскіх мас; сабатаж — вось што такое

патрабаванне часу, якому падпарадкоўваюцца нават сямейныя пары: быць шчаслівымі непрыстойна, калі *радзіма ў небяспецы.* Нам зноў не хочацца разумець адно аднаго, затое хочацца, каб нехта старонні разумеў усё: ад першага да апошняга слова. Ты мітусішся, засяроджаны на асабістым горы і ўласным шчасці; ты перастаеш хаваць фотаздымак маладой дзяўчыны, але старанна змываеш ейны пах, дотыкі, словы (нібы словы, нават з тэлефоннай размовы, могуць выступіць экзэмнымі плямамі на целе, горка-гаючай жывіцай), ты сочыш за сваёй няўрымслівай спадарожніцай у начных снабачаннях, ты наогул кепска спіш і часта ўздыхаеш. Каб не падацца нетактоўнай і назолай, паварочваюся да цябе спіной і... *што? ты не варты ейнага ложку?* і... *ты не варты майго ложку...* Меланхолія задавальняе цябе, напаўняе жыццё сталага мужчыны навюткім сэнсам, тайнай адзнакай, нібы ён цяпер належыць *абраным*; «мае спачуванні, дарагі... я не хачу набліжваць час, калі ты апранеш рытуальны чорны строй і *насыплеш попелам галаву*»; прэч дыктатуру пачуццяў, хай усталюецца натуральны парадак рэчаў, ісціна: *як гукнеш, так і адгукнецца.*

Запознены ўжо хвіліну стаяў на адным месцы, раскачваўся нервова і ашаломлена, ён знайшоў, за кім імкнуўся на пах; аб'ект ягоных пошукаў рушыў на зялёнае святло, а мужчына так і застаўся на месцы, аслеплены адкрыццём: ён павінен быў заставацца да канца, да самюткай развязкі, а іначай яму не варта было ісці ў палітыку. Ён жа сам абраў сабе ролю палітыка (прызнаўшы там самым, што архітэктура, гісторыя і нават паэзія больш сумніўны занятак, чымся вялікая палітыка), а гэтая роля часцяком супадае з роляй пакутніка. Разважаючы, Запознены правёў вачыма Тонкую Бананавую Скурку, чые блізкія продкі скаралі Еўропу, як далёкія — пальмавыя лясы, *мне нідзе не знайсці прыбежышча*; ён намерыўся ісці назад, у бок гатэля, і Карлштрасэ хісталася пад ягонымі крокамі, як палуба ў хвіліну бяспекі, але ніхто вакол не думаў пра крушэнне і буру; можа быць, тут жывуць толькі моцныя, дужыя, упэўненыя, — думаў Запознены, — народ, адаптаваны да землятрусаў; да ўзрушэнняў. Доказ атсутнічаў; *тут таксама адбываецца рэстаўрацыя; рэстаўраваны нацыяналізм*; Тонкая Бананавая Скурка пахне не парфумай, а салодкім пахам спаленай чалавечай скуры, болем і потам патыхае яе лёгкая хада, пачварнымі вопытамі адных разумных істот над другімі.

«Мізэрная здабыча ўцякла», — сумна зазначыў паляўнічы, начныя матылі віюцца над соннай ружай, чорнай ружай неўразумелага гатунку.

Жонка — вось хто чакаў ад яго мемуараў, дзе былі б названы імёны: сляпых у ролі павадыроў, вучняў у ролі правідцаў, д'ябла-

вы гульні, д'яблавы хітрыкі, масіраваная атака на розум неразумных, *сон розуму...;* верная саратніца павінна ведаць, што ён не спацьме ў ганаровай дзяржаўнай труне, накрытай рэвалюцыйным штандарам, ён перастаў быць сімпатычным нават у вачах дыпламатаў — грамадзянін эпохі незалежнасці, пераможаны нявартымі яго; сімвал пагарды, хаця мог бы звацца сімвалам любові да радзімы, бо ён любіў моцна, самаддана, можа, нават, мацней, чым тыя, хто застаўся ў межах радзімы, ён мог яшчэ ідэалізаваць народ са свайго *далёкага-далёка*, але народ канстатаваў: *здраднік*, варты такой долі. Але і гэтага было недастаткова... Антыпатыя да чырвонага зрабіла яго выгнаннікам, прысаромленым вучнем вялікіх папярэднікаў, што загінулі ў змаганні за незалежнасць краіны; Запознены не прыйшоў *позна*, ён *затрымаўся* на болей, чым таго патрабавалі абставіны, мільёны даверылі яму сваю будучыню, і ён не апраўдаў даверу...

Ён ішоў, не звяртаючы ні на каго ўвагі, крочыў паспешліва, не беручы пад увагу, што яго абачліва абміналі: адзінокія, умоўна знаёмыя, цесныя парачкі, маладзіцы ў суперблiскучых панчохах, чыноўнікі з залысінамі і скуранымі папкамі, замежныя турысты, энцыклапедысты, рамантыкі, удачлівыя і няўдачлівыя, сацыял-дэмакраты, нацыяналісты, унукі нацыстаў і нашчадкі ахвяр нацызму. Запознены гатовы быў закрычаць: ён у лесе, сярод дрэваўлюдзей, у самым гушчары, ён заблукаў і не зможа доўга пратрымацца ў гэтым лесе, нават калі зважаць на тое, што лес — любімы вобраз нямецкіх паэтаў. Каго з нямецкіх паэтаў ён чытаў у арыгінале?.. Ён сам выйшаў з хваёвых лясоў, дзе даўно ператварыліся ў глебу, ігліцу, жывіцу і мох забітыя суайчыннікі; большасць з іх магла дажыць да гэтага часу, калі б не было вялікай нямецкай гісторыі, вялікіх нямецкіх паэтаў, вялікіх нямецкіх філосафаў, бацькі і заступніка сусветнага пралетарыята і фюрера — найвялікшага неўрасценіка XX стагоддзя.

Краіна, дзе знайшоў прытулак Запознены — хіба і сёння не здатная яна на любое ашуканства? «Гэта вайна, а не прыгодніцкі раман; вайна працягваецца», — разважаў Запознены, *але і гэтага было недастаткова.* ...Што такое: пасеяць Смерць? Нібыта Смерць — гэта зерне, як пшаніца ці жыта, *памяраць збірайся, а жыта сей;* сейбіт — той, хто поўнай жменяй налева і направа раскідвае жудаснае, ядранае, змрочнае, правакацыйнае зерне нябыту. «...не прыгодніцкі раман для непаўналетніх». *Але і гэтага было недастаткова.* Ён заўважаў непаўналетніх, малалетніх, падлеткаў еўрапейскай краіны: іхняя жыццярадаснасць падавалася яму абнадзейваючай уседазволенасцю, здаровы выгляд — істэрычнай руплівасцю, разбоўтанасць — смуткам па ўпарадкаванасці і парадку, іхняе адзенне — выклікам грамадству, іхнія думкі — карычне-

вымі, погляды неанацысцкімі; *фюрэр любіць дзяцей, будучыня за намі*; яны — галоўныя трымальнікі акцый кампаніі «Глобус», карпарацыі «Сусвет», канцэрна «Касмічныя войны»... Яму трэба было ажаніцца раней, завесці дзяцей, крочыць па жыцці разам з моладдзю, назіраць за сталеннем, каб паспяваць удасканальвацца, ісці на кампрамісы, — так, глядзіш, і не былі б здзейснены памылкі. Бедны разгублены лідэр, незадаволены жыццём, пачварнае адчуванне бессэнсоўнасці напоўніла мужчынскае сэрца ў той час, як ягоная жонка з вышыні дванаццатага паверха гатэля пазірала на вечаровы пейзаж, бясконцы горад, бясконцы сум, бясконцая туга ў зледзянела-вільготных вачах...

Што давала табе надзею, пра якую ты дбаў распавесці раней, чым я адкрыю табе таямніцу? Мы былі часцінкамі адно аднаго, узаконенымі часцінкамі, пакуль я не стала тваім *сродкам для дасягнення мэты*, дасканала абраным аб'ектам для жыцця, эксперыментаў і пакут, смірыцельнай кашуляй для дарослага свавольніка, рэдкая кветка ў гербарыі пачуццяў, а можа быць, дубец для твайго ўласнага садамазахісцкага раскаяння.

Я кладу тваю руку на сваё ўлонне, вышэй, яшчэ крыху вышэй, ты торгаешся, пазіраеш пытліва, аж пакуль не пырскаеш чырванню. Я шчаслівая: *ты разумееш усё.* Няпраўда, кабета не ўсміхалася зласліва, яна наогул не ўсміхалася, покуль ты размаўляў апрыёры, ты павінен быў залівацца гаручымі слязьмі, што згубіў сваю каханую, дарэчы, чаго яшчэ ты мог прычакаць? Кожны ўчынак працягвае нас ствараць: безабаронна-голымі, як з біблейскіх садоў, і тады адзеннем становяцца нашыя перажыванні. Палюбі найбліжэйшага свайго, — гаворыць Вялікая Кніга і не тлумачыць: пакінь яго ў спакоі.

Ты зноўку сядзеў поруч у глухой адзіноце і зноўку выкладваў падрабязнасці, што ўсё скончылася разрывам з Дадуткай, і ты больш нічога не патрабуеш ад яе; гаворачы з прывіднымі істотамі, чыя існасць у пакоі падлягала сумненню, ты намагаўся сачыць за рухамі ценю, светлаценяў, злуючыся на мяне ўжо адно за тое, што нібыта я прымусіла пераказаць цябе ўсю гэтую лухту, жорсткую ў выкананні. «Вам дадуць найменне «знішчальнікі маралі», але вы толькі адкрывальнікі саміх сябе», — здаецца, так навучаў цынічна-годны Ніцшэ.

За што на цябе злавацца? Хіба на надвор'е? «Ну вось і дождж, здаецца, пайшоў», — гаворыш ты. І нерашуча цягнеш руку да мяне, але неўзабаве падымаеш яе ўвыш — нібыта да неба.

— Хіба не так?.. Чаму ты маўчала ўвесь гэты час?

...які час?

...час, калі мы жылі паасобку.

Мой Уладальнік, няшчасны кат, схілены над сваёй ахвярай, якой не можа выказаць спачуванне. Ты не такі? Усё зусім іначай; іначай што пра нас падумаюць суседзі? Вось чаму ты безупынна глядзіш убок, каб пазбавіцца запозненай споведзі; жалкуеш, але на самога сябе...

Да налецця і ты пойдзеш у свет за вачыма... Выканаеш прыгавор, ператрываеш нядужасць, нібы па чужым волевыяўленні безудзельна забыўшыся на гэтую хвіліну мужчынскай роспачы і бяссілля.

Горад клікаў, але без указальнікаў; ён выклікаў на арэну, але вакол не было ні рэпарцёраў, ні гледачоў, перад якімі варта было б біцца насмерць, гняўліва адсякаючы ад астатніх таго, хто трымае ў руках чырвоную анучу, танны сімвал; вера, абавязак і «айчына ў небяспецы», яму не прабачылі ўтрапёнасці: надта многа фанатычнай дзёрзкасці ў голасе, аптымістычнага гневу і патрыятычнай балаганнасці. З новым піарам, шансанье палітычнай сцэны, з піарам падчас чумы, экспанат музея гісторыі! Супраціўленне ўладам караецца смерцю... Ён застаўся ў жывых, ці варта за тое аддзячыць тырана? Ці варта застацца ў публічнай цяпліцы краіны, парніку страху, адчаю і чакання, узрошчваючы элітарную флору, — тых, каму застанецца толькі выбіраць, за чыю дыктатуру прагаласаваць...

Запознены азірнуўся, ён згубіў перспектыву быцця; побач мастак маляваў нямецкі пейзаж вечаровага горада, сонца садзілася за статую незнаёмага пакутніка, жыццярадаснасць змрочнага быту; чародка дзявіц прамільгнула праз пераход, выстаўляючы даўгалыгія ногі, як раскошлівыя прыстасаванні для плоцкай любові; Смерць шпацыравала за ім па пятах, і Запознены прадчуваў яе асвойтаную постаць... Але вакол усё было, як і раней, нібыта нічога не здаралася. Сэрца Запозненага пачашчана тахкала; звечарэла, але ён перабольшваў, думаючы, што зараз з'явіцца месяц, каб зацямніць алебастравыя ліхтарні, каменныя парасткі, кволыя кветкі на падваконнях, перавернутыя ўніз галавою, гатычныя бетонныя армады і, урэшце, задрапіраваць стылістыку вялікагерманскага рэйха.

Запознены паправіў гальштук, дакладней, расцягнуў яго вальней, яму не хапала паветра, запас гаручага скончыўся, — сэрца працавала ўхаластую; панылы аматар знешніх эфектаў раптам усвядоміў, што *нацыянальныя інстынкты памерлі*, і ён памірае таксама... Il camerata...* за шклянымі дзвярыма п'юць піва простыя хлопцы; піцейныя не пустуюць, але з дня на дзень чакаецца папаўненне: пасля таго, як уступіць у сілу закон аб так званай «зя-

---

* Ад італьянскага «саратнік, таварыш па зброі». Так звярталіся адзін да аднога фашысты.

лёнай карце», у Германію прыедзе «замежны легіён» камп'ютэрных спецыялістаў з іншых краін. *Сімвалічнае ўручэнне карты № 1 адбудзецца... у Нюрнбергу... міністр па справах занятасці Вальтэр Рыстэр кажа, што асабіста падпіша яе.* Рабіць прарыў у сферы інфармацыйных тэхналогій дапамогуць Германіі і суайчыннікі Запозненага... Праз пяць гадоў «ударнікі кампрацы» павінны пакінуць заходнюю краіну і не будуць прасіць прыбежышча. А іначай — усіх гэтых паганых шчаўкункоў, што ўмела шчоўкаюць і пстрыкаюць па камп'ютэрных клавішах, выкліча да сябе легендарны персанаж: старэйшы саветнік суда, ён жа прыдворны гадзіннікавых спраў майстар, ён жа цудадзей Драсельмейер з Нюрнбергу...

— *Кепскі тавар!.. Нічога няма з таго, што мне патрэбна. Пяцьдзесят гадоў таму было куды лепей*, — сварыцца злая чараўніца Крэйтэрвейс*, якая мае звычай раз у пяцьдзесят гадоў выходзіць у горад, каб закупаць правізію... Час, адведзены на спачынак, яшчэ не мінуў, але дынамізм сучаснага грамадства, праяўлены ва ўзбуйненні міжнародных карпарацый, фінансавых груп, у інтэрнацыяналізацыі бізнеса, мабільнасці насельніцтва, з'яўленні камп'ютэрных тэхналогій, інтэрнета, агульнамасавай культуры, суцэльнай глабалізацыі свету, збілі старую з панталыку; хоцькі-няхоцькі давялося выпаўзці ў свет... Год — за дзесяць?!

На адлегласці старая здавалася кулём чорна-пярэстых лахманоў, адзіным прадметам, у якім яшчэ дыхае жыццё; усе астатнія хадакі больш падобныя на марыянетак, і вось поруч з ёй апынуўся мужчына, ён паклаў ёй руку на плячо, — бледнатвары, з крыху вырачанымі вачыма, з потам на ілбе і скронях, з распушчаным гальштукам, панылы і цвярозы, а зрэшты, даволі рашучы, усевідушчы. Крэйтэрвейс паспрабавала вызваліцца, клявала носам, торгала старэчай сівой галавой, зморшчанай шыяй, ад яе патыхала начлежкай, газай і нямытымі нагамі... яны спрачаліся, дамаўляючыся пра нешта важкае, вельмі-вельмі істотнае. Хадыкі спасцярожліва абміналі іх заганную інтымнасць, праходзілі хутка, каб не быць замешанымі ў неўразумелае і непрыстойнае дзейства. Святло лілося з вокнаў, мрэлі ліхтарні, руды сабака, жыхар трушчоб і падваротняў наважыўся абнюхаць парачку: пярэсты куль і мужчыну, заглыбленага ў сябе; у вачах дварняка прамільгнуў недавер, ён пакрочыў, каб з нейкага цёмнага кута назіраць за злашчаснай містэрыяй.

Нас авявала іншае паветра; ніхто не адчуваў сябе гаспадаром становішча, хіба што маленькі чалавечак, эмбрыён у цёплым матуліным чэраве, малесенькі сыночак, які дзень пры дні набіраўся

---

* Персанаж казкі Вільгельма Гаўфа «Карлік Нос».

сілы і моцы, рос і дужэў ува мне; *апошняе слова...* Магчыма, гэта і не махлярства зусім, ранняя вечаровая цеплыня і дождж-драбнасей *на вуліцы імя Чырвонай Шапачкі.* Дзейснасць, забытая на час; дзейснасць, якая дае падставу ўсё разумець як махлярства; разгублены, ты маўчыш, нібы чакаеш, што прыйдзе перакладчык і голасам, падобным на крыклівы клаксон, патлумачыць, чаго мы хочам адзін ад аднаго.

...Ён кахаў цябе? — я: здрадніца, я: крышу хлеб, покуль у руках не застаецца адно скарынка, — ...не адразу. — ...не вытрымалі выпрабаванняў? — Віна не п'еш, — кажаш ты, — а мне так хочацца напіцца. — Калі ласка, я згатую кавы; запару зялёнай гарбаты; налью вады і пакладу туды лёд. — Чаму не сказала прама? Ты саромелася?

«...саромелася», — меланхалічна паўтараў ён. Мы выйшлі на вуліцу. Божа, ратуй, колькі шчасця свеціцца ў маіх вачах; ты галантна трымаеш мяне пад руку.

— Я з'еду...

— Калі?

— Заўтра, сёння, усё адно калі. Калі хочаш!

Па вуліцы імя казачнай гераіні праходзяць мужчыны; ты ўважліва назіраеш: нехта з іх можа быць бацькам майго дзіцяці. Калі ён крыху вырасце, я пачну чытаць яму нанач добрыя нямецкія казкі пра Хлопчыка-з-пальчык; пра Якаба, які стане Карлікам Носам; пра мыш аб сямі галовах і адважную Мары; пра музыку-асла і ягоных сяброў, *«пайду ж я ў нямецкі горад Брэмен і стану там гарадскім музыкантам»*; і, вядома ж, пра Чырвоную Шапачку...

У галаве ўзнікае блытаніна, ты пачціва змаўкаеш, калі я шчыра кажу: «Добра, што гэта адбываецца не ў Польшчы». Ты зацікаўлены; краем вока пазіраеш у вітрыну, за якой стаяць пляшкі з віном, процьма этыкетак; жыццё можна будаваць без самападману; мы, выканаўцы галоўных роляў на падмостках вось-вось прамінулага часу. Побач праходзіць яшчэ мужчына. «Ён не такі, як ты», — зазначаю; ты разгублены і не ведаеш, між іншым, што табе тут рабіць. Спяшаюся: ты чуў? ...мне пераказала суседка, і я пераказваю табе: у невялікім гарадку на поўначы Польшчы жыхары новага квартала пратэстуюць супраць таго, што адну з вуліц назвалі імем Чырвонай Шапачкі. Дваццаць сем'яў накіравалі ў мэрыю петыцыю з просьбай як мага хутчэй змяніць назву. «Чырвоная Шапачка наводзіць на сумнавядомыя камуністычныя асацыяцыі». «Для мяне чырвоны колер самы кепскі, гэта нагадвае пра камуністаў. Хто рэагуе па-іншаму, — калі ласка, хай жыве на гэтай вуліцы, а мне асабіста гідка!» — заявіла ў інтэрв'ю мясцовай газеце спадарыня Глебовіч... Чым скончыцца гісторыя з пераназовам

вуліцы, размешчанай каля праспекта Беласнежкі, невядома, але не выключана, што ў бліжэйшы час яна пачне насіць імя Шэрага Воўка...

Смешна, але як абавязваюць падобныя недарэчныя гісторыі, — ты пасміхаешся, нібы абудзіўшыся ад сну, бедненькая Глебовіч, пасля перажытага ўзрушэння яна прыняла б усё гэта за прапаганду, мы спачуваем яе дзецям і дзецям астатніх жыхароў невядомага нам квартала: невінаватыя малечы прапісаліся на правінцыйных кладах сацыялістычнай эпохі.

Надзея — вось гарката, яна мае намер падаўжаць чалавечыя пакуты; горад як горад, крыху абмыты кароткачасным дажджом, у горадзе маецца вязніца чараўніцы, дзень у дзень паўз яе цагляныя сцены дзеці ходзяць у школу, вузкія вулкі крута ўздымаюцца ўверх і рэзка абрываюцца, яны патрабуюць толькі спакойнай і вольнай хады, вуліцы-брукаванкі. Калі б мы раслі ў Швальмштаце, мы б сустракаліся на вузенькім мастку невялікай рачулкі і ты прыносіў бы садовыя кветкі — герань і ляўкоі.

Гэта правакацыя, падаць тварам уніз, пакрысе завальваючыся набок, каб усё-ткі абараніць ад удару аб асфальт нос, вочы і худыя сківіцы; «я нікому не патрэбны, я смешны і мне не пад сілу змяніць абставіны», «я прапажа для краіны, у якой прапажы сцвердзіліся як звычай»; у горадзе падняўся вецер, ён гоніць смецце па тратуары: недапалкі, скарыстаныя квіткі на грамадскі транспарт, кавалкі газетнай паперы і згубленыя гузікі; вецер вымушае старую ў дзівацкім пярэстым адзенні спусціцца ў бліжэйшую падземку. Сабака ў цемені не абураецца, натапырыўшы вушы, спрабуе зразумець: што адбылося з чалавекам у цёмным, з чалавекам у цёмным летніку, якія носяць адвакаты і апазіцыянеры ад супрацьлеглага, як напамін аб былых поспехах часовай абранасці і прамінулай запатрабаванасці. Запознены — памерлы, ягоны твар падаўся б нам жудасным, калі б мы з Уладальнікам змаглі б на той час убачыць ягоны твар мерцвяка; чырвоная кроў выцякала з прабітай скроні — моцны ўдар! моцны ўдар таму, хто памёр яшчэ да ўдару аб асфальт і бетон. Каменны лес набліжаўся з усіх бакоў; старому зверу зламалі хрыбет; нацыя салдат вышуквала ваўка па ўсім лесе, а той, выключаны з агульнай шэрай масы, забраўшы ў людзей, якія паштодзень змагаліся за кавалак хлеба, самае дарагое — Веру, стаўся заложнікам катастрофы, народжанай ягонымі думкамі, уласнай папулярнасцю і няўменнем быць на роўных з абставінамі.

— Ваш бацька? — звярнуўся палісмэн да ўнука аматара батанікі, уладальніка аўтэнтычнага анёлка ў раскошлівым парку.

Той спачувальна нахіліўся над мерцвяком, ён адзіны наважыўся падысці да чалавека, якога напачатку прыняў за п'янага. Статыст вечаровай дзеі, выпадковы сведка быў ізноў закаханы: яму не патрэбна алібі, ягоныя вочы ззялі шчасліва і трывожна (зусім позніцца на спатканне, і собіла ж яму!.. і як цяпер усё патлумачыць?) Але зірнуўшы на палісмена, маладзён пабачыў, як у іхні бок бяжыць дзяўчына, толькі што яна вярталася знаёмай дарогай, мацуючы крокамі крыўду: спазніўся... не прыйшоў... не...; і вось ужо крыўда забытая, Тонкая Бананавая Скурка ў адначас усё зразумела, рукі закаханых сустрэліся і сашчапіліся моцна-моцна...

А ў свеце тым часам усё ішло сваёй чарадой:

— ты ад'язджаў электрычкай, каб пазней перасесці ў самалёт;

— я шчасліва пасміхалася, паклаўшы руку на жывот;

— Ева Браўн Бездапаможная набірала нумар мясцовага шэфарэдактара радыё «Свабода»;

— анёлак-небажыцель упершыню за свой мармуровы век каціўся па месячным сяйве на другі бераг бязмоўнага магутнага Рэйна;

— швальмштацкі лес пакрываўся своеасаблівым арыйскім туманам;

— збранзавелы воўк-помнік падсоўваўся бліжэй да адзінавернай сяброўкі — збранзавелай Чырвонай Шапачкі;

— Дадутка пазяхала, не ведаючы, што неўзабаве ёй давядзецца набіраць тэкст-спачуванне пра заўчасную смерць на эміграцыі *апостала нацыі, сумлення нацыі*, экс-дэпутата і патрыёта Запозненага;

— чалавечак з тварам камбалы і пустымі вачніцамі засяроджана, з захапленнем слухаў марш альпійскіх стралкоў;

— бюргеры пілі сваё вечаровае піва — напой, *які распальвае нацыянальную самасвядомасць немцаў і абуджае любоў да Айчыны* (хто такі назіральны? здаецца, Кёпен*);

— палітычныя выгнаннікі ва ўсім свеце разважалі пра сваю абранасць і вялікасць, запамятаваўшы на вопыт старажытных: шлях у Аід аднолькавы адусюль...

Канец

— А дзе ж я, — спытаўся сапраўдны бацька будучага дзіцёнка, — гэта ж я ратаваў цябе ад твайго Уладальніка, ад расчаравання на ўвесь свет, урэшце, я цябе звёз у Германію. І чым ты мне адплаціла... Тут няма ані слова пра мяне!

---

* Пісьменнік Вольфганг Кёпен.

«Ён мае рацыю», — адзначаю моўчкі і спакойна працягваю:

— Я выпраўлю гэтую памылку. Выпраўляйся ў лес!

— Навошта?

— Не пытайся, проста ідзі ў лес.

Ён паслухмяна крочыць у бок ялінаў і хвой, а калі ён схаваецца за дрэвамі, я рушу следам, сцярожка кіруючыся праз шэра-малочны туман, шэры і малочны туман:

— Я іду! Я — Чырвоная Шапачка.

— А я хто? (здалёк).

— А ты — Шэры Воўк.

І ты скочыш мне насустрач, не паглядзеўшы на тое, што класічная казка развіваецца па іншых законах, абхопіш мяне сваімі дужымі лапамі, моцнымі і мяккімі звярынымі лапамі, паваліш на зялёны мох (*прызнаю:* падобны мох расце і на Любаншчыне), на мох і салодкі верас, будзеш зрываць адзенне, смешныя людскія прычындалы, і, уславіўшы першароднасць граху *(ты)*, уславіўшы першароднасць здрады *(я)*, мы злучымся адпаведна прыродзе і чалавечым інстынктам.

— Цяпер ты ўва мне. Табе добра... мой малесенькі?

P.S. Аматарам казак напамін: *у лесе жыве шмат ваўкоў. Адным дастанецца па адным, а іншым, мажліва й болей.*

Любаншчына, 2000 — Мінск, 2001

ЭДЭМ ПАЧЫНАЕЦЦА ЛЕТАМ

I

Хутка зачыняць метро, але яна паспела. І калі падышоў цягнік, яна села на лаўку, паклала поруч рэпарцёр, скінуўшы вузкі раменьчык з пляча, закінула нагу на нагу, заплюшчыла вочы і паспрабавала расслабіцца. Яна ўжо намацала мыском правага туфлі-ка вузкі абцасік левага, каб звыклым рухам скінуць адзін, а потым другі, як пачула, што ў вагон нехта заскочыў. Яна не адплюшчыла вочы і не зняла туфляў. Але той нехта сеў поруч, зусім шчыльна, як стары знаёмы. Жанчына рэзка павярнула галаву, дасылаючы абураны позірк нахабе, ды ён зусім і не думаў глядзець на яе. Трохі ссунуўшыся ўніз на лаве, ён сядзеў нязмушана, разняволена, закінуўшы галаву назад так, што макаўкай прыціскаўся да вагоннага шкла. Яна не злавіла ягонага погляду, бо мужчына не зварухнуўся, гледзячы некуды ўвыш шырока расплюшчанымі, як вырачанымі, вачамі. Вагон быў пусты, і можна адсесці, але яна не зрабіла гэтага. Жанчына паспела пабачыць, што незнаёмец густоўна апрануты, мае добрую стрыжку і зусім не падобны на п'янага. Яна зноў паспрабавала расслабіцца.

...Праца так зацягнулася, што яна ледзь трапіла на электрычку. Упершыню яна адна так позна вярталася з працы. Сёння прыязджаў тэатр з Міёраў, паказваў толькі адзін спектакль — скандальную п'еску. Іхняга прыезду чакалі, бо кіраваў тэатрам вядомы мінскі рэжысёр, які пасля некалькіх гучных сварак з калегамі (што дало на працяглы час тэму розным журналістам), з'ехаў у правінцыю і, як даходзілі чуткі, стварыў свой, незалежны тэатральны калектыў. Спектакль паказвалі ў шыкоўным нетэатральным будынку, што падагрэла цікаўнасць публікі. А яна вырашыла пагутарыць з апальным рэжысёрам і ўзяла рэпарцёр. Дзея на сцэне выклікала шмат воплескаў, пад канец крычалі «брава», акцёры зноў і зноў выбягалі, дасылалі ў залу паветраныя пацалункі і шчаслівыя ўсмешкі. Журналістка прабралася да трыумфальнага рэжысёра і дамовілася на інтэрв'ю. Яны доўга чакалі, покуль усе разыдуцца, і ўладкаваліся на сярэдзіне пустога рада. Яна ўключыла рэпарцёр, пачала задаваць пытанні. Некалькі разоў да іх падбя-

галі, нешта казалі яе суразмоўцу. Урэшце здалёк, ад дзвярэй, нейкая кабета пракрычала, што не збіраецца сядзець тут цэлую ноч, зараз выключыць у зале святло, пазамыкае ўсё і пойдзе. І тады рэжысёр запрасіў яе на банкет, які мусіў зараз пачацца. Ён паабяцаў, што абавязкова знойдзе час, каб пагаварыць. Так яна апынулася ў банкетнай зале, каля яе пачалі завіхацца прыстойныя маладыя людзі; госці гаманілі пра вечнае: мастацтва, каханне і Айчыну. Час ляцеў імкліва, а рэжысёра то абкружалі акцёры і нешта задаволена выкрыквалі, то яго цягнуў у кут немалады, асаністага выгляду мужчына, а ў таго вінаваўцу ўрачыстасці пераймала хударлявая, высокая дама з вечным грымам маладосці на твары... Журналістка некалькі разоў кідала на яго жаласлівыя позіркі, і неяк ён падышоў да яе, спытаў, як далёка яна жыве, і паабяцаў, што адразу пасля заканчэння банкету, калі ўся трупа паедзе дадому, у Міёры, яны падкінуць яе на сваім «рафіку». Засталося толькі бавіць час і чакаць, бо яны дамовіліся пагутарыць перад ад'ездам.

...Пазней яна задала некалькі цікава-патрабавальных пытанняў, атрымала шчырыя адказы, не абмежаваныя прафесійнай сферай; яны закранулі палітыку, гісторыю і філасофію. Сапраўды, рэжысёр быў выдатным суразмоўцам. І, пэўна, далей усё атрымалася б так, як ён планаваў для яе, — магчымасць спакойна і хутка дабрацца дадому. Калі б не ўпартасць шафёра: пакуль ішла гамана ў машыне, той кіраваў і спыніўся каля апошняй станцыі метро на супрацьлеглым ад яе дома канцы горада. Ніхто не змог угаварыць яго развярнуцца, прыйшлося выйсці з машыны і бегчы ў бязлюдную падземку.

Жанчына раптам страпянулася, як выхапленая са сну птушка, і спалохана зірнула на суседа. Яна адчула дотык. Ён апусціў руку на ейную шчыкалатку і запаволена-пяшчотна, але ўпэўнена праводзіў па назе. Жанчына ўжо прыадкрыла рот, удыхаючы раптоўны гнеў, але яшчэ не скеміўшы, што зрабіць насамперш, сустрэла ягоны погляд. Ён уважліва і пранікліва зазіраў у вочы, не адводзячы, не хаваючы позірку. Рука спынілася і легла вышэй калена. Ён усміхнуўся. Не ганарліва-нахабна, а неяк адкрыта, прывабна, яна адразу заўважыла ямачку на падбароддзі. Ягоныя доўгія, амаль да плячэй валасы былі зачэсаныя назад, адкрываючы высокі загарэлы лоб. Ад яго патыхала здароўем і моцай. Ён быў проста вышэйшы гатунак, такія не гвалтуюць у ліфтах, не стаяць пад вокнамі і, зрэшты... не лезуць пад спадніцу ў пустым вагоне метро! Такім усё ідзе само ў рукі, яны не клічуць гучна, а толькі робяць намёк, вось так...

— Я не саміца, — жанчына выгнула спіну, — я не стаю на панелі, вашамосць памыліўся ў выбары!

Яе вочы загарэліся, яна стала падобная на раз'ятраную котку. Яна стамілася ад такога працяглага працоўнага дня, увагі-няў-

вагі, павагі і непавагі, яна доўга цягала цяжкі рэпарцёр, і хай яна добра прычасаная, надзетая ў лепшую сукню, з макіяжам, які ёй пасуе, і да таго ж трохі выпіла, але гэта ўсё разам з пахам «Фіджы» — яшчэ не сіло для начных птахаў!

— Ты хочаш сказаць, што я шукаю жанчыну?

— Прыбяры руку!

— У цябе такія вытанчана-прыгожыя ногі! Як цябе завуць?

— Караліна Цвікевіч.

Ён прыбраў руку і знерухомеў у той жа самай позе, у якой яна пабачыла яго ўпершыню: ногі злёгку выпрастаны, галава адкінута. На гэты раз ён заплюшчыў вочы.

Электрычка спынілася, і Караліна ледзь паспела выскачыць, прыхапіўшы рэпарцёр. Разам з двума-трыма пасажырамі, якія таксама выйшлі на станцыі, яна паднялася наверх і апынулася на цёмна-ліловай начной вуліцы. Цішыню парушалі хуткія крокі ды шорганне шын. Намагаючыся нягучна пастукваць абцасамі, яна рушыла дадому.

II

Наблізіўшы твар да люстэрка, Караліна няспешліва вывучала кожную кропку на ім, спрабуючы зразумець: што змянілася? — і разам з тым не магла пазбыцца думкі, што нешта адбылося з ёй за гэты дзень. Ёй ужо трыццаць два, і тое, чаго баялася, здарылася: пазначыліся першыя зморшчынкі на лбе і каля вачэй — ледзь бачнае павуцінне. Пакуль што іх можна разгледзець толькі вось так, калі наблізіць твар да люстэрка.

Караліна ўключыла цёплы душ, заспакоеная тым, што праз колькі хвілін можна будзе легчы, разняволіць стамлёнае цела і шаптаць, як малітву: «Я зусім спакойная... я зусім спакойная», — да таго часу, пакуль свядомасць не захлынецца ў белаватай, як пара, субстанцыі сну. Ужо позна, і, Бог дасць, Васіль не пазвоніць пажадаць ёй добрай ночы, — а ўсё для таго, каб даведацца, з якім настроем і як позна яна прыйшла. Апошнім часам гэтая сувязь пачала яе стамляць: ведала, што за пяць гадоў іхняга знаёмства не давала яму падстаў для рэўнасці, і ўсё-ткі выклікала яе. Магчыма, усё было прасцей: яна з самага пачатку адвяла яму ролю заменніка пасля недарэчнага, нежаданага разводу, калі муж кінуў яе дзеля цяжарнай школьніцы-выпускніцы. Выкараскалася дзякуючы Васілю, акрыяла і выжыла. Яна ўдзячная, але... Ёй лёгка песціць думку аб волі, гэтак жа лёгка, як назваць сваё імя незнаёмцу ў апошняй электрычцы. «Беларускае радыё. Караліна Цвікевіч...» «Алё.

Вас слухае Караліна Цвікевіч...» Дзесяткі разоў за дзень яна вымаўляла гэтак па тэлефоне. Яна абгарнулася ручніком і рушыла на званок.

— Я забыўся ключ, дарагая, — сказаў Васіль, калі Караліна адчыніла дзверы.

Калі ўбачыла ягоны твар і нібы вінаваты погляд, ёй стала няёмка за свае думкі. Яна некалькі дзён пазбягала размовы з ім, а калі ён званіў, спасылалася на занятасць, знаходзіла прычыны, каб не сустракацца. Падалося, што апошнія тры гады проста падманвала сябе: «Гэта мой лёс, я кахаю яго». Іхнія стрэчы сталі настолькі абыклымі, што ў тыя вечары і ночы, калі яго не было, яна пачувала сябе жонкай, якая выправіла мужа ў камандзіроўку... Калі ж яны заставаліся ў ягонай кватэры, яе ахоплівала пачуццё бяздомнасці, адзіноты і... няволі.

— Якая ты мілая, зусім мокрая... Я засумаваў па табе. Ты адна?

— Так. Заходзь.

Амаль кожны раз, калі Васіль заходзіў ці званіў сюды, ён пытаў: «Ты адна?» Але гэта проста абуральна! — задаваць ёй такое пытанне (проста па інерцыі, без цікаўнасці ў голасе!) у дзве гадзіны ночы.

Караліна пайшла ў ванную і, зачыніўшы дзверы, апранулася. Потым, калі сядзелі ў пакоі, ён наліваў віно ў дзве высокія шклянкі і распытваў: як праца... чым была занятая... і ўжо ў ложку яна даведалася ад яго, што сённяшні вечар ён правёў пад яе домам, назіраючы за машынамі і тымі, хто ехаў у гэтых машынах. А яна прыйшла пешкі. Адна.

Засынаючы, яна зноў згадала ягонае недарэчнае пытанне ў парозе, вінаваты пагляд, самазадаволеную ўсмешку, калі расказваў, як ён вартаваў яе цнатлівасць, гатовы кінуцца з цёмнага кута да таго, хто абдыме яе за плечы ці пацалуе. Думкі беглі самі сабой, яна паварушыла вуснамі, намагаючыся сказаць яму нешта важнае, выкрышталізаванае гэтымі начнымі думкамі, але стома пераважыла, і Караліна заснула.

III

Раніцай ён падвёз яе на працу, і яна спачатку здзівілася, што ўночы не заўважыла знаёмай машыны, пасля здагадалася, што ён адагнаў яе далей і выйшаў першы з кватэры, кінуўшы «я пачакаю цебе ўнізе» для таго, каб пад'ехаць да пад'езда.

У машыне яна ўключыла радыё. Знаёмая дыктарка начытвала ранішнія паведамленні. Нельга было сказаць, што Караліна выспалася, але, падбадзёраная двума кубачкамі кавы, думала, што

любіць сваю працу, у яе добрыя сябры і знаёмыя, доўгая і трывалая сувязь з Васілём. І яна ні пра што не шкадуе. Не пашкадуе нават тады, калі скажа Васілю сваё рашэнне.

Яна расправіла спадніцу, якая ледзь-ледзь даставала да каленяў, звыкла правяла далонямі па нагах — знізу ўверх, інстынктыўна правяраючы, ці няма зморшчын на танюткіх калготках. Зразумела, што гэты рух нагадаў учарашняе незвычайнае здарэнне, прыгадала вабную ўсмешку, адкрыты погляд незнаёмага мужчыны і ўсміхнулася.

Васіль адразу ж зрэагаваў. Нягледзячы на працягласць і адналстайную трываласць іхняй сувязі, ён ніколі не быў ўпэўнены, што Караліна кахае яго. Адтуль, мусібыць, і жывілася рэўнасць.

— Чаму ты ўсміхаешся? Я зрабіў што-небудзь смешнае?

— Не, гэта цябе не датычыць.

Ён пагладзіў яе калена. Пачынаўся дождж. Свежую, празрыста-шэрую раніцу асвятлялі толькі свечачкі каштанаў ды ярка-зялёная маладая лістота прыдарожных дрэў. Яна любіла такія дні, насычаныя водарам першых кветак, абуджанай зямлі — пах, які дасягаў горада толькі вясной! — дні, поўныя марудных, празрыстых кропляў дажджу.

Васіль нешта казаў ёй, час ад часу паўтараў: «Памятаеш?», і яна згодна ківала галавой, абы толькі не слухаць, не заглыбляцца ва ўспаміны, бо там яе пільнуе сентыментальнасць, якая адразу зробіць Васіля ахвярай яе бяздумнасці і абыякавасці, і вось тады... тады яна будзе вымушана надалей іграць ролю закаханай жанчыны. Васіль часта распавядаў, як ён адчуваў сябе ў тую ці іншую хвіліну без яе, яна ўжо прызвычаілася да гэтых прызнанняў. Але цяпер гэта пачыналася зноў і пужала, бо было падобнае на жалобнае спавяданне сына матулі, якая доўга не прыходзіла.

— Караліна, ты зусім мяне не слухаеш. Пра што ты думаеш?

Яна марудна павярнула да яго свой твар і, усміхаючыся, каб словы не былі ўспрынятыя за абразу, вымавіла:

— Я не лічу прывілеяй каханка ведаць мае думкі. Спыні тут. Я хачу прайсціся. Мы сустрэнемся потым.

Яна зрабіла выгляд, што не заўважыла ягонага чакання пацалунка, падхапіла рэпарцёр, кайстрачку. І толькі стоячы на ходніках пад парасонам, памахала Васілю.

Днём ён патэлефанаваў і прапанаваў заехаць за ёй, але Караліна адмовілася.

— Я хачу папрацаваць некалькі дзён спакойна. Хачу разабраць і праслухаць старыя запісы. Ты не крыўдуй.

Ён толькі запытаў:

— У цябе нехта ёсць?

Яна рассмяялася — мусібыць, гэтым заспакоіўшы яго, — і адказала:

— У мяне пакуль ёсць толькі ты. Я на самой справе хачу пабыць адна.

— Тады да сустрэчы, любая. Ты пазвоніш мне сама. Цалую.

Яна няраз развітвалася з Васілём: на некалькі дзён, на тыдзень; аднойчы гэта цягнулася два месяцы. І ён цярпліва чакаў, покуль яна сама, першая, не пойдзе насустрач. Праўда, цяпер яна не была ўпэўненая, што раней, падчас гэтых нястрэч, ён патаемна не хадзіў за ёй, не вартаваў ля пад'езда. Бо аднойчы, калі яна трапіла ў лякарню, два гады таму, — ён прыйшоў да яе ў той самы дзень, так і не адкрыўшы, адкуль даведаўся. Тады гэта расчуліла Караліну, і потым доўгі час іхнія адносіны былі надзіва гарманічныя.

Увечары яна ледзь не пашкадавала, што ізноў спакойна адштурхнула ад сябе Васіля, бо разумела, што і ён — адданы, верны — калі-небудзь можа ўзбунтавацца і ўжо не будзе ўмольваць стаць яму сапраўднай жонкай, а паставіць ультыматум: «Выбірай, даражэнькая, бо мы з табой не такія маладзёны, каб планаваць дзіця на будучае. Я доўга чакаў! Мне патрэбна жонка, а не журналістка, вакол якой увесь час так шмат мужчын...» Такімі ці не будуць яго-ныя словы, але гаворка непазбежная, і Караліна вырашыла яшчэ раз падумаць.

Яна некалькі разоў абышла сваю кватэру, зазірнула ў ванную, на кухню. А потым прысела на ложак, стрымліваючы слёзы. Яна так хацела быць адна! — і яна адна: сярод крухмальных прасцін і ўзбітых падушак. Засынаючы, ёй падалося, што нехта варухнуўся, і яна працягнула руку, каб супакоіць таго, хто побач, паправіць на ім коўдру. Пад рукой апынуўся плюшавы мядзведзь, з якім Караліна спала ў адзінокія ночы. Васіль ведаў пра гэтую звычку і часам, калі тэлефанаваў позна, жадаў «дабранач» ёй і яму, мядзведзю.

Яна доўга ляжала, стойваючы дыханне, нібы яно магло патурбаваць цацачны сон. Яна сама не ведала, хто ёй больш патрэбны: муж ці дзіця. Але не хацела думаць, не жадала ўяўляць сабе Васіля ў ролі мужа ці ў ролі бацькі яе дзяцей. Іхнія адносіны — не каханне, нават у самыя светлыя часіны, а толькі фізіялогія. Магчыма, яна памыляецца. Але лепш не думаць пра гэта і аддацца ва ўладу ўсепанавальнай адзіноце; адзіноце, што так падобная на хваробу.

А потым... потым, калі яна вылечыцца, яна завядзе рыбаў ці ката, а можа, сабаку.

IV

Наступным вечарам ізноў ішоў дождж. Караліна затрымалася ў студыі, праслухала некалькі музычных застават: ёй карцела памяняць музыку да сваёй перадачы, але гукааператар і на гэты раз не дагадзіла. Было вырашана, што Караліна праслухае сама новыя запісы ў радыйным музычным фондзе і вызначыць, што ёй хочацца. Яна лічыла, што музыка, якую яна хоча пачуць у сваёй праграме, даўно знаёмая, часам здавалася, — яна чуе акорды, але...

Яна спусцілася ўніз па лесвіцы і запынілася ля шкляных дзвярэй: ішоў дождж, а яна не захапіла парасон, бо з раніцы яркі блакіт абяцаў гожы дзень. Караліна глядзела на вуліцу і вагалася: ці не затэлефанаваць Васілю. Але мінулі толькі два дні і адна ноч без яго — занадта малы час, каб даць пэўны адказ. На лужынах пеніліся бурбалкі — дождж узмацніўся, і не было відаць хадыкаў. Зрэшты, і вуліца, дзе стаяў стары, велічны будынак радыё была вузенькай, ціхай і ад таго ўтульнай. На прыпынак трэ было ісці праз гай; па ранейшым часе, калі Караліна была школьніцай, а потым студэнткай журфака, яна не вагаючыся здымала туфлікі і ішла басанож па лужынах. Яе віталі мужчыны, якія праязджалі ў гэты момант у машынах: хто націскаў на сігнал, хто свісцеў, высунуўшыся з акна. Іншыя спыняліся з прапановай падвезці, але ўсім адмаўляла са шчаслівай усмешкай на твары, ішла далей — у мокрай сукні, танюткая, як толькі што вылепленая з гліны Ліліт.

Караліна зразумела: той мужчына, які выйшаў з машыны на супрацьлеглым баку вуліцы, памахаў менавіта ёй, бо за спіной у яе нікога не было. Яна не паспела разгледзець твар, а зараз ён быў напалову схаваны за парасонам, але відочна, гэта быў не Васіль.

...Дворнікі рытмічна слізгалі на шкле, але іх торганне было марным: за лічаныя хвілі ўлей узмацніўся. Сядаючы ў мяккі, зручны фатэль, Караліна адкінула валасы і ўбачыла над галавой празрыстае вакенца, на якое абрыналіся патокі вады, і ад таго, што так лёгка і ўтульна пачувалася ў палоне дажджу, не ўгледзела момант, як мужчына паклаў ёй на калені ружы, толькі адчула вострый дотык у далонь. Ёй стала смешна і ад гэтага кароткага болю, і ад таго, што знайшоўся незнаёмец з апошняй электрычкі, які зацікавіўся ёю, і ад таго, што іхняя прыгода толькі пачынаецца. Яна забылася нават, што не ведае ягонага імя, але гэта было зусім нязначным зараз.

Ён па-майстэрску вёў машыну, і яна пачала ціхенька падпяваць у такт музыцы, што лёгка і ненавязліва гучала ў салоне машыны.

— Мы едзем да мяне. Ты згодна?

Ён спытаў, не павярнуўшыся. І ў гэтае імгненне яе ахапіў жах з таго, што яна зусім не ведае ні яго, ні ягоных звычак, ні ягонага

жыцця. І, не маючы надзеі, што яе пярэчанне будзе ўспрынятае, прамовіла:

— Не-не, толькі не зараз. Я не хачу да вас.

Ён адразу пагадзіўся, прыцішыў ход машыны і запытаў, дзе яна жыве. Караліна нейкую хвілю вагалася, але назвала адрас. Ён прапанаваў цыгарэту, і яна не адмовілася. Караліна зусім блізка ўбачыла ягоную руку, пальцы, якія падносілі запальнічку. Паліла і ўвесь час разглядала яго краем вока: адкрыты твар, доўгія густыя валасы, дарагі строй, на якім дождж пакінуў плямы, рукі, што трымалі абаранку руля, — моцныя і загарэлыя, яны прыцягвалі погляд і выклікалі дзіўныя, яшчэ не зразумелыя жаданні.

У адну хвілю яна адчула сябе бездапаможнай, зусім маладзенькай і... супакоілася.

— Спыніся тут, — папрасіла Караліна.

Ён моўчкі выйшаў з машыны, адчыніў ёй дзверцы і правёў пад парасонам да пад'езда, але (яна не паспела ні запрасіць яго, ні адмовіць у візіце) павярнуўся і пайшоў назад.

У ліфце зусім нечакана для сябе Караліна зразумела, што плача, нахіліўшы твар да пяшчотных ружаў. Яна не хацела асэнсоўваць таго, што адбылося і што не адбылося, бо яе эмоцыі значылі больш, чым просты расклад падзей. А чаканне будучага заўжды выйграе перад мінулым. Трэба толькі навучыцца чакаць...

Калі праз колькі хвілін зазвінеў тэлефон, Караліна была ўжо заспакоенай, упэўненай, гэткай вежай, дзе наверсе схаваная любка-душа: даскокні, гожы малойца, пацалуй у вусны гарачыя, а я табе пячатку на лоб — трэсь! — вось знак, што будзеш маім...

Ды ўся яе заспакоенасць абрынулася адразу, калі пабегла любка-душа насустрач невядомаму: вось ён, жаданы, гаворыць знаёмым ды чаканым голасам:

— Ты паспела прыняць душ? Праз пятнаццаць хвілін мы едзем вячэраць.

Караліна толькі сказала «так», і адразу ж нейкая вар'яцкая радасць, смех, узбуджэнне паглынулі яе; яна бегала па пакоі, вышукваючы рэчы і раскідваючы пры гэтым бялізну, спадніцы, пацеркі і бранзалеткі. Праз пятнаццаць хвілін яна вылецела з кватэры, дзе панаваў хаос, які за паўгадзіны маглі зрабіць тры рабаўнікі.

Караліна спускалася ў ліфце і радавалася таму, што зусім не ведае мужчыны, з якім ідзе вячэраць: ні ягоных звычак, ні ягонага жыцця, і можна было яшчэ ствараць яго для сябе, прыдумваць. А гэта давала ёй права на памылку.

V

Яна сустрэла Васіля дома, лежачы на канапе. Ён пазваніў, каб дамовіцца аб сустрэчы. Караліна не хацела развітвацца з ім на вуліцы — пяць гадоў амаль сяброўскага суіснавання шмат значаць для абаіх! Яна лічыла, што яе прагматызм, які заўважалі ўсе знаёмыя, — штучны, несапраўдны; сапраўднае ж у ёй — жаночая непрадказальнасць і эстэтыка: у пачуццях, справах, жаданні бачыць вакол прыгожыя рэчы і неардынарных людзей, і нават праца — гэтыя нескончныя сустрэчы з суразмоўцамі, — адпавядала стэрэатыпу такога эстэцтва. Яна магла запісаць гадзінную размову і выбраць з яе для эфіру дзесяць хвілін, не парушыўшы ход гаворкі.

І яна, як кожная жанчына, імкнулася прайграць момант развітання, як на сапраўднай сцэне: годна, спакойна і прыгожа. Васіль, як зазвычай, адчыніў дзверы сваім ключом і адразу адчуў перамену: Караліна была ўзбуджанай, нервова-вясёлай.

— Што здарылася, Караліна?

— Усё добра... Мы не бачыліся некалькі дзён, і я хацела пагаварыць з табой...

Ён падсеў да яе на канапу, нават не пацалаваўшы ў шчаку, меў разгублены і напружаны выгляд, і яна падумала, што збіраецца выступіць перад ім у ролі жорсткай і неўласцівай ёй; а потым, каб змяніць сітуацыю, ёй прыйдзецца выдаваць сябе за сядзелку, якая апякае невылечна хворага, гаварыць словы суцяшэння, і, магчыма, пасля ўсяго яны разам будуць плакаць над сваім няўдалым раманам. Ён выглядаў такім стомленым, такім прыцятым ад прадчування і адчування яе ўпэўненасці ў сабе, сваіх сілах. Караліна сапраўды была цяпер узнёслай і моцнай... яна сумелася, адцягваючы вырашальную хвіліну.

— Я такая эгаістка!.. Ты будзеш вячэраць?

Васіль згадзіўся і асцярожна, як шкляныя, паднёс да вуснаў яе рукі, пачаў цалаваць кожны пальчык. І, пэўна, ягоны спакой быў бы выратаваны, калі б Караліна не прашаптала:

— Я такая шчаслівая... эгаістка.

— Ты шчаслівая?

— Так.

І з таго, што жанчына, якая належала яму столькі гадоў, ніводнага разу не прызналася, што пачувае сябе шчаслівай з ім, ён мог лёгка зрабіць выснову, што не мае ніякага дачынення да гэтага прызнання: бо тады чаму адчуў ён трывогу і занепакоенасць?

Караліна не бачыла ў ім ані мужа, ані ворага — яна весела і лёгка напявала на кухні, рыхтуючы вячэру на дваіх. Так сястра шчыруе для брата.

Караліна ўвесь дзень і зараз, увечары, завіхаючыся на кухні, прыгадвала ўчарашнюю падзею: паездку ў рэстаран, успомніла, як у нейкі момант, седзячы за столікам, пры сцішнаватым святле свечак, яна зразумела, што яе спадарожнік не проста прывабны, а вельмі прыгожы, з антычнага складу тварам. І ў той жа момант яна перахапіла погляды дзвюх жанчын, што сядзелі за суседнім столікам; тое быў выраз дагодлівай адданасці і ўзвелічэння. Караліна адчувала, што яны назіралі за імі цалюткі вечар: як мужчына ў танцы лагодна прыціскаў да сябе жанчыну, як ён піў віно, падпальваў ёй цыгарэты, як казаў нешта вясёлае, — і тады разам з Каралінай усміхаліся жанчыны за суседнім столікам.

Васіль зазірнуў на кухню, але Караліна была паглыбленая ў свае думкі, яе вочы свяціліся радасцю. Ён хацеў гукнуць яе, але перадумаў і ціха сышоў з кватэры.

А Караліна ўзгадвала зноў і зноў, як марудна ехалі яны ўначы і яе галава была ўладкаваная на мужчынскім плячы; яна адчувала, як той час ад часу паварочваўся і ўдыхаў водар яе валасоў, а потым некалькі хвілін пяшчотна гладзіў яе калені... Яны зайшлі ў кватэру, імкліва апусціліся на кілім і, не марнуючы ні хвіліны, заняліся каханнем... А потым ён асцярожна нёс яе з ванны ў ложак, і як толькі яны леглі, ён заснуў, моцна трымаючы яе ў абдымках. А яна ўсё шаптала ягонае імя: Стэфан, — такое ж незразумелае, як і ён сам...

VI

Стэфан пазваніў толькі праз тры дні, быў выхадны, і Караліна затрымалася ў ложку.

— Мне сумна піць каву ў адзіноце. Ты не хацела б заехаць да мяне?

Праз паўгадзіны Караліна ехала ў тралейбусе, які цягнуўся праз увесь горад у такі нечакана спякотны для вясны дзень. Здаецца, гэтыя тры дні ацверазілі жанчыну, а штохвіліннае чаканне і прыхаваная трывога надалі яе вачам хваравіты бляск. Яна была незадаволеная сваім рашэннем ехаць па названым адрасе, узгадваючы сухі тон, якім ён размаўляў з ёй, нават не папытаўшы, чакаць яе ці не.

...Ён выйшаў на званок, трымаючы ў руцэ пэндзаль, адразу адчуўся моцны пах фарбы. Караліна зайшла і зразумела, што трапіла ў майстэрню. Яе незадаволенасць сабой знікла: Стэфан дазволіў ёй наталіць цікаўнасць, даючы магчымасць пазнаёміцца з ягоным жыццём. Нават у гэтым была мужчынская перавага, бо, запомніўшы імя і прыкмеціўшы рэпарцёр, ён змог знайсці яе і даведацца нумар хатняга тэлефона. А яна да апошняй хвіліны не ведала пра яго анічога.

Майстэрня была з двух пакояў. У невялікім першым пакойчыку стаялі буфет, пліта, тэлевізар і некалькі фатэляў.

— Ты згатуеш каву?

Ён паказаў ёй, дзе стаялі філіжанка, кубкі, ляжалі кава і цукар.

— Мы вып'ем кавы. Хутка я буду вольны.

Яна засталася ў першым пакоі гатаваць. Пазней на знятую са сцяны дэкаратыўную драўляную тацу паставіла гліняныя кубачкі з духмянай кавай.

Яна наблізілася да Стэфана і працягнула яму тацу. Яе вочы поўніліся абурэннем. Паперадзе, на адлегласці некалькіх крокаў, на белых прасцінах ляжала голая дзеўчынёха. І ейныя вабы ажывалі асобна на палатне, на якім пісаў Стэфан.

Ён, нібыта не разумеючы маўклівага абурэння, акуратна зняў кубачак і доўга нюхаў, покуль зрабіў першы глыток. Увесь час, як ён піў каву, натуршчыца ляжала, не варухнуўшыся. Караліна не знаходзіла словы, не ведала, як сябе павесці ў такой сітуацыі, і ў той момант, калі яна вырашыла сысці, Стэфан сказаў:

— На сёння ўсё, Луіза. Можаш надзявацца.

Маладая дзяўчына ажывілася, усміхнулася зусім па-дзіцячы, адкрыта і шчыра. Яна ўжо надзела лёгкую сукенку, і Караліна, каб прыхаваць разгубленасць, прапанавала ёй кавы. Давялося зварыць яшчэ адну порцыю. Луіза не затрымалася надоўга. Стэфан нічога не тлумачыў, і Караліне падалося, што калі яна пачне папікаць ці абурацца, то стане падобнай да непрыстойна крыклівай жонкі, якую пакрыўдзіў муж. Яна толькі адвярнулася ад Стэфана і пачала разглядаць карціны. На адной сцяне віселі афішы да выстаў, сярод імёнаў паўтаралася адно: Стэфан Загражскі.

— Гэта ты? — папыталася Караліна.

— Так.

— Я ведаю тваё прозвішча, я чула пра цябе раней.

Праз вялізныя вокны майстэрні свяціла шчодрае сонца, і Караліне падалося, што ягоныя промні сканцэнтраваліся пасярэдзіне, дзе ложак і бялюткія, цнатліва-чыстыя прасціны. Ёй захацелася наблізіцца да ложка, каб трапіць у празрысты, зіхатліва-мройлівы прамень. Стэфан падышоў і дакрануўся да яе рукі.

— Хачу бачыць сінюю ваду і зялёную траву. Гэта магчыма?

Яна адуазала пытаннем на пытанне:

— Мы паедзем за горад?

— Калі ты не супраць. Мне падабаецца, што ты гатуеш добрую каву.

У машыне яны ехалі моўчкі, зусім як чужыя, яна адкінула галаву, заплюшчыла вочы і паспрабавала разняволіцца, але ў думках увесь час пракручваліся розныя драбніцы, звязаныя з іхнімі адносінамі. Толькі за горадам ён павярнуўся да яе і сказаў:

— Я мог пазнаёміць цябе са сваімі сябрамі, мы зрабілі б такі міленькі пікнічок. Ты слухала б размовы пра канцэпцыю Фукса і Далі, пра школу Малевіча і манументалізм...

— Стэфана Загражскага.

Упершыню за гэтую доўгую раніцу яны ўсміхнуліся адно аднаму. І зноў Караліну апанаваў бязмежны давер; ёй падалося, што — сёння, зараз! — яна не хоча бачыць ягоных сяброў.

Ён збочыў з шашы па добра наезджанай дарозе ў лес і спыніўся.

...Выйшаў першы, адчыніў дзверцы з яе боку і нечакана пяшчотна вынес Караліну з машыны. Яна толькі абхапіла ягоную шыю і, пільна ўглядаючыся ў вочы, сказала-прашаптала: любы. Яны доўга і прагна цалаваліся, і Стэфан усё трымаў яе на руках.

А потым хадзілі па лесе, дыхаючы водарам угрэтай травы і маладога лісця. Ужо цвілі канваліі, і ён прапанаваў нарваць вялізны букет.

— Не, мне шкада іх. Гэта — слёзы.

— Хто тут плакаў, у лесе?

— Кажуць, гэта слёзы святой Марыі, якімі яна аплаквала ўкрыжаванага Хрыста. Калі прыедзем пасля адцвітання, мы ўбачым на сцяблінах плады, яны — як чырвоныя кроплі крыві пакутнага Сына. Дзіўна, праўда?

— Ты верыш у Бога?

— Веру.

— А я — не. Мусіць, не. Я веру, што ён, Ісус, быў на самой справе. Як і Алах, і Буда. Але яны — не той Бог, якому моляцца людзі. Яны толькі пасланцы, выканаўцы нечай волі.

— Я не думала пра гэта. Але мне здаецца, для многіх Бог, Айцец — гэта той, хто ратуе ад бездухоўнасці, хто працягвае чалавеку нябачную руку, каб паказаць яму высокі шлях...

— І хто ратуе ад пакутлівай хваробы.

— Ад хваробы?

— Ад адзіноты. Асабліва ў горадзе. Колькі людзей, адарваных ад каранёў, ад нейкай невядомай ім самім — бо нязнойдзенай — сутнасці, ад непаразумення пакутуюць і застаюцца адзінокімі, незапатрабаванымі ўсё жыццё.

— Гэта праўда, кожны хоча, каб яго любілі. Кожнаму дадзена права запэўніць сябе, што Бог любіць яго.

— А ты... ты хочаш, каб цябе любілі?

— Я не адзінокая.

— Ніколі?

Яна раптам узгадала свой пакой, знаёмы да драбніц: шпалеры, фіранкі, кілім і няспаныя ночы, калі яна плакала ў падушку, і ложак, на якім засынала з мядзведзікам. У яе быў каханак, але... не было сям'і. Уся сям'я — яна ды цацка.

VII

Нечакана пайшоў дождж. Але Караліна, стомленая чаканнем свежасці, як і ўсё, што акаляла яе ў гэты млявы, пякучы дзень, урэшце пачала дыхаць напоўніцу. Яны сядзелі ў маленькім рэстаранчыку, на адкрытай пляцоўцы, затуленай з двух бакоў шклянымі сценамі. Частку сцен упрыгожвалі вітражы. Сонца схавалася, і ля ног больш не ляжалі каляровыя плямы. Але так жа ціха і незалежна, як да гэтага праз вітражы прасочваліся промні, невядомае, незразумелае пачуццё праходзіла праз сэрца Караліны і пакідала свае адбіткі-ўспаміны. Яна адчувала пяшчоту да чалавека, што сядзеў побач з ёй, але разам з тым лічаныя хвіліны прынеслі ёй мінулае: таго, хто стаўся яе мужам і каму належала яе першае каханне, і таго, хто прыйшоў на дапамогу ў час дэпрэсіі і нянавісці да сябе, — вернага сябра і каханка. На нейкі момант яна адчула сябе вельмі шчаслівай, што лёс падарыў ёй гэтых двух людзей, праз якіх яна прайшла, якіх перажыла, удзячная ім за кожнае імгненне радасці і болю. І яшчэ больш шчаслівая, што лёс не кінуў, не адвярнуўся, а прапанаваў новае выпрабаванне...

— Ты сумуеш? — спытаўся Стэфан.

Яна паглядзела на яго і ўсміхнулася ў адказ. Ёй захацелася ўведаць пра яго ўсё: што ён думае, калі адзін і калі трымае яе ў абдымках. А гэтая нечаканая паездка за горад — даніна пачуццям, падзяка за ноч кахання ці дэманстрацыя незалежнасці? Яна ўжо баялася згубіць Стэфана.

Ён спакойна піў каву, здавалася — ні пра што не думаў, толькі назіраў за маленькай пчалой, якая звонка і варожа спрабавала вызваліцца з празрыстага кубка, дзе на донцы застаўся недапіты ледзь цёплы шакалад.

...А потым яны кахалі адно аднаго на вялізным ложку. Здавалася, прасціны захавалі цяпло Луізы, яе маладога, прыгожага цела, захутанага адно што ў святло дзённых промняў. Але ўзгадка пра яе чамусьці ўзбуджала Караліну.

Раптам яна ўявіла той момант, калі зноў апынецца на вуліцы адна, незалежная ад Стэфана і не абавязаная яму нічым, — вольная ў сваіх учынках, і ў адчайным супраціўленні гэтым думкам Караліна схавала твар пад пахай у каханка і... заснула.

Зусім позна Стэфан адвёз яе дадому, падзякаваў за гэты дзень і сказаў, што пазвоніць, як толькі будзе вольны. Яна зразумела, што ягоны занятак працягнецца не адзін дзень, але згодна кіўнула галавой. Ён пацалаваў яе ў шчаку, як стары знаёмец. Караліна засталася адна, пачуваючы сябе стамлёнай, адчужанай і няўпэўненай.

VIII

Яна прачнулася зусім рана і адразу пашкадавала, што гэта — нядзеля, а не будзённы працоўны дзень. Зазвычай усе яе нядзелі былі занятыя: Васілём, сяброўкамі, набегамі ў тэатр ці суседнія бары... Пэўна, можна было пачытаць кнігу, але ўжо зараней вядома, што не атрымае ад гэтага ніякага задавальнення... Можна стэлефанавацца з сяброўкамі і, калі адна з іх апынецца дома, запоўніць дзень размовамі, плёткамі і некалькімі кактэйлямі... А яшчэ — можна застацца ў ложку і, як кінуты верны сабака, ціха і маркотна ляжаць у штохвілінным чаканні званка. Але тады дзень ператворыцца ў бясконцую пакуту і ад самой раніцы да вечара магчыма толькі адно: бязвольна выцягнуцца і маўчаць... маўчаць... маўчаць...

Караліна агледзела пакой і здзівілася, што адзінокая (а менавіта такой яна сябе лічыла пасля расстання з мужам, бо гэтае слова адпавядала для яе значэнню «незалежная») жанчына ўсяго за тыдзень можа так закінуць сваё жытло, што яно падасца пустым і няжылым. Яна не любіла займацца хатнімі справамі, знаходзячы ў непрыбраным пакоі адзнакі ўтульнасці, і ніколі не ўяўляла сябе хатняй гаспадыняй — гэтым сімвалам шчасця для многіх знаёмак.

Відавочна, гэтым разам не трэба адцягваць з прыборкай, і яна прыняла гэта з суцяшэннем. Той час, што Караліна правяла ў бацькоўскай хаце, яна добра памятала з-за спрэчак з маці, калі сцвярджала сваё права на поўнае валоданне дзіцячым пакоем, дзе існавала зусім іншае жыццё, адрознае не толькі сістэмай навядзення парадку, але і знешнімі, ледзь не штодзённымі зменамі. Аднойчы маці была шакіраваная, калі ўбачыла прымацаваны на сцяне твор, напісаны дачкой: артыкул у абарону незалежнасці дзяцей з нармальных сем'яў. На вялікае здзіўленне дзяўчыны, яго надрукавалі ў газеце пад рубрыкай «Свой погляд». Тады Караліна была школьніцай!

Маці так і не зразумела гэтага імкнення да поўнай незалежнасці, бачыла ў ім жаданне адасобіцца, пэўна, думала, што Караліна чамусьці саромеецца бацькоў. Гэта не надавала гармоніі іхнім адносінам.

Шчыруючы ў пакоі, Караліна зразумела, што была б рада пабачыцца з маці. Яна пазваніла, трубку доўга не здымалі, але нарэшце пачуўся бацькаў голас.

— Тата, гэта я, дзень добры...

Яны не бачыліся ўжо некалькі месяцаў, і Караліна ўявіла яго ў цёплай вязанай кофце і мягкіх пантофлях, як пры апошнім развітанні. Маці не было, пайшла з суседкай на кірмаш, ён абавязкова перадасць прывітанне, ён разумее, што ў яе ўсё добра, яны заў-

сёды чакаюць, яе любімы кот спіць... ён, бацька, таксама пяшчотна цалуе яе.

— Пакуль.

Караліна набрала новы нумар. Паліна аказалася дома. Яна сумавала і з радасцю прыняла прапанову сустрэцца. Караліна надзела лёгкі белы строй, і ўжо праз чвэрць гадзіны яны сядзелі з Палінай у кавярні.

— Як маецца твой Васіль? — спыталася Паліна пасля глытку кактэйля і першых камплімента ў, якія ёй выказала сяброўка. Паліна была актрысай і, нягледзячы на свае сорак пяць гадоў, паводзіла сябе ў жыцці, як цікаўная правінцыйная маладзіца. Сваім найграным, а зрэшты, вельмі натуральным наівам яна прыцягвала мужчын. Флірт быў яе другой натурай. Яна любіла яркія вобразы на сцэне і кідкае адзенне. Яна мела дарослага сына і тры шлюбы ў мінулым.

— Ведаеш, днямі я бачыла Васіля ў тэатры. Ён хацеў са мной пагаварыць, але я была не адна. Ягоны настрой вымагаў лепшага. Вы не пасварыліся? І хачу сказаць табе, ён шмат піў на банкеце.

— Ну, ён ніколі не быў п'яніцам.

— Таму мне цікава: што здарылася? Я заўсёды прадчуваю такія маленькія трагічныя сцэнкі ў жыцці блізкіх. Вы па-ранейшаму сустракаецеся?

— Мы яшчэ не размаўлялі сур'ёзна, але... у мяне ёсць мужчына.

Паліна ў захапленні заплясала ў далоні.

— Брава, дзіця маё!

Караліна зачырванелася. Яны размаўлялі гучна, і на іх звярнулі ўвагу.

— Ён прыгажун з торсам атлета, ці не так?

Паліна ажывілася, пачала распытваць, увесь час жэстыкулюючы рукамі, нібыта знаходзілася сярод прыхільнікаў і чакала ад іх апладысментаў.

— Я заўсёды была здзіўленая працягласцю тваіх адносін з Васілём. «Гэта не пара», — казала я сабе.

Пэўна, яна ставіла сабе ў заслугу тое, што не выказвала гэтыя меркаванні раней. Разам з імпэтам павучаць яна мела такт не абгаворваць блізкіх без дай прычыны і не навязваць ім сваёй думкі...

Караліна кінула намаганні перавесці гаворку на іншае, бо сяброўка чакала толькі новых падрабязнасцяў. Безумоўна, Караліна выглядала не так, як раней, яна сама гэта адчувала: цёмныя цені пад вачыма, злёгку схуднелыя шчокі надалі яе твару выраз загадкавы й годны, што выклікала ў суразмоўніцы процьму інтымных пытанняў. Караліна больш усміхалася, чым адказвала, і тады актрыса сама дамалёўвала вобраз «шчасліўца», як яна называла Стэфана. Наталіўшы смагу пазнання, Паліна адчула смагу нату-

ральную і замовіла дзве порцыі халоднай гарбаты з цытрынай. Афіцыянт, хлопец гадоў дваццаці пяці, дасылаў цнатліва-захапляльныя погляды Паліне. І калі ён браў пустыя шклянкі з-пад кактэйлю, то зрабіў гэта ля Паліны, стаўшы амаль ушчыльную, каб мець магчымасць адчуць хоць пах парфумы, якой карысталася гэтая жанчына. Паліну ведалі ў бары, а малады афіцыянт пэўна навічок, і не сакрэт, што старэйшыя падказалі, каго ён абслугоўвае. Надзіва хутка ён прынёс ім духмяную гарбату з цытрынай і запытаў, ці не хочуць яны яшчэ чаго-небудзь.

Караліна вярнулася дадому не вельмі позна і, перш чым пераступіць парог кватэры, узгадала Стэфана, але не адчула гаркоты ці смутку.

IX

Напрыканы наступнага тыдня Караліна зразумела, што пачала станавіцца няўважлівай. Кожны тэлефонны званок выклікаў лёгкую паніку. Яна перастала ўдзельнічаць у размовах з калегамі, а калі ў яе пыталіся нешта, то часта адказвала не тое, чаго чакалі. Дома, вечарамі, яна слухала кружэлкі з сімфоніямі, музыка рабіла яе чаканне рамантычным. Яна падумала, што паводзіць сябе рыхтык як семнаццацігадовае дзяўчо, але не было ні сілы, ні жадання змяніць штосьці.

Стэфан усё не тэлефанаваў, і Караліна знаходзілася ў адчаі. Уся яе ўвага сканцэнтравалася вакол чалавека, якога не было побач. Часам ёй падавалася, што яна пачынае губляць сябе. І тады яна не стрымалася — і пазваніла Васілю. Яна яшчэ не ведала, што скажа яму, можа быць, проста хацелася падзяліцца пачуццямі — нават так: не зусім з тым, не зусім разумна.

Дамовіліся, што ён павядзе яе на канцэрт. Яна згадзілася. І адразу ж спужалася гэтай згоды. Але ўжо было позна адмаўляцца — Васіль паклаў трубку. Караліна ўявіла, як яны будуць сядзець побач і ён абавязкова будзе трымаць яе за руку, час ад часу нешта шаптаць на вуха, а ў перапынку павядзе ў бар, дзе прапануе келіх шампанскага. І, магчыма, там будзе нехта знаёмы... Але Караліна суцешыла сябе тым, што яна ідзе ў філармонію выключна з-за «Катрынкі». Яны ігралі джаз, а джазавыя кампазіцыі, дзе партыю вядзе саксафон, былі для Караліны, як святыя распевы для служкаў Божых.

У сем гадзін вечара яны ўвайшлі ў залу, занесеныя плынню наведвальнікаў. Пакуль яны падымаліся па прыступках, Васіль увесь час падтрымліваў яе пад руку.

У зале было напаўцёмна і, як заўжды перад канцэртам, чуліся бязладныя гукі музыкі. Караліна запэўнілася, што не ўбачыла знаёмых. Яе настрой палепшыўся.

— У цябе ўсё добра? — спыталася ў Васіля.

— Так. Я нават пачаў пісаць кнігу.

Караліна ведала, што раней, яшчэ да знаёмства з ёю, Васіль нешта пісаў, але не ставіўся да гэтага сур'ёзна. Ён працаваў у газеце, ягоная праца была хутчэй тэхнічная, чым творчая. Ён апрацоўваў лічбы, факты, збіраў статыстыку, аналізаваў і рабіў свае артыкулы прафесійна і раўнадушна.

Яна хацела распытаць: пра што ён піша кнігу, але пачуліся воплескі, дырыжор пакланіўся публіцы, ускінуў палачку — і пачалася ўступная частка. Філарманічны аркестр іграў кампазіцыю — музыка гучала пранізліва-ўзнёсла, і Караліне падалося, што кампазітар быў не зусім шчыры, калі пісаў твор... Яна ўжо зусім засяродзілася на музыцы, знайшла з ёй суладдзе, але адчула дотык Васілёвага локця. І ёй узгадалася, як зусім нядаўна, некалькі тыдняў таму гэты мужчына трымаў яе ў абдымках, шаптаў пяшчотныя словы, бажыўся абараняць і песціць, казаў, што ніколі нікому яе не саступіць. А што на самой справе?.. Ён, пэўна, сумуе без яе, і, зрэшты, яна шчыра ўдзячная яму за тое, што ён не рабіў аніякіх сцэн, хаця адчуў, што яны разыходзяцца. Яна досыць добра дала зразумець Васілю, што мае іншага мужчыну, жаданага, блізкага. А ён? Як ён перажывае расстанне? Караліна зусім не цікавілася гэтым і цяпер адчула сябе вінаватай.

Ён нахіліўся, нешта прашаптаў ёй, кшталту «табе падабаецца, дарагая?», і пяшчотна кранув вуснамі вуха. Гэтым цнатлівым пацалункам былі перададзены нясцерпны сум па ёй, і трывожнае чаканне, і спадзяванне на чуласць. Так пракацілася першая цёплая хваля літасці.

Цяпер гучалі некалькі скрыпак, музыка суладна білася недзе пад столлю, туды ж, увыш ірвалася і душа Караліны. Яна больш не зважала на шэпты, лёгкі кашаль, парыпванне крэслаў — зала знікла, пакідаючы Караліну сам-насам з гармоніяй гукаў. Калі ж на сцэну выйшла «Катрынка» і пачуўся саксафон, Караліна зусім ажыла, павесялела, нават пашкадавала, што збіралася стаць гэткай пустэльніцай: парушыць сувязі з сябрамі і знаёмымі, шчыльна зачыніцца ў кватэры і гэтаксама моцна закрыць душу. Музыка дала пачуццё незалежнасці ад Стэфана, а стрэчу з музыкай падарыў ёй Васіль, і, удзячная, яна накрыла сваёй рукой руку каханка. І толькі тады, як адчула дрыжэнне ягоных пальцаў, калі ён наважыўся сам сціснуць яе руку ў сваёй, яна адчула непрыязнасць, але не прыбрала рукі і не адсунулася.

Потым ён замовіў для яе бутэльку шампанскага ў невялічкай кавярні ля Свіслачы. Сам піў каньяк, некалькі разоў паўтараў свой заказ, і Караліна падумала, што Паліна мела рацыю, калі казала, што Васіль змяніўся і пачаў «перабіраць». Ён горача нешта даказваў, казаў, што гэтак кепска, як сёння, «Катрынка» яшчэ не іграла. І наогул, ён думаў, што іхняя сустрэча дасць натхненне, бо праца над кнігай зайшла ў тупік. Караліна зразумела адно: калі яна зараз не забярэ адсюль Васіля, ён нап'ецца ўшчэнт і ў яе пачнуцца праблемы, бо не кінеш п'янага сярод вуліцы. Да таго ж яна баялася, што Васіль гатовы пачаць сварку: ён ужо сказаў, што ніякім жанчынам нельга верыць, асабліва каханым, бо для іх галоўнае — пасмяяцца з пачуццяў... Самы час сысці; не дзіва, што на іх пачалі азірацца.

Караліна паднялася. Васіль паспешліва разлічыўся і выйшаў услед. Яна стаяла ля Свіслачы і паліла цыгарэту. Караліна лічыла, што добра ведае Васіля, бо ніколі не бачыла яго раз'юшаным ці моцна п'яным, а вось зараз ён зусім не такі — незнаёмы і дзікі. Яшчэ ёй падалося, што іхнія адносіны перапыніліся менавіта з-за таго, што яна перастала бачыць у ім мужчыну. І, відочна, яна зрабіла памылку, што сёння сустрэлася з ім.

Васіль падышоў да яе і па-дзіцячы жаласна прызнаўся: «Я зусім п'яны. І я яшчэ кахаю цябе». Так пракаціласа другая цёплая хваля літасці.

Пазней, у таксоўцы, калі Караліна везла яго дадому і ён ціха пасопваў на яе каленях, яна адчула трэцюю спагадную хвалю і зусім без боязі ўвайшла за Васілём, падтрымліваючы яго, у кватэру. Тут усё было па-ранейшаму, як і ў рэдкія часы былога наведвання. Як зараз, так і раней, яна з'яўлялася тут ноччу, калі не хацелася дабірацца дадому: ён жыў ў цэнтры горада.

Васіль адсунуўся ад яе, сеў на канапу, і тады яна ўбачыла і адчула, як моцна ён стаміўся.

— Караліна, я сапраўды кахаю цябе. Я ведаю, што больш непатрэбны табе. Ты так доўга імкнулася кінуць мяне, але не знаходзіла замены. І вось зараз...

Яна сядзела насупраць. Ёй захацелася падысці, абняць гэтага стомленага, расчараванага мужчыну, сказаць яму нешта пяшчотнае, каб супакоіць, але адчула, што ўжо не мае на гэта права. І потым, калі яна дакранецца да яго, гэта скончыцца ложкам і познімі слязьмі.

— Я, пэўна, вінаватая перад табой. Прабач. Але гэта залежала не толькі ад мяне. Мы абодва вінаватыя.

— Я не хачу высвятляць. Я ведаю толькі тое, што калі табе было цяжка, ты заўсёды шукала мяне. Разумееш? Мяне! І я ведаў, што патрэбны табе, і спадзяваўся, што, магчыма, ты мяне кахаеш.

Ён падняўся і падышоў да Караліны. Пяць гадоў іх жыцця — гэта гісторыя цяпла і пакутаў, адкрыццяў і аднастайнасці, ратунку і адчаю, але ніколі, ніколі — раўнадушнасці! — нібы прамільгнулі перад імі. Яна зразумела, што Васіль стаіць перад ёй на каленях і апантана, але ж пяшчотна, цалуе твар, вочы, вусны, лоб. Яна паспрабавала адштурхнуць яго, яна прасілася: «Васіль, Васіль, не трэба...», — але гэта гучала для яго як прызыў. І тады, у нейкі апошні момант, яна адчайна крыкнула «Не!» і заплакала. Гэтыя слёзы ацверазілі яго. Ён падышоў да тэлефона і выклікаў таксоўку.

Увесь астатні да развітання час яны сядзелі, адвёўшы позіркі, і бесперастанку палілі цыгарэты.

X

А наступным днём пачалося лета. Караліна прачнулася пад гукі флейты, што гучала ў яе душы. Гэта быў добры знак! І яна захавала ўзнёслы настрой нават тады, як прыйшла на працу. Ужо ў апошні момант, выходзячы з кватэры, паспела заўважыць у люстэрку воблік новай Караліны — не пакутлівай, згубленай Караліны, якая існавала шчэ дзень таму, а зусім іншай: шчаслівая і ўзнёслая жанчына зірнула на яе.

Акрылёная прадчуваннем, яна паспела процьму спраў: без боязі адказвала на званкі, размаўляла з калегамі, усміхалася ўсім, хто толькі кідаў на яе погляд; яна занатавала ідэю новай перадачы, тэма якой на хвілю пранеслася ў галаве. Урэшце Караліна правяла гадзіну эфіру і вырашыла, што пасля выхадных папросіць тыдзень адпачынку, каб з'ехаць з горада. Гэтая ідэя захапіла яе.

Яна спусцілася ўніз, даслала ўсмешку дзяжурнаму міліцыянту і выйшла з будынка. У яе была дамоўленасць з Палінай на сустрэчу ў тэатры: увечары ішла прэм'ера «Бэзавай сукні Валянціны». А Караліна любіла Саган*.

Ідучы ў тэатр, Караліна выпіла кубачак кавы з бальзамам на рагу праспекта і вузкай брукаванкі, якая доўжылася не больш за кіламетр і заканчвалася гаёчкам. Потым купіла букет першых, яшчэ закручаных у вабныя шарыкі, півоняў. Калісьці даўно Караліна чытала Саган, пэўна, і гэтую п'есу, але не памятала сюжэта і не намагалася ўзгадваць. Больш важкім было тое, што Караліна ўзнавіла ўражанні, якія заставаліся пасля чытання, яны былі шчымлівымі і цёплымі, як пры развітанні з любімым родзічам, сынам, цёткай, братам...

---

* Франсуаза Саган, французская пісьменніца, аўтар узгаданай п'есы.

Караліна вырашыла не заходзіць у грымёрную. Стрымліваючы сваю ўзнёсласць, з прыхільнай усмешкай гаспадыні яна прыглядалася да публікі. Ёй падалося, што сёння яна іграе нейкую, толькі ёй зразумелую ролю. І гэта была роля Караліны Цвікевіч — жанчыны, якая да бяспамяцтва закаханая ў тэатр, півоні і кубачак кавы і, можа, зусім крыху, у загадкавага суайчынніка з польскім імем. Часам ёй падавалася, што яе пільна разглядваюць, паварочвалася, але спатыкала ветлівыя, цёплыя погляды, без залішняй зацікаўленасці. Яна ведала, што хораша выглядае ў чорнай аблягаючай сукні. Высокі каўнерык падкрэсліваў годны выгіб шыі, а доўгі разрэз спераду дазваляў бачыць ногі і рабіў яе крокі мяккімі, грацыёзнымі. Калі б ёй было семнаццаць, яна б не пакрыўдзілася за параўнанне з коткай. Як і многія госці, Караліна хадзіла па фае з келіхам шампанскага. Але, як нямногія, яна была адна. Каб стварыць ілюзію множнасці, Караліна зноў і зноў разглядала малюнкі мастака, чый партрэт і творы віселі на сценах. Каля кожнай карціны стаялі купкі людзей.

Спектакль прайшоў на «біс». Паліна была надзіва сама сабой: яна не спакушала маладога пляменніка, яна кахала яго! Караліна глядзела на Паліну ў бэзавай сукні і бачыла бэзавае неба, прыцемкі, туман над вадой і постаць адзінокай жанчыны, напоўненай настальгіяй і сумам. Каб толькі ведаць, што той — хто прычына ўцёкаў да сялянскай ідыліі — пытаецца ў Паліны (сапраўднай, яркай, крыкліва-вабнай Паліны): «Яна... передавала што-небудзь... для мяне?»

— Яна цябе пяшчотна цалуе*.

І усё! Няхай тады ён уяўляе, як яна шпацыруе ўздоўж берага — басанож у празрыстай панёве, а побач ідзе той, хто змог замяніць яго — Стэфана!.. Караліна ўявіла гэтую прыгоду і ціха засмяялася.

Яна засталася на сяброўскую вечарынку, дзе ведала амаль усіх. Прысутнасць сярод акцёраў, іхні давер заўсёды дазвалялі Караліне пачуваць сябе непадзельнай часткай вялізнай і прывілеяванай сям'і. Сям'і, якая не займае ніякага становішча ў грамадстве і разам з тым вышэйшая за каралеўскую. Караліне падабалася любіць гэтых людзей. Яны пражывалі дзесяткі жыццяў за адно, у іх было шмат сапраўдных імёнаў: Сяргей, Фрыдрых, Францыск, Юда... Ці: Паліна, Поль, мадам Румянцава, і, зрэшты, Валянціна...

Караліна слухала іхнюю гаману і ўпершыню задумалася: а ці змагла б яна пакахаць Стэфана, калі б ён быў акцёрам? І вырашыла, што — не, бо баялася ўбачыць яго аднойчы іншым, падобным да даўно памерлага героя ці, наадварот, — зусім нерэальным, прыдуманым. А яна не хацела прысвячаць сваё жыццё мумії ці мыльным пухірам.

---

* Апошняя фраза з п'есы «Бэзавая сукня Валянціны».

Караліна падышла да Паліны і ціха развіталася з ёй. Акцёр, што іграў на сцэне закаханага пляменніка, устаў і пацалаваў ёй руку. Ён нават прапанаваў правесці яе дадому, але Караліна не дазволіла. Ёй падалося, што Паліна зусім не ўхваліла прапановы калегі. Караліна па-змоўніцку ўсміхнулася сяброўцы, даслала «пляменніку» паветраны пацалунак і выслізнула за дзверы.

XI

Яна спускалася па бетонных прыступках тэатра ў першую летнюю ноч, захмялелая ад шампанскага, у цёплых хвалях пяшчоты гойдалася ейнае сэрца; яе перапаўнялі пачуцці лагоды і радаснага смутку. У хвіліну, блізкую да разумення шчасця, Караліна адчула боязь: яна не прыслухоўвалася, але, пачуўшы апошні крок да яе, зразумела, што крокі гучалі — нехта ішоў за ёй, ішоў гучна, а не крадком. Яна ўжо рэзка паварочвалася, але нечыя рукі закрылі ёй вочы. Так робяць толькі дзеці і закаханыя.

Яна паспела спужацца, пачала прагна хапаць паветра, але мужчына хутка павярнуў яе да сябе, прыціснуў, прагна цалуючы ў вусны. Ягоныя мяккія валасы казыталі ёй шчокі. І Караліна заплакала: спачатку бязгучна, празрыстыя слязінкі цяклі па шчоках, покуль ён не адчуў іх на смак, а потым, у машыне, куды ён занёс яе і дзе яна скруцілася, як кацяня, на заднім сядзенні, слёзы паліліся раўчаком, яна ўсхліпвала, як пакрыўджанае дзіця. А Стэфан ціха гладзіў яе валасы і шаптаў:

— Усё, мая дзяўчынка. Усё, мая любая. Цішэй... Цішэй...

Ад гэтага шэпту яна супакоілася і села.

— Адкуль ты ведаў, што я тут?

— Я бачыў цябе перад спектаклем.

Ёй захацелася спытаць: ён быў адзін ці не, ды баючыся пачуць адказ, змаўчала. Але Стэфан, нібы зразумеўшы нямое пытанне па вачах, пачаў тлумачыць:

— Я даў сабе слова, што не прапушчу нічога цікавага з таго, што будзе адбывацца дома. Я не казаў табе? Апошнія тры гады я жыў у Празе. Але я вярнуўся. Я хачу працаваць і хачу быць вольным.

— Ты хочаш сказаць, што для мастака патрэбна Луіза, а для мужчыны — Караліна?

— Я думаў так.

— Стэфан?..

Нарэшце ён павярнуўся да яе і паглядзеў у вочы. Проста перад сабой Караліна бачыла твар, такі знаёмы, такі любы. Стэфан так-

сама разглядваў яе, і на хвілю яна пашкадавала, што не можа, як акцёр, сцерці са свайго твару слёзы і пакуту, каб ён запомніў толькі шчаслівае бяздонне яе вачэй. Яны доўга глядзелі адно на аднаго, але Стэфан перапыніў маўчанне.

— Я кахаю цябе, Караліна.

Яна перанесла столькі ўражанняў! І ўсё за адзін вечар! «Не, не! — крычала Караліна. — Ты ненармальны, блазан! Ты дорыш толькі пакуты! Што яшчэ чакаць ад цябе? Ты маўчаў цэлы тыдзень!»

— Я працаваў.

— А я? Я таксама працавала. Але ты мог пазваніць мне. Ты мог пакінуць свой тэлефон!

— У мяне няма тэлефона. Я пабіў яго, бо не люблю тэлефонаў.

— Божачкі, я сплю з блазнам, які не любіць тэлефонаў і малюе голых жанчын.

— Ты даўно не спіш са мной.

— Ах, так!..

Караліна сціснула кулакі і ў шале, падобным да гульні раз'юшанага тыграня, пачала біць Стэфана па плячах. Ён засмяяўся.

— Як я хачу цябе!

Здаецца, яны сказалі гэта адначасова.

— Што, тут?

— Чаму не?

— О не, не...

Вакол былі дрэвы і ліхтары. З тэатральных клумбаў дасягаў п'янкі пах кветак.

Стэфан рэзка крануў машыну з месца. Ён імчаў па начным горадзе. Караліна сядзела ззаду, утаропіўшыся ў люстэрка, у якім лавіла прагныя погляды Стэфана. Яны ўсміхаліся, але толькі вуснамі, бо ў вачах быў адно шал.

— Сёння ў тэатры я разглядваў цябе, як упершыню.

— Ты разглядваў мяне? Чаму ж я не бачыла цябе?

— Я хаваўся за калонамі.

— Навошта?

— Каб назіраць за табой.

— І табе не хацелася падысці, сціснуць маю руку?

— Я жадаў гэтага. Але тады б я не ўбачыў тых поглядаў, якія кідалі на цябе мужчыны.

— Што?

— Твая рэакцыя была непрадказальнай: ты б кінулася мне на шыю.

— Другім разам я таксама буду крытна назіраць за табой.

— Але не рабі гэтага, калі я не адзін.

— Што ты хочаш сказаць?

— Я магу памыліцца, а ты не даруеш.

Яны літаральна рыкалі, як драпежныя звяры, — у чаканні гульні больш цяжкай, чым гульня ў словы...

— Я хачу кожны раз бачыць цябе ў гэтай сукенцы.

— І ноччу?

— Дурненькая дзяўчынка. Як мастак, я адразу ўявіў, куды павязу цябе. Там, дзе абстаноўка будзе дапасоўваць і падкрэсліваць твой воблік.

— І куды ж?

— Туды, дзе будзе комін. Дзе будуць драўляныя сцены.

— На сценах карціны.

— На стале свечкі

— Зоркі на небе...

— А я ля тваіх ног. Буду падліваць табе чырвонае віно і смажыць мяса.

— Стэфан, я не ведаю, чаго мне хочацца больш: цябе ці смажанага мяса.

Гэта прагучала так жаласліва і шчыра, што яны рассмяяліся.

— Сёння ты атрымаеш усё, што хочаш.

— Значыць, гэтае месца існуе: комін... і ўсё астатняе?

— Мы едзем туды.

XII

Наступныя два дні яны правялі на хутары, стылізаваным пад нямецкі дамок. Праўда, прыдатным для жытла быў толькі адзін пакой, ён меў выгляд гасцёўні, варыўні і спальні адначасова. Там быў комін і стаяў ложак. Зараз ён быў незасланы. Два гэтыя дні яны жылі не ў пакоі, а на ложку, і толькі позна ўвечары яна надзявала чорную сукенку і яны йшлі на шпацыр да вялізнага возера. Па празрыстай у месяцовым святле вадзе плавалі свойскія гусі — побач была вёска, і, мусіць, не кожная гаспадыня заганяла гусі нанач. Часам яны бачылі на возеры лодку, а ў ёй рыбакоў — аднаго ці двух, і Стэфан паабяцаў, што наступным разам, калі яны прыедуць сюды, то абавязкова пераплывуць у лодцы на другі бераг.

Яны хадзілі ўздоўж берага па калені ў вадзе (Караліна падцягвала сукенку), каб адчуць прахалоду пасля спякотнага дня і каб сцішыць пал, які спапяляў іх знутры. Яны ішлі наперад, потым вярталіся, трымаючыся ўвесь час за рукі, і здавалася, іхнія постаці хістаюцца ад стомы.

— Скажы, чым ты быў заняты цэлы тыдзень?

— Ты хочаш спытацца, ці не было побач са мной Луізы?

— А яна была?

— Так, я пісаў яе. Я закончыў карціну, і ты хутка ўбачыш яе.

— І ты зусім не думаў пра мяне?

— Чаму? Думаў увесь час. Я ж купіў для нас хутар.

— Значыць, гэта твой дом?

— Так. Я ледзь-ледзь паспеў прывесці да ладу адзін пакой.

— Мілы Стэфан... Мілы... Ты любіш усё рабіць сам?

— Толькі імкнуся. Тут мне дапамагаюць. Разы два прыязджаў Віктар Палескі. Я пазнаёмлю цябе з ім. Ён архітэктар, і яго любяць усе жанчыны, бо ён умее іх слухаць.

— У цябе шмат сяброў?

— Знаёмых — шмат. Я тры гады жыў за мяжой. Там у мяне застаўся сябар. Але сярод маіх знаёмых шмат цікавых людзей.

— Што ты рабіў у Чэхіі?

— Я быў жанаты.

— ... З'ездзем адсюль, — прапанавала Караліна. Раптам ёй захацелася зрабіць яму балюча хаця б за тое, што дагэтуль не магла зразумець, хто ж яна для яго — толькі прамежак паміж былой жонкай і натуршчыцамі? І хто ў гэтай сітуацыі мае большае права на яго? Але ж і яна зусім нядаўна мела мужчыну, які не толькі замяніў мужа пасля здрады, але лёгка мог заняць ягонае месца, калі б Караліна згубіла пільнасць і адчаілася...

Яны прыселі на беразе, і Караліна паклала галаву на калені Стэфану. Ён задумліва разглядаў адбітак месяца ў вадзе, а яна фізічна адчувала ягоную стому, нібы ўпершыню бачыла яго пасапраўднаму. Ёй раней здавалася, што яны аднагодкі, яна дапускала нават, што ён маладзейшы за яе на год-два. Але зараз Стэфан выглядаў больш сталым і сур'ёзным.

— Думаю, хутка можна будзе запрасіць сюды гасцей. Ты не супраць, любая?

Яна падумала, што Стэфан, па сутнасці, не адзінотнік і, пэўна, любіць прымаць гасцей. У яго такі добры густ! І, пэўна ж, у Празе яны з жонкай ладзілі сустрэчы. Да іх прыходзілі мастакі, паэты...

— Якая яна?

Ён уважліва паглядзеў на Караліну і зразумеў, што яна хоча ведаць. У яе пытанні не адчувалася рэўнасці, толькі спакойная цікаўнасць. І ў вачах ён не ўбачыў перавагі, якую адчувалі «недалёкія» жанчыны, калі размова ішла пра суперніц, што засталіся ў мінулым.

— Яна была цудоўная жанчына, мяккая і добрая.

— І прыгожая, і ты яе моцна кахаў.

— Так. Я быў такі закаханы, што маляваў яе паўсюль: дома, у кавярні, на курорце. Я не дазваляў ёй фатаграфавацца, мне здавалася, што на здымку яна будзе менш жывая, чым на маіх малюнках.

— Яна не пярэчыла?
— Не, яна давярала мне.
— А потым?
— ...Яна загінула.
— О, Стэфан! Я...
— Нічога, мне ўжо не баліць. Тут ніхто не ведаў яе, і таму я не мог ні з кім падзяліцца... І потым — гэта эгаістычна, казаць пра тое, што ты адчуваеш, чужым людзям.

Можа быць, ён позна з'явіўся ў яе жыцці. У трыццаць два ўсё не так, як у дзевятнаццаць. Але і ў трыццаць два, і ў сорак хочацца, каб блізкі чалавек адчуваў сябе шчаслівым побач з табой. Магчыма, ён кахаў толькі тую незнаёмую жанчыну, якая была яму жонкай, але ж для Караліны — і яна была ўпэўненая ў тым, — гэта станавілася адзіным, непарушным, самаадданым пачуццём.

— Я кахаю цябе, любы...

XIII

Цяпер Караліна рэдка клалася спаць адна. Яна вярталася з працы і рыхтавала вячэру, часам ён вяртаўся не адзін, прыводзіў з сабой Луізу ці такую ж маладзенькую знаёмую. Адразу дзяўчаты адчувалі сябе няёмка, чырванелі, бянтэжыліся, але Караліна супакойвала іх. Яна зразумела, што покуль хоць адна з іх не апусціць перад ёй вочы, хаваючы «грэх», датуль яна будзе давяраць Стэфану. Яна зараней прыняла ўсё, што адбудзецца з ёй і Стэфанам. Ніхто не будзе мець на яго правоў, але пакуль ён з ёю, яна адчувае трывалае супакаенне.

Ён пазнаёміў яе са сваімі сябрамі, іхняе ідылічнае каханне не парушыла сувязяў са светам: яны часта выбіраліся на выставы, канцэрты, сустракаліся з тэатраламі і мастакамі. Стэфан шмат працаваў, часам знікаў на некалькі дзён, вяртаўся стомлены і, як удавалася, засынаў ледзь не на суткі. Караліна была ўпэўненая, што ён працаваў у майстэрні ці на хутары, амаль не сплючы, і пачынала спадзіху хвалявацца за ягонае здароўе.

Але ён быў дужы і пяшчотны, напоўнены здаровай мужчынскай моцай і прагай кахання.

Зрэдку яна бачыла Васіля, некалькі разоў той запрашаў яе ў кавярню, і тады яны сядалі насупраць за круглы столік «Батлейкі», дзе любілі бавіць час раней. Васіль дзяліўся з ёй нечым нязначным, будзённым, аніколі не закранаючы тэму іхніх асабістых адносінаў, бо тады б Караліна проста не ведала, як сябе паводзіць; баялася, што не змагла б падняць на яго вочы, каб Васіль не ўбачыў,

што немаведама чаму — з ім — саромеецца свайго шчасця. Баялася, што праз якое шчырае пытанне ён абудзіць у ёй тую — даўнюю — Караліну: памяркоўную, спакойную і... блізкую. Яны не парывалі сувязі, але гэтая сувязь стала амаль па-сяброўску разважлівай.

І толькі аднойчы ён нахіліўся і ледзь-ледзь крануў вуснамі шчаку. Яна не апусціла вачэй і паспела ўбачыць пашыраныя, вільготныя зрэнкі, пяшчотныя і нібыта спуджаныя.

Гэтыя рэдкія стрэчы надалі такому сяброўству таямнічасць, але Караліна не адважвалася прызнацца сабе, што пасля расстання Васіль стаў адначасова больш далёкім і больш блізкім. Ёй хацелася бачыць яго шчаслівым, і яна сама дзялілася з усімі сваім шчасцем: адорвала ветлым поглядам, вясёлай усмешкай, цёплым дотыкам пальцаў.

Да яе цягнуліся. Стэфанавы сябры знайшлі, што яна добрая суразмоўніца, ацанілі дапытлівы розум і дасціпна іранізавалі пры ёй са Стэфана. Яны любілі збірацца ў майстэрнях, дзе на мальберце пад плямістай прасціной стаяла няскончаная праца і над усім панаваў пах фарбы, змяшанай з дымам і водарам кавы. Адзінае, чаго не адчула Караліна гэтым летам — спакойнай, будзённай адзіноты. Здавалася — так будзе вечна: і радаснае хваляванне сустрэч, і здзіўленае адкрыццё свету, калі глядзіш нібы праз вочы закаханага партнёра, і бязмежная салодкая стома, уласцівая цяпер іхнім паставам. Здавалася, у любы момант, як Стэфан і Караліна сустракаліся вачыма — сам-насам ці сярод знаёмых, — яны чыталі ў іх адно: «Вось я. Табе — маё цела, мая пяшчота, мая цеплыня, мой давер. Бяры іх, я ведаю, ты аддзячыш мне тым самым». І тады ім здавалася, што няма, і ніколі не існавалі ні плёткі, ні зайздрасць.

Аднойчы ён спытаў, ці не хоча яна ў Прагу?

— Гэта горад багоў. Ты павінна яго ўбачыць.

— Прага — гэта цудоўна. Я ніколі не была там. Мы паедзем адпачываць?

— Мой расклад цябе задаволіць: я атрымаў запрашэнне на выставу. Я выстаўлю свае творы, і ты будзеш, як гаспадыня, абносіць гасцей шампанскім... Не, я загарну цябе ў прасціну, як скульптуру, і пакажу ўсім толькі на развітанне, каб ніхто не паспеў зразумець, што ты жывая. У наш час няшмат вар'ятаў кахаць стод.

— І ты будзеш бязмежна рады...

— Ты будзеш толькі маёй багіняй.

Яны спланавалі сваю паездку на верасень, каб да прызначанага тэрміну Стэфан паспеў сустрэцца са службоўцамі галерэі і абмеркаваць умовы.

А пакуль — ціха мінала лета...

XIV

...І вось яны сядзелі ў кавярні — на нейтральнай тэрыторыі... За вакном зіхацеў шматколернымі агеньчыкамі прыбраны да Калядаў Мінск... На цёмным шкле вымалёўваліся два стрыманыя, строгія профілі... Ішоў густы снег... Яны абодва замерзлі і зараз маленькімі глыткамі пілі гарачы грог, адцягваючы размову...

Караліна намагалася не падымаць вачэй, ёй здавалася, што ў яе поглядзе тоіцца — незразумела з чаго? — вінаватасць, і яна злавала на сябе за гэта. Стэфан сядзеў прама, амаль нерухома, толькі рукі, у якіх ён трымаў гарачы кубак, раўнамерна падымаліся і апускаліся. Яны абое адчувалі небяспеку першага дапытлівага погляду, можа быць, больш небяспечнага, непазбежна-вырашальнага, чым першы дотык у цноце. Яны стаіліся, стрымліваючы дыханне, але ў нейкі момант, губляючы трываласць, яны сустрэліся: ён — з горкай усмешкай, яна — стомленай і цёплай.

— Я думаў пра цябе. Я ўвесь час думаў пра цябе.

Але паміж імі ўжо стала тое, што завецца расстаннем.

* * *

Ішлі апошнія дні лета. Нарэшце Стэфан закончыў абсталёўваць хутар, надаўшы яму выгляд ідылічнага сялянскага доміка. Была завезена мэбля, і можна было ўжо прыняць хеўру добрых сяброў, каб адзначыць заканчэнне лета і іхні ад'езд у Прагу. Зараней вызначылі дзень, атрымалі згоду сяброў. Туды прыехалі архітэктар Віктар Палескі, Паліна з дваццацігадовым сынам, які для няцямных здаваўся «кавалерам» сваёй маці, што смяшыла актрысу і адначасова падабалася ёй, а таксама добрыя знаёмцы Стэфана — сталы пісьменнік з жонкай і малады мастак. Ужо некалькі дзён Стэфан не прыходзіў да Караліны, толькі званіў, ёй падалося, што ён пазбягае яе, але яна адагнала гэтую думку і супакоілася. Ён заехаў па яе, дарогаю на хутар то маўчаў, то намагаўся доўга і хутка гаварыць, адчуваючы, што гэтыя перапады настрою трэба тлумачыць, і не тлумачыў. Караліна дзівілася, але не прыспешвала яго, сярод спёкі размераных месяцаў лета яна аблытала сябе ў кокан шчасця, ахвярна адрынуўшы права нешта вырашаць самой, і гэтая шчодрасць, якой надзелены толькі закаханыя жанчыны, не дазволіла ёй запытаць: «Дык што ж з намі адбываецца ў гэтыя хвіліны?»

А позна ўвечары, калі Стэфан павёў гасцей да возера паказаць ім той грудок, які ён аднойчы такім часам прыняў за русалку, Караліна засталася, каб прыбраць збольшага стол і падрыхтаваць ложкі. Стэфан не запярэчыў.

Яна ўжо сцяліла ў маленькім пакоі, як убачыла на століку тэчку. Час ад часу яна бачыла яе ў Стэфана: там ляжалі накіды, але Караліна ніколі не разглядала іх. Стэфан не любіў хваліцца чарнавікамі, ён паказваў толькі гатовыя працы, увасобленыя на палатне, дзе буяў свет чароўна-маляўнічых фарбаў, нязвыклых вобразаў і метафар. Ён быў таленавітым мастаком, і гэта зазначалі ўсе, хто сутыкаўся з ім.

Караліна раскрыла тэчку, і першае, што кінулася ў вочы, — ліст: адмысловы канверт, пражскі штэмпель. Яна не ўтрымалася і выцягнула паперку. Жонка прасіла Стэфана дараваць ёй памылку, пісала, што кахае толькі яго і чакае яго. Яна захавала ўсе ягоныя малюнкі і божыцца, што больш ніякі мастак, акрамя яго, не ўбачыць ейнага цела. Ліст быў датаваны нядаўнім часам.

Караліна сыходзіла па лесвіцы якраз у той момант, як вярталіся госці. І Віктар Палескі ледзь паспеў падхапіць яе ў той момант, калі яна адчула, што губляе прытомнасць. Ліст упаў да ног Стэфана.

* * *

Ён паехаў у Прагу адзін. Іхняе расстанне было надзіва стрыманым, ён увесь час пра нешта думаў, яна таксама была засяроджаная ў сабе. ...І вось зараз яны сядзелі разам у знаёмай кавярні на рагу дзвюх вечаровых мінскіх вулак, упрыгожаных гірляндамі лямпачак і каляровых ліхтарыкаў. Яна ніяк не магла яшчэ паверыць, што ён вярнуўся, як не дазваляла сабе думаць: чаму? А ён неадрыўна глядзеў на яе і толькі бясконца паўтараў:

— Я думаў пра цябе. Я ўвесь час думаў пра цябе.

1995

РУЖЫ ДЛЯ ЧУЖОГА КАХАНКА

Дзейныя асобы:

К а з і м і р — далёка за сорак, маладжавы
М а р т а — ягоная жонка
М а р ы с я — сяброўка Казіміра
Б а г у с я — пляменніца Марысі
П у ч ы н с к і — калега Марысі
І к а р — таксіст

ДЗЕЯ ПЕРШАЯ

З густам абстаўленая кватэра, шмат дробных дэталяў: вазачкі, скрыначкі, парцалянавыя статуэткі. Адны дзверы вядуць у суседні пакой, другія — на кухню.

Сцэна першая

Уваходзяць Марыся і Казімір. У ягоных руках валізка. Спыняюцца пасярэдзіне пакоя.

К а з і м і р

(весела)

Боскае месцейка... Пазнаю...

М а р ы с я

Табе ўсё боскае, што не дома. Тое, што мне ўжо не дваццаць, таксама не мае значэння?

К а з і м і р

Вядома, не.

(Падыходзіць бліжэй, цалуе яе ў дзве шчакі.)

У маім жыцці значэнне маюць толькі дзве рэчы: прыгожае асяроддзе і вытанчаныя жанчыны.

М а р ы с я

Не скажу, што засталася вытанчанай.

(Праводзіць далонямі па баках: зверху ўніз.)

Але я рада цябе бачыць. Як ты, чаму да мяне?

Казімір

(здзіўлена)

Але...

Марыся

Зараз, зараз, я згатую каву, і ты ўсё мне раскажаш. Толькі не хлусі, што ты кінуў Марту.

Казімір

Чаму кінуў? Мы з ёю рассталіся.

Марыся

Ці не хочаш ты сказаць, што застанешся ў мяне назаўсёды?

Казімір

(смяецца)

Чаму ж не? Я заўсёды любіў цябе.

Марыся

Што не перашкаджала табе жыць з Мартай.

Казімір

Прабач, што я не захапіў з сабой раскладанкі. Але я так спяшаўся.

(Паціскае плячыма)

Пакуль Марыся на кухні бразгае кубкамі і гатуе каву, Казімір абыходзіць няспешна пакой, разглядае парцалянавыя сувеніры, перастаўляе іх і ўвесь час нешта насвістае.

Ты ўсё адна?..

Марыся

(вызірае з дзвярэй кухні)

Ты думаеш, за той час, што цябе не было, я змянілася?

Казімір

Зразумела. Ты па-ранейшаму любіш волю. Воля — найцудоўная ў свеце рэч. Я ведаю гэта не на словах, сам усё жыццё змагаюся за яе. Колькі дзівосных жанчын прайшло праз мае рукі, а я ўсё баяўся быць не адзін.

(Уваходзіць Марыся з тацай і кубкамі кавы.)

Таму і не засталіся мы разам. Ці не так? Марыся, ты зацугляла б мяне, як лядашчага коніка?

Марыся

Не ведаю.

Казімір

Ведаеш, ведаеш. А так — паглядзі, як добра, — усе зніклі, і засталіся толькі я і ты.

(Сядаюць за стол.)

Марыся

Ты хочаш сказаць, што маё жыццё не ўдалося? Што я нікому не была патрэбная?

Казімір

Ды не, дарагая. Мне зусім не хочацца, каб на пачатку сустрэчы мы пачалі высвятляць адносіны.

Марыся

І пасварыліся, ты хочаш сказаць? Тады табе сапраўды не будзе куды падзецца.

Казімір

Прабач, прабач, любка. Я не хацеў цябе пакрыўдзіць. У мяне папраўдзе застаўся толькі адзін блізкі чалавек — гэта ты. Мне не хацелася б бавіць час у гатэлі з прусакамі.

Марыся

Табе ізноў патрэбна спачуванне?

Казімір

У цябе знойдзецца што-небудзь выпіць?

Марыся

(намагаецца падняцца)

Ром?

Казімір

(стрымлівае яе, падымаецца сам)

Калі ён стаіць там, дзе заўсёды, я знайду сам. Ты ніколі не любіла перастаўляць рэчы.

Марыся

Твая праўда, я не люблю перастаўляць рэчы, я не люблю мяняць мужчын і, наогул, за тры гады, што мы не бачыліся, ні на кроплю не змянілася! Табе жыццё дорыць новыя і новыя задавальненні, а мне толькі новыя зморшчынкі. Ты не заўважыў?

Казімір

(бярэ пяшчотна яе руку і цалуе)

Так, я сапраўды бачу, што ты змянілася. Але хіба гэта так важна для нас абаіх? Ты ўжо не лічыш мяне сваім сябрам? Паглядзі на мяне — я не маладзён, які марыць спадабацца вопытнай жанчыне. Вядома, я не праціўнік цёплых адносін паміж юнаком і сталай кабетай, але мяне не трэба заваёўваць. І мы не сярод тваіх знаёмых, дзе можна гуляць у закаханых. Як мы любілі гэтую гульню!

Марыся

Мы любілі гэтую гульню... Я здзіўляю цябе?

Казімір

Ніколькі. Мы ведаем адно аднаго з юнацтва. У нас усё за плячыма. І мы даўно не хлусім адно аднаму.

(Нахіляецца і пяшчотна цалуе яе ў вусны.)

Марыся

Навошта ж хлуслівы пацалунак?

Казімір

Мне проста прыемна бачыць цябе. Я рады, што нарэшце вырваўся.

(Усміхаюцца абое.)

Марыся

Ты можаш тут жыць, колькі хочаш. Але спаць табе давядзецца на раскладанцы.

Казімір

А дзе той ложак, на якім я спаў мінулы раз? Хіба ты выкідаеш рэчы?

Марыся

Там спіць Багуся.

Казімір

Хто гэта?

Марыся

Як бы ты ні хацеў гэтага не заўважаць, але я ўжо старая цётка. І гэтая цётка мае пляменніцу... Зразумеў?

Казімір

(з пафасам)

Пэўна, яна зусім дзяўчынка. Яе бацькі загінулі ў катастрофе, і ты як сумленная і адказная асоба ўзялася яе выхоўваць.

Марыся

Не іранізуй. Яна дарослая дзяўчына і вучыцца ва універсітэце. Ты не хочаш жыць у гатэлі з прусакамі, а яна не хоча — у інтэрнаце сярод разбэшчаных маладых людзей.

Казімір

І гэтая твая Папялушка кожны вечар пасля заняткаў разбірае гарох і бабы? Ці ты ёй змешваеш рыс з просам?

(Ідзе на кухню, вяртаецца з бутэлькай і келіхам.)

Марыся

(смяецца)

Яна не Папялушка, яна член сям'і. І калі ты застанешся з намі, то, любы сябра, паводзь сябе так, каб твая былая каханка выглядала прыстойна ў вачах сваёй пляменніцы.

Казімір

Сапраўды, моладзь не заўсёды правільна разумее адносіны старэйшых. Яны ўжо не ведаюць, што такое сяброўства?

(Налівае на донца.)

Марыся

Ты катэгарычны. У яе ёсць сябар.

Казімір

Таксама студэнт. І, вядома, нігіліст...

(Смяецца.)

Уваходзіць Багуся. Рашуча здымае з пляча кайстру, шпурляе яе на канапу. Сама праходзіць у другі пакой і ляпае дзвярыма.

Марыся

Багуся...

Казімір

Падобна, што студэнт яе пакрыўдзіў. Яна такая бледная і... танюткая.

Марыся

Я была амаль такая ў яе гады.

Казімір

Ты была крамяная і ружовая. Памятаеш, як мы хадзілі ў вандроўку па Дзвіне? Днём плылі на байдарках, а ўвечары ставілі намёты і цешыліся вясёлымі показкамі. Аднойчы я залез у твой намёт, каб размаляваць табе твар зубной пастай... Зубной пастай...

(Смяюцца разам.)

Маё сэрца раздзірала шкадоба ад таго, што ты спіш і не бачыш, як я смяюся з сябе.

Марыся

Затое ў другую ноч я бачыла, як ты цалаваў Раіну. Яна была рыжая, з рабаціннем на твары.

Казімір

(збянтэжана)

Ты бачыла? Не, гэта быў не я... Гэта быў той малады гітарыст, да якога яна заляцалася. Я толькі мазаў яе кефірам, бо за дзень яна спальвала ружовую скурку... Якія мы былі маладыя! Але...

Марыся

Што?

Казімір

Твая пляменніца так і не выйдзе пазнаёміцца са мной?

Адчыняюцца дзверы, адтуль вызірае Багуся.
Яна змушана ўсміхаецца і выходзіць да іх.

Багуся

А-а, цёця. Я не заўважыла, што ў нас госці.

(Багуся падае руку Казіміру, той устае і цалуе працягнутую руку.)

Казімір

Казімір, стары знаёмец вашай цёці.

Багуся

Гэта ваш партрэт трымае яна на тумбачцы перад ложкам? Тады я вас ведаю.

Марыся

Багуся! Гэта мой стары сябра.

Багуся

Я так і зразумела. Жывы вы больш прывабны, чым на партрэце.

Казімір

Я стану для вас яшчэ больш прывабным, калі вы даведаецеся, як я іграю...

Багуся

Вы іграеце? У што — у покер ці ў дурня?

Марыся

Багуся!

Казімір

Не, мілае дзіця, я іграю на фартэпіяна.

Багуся

Дык вы музыкант? А мая цёця казала, што вы донжуан і няшчасны чалавек. Хаця няшчасныя людзі лепш за ўсё іграюць на фартэпіяна... ці саксафоне.

Казімір

Дарагая Марыся, з гадамі ў цябе развіваецца пачуццё такту.

Казімір і Марыся глядзяць адно на аднаго.

Марыся

(хутка)

Не, ты разумееш... ты думаеш... Не, я не магла... Я проста сказала ёй, што ты любіш жанчын.

Казімір

А ты не сказала, колькі мне гадоў?

Багуся

Старыя мужчыны заўсёды любяць маладых дзяўчат. Я вам падабаюся?

Казімір

Я мала вас ведаю.

Багуся

Няўжо!

Казімір

Вядома, мне падабаюцца маладыя дзяўчаты, але я не прэтэндую на іхняе каханне.

Багуся

А на іхнюю ўвагу прэтэндуеце?

Казімір

Вядома, яны валодаюць вялізнай жыццёвай сілай, яны здольныя вярнуць моц... Але мне хутка пяцьдзесят, і такія спелыя плады не па маіх зубах.

Багуся

А я бачу, што вашыя зубы ў парадку. І часта плод сам падае ў рукі, для гэтага неабавязкова стаяць пад дрэвам.

Марыся

(здзіўлена)

Багуся, цябе пакрыўдзіў Уладзіслаў?

Багуся

Не, цёця. Я сама пакрыўдзіла яго. Здаецца, вы казалі, што ваш сябар жанаты?

Казімір

Так, я жанаты, дзіця.

Багуся

І?..

Казімір

І зараз я здыму папругу і надзяру тваю худую задніцу, каб надалей ты не крыўдзіла сваю цётку.

Багуся

Лепш надзярыце задніцу маёй цёці... а яшчэ лепей...

Казімір і Марыся збянтэжана пераглядваюцца.

...А яшчэ лепей, мілы дзядзька Казімір, прывязіце сюды вашу жонку. Думаю, што пакрыўджаная жанчына дасць самую правільную характарыстыку таму, з кім жыве. Можа, гэта хоць трохі расчаруе і ацверазіць маю Марысю.

Марыся была ўстала, але адразу апусцілася на крэсла. Яна закрыла вочы рукамі. Багуся ідзе на кухню і прыносіць яшчэ дзве шклянкі. Налівае ва ўсе пакрыху рому. Падымае шклянку.

За сустрэчу! І за знаёмства.

(Выпівае.)

Казімір

(разгублена бярэ шклянку)

За знаёмства.

Марыся

(адымае рукі ад вачэй)

За сустрэчу.

Казімір

Я-я...

Марыся

Не злуйся на яе, не сварыся. Яе праўда. Я ўсё роўна буду любіць яе. Успрымай усё, як жарт.

Казімір

Маладое пакаленне надта жорстка жартуе.

Багуся

Я не жартую, я іранізую. Прабач, цёця. Не бяры да галавы, а то спаць не будзеш.

Марыся

Я буду добра спаць, не хвалюйся.

Багуся

(Казіміру)

А вы?

Казімір

А я не люблю доўга спаць. З гадамі мне шкада часу, патрачанага на сон.

Багуся

І што вы робіце, калі не спіце?

Казімір

Чытаю.

Багуся

І што — дапамагае?

Казімір

О, дапамагае. Я тады разважаю, як філосаф. Мне здаецца, у гэтыя моманты я адкрываю вялікія ісціны. Я ўзгадваю тых, што жылі да нас, і тыя вучэнні, якія яны складалі для нас. Яны толькі хацелі, каб мы любілі адно аднаго і былі добрымі, чулымі, спагаднымі.

Багуся

А як жа тады зло, войны? Хто прымушаў бамбіць Ірак ці нападаць на бедных палесцінцаў? Дзе ж былі добрыя, калі маладых хлопцаў адпраўлялі ў Афганістан? Хто ж вінаваты за вашае пакаленне? Вашых бацькоў навучылі ваяваць на франтах Айчыннай. Цяпер вы вучыце гэтаму майстэрству маладзейшых. Чаму б не распусціць усе войскі і не падпісаць новага Мюнхенскага пагаднення?

Казімір

Калі зла занадта многа, яно абавязкова народзіць дабро... Здаецца, гэта сказаў Шэлі. Папраўдзе, мілая дзяўчына, я не маю права на жыццё.

Багуся

Не бярыце ўсё на сябе! Я не вас мела на ўвазе.

Марыся

Здаецца, цяпер ты пакрыўдзіла яго.

Багуся

Вы, абое, выбачайце. А каб больш не сварыцца, мы абмяркуем умовы пагаднення і змацуем усё шчырым братэрскім... ці ўсё-ткі сястрынскім?.. пацалункам.

Багуся падыходзіць да Марысі і цалуе яе ў шчаку.
Казімір хоча нешта сказаць, але спыняецца.
Багуся набліжаецца да яго, заплюшчвае вочы і цалуе яго доўгім пацалункам. Пасля забірае сваю кайстрачку і імкліва сыходзіць.

Марыся

А яшчэ зусім нядаўна мне здавалася, што яна захопленая толькі сваім Уладзіславам і ні пра што не думае.

Казімір

Яна не проста думае, яна разважае. І ты, мая мілая сяброўка, спрыяеш ёй у гэтым.

Марыся

Як?

Казімір

Хаця б тым, што расказваеш ёй пра нашыя адносіны. Яна ўжо не будзе так безаглядна давяраць юнакам.

Марыся

Ты смяешся з мяне. Яна не мая тайка, яна мая пляменніца. Каб зразумець маю пяшчоту да цябе, не трэба быць відушчай: мы жывём побач ужо другі год.

Казімір

Яна любіць цябе. Так, яна любіць цябе, гэтае складанае, іранічнае дзіця.

Марыся

Ты кажаш — дзіця? Ты сур'ёзна так думаеш? Але ў яе ўзросце мы...

Казімір

Таму што зараз для мяне яна дзіця.

Паўза.

Марыся

Хм! Ёй дзевятнаццаць гадоў. І яна ўжо ведае, што такое каханне... Папраўдзе, мне падалося, што ты ёй спадабаўся... І што яны ўсе ў табе знаходзяць?

Казімір

Ты сама мне заўсёды казала, што я прывабны...

Марыся

Так.

Казімір

Імпэтны...

Марыся

Так.

Казімір

Пяшчотны...

Марыся

Так.

Казімір

І ты думаеш, што я сапраўды ёй спадабаўся?

Марыся

Не, не і не! Нават не думай...

(Казімір паціскае плячыма.)

Нядаўна я разбірала рэчы і знайшла наш студэнцкі альбом. Я пакажу табе яго. Можа, цяпер ты зразумееш, чаму я кахала цябе тады?

Марыся ідзе ў пакой. Вяртаецца з тоўстым альбомам у руках, кладзе альбом на стол перад Казімірам. Ён разглядае здымкі, яна ходзіць па пакоі, гладзіць і перастаўляе парцалянавыя сувеніры, як рабіў перад гэтым Казімір.

Казімір

О, глядзі — наш курс... А я ўжо многіх не памятаю. Не памятаю нават імёнаў... А гэта хто такая — у самым кутку, з двума хвосцікамі?

Марыся

Каця Разанцава.

Казімір

Я не заляцаўся да яе?

Марыся

Не, таму і не памятаеш.

Казімір

А гэта, смешная, з пышынай касой?

Марыся

Мне трэба было скласці спіс, каб ты не пытаўся. Табе не хапае яе імя? Як я раней не здагадалася апісаць кожную паасобку, каб занатаваць для цябе сённяшняга тое, што ты прапаноўваў ім у мінулым? Там ёсць Света... прыгледзься, у яе самыя вялікія вочы... ты пісаў ёй цыдулкі і запрашаў у кіно.

Казімір

Мы часта збягалі з ёй з апошняй пары, каб паесці марозіва ў маленькай кавярні.

Марыся

А Дзікава Марына? Ты цалаваў яе ў калідоры на перапынках.

Казімір

Гэта было толькі на... другім курсе... А вось ты.

Марыся хутчэй перастаўляе статуэткі, адна з іх падае. Казімір падхопліваецца, ідзе да Марысі, падымае сувенір.

Казімір

Ты была самай прыгожай у нашай групе.

Марыся

Ты ліслівіш. Зусім так, як тады. Самае каштоўнае для цябе — вабнасць, гульня ў каханне і недагаворанасць. Ва ўсім. Ты застаўся такім жа нерашучым.

Забірае з ягоных рук статуэтку, ставіць на месца.
Ён зноў бярэ яе і робіць выгляд, што разглядае.

Казімір

А твая пляменніца — што яна вывучае?

Марыся

(уважліва глядзіць на яго)

Часам мне здаецца, ты ўсё жыццё будзеш смяяцца з мяне, нават не падазраючы пра гэта...

(Адыходзіць да стала, сядае на тое крэсла, у якім сядзеў ён.)

Ты пытаешся пра Багусю? Яна вывучае біялогію, і, здаецца, ёй гэта падабаецца. Яна выдатніца.

Казімір

О, гэта такая цікавая навука! І ты кажаш, яна на другім курсе? І яны ўжо рэзалі жабаў на сваіх занятках?

Марыся

Скажы мне, акрамя таго, што ты сышоў ад Марты, акрамя таго, што табе цікава, чым займаецца мая пляменніца, ты нічога больш не хочаш ведаць... пра мяне? Мы не бачыліся з табой тры гады!

Казімір

Я заўжды быў кепскі тактык. Мяне заўсёды цікавіць шмат чаго, акрамя галоўнага.

(Падыходзіць да яе, бярэ за руку.)

...Ну вядома, я хацеў спытацца, ці ёсць у цябе мужчына?

Марыся

Я табе ўжо адказвала. Я адна.

Казімір

А чым ты займаешся па вечарах?

Марыся

Разглядаю твой здымак, плачу ў падушку, а потым іду выгульваць сабаку.

Казімір

(азіраецца)

Але ж у цябе няма сабакі.

Марыся

Няма сабакі?.. Я забылася — у мяне няма сабакі. Тады я бяру гэты альбом, пераглядаю некалькі разоў, п'ю каньяк, а потым раскладаю пасьянс.

Казімір

Мая Марыся раскладвае пасьянс?

Марыся

Табе смешна?

Казімір

Не, я толькі прашу навучыць мяне раскладваць карты. Ты ж робіш гэта на картах ці ў цябе ёсць адмысловыя карцінкі?

Марыся

Навошта табе гэта?

Казімір

(сур'ёзна)

Каб ведаць свой лёс!

Марыся

(перакрыўляючы)

Божухна, ведаць свой лёс! Ты і так ведаеш: цябе чакае крыжовая дама, у цябе была дарога, на тваім шляху яшчэ дзве дамы: адна з іх значна маладзейшая. Потым, калі ты вырашыш развітацца з той, што цябе чакае, ты трапіш у казённы дом, будзеш шукаць грошаў.

(Раптам дастае з-пад абруса калоду картаў, тасуе, кідае па чарзе карты.)

Вось, нечыя слёзы... Каханне... У пары з гэтай картай — палкае каханне... А гэтая карта паказвае, што кахаць будуць цябе, а не ты...

Казімір

(нясмела)

І калі?.. Хутка?

Марыся

(кідае калоду, потым збірае ўсе карты і хавае пад абрус)

Божухна, скуль я ведаю? Ты невыносны! Прыедзеш, развярэдзіш душу, абнадзеіш, пасмяешся, пацалуеш... і ўсё! Ты калі-небудзь станеш дарослым? Сур'ёзным, цвярозым?

(Адварочваецца.)

Казімір

Марыся! Марыся, ты плачаш?

Марыся

Ды не... не, табе здалося.

Казімір

Марыся, мілая... Я больш не буду абнадзейваць, я больш не буду прыязджаць.

Уваходзіць Багуся, у руках ружы.

Багуся

Што такое? Вы сентыментальнічаеце?

Марыся і Казімір маўчаць.
Багуся, увесь час напяваючы, праходзіць на кухню, вяртаецца з вазай, у якую пастаўлены ружы. Ставіць вазу на стол. Падыходзіць да маленькага століка, дзе стаіць прайгравальнік. Ставіць кружэлку. Гучыць «Як мне быць» у выкананні Аляксандра Сярова. Спрабуе танчыць адна, але, вальсіруючы, набліжаецца да Казіміра і прысядае.

Багуся

Я запрашаю вас на белы вальс.

Казімір

(згаджаецца, яны марудна рухаюцца)

Вы такая вясёлая. А мне здавалася — ужо нішто не зможа вас развесяліць. Хаця нічога дзіўнага: вы вярнуліся пасля сустрэчы з гэтым... Уладзіславам. Гэта ён падарыў вам ружы?

Марыся адварочваецца ад іх.
Падобна, што яна ў задуменні — уся прамая, зацятая.

Багуся

Так. Ён сказаў, што кахае мяне. І ён хоча жыць са мной. Казімір, што такое жыць разам?

Казімір

Ну, гэта калі кахаеш...

Багуся

А калі не кахаеш?

Казімір

Тады вы не можаце жыць разам.

Багуся

Але ж я не пра нас. Хіба вы кахаеце сваю жонку, калі зноў і зноў вяртаецеся да Марысі?

Марыся рашуча ідзе да прайгравальніка, спыняе кружэлку.

Марыся

Казімір збіраецца сысці ад нас.

Казімір

Але, Марыся, я не хачу ў гатэль... Я хачу быць з вамі.

Багуся раптам падбягае да Марысі, становіцца перад ёй на калені.

Багуся

(жаласліва)

Марыся, калі ласка, не выганяй яго. Марыся, пакінь яго. Я буду харошай і перастану цябе крыўдзіць.

Марыся горка ўсміхаецца. Багуся ўстае. Яны глядзяць адна на адну. Марыся згодна ківае галавой і сыходзіць у другі пакой.

Казімір

У яе моцныя нервы. Не дзіва, што я так трымаюся за яе: з усіх жанчын яна была самай разважлівай. Часам мне здаецца — я зусім не ведаю яе.

Багуся

А мне здаецца: я ведаю цябе ўсё жыццё.

(Узнёсла.)

Дык жыві так, нібыта ты зараз павінен развітацца з жыццём, нібыта час, пакінуты табе, ёсць нечаканы падарунак.

Казімір

Прызнайцеся, вы цытавалі старажытных філосафаў.

Багуся

(павучальным тонам)

Прызнайся... ты... цытавала... Казімір, мы будзем на «ты». Цяпер мы будзем размаўляць на «ты».

Казімір

Але ж «вы» — гэта ў нейкай ступені сцяна.

Багуся

Ты бачыш сцяну паміж намі?

Казімір

(жартам азіраецца, мацае)

Не, не бачу.

Багуся пачынае смяяцца, Казімір падхоплівае смех.

Давай станем сябрамі.

Багуся

Люблю нязначныя фразы. Будзем сябрамі; пацалуйце за мяне вашу цёцю; перадай яму прывітанне; скажы, што я заняты... А яшчэ: я не буду на пахаванні, я толькі атрымаю спадчыну.

Казімір

(уважліва разглядае яе)

А ты зусім няпростая.

Багуся

Я складзена з двух чалавек: з маці і бацькі. А яны абое дбалі толькі пра сябе.

Казімір

А жыццё з Марысяй цябе чаму-небудзь навучыла?

Багуся

Так. Толькі тут я зразумела, хто мне патрэбны.

Казімір

Хто?

З пакоя выходзіць Марыся, яна трымае кошык.

Марыся

Схаджу, куплю што-небудзь на вячэру. Ад радасці я забылася цябе накарміць. Ты не ў крыўдзе?

Казімір

Я не адчуваю голаду.

Багуся

А я дык зусім галодная.

Марыся

Вазьмі што-небудзь у лядоўні.

Багуся

Мы пачакаем. Я папрашу Казіміра заняцца ўспамінамі: няхай ёй мне раскажа пра вашу маладосць.

(Разгортвае альбом.)

А гэта хто такі — высокі, з завітымі валасамі?

Казімір

(глядзіць запытальна на Марысю)

Здаецца...

Марыся

Васіль Гайсёнак.

(Сыходзіць.)

Багуся

(рэзка загортвае альбом)

Я бачу ў гэтым пераемнасць пакаленняў: калі нехта са старога здымка падобны на таго, каго ты блізка ведаеш сёння...

Казімір

Які сэнс ты ўкладаеш у слова «блізка»?

Багуся

У дадзеным выпадку сэнс у тым, што яднае дваіх маладых людзей рознага полу: пазнанне... ха-ха-ха... Калі адбываецца псіхалагічнае і фізічнае пазнанне...

Паўза.

...Я не павінна была табе гэта казаць. Ты пакутуеш?.. Я маю на ўвазе ад таго, як я сябе паводжу?

Казімір

Па шчырасці, не ведаю. Але Марыся, здаецца, не заахвочвае такога стылю. Кім была ты раней? Я маю на ўвазе да таго, як перабралася да Марысі?

Багуся

Школьніцай.

Казімір

Але ж, усё-ткі кім?

Багуся

Не разумею. Цябе цікавіць — якой?

Казімір

І гэта таксама.

Багуся

Мілай, цікаўнай дзяўчынкай.

Казімір

А як з даверам, шчырасцю?

Багуся

Усе, з кім мяне знаёмілі, — давяралі мне... І я зусім шчырая... сама з сабой.

Казімір

Не, ты не брыдкае качаня, і нават не Аліса... Усе мы ў дзяцінстве — хтосьці; мы гуляем у робін гудаў, маўглі, індзейцаў, факіраў ці каралёў. А вось ты кім была?

Багуся

(з аблёгкай)

А-а... Дык вось што цябе цікавіла. Я не гуляла ў прынцэсаў, а калі й гуляда, то не памятаю. Мне было цяжка знайсці агульную мову з дзяўчынкамі. Мае сяброўкі былі спрэс балбатлівыя, крыклівыя і капрызлівыя. Цішком я запіхвала ў іхнія доўгія валасы дзядоўнік і так шчыра спачувала, калі яны, плачучы, выдзіралі калючкі... Я дапамагала ім...

Казімір

Ты прапаноўвала збегаць па нажніцы?

Багуся

Адкуль ты ведаеш?

Казімір

Я здагадаўся... У юнацтве я зрэзаў калючкі з ружаў, калі пайшоў на першае спатканне. Мне было так шкада, што яна паколе рукі.

Багуся

Зрэшты... падсоўваць ці не падсоўваць калючкі — гэта залежыць ад таго, чаго чакаць у выніку.

Казімір

А ты не баішся, што...

Багуся

У глыбіні душы — баюся.

Уваходзіць Марыся з кошыкам.

Марыся

Багуся, ты сказала: чагосьці баішся? Хацела б я ведаць — чаго.

Багуся

Баюся, цёця. Атамнай вайны, начных пачвараў, прышэльцаў з космасу... Баюся памерці такой маладой, прыгожай і ні хвіліны не належаць яму... А яшчэ я баюся быць раскапанай праз тысячагоддзі. Я бачыла ў музеі астанкі старажытнай жанчыны. У яе на шыі... на гэтым месцы *(паказвае)*... былі пацеркі з блакітных камянёў... Уяўляеш, яна памерла ў пацерках!

Марыся

Але ж іх маглі надзець потым.

Багуся

Не! Была рэч, і была тая, каму яна належала. Душы няма, чалавека няма, няма таго, што іх акаляла. І раптам нейкі вар'ят выцягвае на свет прывідаў. А тая — прыгожая, пяшчотная, сарамлівая, — ніколі не ўведае, што праз многія тысячагоддзі яе цела адкрытае кожнаму воку.

Казімір

Але ж цела, па сутнасці, няма. Ты сама сказала — астанкі. Значыць, некалькі шэра-зялёных костак. Ты ўсё драматызуеш.

Марыся

(іранічна)

Мы любім удзельнічаць у трагедыях. Здаецца, у школе ты займалася ў драмгуртку?

Багуся

Гэта табе мама напісала?.. А зрэшты, я магла сказаць гэта сама.

Казімір

Мілыя дзяўчаты, цяпер я па-сапраўднаму галодны. Мяне чакаюць тысячагоддзі, а я перад тым нават не павячэраў.

Марыся ўсміхаецца, Багуся задуменная.

Марыся

(весела)

О, паглядзі толькі, што я купіла!

(Падыходзіць да стала, пачынае выцягваць пакункі.)

Вось сыр. Вось паштэт. Памідоры... не памятаю — ты любіш памідоры? Мы паспрабуем абысціся канапкамі. Ты ж ведаеш, як я люблю гатаваць. Заўжды была кепскай гаспадыняй... Але Багуся яшчэ горшая.

Багуся

Няпраўда.

Марыся

Зрэшты, твая прыгода набудзе разнастайнасць. Мужчыны любяць добра харчавацца. Часам здараецца, яны бяруць сабе за жонку тую, якая лепш гатуе.

Багуся

Гэта праўда?

Казімір

Пэўна, у такіх выпадках спрацоўвае інстынкт самазахавання. Мы будзем есці?

Марыся

О, так!

Дастае з кошыка хлеб, нейкія пакункі.

Багуся, нясі хуценька начынне. Казімір, пастаў кружэлку. Мы будзем насычацца нішчымнай ежай пад боскую музыку... Класіку, Казімір!

Казімір

А потым, мае мілыя дамы, я запрашу вас у рэстаран. Куды мы пойдзем, Марыся?

Марыся

Туды, дзе мы былі роўна тры гады таму.

Казімір

А-а... Там прыцемнена, у вокны залятае ветрык і час ад часу задзьмувае свечкі, што стаяць на стале.

Марыся

І цалюткі вечар іграюць блюзы.

Багуся

Калі яны не змянілі свайго стылю. У наш час усё так імкліва мяняецца!

Марыся

Я гэта заўважыла па табе.

Казімір ставіць кружэлку, гучыць узнёслая музыка.
Багуся прыносіць відэльцы, нажы, шклянкі. Усе сядаюць за стол.

Багуся

Але хіба ходзяць у рэстаран адразу пасля ежы?

Казімір

Думаю, я паспею згаладацца, покуль вы збярэцеся.

Заслона.

Сцэна другая

Тыя ж дэкарацыі. На сцэне Казімір і Багуся.
Яна ў лёгкім халаціку і мае такі выгляд,
нібыта толькі што выйшла з ванны.

Казімір

Навошта?

Багуся

Што навошта?

Казімір

Навошта ты прымусіла мяне схлусіць Уладзіславу, што цябе няма? Бачыла б ты, які ён меў выгляд!

(Перадражнівае.)

Але... але... сёння аўторак, дванаццаць гадзін. Яна павінна быць дома!.. А ў сераду, у 14.30 таксама хто-небудзь будзе дамагацца сустрэчы з табой?

Багуся

(іранічна)

Проста Пуаро. Як ты здагадаўся, што ў сераду, у 14.30 я буду чакаць...

Казімір

А хіба не? У тваім узросце ўвесь час нечага чакаюць.

Багуся

Ты хацеў сказаць: некага.

(Загадкава.)

Як ты думаеш, слова «труп» адказвае на пытанне «хто» ці «што»?

Казімір

Хочаш пачувацца ракавой жанчынай? Але ў той гульні, якую ты навязваеш, трупа не будзе. Гэта я табе гарантую.

Багуся

(злосна)

Ты... ты...

Казімір смяецца гучней і гучней.

(Пераможна, амаль крычыць.)

А труп будзе! У фінале!

Казімір

(раптам сур'ёзна)

Нават у тым выпадку, дзіця, калі ты здолееш закахаць мяне ў сябе, ты не станеш сведкай смерці. Гэта я табе гарантую.

Багуся

Дзікун! Хто сказаў, што я хачу, каб ты закахаўся ў мяне?

Казімір раптам набліжаецца да яе, моцна прыціскае і цалуе.
У гэты момант уваходзіць Марыся

Марыся

Божухна!.. Я вам перашкодзіла.

Казімір і Багуся адштурхваюцца, яны збянтэжаныя...

Марыся

Я бачыла Уладзіслава. Ён быў тут?

Казімір

Так, я пазнаёміўся з гэтым маладым чалавекам. Даволі прыстойны тып.

Багуся

Не вычварайся.

Казімір

Я не чакаў цябе так рана.

Марыся

Я гэта заўважыла... Я ведаю, што малады чалавек наведваецца да Багусі, пакуль я на працы. Я спадзявалася, што вы добра правядзеце час і я вам не перашкоджу, калі далучуся да ўсёй кампаніі раней...

Багуся

Ты сышла з працы?

Марыся

Я паскардзілася Пучынскаму, што мне баліць галава. Проста разломваецца на часткі. Тут... *(паказвае)* і тут.

Багуся

Табе заўсёды баліць галава, калі ты хочаш сысці раней. Твой Пучынскі не заўважыў, што ты хлусіш?

Марыся

(суха)

Не думаю.

Казімір

А гэты Пучынскі — я так зразумеў — твой калега? Ты сядзіш з ім у адным пакоі?

Багуся

Гэта яе начальнік і таемны сведка дзікіх галаўных болеў. Ты не баішся, што ён ізноў прыбяжыць лячыць цябе?.. А-а, можа, ты правакуеш яго на спатканне?

(Казіміру.)

Ён аказвае ёй увагу. Калі ў яе крызіс са здароўем, ён яе лечыць.

Казімір

Лечыць? Ён што, доктар?

Багуся

(з'едліва)

Народны лекар.

Марыся ходзіць па пакоі з кута ў кут.

Казімір

Марыся, табе сапраўды баліць галава?

(Багусі.)

Ідзіце, дзіця, займіцеся сваімі канспектамі. Я дапамагу вашай цёткы.

Казімір падыходзіць да Марысі і асцярожна падводзіць яе да канапы, дапамагае сесці. Багуся паціскае плячыма і выходзіць у іншы пакой. Паўза. Стук у дзверы. Уваходзіць Пучынскі з пакункам пад пахай.

Марыся

Пучынскі... Знаёмцеся — мой начальнік. А гэта... гэта...

Казімір

Стары сябар сям'і. Казімір.

(Яны рукаюцца.)

Дзень добры, сядайце.

Пучынскі

Дабрыдзень... Я ненадоўга. На адну хвілінку. Паглядзець — як сябе пачувае Марыся. Праўда, калі тут ёсць каму дапамагчы ёй, то я пайду.

Марыся

Багуся! Багуся, прыгатуй нам усім гарбаты. Сядайце, Пучынскі. Я не паспела прыбраць да вашага прыходу. Ой...

(Мацае галаву.)

Казімір

Што?

Пучынскі

Баліць?

Марыся

(здзіўлена)

Ой... Ай...

(Ківае галавой у знак згоды.)

Багуся выходзіць з пакоя пераапранутая, вітаецца кіўком галавы з Пучынскім і ідзе на кухню.

Пучынскі

Твая пляменніца міленькая дзяўчына. І такая паслухмяная, добрая.

Марыся

Ага, толькі часам дзейнічае на нервы. Калі ёй нагадваюць, што яна мая пляменніца.

Пучынскі

А кім бы яна хацела быць?

Марыся

...Для пачатку сястрой. І мець мой вопыт. І маіх сяброў.

Пучынскі

Яна вельмі прыгожая. І ў яе такія ж вочы, як у цябе.

Марыся

Не заўважала.

Казімір

Ён мае рацыю. Я сам зразумеў гэта сёння.

Пучынскі

(узрадавана)

А я прыгадваю вас. Марыся паказвала мне свой студэнцкі альбом. Там былі вы. Я маю на ўвазе, там было шмат вашых здымкаў. Яна не вельмі ахвотна расказвала пра вас, але я зразумеў, што вы шмат значылі для яе... тады... Ну вось, я рады нашаму знаёмству.

(Працягвае руку, яны ізноў рукаюцца доўга і моцна. Пучынскі ўважліва разглядае Казіміра.)

Вось... Я шчыра рады...

(Адпускае Казіміраву руку.)

У вас такая мужная рука, і самі вы такі дужы, моцны. Такія заўсёды моцныя з чужымі жанчынамі. Ага...

Казімір

(запытальна)

Мужны...

(Узгадвае нешта.)

Мужны не толькі той, хто перамагае ворагаў, але і той, хто ўладарыць над сваімі жаданнямі. Некаторыя ж царуюць над гарадамі і ў той жа час з'яўляюцца рабамі жанчын.

Уваходзіць Багуся з тацай і посудам для гарбаты. Ставіць усё на стол.

Багуся

Дзядзька Казімір любіць цытаваць старажытных.

Пучынскі

А, дык ён да таго ж і філосаф.

Падыходзіць да Марысі і ўручае ёй пакунак.
Яна разгортвае, там кніга і шакалад.

Казімір

Набор народнага лекара.

Пучынскі

Здаецца, вам робіцца невыносна, калі нехта шчаслівы.

Казімір

Шчаслівы?

Пучынскі

Толькі не намагайцеся ўзгадаць, што ў гэтым выпадку казаў Цыцэрон ці Дэмакрыт.

Казімір

О, ён амаль адукаваны. Ён ведае такія імёны!

Пучынскі

Рады, што спадабаўся вам. Калі мы пазнаёмімся бліжэй, вы навучыце мяне тым выслоўям, што памятаеце?

Казімір

Калі я зраблю гэта, вы адчуеце сябе няшчасным.

Пучынскі

З чаго?

Казімір

Філасофія — навука нешчаслівых. Ты разумееш тады сваю мізэрнасць і нязначнасць. А гэта небяспечна для начальнікаў. Увесь вольны час вы прысвеціце не пачуццям, а асэнсаванню іх, пачнеце шукаць вытокі, і, урэшце, калі дойдзеце да іх, вам стане сорамна і вы адмовіцеся ад саміх пачуццяў.

Пучынскі

Мне няма чаго саромецца...

Багуся

Што вы пляцеце?

Пучынскі

Казімір гаворыць, што падаснова ўсяго — пустэча.

Багуся

Але ж ён сам так не лічыць. Вы запытайцеся ў яго, чым ён кіруецца, калі хоча заваяваць жанчыну?

Казімір

У мяне і ў думках не было каго-небудзь заваёўваць.

Марыся

Сядайце за стол. Ад вашых размоў мне па-сапраўднаму пачынае балець галава.

Пучынскі

А да гэтага?

Марыся

Гэта неістотна. Лепш мы паразважаем пра тэатр, літаратуру ці жывапіс. Што яшчэ можа зрабіць гутарку больш інтэлектуальнай, як не развагі пра высокае мастацтва? Паглядзіце, што прынёс Пучынскі.

(Паказвае кнігу.)

Казімір

(бярэ кнігу ў рукі)

«Філонаў. Аналітычнае мастацтва». Вось не думаў, што ты любіш Філонава.

Марыся

Я толькі збіраюся яго палюбіць.

Пучынскі

Вы бачылі яе калекцыю? Яна збірае альбомы мадэрністаў.

Казімір

(Марысі)

Ты казала, што твае густы не змяніліся. Мы калекцыяніравалі паштоўкі. Ты збіраеш альбомы?

Марыся

Твае паштоўкі ўсе засталіся. Я вывучыла напамяць усё, што ты пісаў на іх. Але, згадзіся, апошнія тры гады ты рэдка дасылаў іх.

Казімір

Але я мала выязджаў. Я б хацеў даслаць табе краявіды Кіпра ці Аўстраліі. Ды я ж не быў там.

Марыся

(перабівае)

Я запоўніла свае вечары новым заняткам: я разглядаю Малевіча, Мацюшына, Шагала... Цяпер пачну вывучаць Філонава.

Казімір

Ну вось, нядаўна я казаў Багусі, што зусім не ведаю цябе. Ты зноў знікаеш.

Марыся

Я не належу нікому. А ад сябе не знікаюць... Можа быць, я толькі пачынаю знаходзіць сябе.

Казімір

І для гэтага патрэбны памочнік?

Марыся

Мне патрэбны сябар.

Казімір

У цябе ўжо ёсць адзін сябар.

Пучынскі

(задаволена)

Я!

Багуся

(смяецца)

Яна давярае вам абодвум... Марыся, каму ты давяраеш больш?

Пучынскі

Я бачу, Марыся, табе ўжо лепш. Я прыйду іншым разам. Дзякуй за гарбату.

(Сыходзіць.)

Казімір падымаецца і пачынае хадзіць па пакоі. Багуся ціхенька ўстае і асцярожна сыходзіць. Марыся разглядае альбом, потым адкладае яго.

Казімір

Ты ўжо пазнаёмілася з Філонавым?

Марыся

Што? А-а, так. Я думала, як яны маглі працаваць тады — у трыццатыя гады. Іх не разумелі, ім не дазвалялі праводзіць выставы, сустракацца з гледачамі. Дзеля чаго яны працавалі? Дзеля каго?

Казімір

Дзеля нас.

Марыся

Нядаўна са мной адбылася дзіўная гісторыя. А зрэшты, гэта бывае даволі часта. Я сядзела на працы і адчула... што... перастала прыносіць карысць. Мае распрацоўкі друкуюцца ў вузка спецыялізаваным часопісе... Мая праца — фікцыя. Але я залежная ад сваіх калег. Мы разам складаем дапаможнікі па выхаванню... Калі я ўяўляю сябе тым дзіцем, для якога гэта робіцца, я

пачынаю ненавідзець тых, хто так фарысействуе для мяне. Я — дзіця — хачу развівацца незалежна!.. Гэта невыносна. Я проста вар'ятка.

Казімір

Калі мы не будзем паліваць кветкі, яны не вырастуць.

Марыся

Слушна. І ўсё-ткі мне здаецца, мой начальнік разумее мяне. Інакш бы ён не паверыў, што мне так часта баліць галава.

Казімір

Нядаўна ты казала, што ён твой сябар. У яго ёсць імя?

Марыся

Нашы кабеты завуць яго Сяргей Эмануілавіч.

Казімір

А ты?

Марыся

Пучынскі.

Казімір

Ты не задумвалася, чаму ён дазваляе табе называць яго...

Марыся

Пучынскі? Яму здаецца, што гэтым я падкрэсліваю сваю лаяльнасць.

Казімір

Ён дэмакрат?

Марыся

(жартам)

Дэмакрыт? Не, ён проста адказны работнік. Сціплы і ўдовы.

Казімір

(іранічна)

І ў адрозненні ад цябе, ён адчувае сваю адказнасць перад будучымі пакаленнямі... А што ён можа даць табе, акрамя клопатаў з ягонымі дарослымі дзецьмі і праблемаў падзелу спадчыны пасля ягонай смерці?

Марыся

Ты не маеш права так казаць! Так, у яго ёсць дом, праўда, стары, але там вялікі сад. І машына... І... і двое дарослых дзя-

цей... Але я не збіраюся паляпшаць дабрабыт ці мяняць сваю кватэру на асабняк. Я ўвесь час жыла незалежна.

Казімір

У мяне ёсць кватэра, але там жыве жонка. На маёй машыне ездзіць зяць, і я не цікаўлюся мадэрністамі. Здаецца, я пачынаю шкадаваць, што мяне не вучылі жывапісу.

Марыся

Але ж ты цудоўна іграеш на фартэпіяна. І ты любіш вандроўкі на байдарках. Ты падабаешся жанчынам — а гэта таксама талент.

Казімір

Не іранізуй. Я сапсаваў табе жыццё.

Марыся

Але ж гэта не такая ўжо вялікая трагедыя.

Казімір падыходзіць да яе, абдымае.

Казімір

Ты сапраўды так лічыш?

Марыся

Але мне не патрэбна спачуванне. Мне шкода цябе: хто яшчэ паклапоціцца, каб ты не жыў з прусакамі?

Казімір бярэ яе руку і цалуе.

Казімір

Я так часта чую пра гэтых стварэнняў, што хутка пачну любіць іх.
(Абодва смяюцца.)
...А чаму б табе папраўдзе не выйсці замуж?

Марыся

Каму? Мне? Але ж у тваёй кватэры жыве жонка. І мне не будзе да каго збегчы ў час дэпрэсій.

Казімір

Гэта горш за ўсё.

Марыся

Ты не прывык адказваць за мяне.

Казімір

Сапраўды, я пачну хвалявацца, як ты жывеш.

Марыся

А так ты зможаш зноў не прыязджаць гадамі.

Казімір

Адчуваю, што ты шмат не дагаворваеш. Як твая галава?

Марыся

Маю галаву раздзіраюць думкі і тэорыі. З той самай хвіліны, як ты з'явіўся. Але варта мне прасачыць ход дзеі і вызначыць сваё месца, як усё мяняецца. На полі бою з мяне выйшаў бы кепскі стратэг.

Казімір

Але, як толькі ты распачнеш вайну і выйграеш яе...

Марыся

(перабівае)

Здагадваюся, заваёўнікі заўжды гублялі свабоду, бо давялося б падладжвацца пад пераможанага, каб прымусіць таго калі не любіць... то хаця б цярпець сябе. Не хачу! Не хачу жыць па прынцыпах заваяванага і не хачу нікому навязваць сябе.

Паўза.

Казімір

Дзіўна. Калі я зараз трымаў цябе, я не адчуваў сябе заваяваным. Мне было проста прыемна. Такое ўражанне, нібыта мы вярнуліся ў начны намёт. Толькі пастай цяпер пэцкаеш мяне ты... Я адчуў сябе такім нязграбным, бездапаможным, такім маладым, якім я ўжо не памятаю сябе... Мне падалося, што я на момант стаў шчаслівым... Не, не падалося.

Уваходзіць Багуся, тэатральна разглядае іх,
праходзіць да канапы і плюхаецца ў яе з нагамі.

Марыся

Багуся... што здарылася?

Багуся

Я хадзіла званіць Уладзіславу.

Марыся

Ты магла зрабіць гэта дома.

Багуся

Але ў аўтамаце ніхто не падглядае за мной. І там я магу гучна сварыцца.

Казімір

Гэта абавязкова — сварыцца?

Багуся

А як думаеш ты? Гэты ненармальны хоча, каб мы ажаніліся.

Марыся

Ты ўжо казала.

Багуся

Але ён хоча зрабіць гэта зараз.

Казімір

І што?

Багуся

Ён хоча ці пераехаць сюды, ці забраць мяне.

Марыся

Ну, пераехаць сюды, да прыкладу, я не дазволю.

Багуся

Вось і я так сказала... Ён зняў для нас кватэру! Вось адрас *(кідае на падлогу паперку)*. Ён кажа, калі я не прыеду, ён больш не захоча мяне бачыць.

(Бярэ з канапы падушачку і плача ў яе.)

Марыся

Гэта проста цудоўна!

Багуся

(раз'ятрана)

Вам абы толькі пазбавіцца ад мяне!

Казімір

(падыходзіць, асцярожна гладзіць яе па галаве)

Не, ты няправільна зразумела. Марыся хацела сказаць, што выбіраць усё адно табе. Ты можаш застацца.

Багуся

Але я не хачу яго губляць!

Казімір

Зусім нядаўна ты не хацела яго бачыць.

Багуся

Я толькі хацела, каб ён сышоў.

Марыся

Як добра — выйсці замуж у тваім узросце. У дзевятнаццаць я марыла пра гэта.

Багуся

Замаўчы. Я не на тое паступіла вучыцца, каб выйсці замуж за студэнта. Уяўляеш?! Раніцай я буду гатаваць яму амлет з памідорамі, а перад сном перапісваць канспекты. У мяне з'явіцца пяць дзевераў і пяць ятровак! Яны будуць час ад часу заходзіць да нас!

Марыся

Я лічу, што мець столькі родзічаў — проста выдатна. Будзе на каго кінуць дзіця, каб не перапыняць вучобу.

Багуся

(грозна)

Дзіця!.. Дзіця!..

(Шпурляе ў Марысю падушачкай.)

Казімір хапае Багусю за рукі.

Казімір

Супакойся. Ніхто цябе не прымушае гатаваць амлет з памідорамі і шлюбавацца з чалавекам, у якога пяць братоў.

Багуся

(усхліпвае)

Марыся... Я гэтага не перажыву.

Казімір

Дай ёй што-небудзь выпіць.

Марыся ідзе на кухню, вяртаецца са шклянкай. Багуся выпівае. Яны глядзяць на Багусю.

Багуся

Ты прынесла мне валяр'янкі? Я што, істэрычка, што ты нясеш мне валяр'янку?

Марыся і Казімір пераглядаюцца.

Казімір

(запытальна)

Я налью ёй рому?

Марыся

Як хочаш, толькі развядзі.

Багуся

І пакладзі туды скрылік цытрыны. Цярпець не магу разбаўлена-га рому.

Казімір выходзіць на кухню, вяртаецца са шклянкай. Яна выпівае.

Багуся

Ну вось, так лепей. Не зважаючы на гэты інцыдэнт, я пазваніла ў шынок і замовіла тры месцы на вечар. Думаю, вы не будзеце супраць.

Марыся

Ты пазваніла... у шынок?

Багуся

Гэта модны бар.

Казімір

Спадзяюся, там збіраюцца не толькі студэнты?

Багуся

Не, там збіраюцца тэатралы і пісьменнікі.

Марыся

І што, там былі месцы?

Багуся

Не, але там працуе брат Уладзіслава.

Марыся

Ты чуў? Яна сварыцца з Уладзіславам і просіць ягонага брата пакінуць там тры месцы! Арыгінальна, праўда?

Казімір

Цудоўная будзе кампанія ў модным бары — муж-уцякач, студэнтка-вар'ятка і...

Марыся

(перабівае)

І старая дзеўка.

Багуся

Калі ты так хвалюешся, я магу пазваніць, што мы не прыйдзем.

Марыся

(рашаецца)

Пойдзем! Чаму не? Не сядзець жа нам дома! Раптам табе ізноў захочацца плакаць?.. Толькі... ты можаш папрасіць, каб нам пакінулі яшчэ адно месца ў тваім бары?

Багуся

(насцярожана)

Ты спадзяешся, што я запрашу Уладзіслава?

Марыся

Не. Я сама запрашу. Толькі гэта будзе не твой вечар, а мой.

Багуся

Але не Уладзіслава?

Марыся

Не.

Багуся і Казімір пераглядаюцца.

Багуся

Добра, мы з Казімірам пойдзем пазвонім.

Марыся

А дома ты не можаш гэта зрабіць?

Багуся

Дома тэлефон заняты: ты будзеш запрашаць чацвёртага госця... Я хачу падыхаць паветрам. Казімір!

(Сыходзяць).

Марыся прыносіць ром, налівае сабе крыху, набірае нумар тэлефона. Выпівае. Адкідваецца на спінку канапы і заплюшчвае вочы.

Марыся

Алё... Запрасіце Сяргея Эмануілавіча.

Заслона.

Сцэна трэцяя

Тыя ж дэкарацыі. У пакоі прыцемкі. На канапе ляжыць Марыся, яна спіць. Побач з ёй стаіць бутэлька рому і шклянка.
Уваходзяць Казімір і Багуся.

Казімір

Цудоўнае надвор'е! Трэба сказаць, каб Марыся...
(Азіраецца.)
Марыся!
(Заўважае яе, падыходзіць да канапы і нахіляецца.)
Спіць...

Багуся

І, здаецца, шмат выпіла. Нічога, хай адпачывае. Мы паспеем сабрацца.
Сядаюць за стол. Багуся выцягвае з-пад абруса калоду картаў.
Перакінемся?
(Смяецца.)

Казімір

Вось дзіўна, як некалькі дзён могуць перавярнуць свядомасць. Здаецца, я губляю свой аптымізм.

Багуся

Скажы, калі ты кахаў каго-небудзь, ты пакутаваў?

Казімір

Мае пакуты вызвалялі процьму жыццядайнай энергіі: я гатовы быў зрушыць з месца горы. Мае пачуцці былі такімі жыццярадаснымі, цёплымі, як сонца, што топіць лёд.

Багуся

А твае жанчыны ўяўляліся табе шчаслівымі вераб'іхамі, што купаліся ў вясновых лужынах.

Казімір

Не. Я памятаю кожную. Калі адна з іх была вераб'ём, то другая ластаўкай, кнігаўкай, сінічкай, вішнёўкай...

Багуся

Ага, толькі бедная Марыся засталася белай варонай.

Казімір

Не, яна здавалася мне снегіром на снезе.

Багуся

Проста ты не змог растапіць снег. Але я не думала, што ты так добра ведаеш птушак. Ты любіў біялогію?

Казімір

Быў раўнадушны. Са школы я памятаю толькі два тэрміны з гэтай навукі: флора і фаўна. А куды адносяць чалавека? Вас гэтаму вучаць?

Багуся

Калі ты платанічна кахаеш — ты флора. Калі займаешся сексам — фаўна.

Казімір

Цікавая тэорыя. Хто аўтар?

Багуся

Я.

Казімір

А як быць з Дарвінам?

Багуся

Мне не падабаецца тое, што сцвярджаў Дарвін. Я веру, што мае продкі — іншапланецяне. Хаця ніхто з вялікіх вучоных-натуралістаў так не лічыў. Ні Паўлаў, ні Мендзялееў, ні Мічурын... Можа, мне заняцца распрацоўкай сваёй тэорыі?

Казімір

Заўважу, што яна не зусім твая.

Багуся

Так. Але ж навукова яе ніхто не абгрунтаваў.

Казімір

Спачатку закончы вучобу, раптам ты знойдзеш аднадумцаў сярод выкладчыкаў.

Багуся

Я не думала пра гэта сур'ёзна. Калі я атрымаю дыплом, то папрашу накіраванне ў самую дзікую вёску. Туды, дзе яшчэ абагаўляюць прыроду. Як ты думаеш, такія засталіся?

Паўза. Багуся падымаецца, прыносіць свечкі, запальвае іх.

(Горача.)

Казімір, забяры мяне ў вёску! Давай з'едзем адсюль!

Казімір

Звычайна дзяўчаты твайго ўзросту мараць пра вялікія гарады ці замежжа.

Багуся

Я ненавіджу вялікія гарады. Яны ўвесь час растуць. І паглынаюць маленькія мястэчкі... У дзяцінстве я баялася, што апынуся перад Робінам-Бобінам. «Робін-Бобін-Барабек З'еў сто сорак чалавек, І карову, і быка, і крывога мясніка. З'еў ён вежу, З'еў ён дом, І драбіны...»

Казімір

Але ж ты не тая наіўная дзяўчынка, ты не дасі сябе з'есці.

Багуся

Свядома — не. Ты памятаеш тую... з музея... з блакітнымі пацеркамі?

(Таямніча.)

Калі я стану такой, ён можа мяне зжэрці.

Казімір

Але ж тады — усе роўна.

Багуся

Не. Я хачу спаць спакойна. Для мяне Старажоўскія могілкі застануцца трагедыяй. Для горада — не. Ён нават не памятае, што з'еў іх.

Казімір

Старажоўскія могілкі?

Багуся

Так. Там цяпер парк і шаша. Абсурд.

(Устае, прыносіць бутэльку, што стаяла ля канапы, шклянку і налівае.)

Казімір

Ці не хопіць табе піць? Я ўжо наліваў табе пасля істэрыкі. Наперадзе нас чакае шынок.

Багуся

(смяецца)

П'ю за цябе. За тваю жонку, за Марысю, за Уладзіслава, за ягонага шчодрага брата, за Марысінага начальніка. За ўсіх тых, хто

поруч з намі ідзе па жыцці, і за тое, што мы ўсе церпім адно аднаго. Інакш бы гэты свет узляцеў. Да д'ябла!

(П'е.)

Ты не вып'еш?

Казімір

Дастаткова, што я пачуваю сябе душэўным алкаголікам. Гэта вынік песімізму. Ні адна жанчына не дзейнічала на мяне так адмоўна. Нават тады, калі пачынала разумець, што мне больш няма чаго даць ёй.

Багуся ўсміхаецца, устае, абыходзіць і кладзе рукі яму на плечы.

Багуся

Які ты няшчасны! Дзякуй за сум. Ты нават не імкнешся пафантазіраваць. Ты не варты ні Марысі, ні мяне... Твой свет нагадвае паветраны шарык. Процьму каляровых шарыкаў. У тым, жоўтым (*паказвае рукой*), старыя фотаздымкі, там жа вучоба і верная Марыся... У ружовым плыве жанчына, якая падтрымлівае сямейны агмень і мые пялюшкі... У сінім — глядзі! — яна ж, толькі праз дваццаць гадоў: яна сядзіць і чакае, калі ты здаволішся наступнай каханкай... У зялёным — наіўнае дзяўчо. Пачакай, зараз я разгледжу, хто яна...

(Гучна.)

Бах!.. Не паспела! Не бачу! Бах! Бах! Бах!

Марыся ўздрыгвае, падымае галаву.

Марыся

Што здарылася?

Багуся

Нічога, мы гулялі ў паветраныя шарыкі.

(Смяецца.)

Званок у дзверы. Усе падхопліваюцца, мітусяцца. Марыся бяжыць у другі пакой.

Багуся

(Казіміру)

Адчыні дзверы.

(Бяжыць за Марысяй.)

Казімір выходзіць. Уваходзіць разам з Пучынскім, які прыбраны ў вячэрні строй.

Казімір

Заходзьце. Гэта вас Марыся запрасіла з намі?

Пучынскі

З аднаго боку, я бязмежна рады, што яна пазваніла. А з другога — я не ведаю... А дзе?..

Казімір

Па-мойму, яна выйшла пераапрануцца.

Паўза. Мужчыны ходзяць па пакоі.

Пучынскі

Скажыце, а-а... вы надоўга... прыехалі?

Казімір

Здаецца, не. Па-мойму, не сёння-заўтра я з'язджаю. Не памятаю.

Пучынскі

Як вы думаеце, можа, нам узяць шампанскае з сабой? Я ведаю тут на рагу невялічкую краму. Там заўжды цудоўнае шампанскае.

Казімір

Думаю, дзяўчаты не зразумеюць нашага памкнення. Я не назіраў у барах дэфіцыту спіртнога.

Пучынскі

Але там даражэй... Я хацеў сказаць, мы маглі б выпіць яго зараз.

Казімір

Тады на правах госця вы застанецеся. А па шампанскае схаджу я. *(Сыходзіць.)*

Выходзіць Марыся.

Марыся

А-а, гэта вы. А дзе Казімір?

Пучынскі

Ён пайшоў па шампанскае.

Марыся

У нас свята?

Пучынскі

Не, але тваё запрашэнне для мяне больш чым свята. Гэта трэба адзначыць.

Марыся

І Казімір пабег у краму?

Пучынскі

Ён сам захацеў.

Марыся

Багуся!

Выходзіць Багуся.

Спадар Пучынскі збіраецца частаваць нас шампанскім.

Багуся

А-а, я думала, ён прынёс табе анальгін.

Марыся

Сёння мы будзем піць, танцаваць і смяяцца. Думаю, анальгін мне спатрэбіцца заўтра.

Пучынскі

Заўтра ты можаш не выходзіць на працу. Я прыкрыю, калі што...

Марыся

(іранічна)

Вялікі дзякуй. Дзеля гэтага ты падняўся на дзевяты паверх, каб паведаміць, што я магу быць заўтра вольнай?

Пучынскі

Не... усё наперадзе... зараз...

(Адкашліваецца.)

Дарагая Марыся, я... зараз... Я адзінокі чалавек.

Марыся

Карацей, мы ідзем пераапранацца, а ты чакай Казіміра.

Багуся

Адзінокія людзі заўжды каго-небудзь чакаюць.

Пучынскі

Але ж я не люблю быць адзінокім.

Багуся

Вы лічыце сябе індывідуальнасцю?

Пучынскі

Так, кожны чалавек індывідуальнасць.

Багуся

Тады я вам раю: заставайцеся адзін.

Багуся і Марыся выходзяць у другі пакой.

Пучынскі

Навошта так? Мне ж балюча.

Паўза. Вяртаецца Казімір з бутэлькай шампанскага.

Казімір

Спадарыні яшчэ не гатовыя?

Пучынскі

Яны зараз. Чаму адным Бог дае сям'ю, каханую жанчыну ды процьму ўсялякіх радасцяў?

Казімір

Таму што адны радуюцца таму, што яны проста жывуць, і дораць сваю радасць кожнаму.

Пучынскі

А як тады з тымі, хто співаецца, кідаецца пад машыны ці скача з вокнаў? Ім што — недадалі радасці?

Казімір

Яны не захацелі шукаць яе. Вы не падобны на чалавека, які кідаецца ўніз.

(Падыходзіць да вакна.)

Ваш Філонаў пісаў краявіды?

Пучынскі

Не. Хіба што ў самым пачатку.

Казімір

Усё адно, ён бы не зразумеў, як можна ляцець праз гэтыя ружовыя вячэрнія промні, праз каляровую бялізну, што сушыцца на балконах, праз вокны, за якімі — розныя-розныя жыцці... Сведкі за вокнамі не даруюць вам такога эксперыменту... Прызнайцеся, вы самі малявалі ў дзяцінстве?

Пучынскі

Так. Але з мяне не атрымаўся вялікі мастак.

Казімір

Кажуць, безвыходных сітуацый не бывае. Вам застаецца адно — смяяцца да слёз. Вы даўно... удавец?

Пучынскі

Пяць гадоў.

Казімір

Чаму вы не жэніцеся? Вакол столькі прыгожых жанчын. Вам нават не трэба ствараць імідж, прымушаць сябе быць кімсьці. Вы дасягнулі неблагога становішча, у вас добрая пасада, дарослыя дзеці. Вы любіце мастацтва.

(З пафасам.)

Вы ін-ды-ві-ду-ум.

Пучынскі

Адна маладая дзяўчына толькі што сказала, што такія павінны заставацца адзінокімі.

Казімір

Яна сказала глупства. Не губляйце надзеі.

Пучынскі

Вы так лічыце?

Уваходзяць Марыся і Багуся ў вечаровых строях.
Багуся тэатральна дэманструе сябе ў адкрытай сукенцы.

Пучынскі

О! О!..

Казімір

Нічога больш прыгожага, чым нашыя багіні, я не бачыў.

Багуся

Мы чакалі такой рэакцыі.

Пучынскі

А цяпер — па келіху шампанскага!

Марыся

Так, гэта адновіць тую энергію, што я патраціла, збіраючыся ў шынок.

Пучынскі падыходзіць да іх, цалуе ручкі, праводзіць да стала.
Казімір разлівае шампанскае.

Казімір

За нашых мілых, нашых чароўных...

Пучынскі

Спадарства, у мяне ёсць што сказаць.

Марыся

(суха)

Слухаем.

Пучынскі

Пры сведках я хачу выпіць за незраўнаную Марысю...

Марыся

(перабівае)

Пазней у цябе будзе больш сведкаў.

Пучынскі

За тую, што ўпрыгожыла маё жыццё. Так-так, не здзіўляйцеся. Я вырашыў нарэшце прызнацца...

Марыся

(зноў перабівае, не зважаючы на тое, што Багуся адчайна махае ёй рукамі)

Я гэта падазравала.

Пучынскі

Скажу, што мне было цяжка, надзвычай цяжка рашыцца. Справа гэтая патрабуе падрыхтоўкі і, можа быць, прамоўніцкага майстэрства. Карацей, у той дзень, калі я перайшоў на новую работу, я заўважыў толькі адну жанчыну. Мяне ўразілі яе вочы. Такія самотныя вочы бываюць у дэльфінаў.

Марыся

Ці акул.

Пучынскі

Не, я не так выказаўся. Такія вочы я бачыў на карцінах старажытных італьянскіх майстроў.

Марыся

Ты хочаш сказаць, што я ўжо мумія?

Пучынскі

Я б хацеў, каб ты жыла вечна.

Казімір

Якая фраза! І галоўнае, зусім свежая.

Багуся

Дык што вы хацелі сказаць?

Пучынскі

Я хацеў папрасіць рукі вашай цёткі... Толькі не адказвай адразу. Я пачакаю.

Марыся

(нервова смяецца)

У цябе ёсць шанц: напаі мяне шампанскім і прымусь сказаць «так».

Пучынскі

Гэтак і зраблю.

Багуся, Марыся і Пучынскі смяюцца.

Казімір

Калі мы хочам сёння трапіць на вячэру ў шынок, то самы час сысці.

Багуся

А ты? Ты хіба не перапранешся?

Казімір

І праўда, я адзін выпадаю з вашай кампаніі. Калі вы пачакаеце некалькі хвілін, то я буду гатовы.

Марыся

Я павесіла тваё адзенне ў шафу. Там прасаваныя кашулі. Я не ведала, якую ты захочаш надзець.

Казімір

Мне ўсё адно.

(Ідзе ў другі пакой.)

Марыся

Тады мы пачакаем цябе ўнізе.

Пучынскі

Я не супраць. Пайшлі, зловім таксі.

Марыся і Пучынскі сыходзяць. Багуся сочыць поглядам за Казімірам, нечага чакае. Потым задумліва сыходзіць за Марысяй і Пучынскім.

Зацямненне.

Сцэна чацвёртая

Уваходзяць Багуся і Казімір.
Чуецца валтузня і прыцішаны смех. У пакоі цемра.

Багуся

Здаецца, на стале павінны стаяць свечкі.
(Натыкаецца на нешта.) Ай!

Казімір запальвае запалку і падпальвае свечкі.
Бачна, што яны ў вечаровым адзенні, злёгку п'яныя.

Казімір

Не памятаю, дзе мой гадзіннік?

Багуся

Здаецца, ты падарыў яго Пучынскаму.

Казімір

Навошта?

Багуся

Ты сказаў, што гэта твой вясельны падарунак яму.

Казімір

Дурань! А як успрыняла гэта Марыся?

Багуся

Яе не было, яна выйшла ў дамскі пакой.

Казімір

Фу-у... Але ж ён усё адно ёй скажа.

Багуся

Гэта нічога не мяняе. Хаця, можа быць, гэта і прымусіць яе памяняць свае погляды на цябе.

Казімір

Кепская дзяўчына!.. Ты наўмысна зацягнула іх туды?

Багуся

У шынку занадта шумна. Марыся б доўга не вытрымала. А там яна можа да раніцы дыхаць ветрыкам, што залятае ў вокны і тушыць свечкі на стале. Фу-у-у.
(Дзьме на свечкі, яны тухнуць.)

Казімір ізноў запальвае свечкі.

Казімір

Па-мойму, Пучынскаму таксама падабаюцца блюзы. І усё-ткі ты жорсткая, злая дзяўчына.

(Ён азіраецца.)

Багуся ляжыць на канапе.

Багуся

Як табе мая сукенка?

Казімір

Ты была самай шыкоўнай.

Багуся

Ты таксама.

Казімір

Бачыў бы цябе зараз Уладзіслаў.

Багуся

Мне ўсё роўна.

Казімір

Толькі не ганарыся гэтым.

Багуся

Я буду ганарыцца гэтым таемна.

Казімір

А калі ён даведаецца?

Багуся

Скажу, што ты напаіў мяне.

Казімір

Па-мойму, ты зусім не п'яная. Гэта я хістаюся ад выпітага.

Багуся

Табе здаецца. Ты цвярозы. Толькі пачаўся землятрус. У чатыры балы.

(Смяецца.)

Казімір

А гэты землятрус можа прысунуць канапу бліжэй?

Багуся

Табе прыйдзецца дабірацца самому, каб паставіць для мяне кружэлку.

Казімір

А скуль узяліся барханы? Мае ногі грузнуць у пяску.

Багуся

Быў землятрус, а потым ветравей... Мы засталіся адны ў пустэльні.

Казімір дабіраецца да століка, ставіць кружэлку.
Іграе ціхая музыка. Ён сядае на канапу.

Казімір

Правільна.

(Глядзіць на свечкі.)

Толькі на гарызонце нехта запаліў маяк.

Багуся

Мы не дасягнем гарызонту. Да таго ж гэта можа быць лятучы галандзец.

Казімір

Лятучы галандзец у пустэльні?

Багуся

Што толькі не ўбачыць п'яны!

Казімір

Спадзяюся, гэтыя агні падкажуць Марысі дарогу дадому.

Багуся

Спадзяюся, гэта будзе не вельмі хутка. Пучынскі павінен скарыстаць шанц, тады ён атрымае сваё «так»...

Казімір

Твая іронія не да месца. Мне шкада маёй сяброўкі.

Багуся

Ты хочаш, каб яна была шчаслівая? Тады ты павінен саступіць яе другому.

Казімір

Як шкада!

Багуся

Шкада, што ты не можаш утрымліваць гарэм?

Казімір

Не-не. Шкада, што калі працверазееш, свет здасца брыдкім, адчай непераадольным, а ўчынкі невыпраўнымі.

(Нахіляецца да Багусі, гладзіць яе твар, шыю, плечы.)

Калі мы танчылі, мне хацелася сціснуць цябе рукамі і зубамі... Каб ты білася ў маіх абдымках і стагнала ад болю. І разам з тым маё сэрца сцінала пяшчота.

Багуся

Бачыш: варта табе выпіць, як ты праяўляеш сваю сапраўдную натуру... Ты даўно хочаш мяне.

Казімір

Справа не толькі ў гэтым.

(Устае, праходзіць па пакоі няцвёрдым крокам.)

Я звязаны сяброўствам з тваёй цёткай, з Марысяй... і не толькі сяброўствам.

Багуся

Я ведаю. Я вывучаю вашы адносіны другі год. Па здымках, паштоўках, з апавяданняў Марысі.

Казімір

Ты чытала мае паштоўкі да яе?

Багуся

Гэта крымінал?

Казімір

Я ў захапленні ад цябе! Ты не толькі жорсткая, ты... ты несумленна гуляеш!

Багуся

Не маеш права! Ты мог зусім не прыехаць. А я павінна была ведаць пра цябе ўсё! Паглядзі на мяне — я табе зусім не падабаюся? Нахіліся, зірні ў мае вочы! Я проста ахоплена жаданнем.

Казімір

Ты начыталася эратычнай літаратуры. Да таго ж невысокай якасці. Трэба сказаць Марысі, каб яна сачыла за тым, што ты чытаеш.

Багуся

Я не маленькая. І не бегаю глядзець парнафільмы да сябровак. І не купляю кніг з аголенай натурай на вокладцы. Я не займаюся каханнем ад суму. Ці па першым жаданні.

Казімір

Дык хто з вас завадатар — ты ці Уладзіслаў?

Багуся

Ты раўнуеш?

(Смяецца.)

Паўза.

Казімір

Добра, давай пасмяемся з іх... Смейся. Твой смех такі дзіцячы. І ў цябе з'яўляецца ямачка на падбародку. Ты адразу мяняешся... Смех — гэта як прызнанне ў каханні... Ты ніколі не здраджвала свайму Уладзіславу?

Багуся

Здраджвала. Часта.

Казімір

(ашаломлены)

Ты... здраджвала?

Багуся

(смяецца)

Так. З табой. Мы займаліся каханнем у маіх снах.

Казімір

Але... ты магла быць маёй дачкой.

Багуся

Дзякуй Богу, гэта не так. Іначай мяне назвалі б кровазмяшальніцай. Я ведаю — у гісторыі ёсць такія выпадкі.

Казімір

Як непрыстойна!

Багуся

Што, кахаць?

Казімір

Спыніся, іначай...

Багуся

Іначай?

Казімір

Я не ўтрымаюся.

Паўза. Яны ўтаропіліся адно на аднога.

Багуся

(голас зрываецца)

Сёння, калі ты пацалаваў мяне... перад тым, як прыйшла Марыся... я чакала, што ты гэта зробіш... Толькі я не разлічыла...

Казімір

Што?

Багуся

Што Марыся вернецца так рана.

Казімір

Не думай больш пра гэта.

(Сядае побач на канапу.)

А як Уладзіслаў?

Багуся

Хай сабе...

Казімір

Але ж ты плакала і казала, што не хочаш яго губляць.

Багуся

Я не ведаю, што са мной. Я хачу належаць донжуану.

Казімір

А хто будзе трупам у апошнім дзеянні?

Багуся

Я, калі ты зараз не пацалуеш мяне.

Цалуе яе.

Заслона.

ДЗЕЯ ДРУГАЯ

Тыя ж дэкарацыі. Але, відочна, нешта змянілася — няма таго парадку, што быў у першай сцэне.

Сцэна першая

На сцэне Казімір і Багуся.
Уваходзіць Марыся.

Марыся

Ты ўяві, ён пазваніў і сказаў, што я прызначыла яму спатканне!

Багуся

Ну дык што? Ты ж сама паклікала яго з намі.

Марыся

Ат, ты не разумееш. Я прызначыла спатканне не Пучынскаму!

Казімір

Тады каму?

Марыся

Ікару.

Багуся

Ха-ха-ха... Можа, гэта быў Апалон. Ці Бахус. Чаму не?

Марыся

Спачатку я сама не паверыла. А потым ён паказаў пашпарт і не ўзяў з мяне грошай.

Казімір

Грошай? За тое, што паказаў пашпарт?

Марыся

Не, ён прывёз мяне на таксі.

Багуся

А твой Пучынскі — ён не змог заплаціць?

Марыся

Я згубіла Пучынскага.

Казімір

Ён што — кінуў цябе?

Марыся

Ды не, я захацела згубіць яго і згубіла. А потым пазнаёмілася з гэтым таксістам. Ён не захацеў узяць грошы і сказаў, што ўсё жыццё марыў сустрэць сталую жанчыну, якая паводзіць сябе рыхтык як школьніца, любіць бадзяцца па рэстаранах, губляць мужчын, чытаць у таксі вершы... і процьму ўсяго астатняга. Ён ведае мой адрас!

Багуся

Казімір, што ты пра гэта думаеш?

Казімір

Думаю, Марыся не заслужыла таго, каб мець спатканне з Ікарусам.

Марыся

Не іранізуй. Сама разумею, што зрабіла глупства... Але, чаму й не? Здаецца, ён паклаў на мяне вока.

Багуся

Бедны Ікар.

Марыся

Я малю вас — ні слова пры ім пра тое, што я старая дзеўка. Ён называе іх сінімі панчохамі. І кажа, што самыя лепшыя жанчыны — удовы. Казімір, як лічыш, магу я выдаць сябе за генеральшу?

Казімір

Ікарус гэтага не варты.

Марыся

(глядзіць на гадзіннік)

Як ляціць час! Зараз хто-небудзь прыйдзе. У мяне прадчуванне...

(Раптам.)

О, мая галава! Пайду прыму душ. Калі з'явіцца Пучынскі, не кажыце яму пра Ікара.

Казімір

Пучынскі? Ты верыш, што ён прыйдзе... пасля таго, як ты яго згубіла?

Марыся

Такія мужчыны абавязкова знаходзяцца самі, іх не трэба шукаць. Да таго ж ён мне патрэбны.

Багуся

Чаго гэта?

Марыся

Па-першае, ён мой начальнік, па-другое, у яго лепшая калекцыя мастакоў-мадэрністаў. І, па-трэцяе, калі трэба, ён абароніць мяне ад Ікара.

Казімір

А на мяне ты ўжо не разлічваеш?

Марыся

Ты толькі і здатны на тое, каб пакінуць мяне без выбару.

Казімір

А мне здавалася, што я змяніўся.

Марыся

Ты перабольшваеш.

Багуся

А гэты Ікар — што ён з сябе ўяўляе?

Марыся

Мужчына.

Казімір

Пераканаўчы адказ. Здаецца, ты казала, што не зважаеш на мужчын.

Марыся

А хто табе казаў, што я іх бачыла?

Казімір

Ты мяне здзіўляеш.

Марыся

Я дзіўлюся з самой сябе.

Казімір

(з іроніяй)

Выключна! Мы ахвяруем сваімі жыццёвымі прынцыпамі дзеля знаёмства з сумніўным Ікарусам.

Марыся

Ахвяруем?.. Мы ахвяруем?.. А зрэшты, чаму й не? Мы здрадзім сваім — як ты сказаў, — прынцыпам дзеля таго, каб спазнаць сябе.

(Тэатральна.)

З гэтага моманту абяцаю: я буду толькі ахвяраваць, знаходзіцца ў пошуку, адмаўляцца, паглыбляцца... Адзінае, што выпадае з гэтага шэрагу, — слова «чакаць». Я больш не буду чакаць таго дня, калі пачнецца жыццё.

Багуся

Ну як? Яна гатовая легчы на плаху, каб толькі даказаць, што мінулае не мае для яе ніякага значэння.

Марыся

Хай так. Я кінула, адмовілася, адбілася, адгарадзілася, адасобілася, ад...

Казімір

Каб жа толькі тваё «ад...» не закранула пачуцця ўласнай годнасці.

Марыся

Гэтага не будзе.

(Выходзіць.)

Паўза.

Багуся

Як ты думаеш, што будзе з яе годнасцю, калі яна ўбачыць нас у ложку?

Казімір

Я не дапушчу.

Багуся

Дарма, а я думаю, час ёй адкрыць вочы... Што з табой адбываецца?

Казімір

Тое, што бывае з мужчынамі, калі яны здраджваюць пры сведках. Я поўны сусветным болем. Мне шкада тых дзяцей, якія пухнуць з голаду. Мне шкада разбураных Пампеяў і затопленай Атлантыды. І я губляю сябе.

Багуся

Пакінь свет у спакоі. Ён не думае пра нас. Спадзяюся, твая здрада — не фарысейства. Ці ты ўжо шкадуеш?

Казімір

Ты чытала Камю? Ён сказаў, што нішто так не натхняе, як усведамленне свайго безнадзейнага становішча.

Багуся

Твая маленькая трагедыя набывае маштабы.

Казімір

Маленькія трагедыі вызваляюць аптымізм. Мне дастаткова, каб ты мяне ізноў спакусіла.

Багуся

О-ля-ля... Сапраўды, ты можаш быць задаволены жыццём.

Казімір

Ага, тым, што недзе засталася жонка, якая мяне чакае, і зяцем, які ездзіць на маёй машыне. І добрай сяброўкай, якая вырашыла здрадзіць прынцыпам. І тым, што мне ёсць дзе спыніцца ў час дэпрэсіі. І дзяўчом, якое дорыць трыццаць тры пацалункі, ад якіх я пачуваю сябе прарокам.

(Тэатральна.)

Падыдзі, дзіця маё, я адпушчу табе грахі.

Багуся

Блазан! Ты здзекуешся з мяне!

Казімір

Не, проста я хутка стану дзедам.

Багуся

Ну вось, яшчэ адна навіна... Твая дачка цяжарная?

Казімір

Вось-вось народзіць.

Багуся

Прашу цябе, стаўся да мяне сур'ёзна. Я таксама магу нарадзіць.

Казімір

Што?!

Званок у дзверы.

Багуся

Пайду адчыню.

Выходзіць. Заходзіць разам з Ікарам.

Ікар

Добры дзень... добры дзень. Мяне завуць Ікар. Я прыйшоў да чароўнай Марысі.

Казімір

Яна хутка выйдзе.

Ікар

Тады я пачакаю. Яна казала, што я прыйду?

Казімір

(надзвычай ветліва)

Яна сказала, што вы былі настолькі ўважлівыя, што згадзіліся прывезці яе бясплатна.

Ікар

Звычайна я так не раблю.

(Ходзіць па пакоі, разглядае ўсё, нібы прыцэньваецца. Зазірае ў другі пакой.)

Марыся жыве тут адна?

Казімір

Думаю, вам рана яшчэ задаваць такія пытанні... А-а, гэта не вы аскублі рымскіх гусей?

Ікар

Ну вось, я ведаў... ведаў. Варта мне назваць маё імя, як людзі пачынаюць з мяне пацяшацца.

Багуся

Ён не хацеў вас пакрыўдзіць.

Ікар

У дзяцінстве я марыў быць лётчыкам. Але здароўе...

Казімір

Вы хворы?

Ікар

Ды не!.. Як вы думаеце: ездзіць на таксі — у гэтым ёсць палёт?

Багуся

Ага *(смяецца)*... У шафёра спыталі: чаму вы так хутка едзеце? А ён адказвае: мы не хутка едзем. Мы нізка ляцім.

Смяюцца. Званок у дзверы.

...Я думаю, гэта хлопчык са стрэламі.

Казімір ідзе адчыняць. Вяртаецца з Пучынскім.

Ікар

(здзіўлена)

А дзе лук і калчан?

Пучынскі

Дабрыдзень. Рады вас бачаць. Вы не ўяўляеце, як я спужаўся, калі Марыся знікла, — з ёй магло што-небудзь здарыцца. Спадзяюся, яна не ў крыўдзе, што я не знайшоў яе?

Багуся

А вы шукалі?

Пучынскі

Безумоўна.

Багуся

Думаю, яна не толькі не ў крыўдзе, але і ўдзячная вам.

Пучынскі

Удзячная? За што?

Багуся

За тое, што Ікар прынёс яе сюды на сваіх крылах.

Пучынскі

(здзіўлена)

Ікар?

Ікар

(працягвае руку)

Гэта я.

Пучынскі

Гэта не ваша фірма пастаўляе нам старыя «Ікарусы» з Германіі? Яны адваявалі ў нас некалькі пакояў! Уяўляеце, гэтыя людзі дураць нашу дзяржаву: яны прыганяюць аўтобусы, якія забруджваюць наваколле. Іхняя фірма так і называецца «Ікар». Дык вы...

Казімір

Супакойцеся. Ён там не працуе. Вашае таксі, Ікар, таксама забруджвае наваколле?

Ікар

(абурана)

Мяне правяраў экалагічны патруль!

Багуся

Вас... ці машыну?

(Смяецца.)

Уваходзіць Марыся.

Марыся

Пучынскі! Ты даўно тут? Ікар, вы запомнілі дом? На вуліцы ж было цёмна.

Ікар

Але. У чатыры гадзіны раніцы досыць добра бачна. І вы напісалі мне ваш тэлефон і адрас на паперцы. Вось *(дастае з кішэні)*.

Марыся

Не трэба. Я вам веру.

Ікар

У вас цудоўная кватэра. Люблю парцалянавыя статуэткі. Сярод іх звычайна жывуць паэтычныя натуры. Вы чулі, як яна чытае вершы?

Марыся

(апраўдваецца)

Я чытала яму Ахматаву... у таксі.

Казімір

А ён не цікавіцца авангардыстамі?

Марыся

Не ведаю. Затое ён разбіраецца ў машынах. Хто-небудзь, схадзіце па шампанскае. Трэба адзначыць нашу сустрэчу. О, мая галава!

Пучынскі

У такіх выпадках лепш каньяк. Ён пашырае сасуды. Я схаджу.

(Сыходзіць.)

Марыся

Ікар, вы зараз вольны ад працы?

Ікар

Мая змена закончылася раніцай. Вы былі маёй апошняй кліенткай. Мне яшчэ ніхто не чытаў вершаў у таксі... Я люблю новых людзей, новыя знаёмствы і новыя кватэры.

Марыся

Вы хочаце паглядзець другі пакой? Хадземце, я пакажу вам мае кнігі.

(Выходзяць у другі пакой.)

Багуся

(перадражнівае)

Хадземце, я пакажу вам мае кнігі... І мае альбомы... І маю калекцыю паштовак.

Казімір

Ты раздражнёная. Гэта табе не пасуе.

Багуся

Я шмат кажу?

Казімір

Не, ты проста анёл.

Багуся

Затое відочна, што табе так і хочацца ўкусіць каго-небудзь. Ты больш не пачуваеш сябе гаспадаром.

(Смяецца.)

Казімір

Смейся, дрэнная дзяўчына. Мне падабаецца, калі ты смяешся з мяне.

Багуся

Ну вядома, у мяне тады з'яўляецца ямачка на падбародку, і я пачынаю выклікаць сексуальныя жаданні.

Казімір

Гэта адзінае, чым ты можаш ганарыцца.

Багуся

Файна. Нарэшце ты знайшоў ува мне нешта прывабнае.

Казімір

Ты абуджаеш ува мне мужчыну.

Багуся

(тэатральна)

А хто сказаў табе, што я бачыла раней мужчын?

Казімір

Працягвай.

Багуся

Навошта? Мне робіцца млосна ад думкі, што я не выклікаю ў табе жадання размаўляць са мной пра мастацтва, пра палітыку. Ты не філасофствуеш са мной — ты павучаеш.

Казімір

Я не ўмею размаўляць пра сур'ёзныя рэчы з дзецьмі.

Багуся пакрыўдзілася. Паўза.
Вяртаецца Пучынскі з бутэлькай каньяку.

Пучынскі

(весела)

Каму баліць галава? Вось лепшы ў свеце анальгін...

(Нерашуча.)

А-а дзе...

Казімір

Яна паказвае вашага Філонава новаму знаёмцу.

Пучынскі

А-а...

З пакоя выходзіць Марыся, яна трохі збянтэжаная, шчокі яе гараць.
За ёй ідзе Ікар.

Ікар

Марысі кепска. Наліце ёй трохі каньяку.

(Падыходзіць да стала, разглядае бутэльку, адкрывае. Багуся прыносіць шклянкі.)

Ваш сябар умее выбіраць.

Пучынскі

Так, я папрасіў самы дарагі.

Марыся

(нервова)

Хто-небудзь пачастуе ўдаву?

Багуся

Хм!

Усе глядзяць на яе.

Я хацела сказаць...

Звоніць тэлефон. Багуся бярэ трубку.

...Вы памыліліся... Што? Ваш муж? Казімір?..

(Казіміру.)

Ты тут?

Марыся

Зусім забылася. Учора званіла Марта, яна хацела сказаць табе нешта важнае.

Казімір падыходзіць да тэлефона, бярэ трубку.

Казімір

Марта?.. Ты ж ведаеш, што я магу быць толькі тут... Учора? Мы проста хадзілі гуляць. З кім?.. Колькі я не званіў? Божухна, як ляціць час... Не... Не хвалюйся... Пэўна ж, я думаю пра вас... Ты можаш прыехаць?

(Глядзіць запытальна на Марысю, яна згодна ківае галавой.)

Так, Марыся не будзе супраць... Дачка? Што? Унучка? Тры дзвесце... Што?.. Добра... Цалую.

(Кладзе трубку падыходзіць да стала.)

Сябры! У мяне нарадзілася ўнучка!

Марыся падыходзіць да яго, цалуе ў шчаку.
Ікар і Пучынскі ціснуць яму руку.

Пучынскі

Далучаюся.

Ікар

Віншую. Унукі — гэта шчасце.

Багуся нервова разварочваецца і сыходзіць.

Пучынскі

Яна не любіць каньяк?

Марыся

Яна любіць званіць з аўтаматаў.

Ікар

У пляменніцы ёсць кавалер?

Марыся

Ёсць. Студэнт, яны разам вучацца на біялагічным. Ён хоча ажаніцца з ёй. Але яны закончылі толькі адзін курс! Казімір, што ты думаеш наконт гэтага?

Казімір

А! Пра што?

Марыся

Пра Уладзіслава.

Казімір

Прыстойны малады чалавек. Думаю, ён не любіць скрыжоўваць розныя віды. І не будзе на яблыню прышчэпліваць сліву... Хаця ў яго ўсё наперадзе.

Марыся

Ён мне падаецца такім мілым, безабаронным. Пэўна, я пачну спачуваць яму, калі Багуся згадзіцца стаць яго жонкай.

Ікар

Мне здаецца, што семнаццаць ці дзевятнаццаць — самы ўзрост быць капрызніцай. Потым гэта выглядае смешна.

Пучынскі

Чаму вы думаеце, што Багуся капрызніца?

Ікар

Мне так падалося... Вып'ем за дзеда.

(Усе п'юць.)

Марыся

Мне горача! Баюся, што расчарую вас, але мне па-ранейшаму баліць галава. Нават мацней.

Пучынскі

О, разумею, нам час сыходзіць.

Ікар

Вы не будзеце супраць, калі я прыйду яшчэ?

Марыся

Не. Я таксама пачынаю любіць новых людзей і новыя знаёмствы.

Пучынскі

(Ікару)

Вы нічога не сказалі пра сябе. Вы жанаты?

Марыся

Ён раскажа вам па дарозе. Дзякуй, што вы прыйшлі... О, мая галава!

Пучынскі цалуе ёй руку. Ікар моцна паціскае. Развітваюцца і сыходзяць.

Казімір

Марыся, можа, мне таксама сысці?

Марыся

Хіба ад гэтага нешта зменіцца? І хто мне намочыць ручнік, каб пакласці на галаву?

Яна ідзе да канапы, кладзецца.

Казімір выходзіць на кухню, вяртаецца з мокрым ручніком. Сядае поруч.

...Ну вось, усё вярнулася на кругі свая. А то я ўжо думала, што не вытрымаю гэтага бегу. Мне ж не дзевятнаццаць.

Казімір

Я казаў, што для мяне гэта не мае значэння.

Марыся

А як з дзвюма рэчамі: прыгожым асяроддзем і вытанчанымі жанчынамі?

(Слаба ўсміхаецца.)

Казімір

Адна з гэтых рэчаў побач са мной. Хочаш, я звару табе кавы?

(Намагаецца падняцца. Яна ўтрымлівае яго.)

Марыся

Потым. О-о... Мы забыліся пра нашую гульню.

Казімір

Гульню?

Марыся

У нас было шмат знаёмых, і мы маглі гуляць у закаханых. Памятаеш, аднойчы...

Казімір

У гэтым была наша памылка.

Марыся

Ты сур'ёзна так думаеш?

Казімір

З двух адно: мы гублялі знаёмых ці адно аднаго.

Марыся

Але як мы кахаліся ў гэтыя хвіліны! Ты ўпэўнены, што я гуляла?

Казімір

Зусім не. Я не быў упэўнены нават у сабе.

(Нахіляецца, цалуе яе ў вусны.)

Марыся

Табе проста прыемна бачыць мяне, праўда?

Казімір

Мне прыемна быць побач, каб адчуваць сябе патрэбным.

Марыся

Ты ўвесь час быў мне патрэбны.

Казімір

Я ведаю... Мы не змаглі б доўга жыць разам. Я пачаў бы прыходзіць пад раніцу, з'язджаў бы ў камандзіроўкі, спаў з іншымі жанчынамі і ўвесь час думаў пра тое, што ты пакутуеш. Ты ведаеш, я баяўся ўбачыць, як ты плачаш.

Падчас гэтага маналога Марыся сцягнула ручнік на твар. Відочна, яна хавае слёзы.

...Марыся... Марыся... ты... ты плачаш?

Марыся

Не.

(Падымае ручнік.)

Казімір

Твае вочы поўныя слёз. Ты плачаш, Марыся!

Марыся

Гэта ручнік. Ён кепска адціснуты. Ідзі, згатуй кавы.

Казімір падымаецца.

Ты... дапаможаш мне?

Казімір

Дапаможаш? Што?

Марыся

Зрабіць тое, што я ніколі не рабіла: пераставіць рэчы.

Заслона.

Сцэна другая

У пакоі чыста, светла і... пуста. Зніклі парцалянавыя статуэткі. Грае кружэлка. Казімір адзін, сядзіць за сталом, нешта піша. Уваходзіць Марта

Марта

О, дарагі!

(Аглядаецца.)

Ты адзін? Там было адчынена, я не стала званіць.

Казімір падхопліваецца, цалуе яе ў шчаку.

Казімір

Прывітанне, дарагая! Марыся пайшла купіць што-небудзь на абед.

Марта

Нарэшце я змагла выбрацца!.. Ты павінен быў пазваніць! Зрэшты, ты мог пісаць сваю кнігу ў Доме творчасці. Для гэтага не варта турбаваць старых каханак.

Казімір

Ты сама сябравала з Марысяй.

Марта

Ат, гэта было даўно!

Казімір

Ты абяцала не раўнаваць мяне.

Марта

Я не раўную. Але месяц не званіць — згадзіся, гэта занадта. І ты не адказаў, што з тваёй кнігай.

Казімір

Пішу.

Марта

(аглядаецца)

А дзе парцалянавыя статуэткі, што так натхнялі цябе?

Казімір

Марыся занесла іх антыквару.

Марта

Вось не думала, што за гэта можна атрымаць грошы... Можа, мне таксама пачаць што-небудзь калекцыяніраваць?

(З'едліва.)

Да прыкладу, мужчын.

Казімір

Ты абяцала не папракаць.

Марта

Я шмат што абяцала табе.

Казімір

Яшчэ Ларашфуко казаў, што пакуль людзі кахаюць, яны прабачаюць.

Марта

Ты верыш у тое, што можна кахаць усё жыццё?

Казімір

А ты — не?

Марта

Ты не хочаш спытацца пра ўнучку?

Казімір

З-за тваіх папрокаў мой мозг працаваў у адным кірунку — як абараніцца... Дык што нашы? На каго падобная дзяўчынка?

Марта

Не на цябе. Дачка ў лякарні, табе трэба вярнуцца. Яна сумуе па табе... Яна сказала мужу, што ты з'ехаў на курорт. У Ачамчыры. Не збытай месца, калі вернешся. Запішы ў сваёй памяці: Ачамчыры.

Казімір

Ну, ведаеце...

Марта

А наогул, я бачу, ты добра выглядаеш. Значыць, цябе не замучылі ўспамінамі?

Казімір

Гэта праўда. Я быў на курорце.

Марта

І раз я ўсё адно прыехала, то будзь ласкавы, правядзі мяне па крамах, дзе прадаецца ўсё для немаўлят. Ты павінен прывезці падарунак.

Казімір

Можа, пазваніць у Ачамчыры, каб яны даслалі нам этыкеткі, мы прымацуем іх на пакункі.

Марта

Дзікун, этыкеткі можна адарваць.

(Падыходзіць да яго, трэцца, гладзіць руку.)

Ты сумаваў?

Казімір

Як заўсёды.

Марта

І хваляваўся?

Казімір

Як заўсёды.

Марта

Шмат працаваў?

Казімір

Як...

Заходзіць Ікар.

...Ікар... Ікар, хадзіце сюды!

(Марта мацае Казіміру лоб.)

Марта

Ты што, з глузду з'ехаў?

Казімір

Гэта таксіст.

Ікар

Добры дзень, спадарыня. Мяне завуць Ікар.

Марта

Мянушка такая?

Казімір

Ты пакрыўдзіш чалавека.

Марта

Такіх імёнаў няма.

Казімір

Але былі!.. Дарэчы, пра імёны: як назвалі ўнучку?

Марта

Чакаюць цябе. Твая дачка ўпэўнена, што калі ты сам выбярэш імя, то будзеш любіць дзяўчынку і перастанеш з'язджаць з дому. Твой Ларашфуко не казаў пра тое, як можна прымусіць мужчыну сядзець дома?

Казімір

Ён гэтага не ведаў.

Ікар

Я думаю, ні адзін філосаф не быў разумнейшы за жанчыну.

Марта

Вы мяне суцешылі, Ікар.

Ікар

Удзячны, удзячны. Суцешыць жанчыну — вось дзе магчымасць паказаць сябе з лепшага боку.

Марта

Не імкніцеся. Я ведаю, што кожны лепшы бок мае і горшы. Ніхто мяне не запэўніць у тым, што ўмее суцешыць жанчыну лепш, чым мой муж.

Казімір

Чаму б табе не праехаць па крамах з Ікарам?

Марта

(падумала, Ікару)

То не будзем губляць часу!

Ікар

Я-я... Э-э... Паехалі.

Уваходзіць Марыся з кошыкам і пакетам.

Марта

(з гонарам)

Марыся. Дабрыдзень. Як жывецца?

Марыся

Прывітанне. Няблага, дзякуй... Мы столькі гадоў...

Марта

Твая праўда. Я еду па крамах. Дапамажы, будзь ласка, майму мужу сабрацца. Мы з'язджаем.

Ікар падыходзіць да Марысі, цісне руку, а потым паказвае поглядам на Марту і пацікскае плячыма. Марта і Ікар сыходзяць.

Марыся

Цвёрдая жанчына. Аж жах!

Казімір

Яна добрая і па-свойму любіць мяне... Можа, у яе своеасаблівы погляд на сямейныя адносіны...

Марыся

Гэта ты маеш своеасаблівыя погляды. Ты ніколі пра гэта не думаў? Толькі ты і твая Марта з яе курынымі мазгамі можаце верыць, што ваш шлюб — не амаральнасць!

Казімір

Ты так думаеш?.. Тады чаму... чаму ты ніводнага разу не паказала мне на дзверы? Ты таксама мела дачыненне да гэтай... як ты кажаш... амаральнасці.

Марыся

Не! Я ратавала тваю Марту ад горшага. Яна б не вытрывала, калі б ты кінуў яе па-сапраўднаму. А як са мной — то яна спакойная.

Казімір

А яна... ухваляе твой... расклад?

Марыся

Мы абмеркавалі гэта шмат гадоў таму.

Казімір

Значыць... табе была дазволена роля вартаўніка?

Марыся

У нейкай ступені. Ты ж не злачынца, каб цябе сцерагчы.

Казімір

А Багуся?..

Марыся

Гэта мая памылка. Я была надта ўпэўненая ў сабе.

Казімір

Марыся! Марыся... мая Марыся. Што ты кажаш?

Марыся

(спахапілася)

Ты не пакінуў мне выйсця.

Паўза.

Казімір

Я вярнуся назад.

Марыся

Я ведаю гэта. Толькі...

Казімір

Што толькі?

Марыся

Як гэта ўспрыме Багуся?

Уваходзіць Багуся.

Багуся

Казімір, Марыся! Я вярнулася. Уладзіслаў паказаў мне кватэру, якую ён зняў нам.

Марыся

Вось цудоўна! Але я не дазволю вам жыць грамадзянскім шлюбам. Я параю Уладзіславу зрабіць усё, каб надзець шлюбны пярсцёнак табе на палец.

Багуся

Марыся, ты не любіш мяне!

Марыся

Люблю. Таму і раю зрабіць гэта найхутчэй.

Казімір

Навошта спяшацца? Яны павінны бліжэй пазнаёміцца адно з адным.

Багуся

Мы знаёмы блізка. І што?

Казімір

Якраз тое, як вы знаёмыя, не мае значэння для шлюбу. Ён павінен прыцягваць цябе, як маяк, як... праводная зорка. І калі ты вывучыш шлях да яго і будзеш вяртацца толькі на ягонае святло, тады можаш лічыць, што шлюб адбыўся.

Багуся

(іранічна)

Дзядзечка Казімір, а ў якім моры свеціць ваш маяк? Калі я раптам заблукаю і выгукну SOS, вы дашлеце ратавальныя караблі насустрач?

Казімір

Я даведаўся, што на мой маяк прыбівае толькі дошкі і трэскі — тое, што застаецца пасля караблекрушэння.

Казімір выходзіць. Заходзіць Пучынскі, ён абураны.

Пучынскі

(Багусі)

Вы чулі? Не, вы чулі?

Багуся

Што чула?

Пучынскі

Тое, што мне сказаў у дзвярах гэты нахаба — Марысін знаёмец?

Багуся

Казімір? А што ён вам сказаў?

Пучынскі

Увесь гэты час ён паводзіў сябе зусім прыстойна. І я не думаў, што ён можа так... амаль незнаёмаму чалавеку... у твар...

Марыся

Не думаю, каб тое, што ты пачуў, тычылася тваёй асобы. Казімір сышоў раззлаваны. Прыехала Марта, ягоная жонка.

Пучынскі

(асцярожна)

І яна спакойная?

Марыся

Яна паспее паказаць свой нораў дома.

Багуся

Ты ўпэўнена?

Марыся

У чым?

Багуся

Што ён з'язджае?

Марыся

Марта прасіла дапамагчы сабраць рэчы.

Багуся

Марта... А-а... ён?

Марыся

Ты ж бачыла — сышоў.

Паўза.

Пучынскі

(Марысі)

Я вось дастаў два білеты ў Оперны. Як твая галава? Можа, нам прайсціся?

Марыся

Падобна на тое, што падскочыў ціск. Але і праўда. На свежае паветра!.. Багуся, падумай над тым, што табе прапанаваў малады чалавек.

Багуся

(нервова ходзіць па пакоі)

Гэта мы яшчэ паглядзім... Не хвалюйся, Марыся, я падумаю.

Марыся

(бярэ люстэрка, пудрыць твар)

Пэўна, Казімір сам збярэ свае рэчы. Ды і Марта яму дапаможа. Перадасі ім маё развітальнае «бывай».

Пучынскі

Усяго найлепшага!

Пучынскі і Марыся сыходзяць. Багуся ўсе яшчэ нервова ходзіць.

Багуся

А я?. Як я?.. Зусім адна?.. Пераехаць да Уладзіслава? Так, я перажыву расстанне з Марысяй. А-а... з ім?

(Плача.)

Так, ён меў розных жанчын! Але ж я дачакалася сваёй чаргі.

(Узрываецца.)

Гэта праўда! Я чакала сваёй чаргі!

(Раззлаваная.)

На маім месцы магла быць іншая, якая паклікала б яго за сабой. Галоўнае што? Паклікаць... Кім я была тут — у кватэры ягонай сяброўкі — хатнім сабачкам? Гэй, свісь!

(Свішча.)

Багуся падае на канапу, падхопліваецца, рухі яе нервовыя. Ставіць кружэлку, гучыць песня ў выкананні Аляксандра Сярова «Як мне быць?». Багуся час ад часу свішча, як бы здзекуецца з сябе. Паўза. Заходзяць Марта і Ікар.

Марта

Божухна, зусім стамілася.

(Заўважае Багусю.)

Вы хто?

Багуся

Пакаёвы сабачка.

(Ціха.)

Фью-фью!

Марта

Тым горш. Хто дапаможа Казіміру скласці рэчы?

Багуся

Я.

Яна рашуча ўстае, ідзе ў другі пакой,
адтуль выкідае валізку, кашулі, штаны — рэчы Казіміра.

Марта

Што? Што вы робіце?

Ікар спачатку нерашуча, а потым уваходзіць у ролю памагатага і падымае рэчы, кладзе ў валізку.

Багуся

Вось вашыя рэчы! Пакаёвыя сабачкі таксама бываюць злымі. Таму — ідзіце і, калі забераце вашага мужа, не забудзьцеся зрабіць яму супрацьслупняковы ўкол — ён мог заразіцца.

Марта

(крычыць)

Казімір! Казімір! Ратуйце!

Ікар

Цішэй! Цішэй! Я пагляджу...

(Аглядае кватэру.)

Яго няма.

Багуся

(выкідае апошнія рэчы)

Прэч! Ён пайшоў пешкі, як пілігрым. Ідзіце, можа, дагоніце!

Марта

Якая істэрычная дзеўка! І што, яна таксама тут жыве?

Ікар

Гэта пляменніца Марысі. Вось *(падае валізку)*, вазьміце.

Марта

Вы адвязеце мяне на вакзал. Я больш ні хвіліны не хачу заставацца ў гэтым доме.

Ікар і Марта сыходзяць. Багуся ходзіць па пакоі.

Багуся

Ідзіце! Мне будзе добра адной! Я больш нікому не дазволю адшпурваць мяне, як цацку! Я стану спакойнай і халоднай. Не, гэта не тое! Зацяганымі словамі немагчыма вызначыць сутнасць... Зрэшты, калі я не стану абыякавай, як скала, то буду вясёлай і шалёнай. Я знайду асалоду ў помсце... У помсце? Але каму?.. Ён не кахае мяне, і я больш ніколі яго не ўбачу! О-о!..

Падчас гэтага маналога з'яўляецца Казімір і прыпыняецца ў дзвярах. Багуся яго не заўважае.

Казімір

Але я вярнуўся.

Багуся

(здранцвела)

Ты?.. Ты!

(Кідаецца да яго, абдымае.)

Застанься. Я магу быць з табой увесь час. Мне ўсё роўна, што ты кахаў Марысю. Мне ўсё роўна, колькі табе гадоў, што ты ўжо дзед. Зараз галоўнае — толькі мае пачуцці. Гэта праўда!

Казімір

Праўда? Ты хочаш сказаць, што пачуваеш сябе праўдзівай, калі гаворыш пра каханне? Ты не баішся, што я паверу?

Багуся

Я гэтага хачу! Я стамілася ад гульні. І ўжо няма розніцы паміж прыстойнасцю і шалам. Мне ўсё адно, як выглядаюць мае пачуцці: цнатліва ці юрліва. Гэта як быць анёлкам і пачварай адначасова. Я не ведаю — хто я, калі стаю побач з табой.

Казімір

Ты пужаеш мяне, Багуся? Не ведаю, што адкажу табе...

Багуся

Мілы... Мой мілы, стары донжуан. Такі разгублены і самотны. Няўжо ты думаеш, што я дазволю табе кінуць мяне вось так... раз і...

(Абдымае яго.)

Казімір

Мне добра з табой, дзяўчынка.

Багуся

Табе заўжды будзе добра. Я моцная. Я змагу абараніць нас ад Марысі, ад Марты. Ніхто не адбярэ цябе. Мы засталіся б удвох... назаўсёды.

Казімір

Ты абароніш... нас? І не будзе ні Марты, ні Марысі... назаўсёды толькі ўдваіх. Дзіўна!..

(Зразумеў недарэчнасць.)

Але так палка, так апантана! Ты сапраўды верыш у свае словы? Ты верыш, што для нас магчымы хэпі-энд?

Багуся

Хэпі-энд?

Казімір

(раздражнёна)

Так, для нас. І для іх таксама: Уладзіслава, якога ты «пракінеш», — так, здаецца, вы гаворыце? І для Марты, калі я скажу ёй, што буду жыць з дзевятнадцацігадовай дзяўчынай, і для Марысі... Знайдзі якое-небудзь пацверджанне — што ўсё, што ты кажаш, можа здзейсніцца.

Багуся

Навошта?.. Я проста ніколі не буду шчаслівай, калі ты сыдзеш ад мяне.

(Раптам.)

Тады ты не прачытаеш тых лістоў, што я пісала табе.

Казімір

Якіх яшчэ лістоў?

Багуся

Ты не будзеш смяяцца?

Казімір

?!

Багуся

Я так шмат ведала пра цябе: праз твае кнігі і ад Марысі... пра нас... што мне трэба было падзяліцца гэтым... Марыся і Уладзіслаў?.. Яны маглі ператварыцца ў ворагаў... А ты?.. Цябе магло проста ніколі не быць! Тады я пачала пісаць лісты, заклейваць у канверты і хаваць. Ты смяешся?

Казімір

Не.

(Сумна ўсміхаецца.)

Мне здаецца, я пачынаю адчуваць сябе шчаслівейшым.

Багуся

Праўда? Паабяцай, што ты зробіш мяне шчаслівай... Ну хоць ненадоўга. Так?

Казімір

Не ведаю.

Багуся

Адно скажы, што ты нікуды не ад'едзеш і гэтую ноч мы правядзём разам. Ты будзеш толькі маім! Скажы!

Казімір

(разважліва)

І ты не пачнеш прымушаць мяне даваць іншыя абяцанкі? Не будзеш казаць, што ты... атруцішся... ці перарэжаш вены... ці застанешся на ўсё жыццё расчараванай... калі... калі я сыйду?

Багуся

Абяцаю.

Казімір

(пасля паўзы)

Абяцаю.

Заслона.

Сцэна трэцяя

Казімір сядзіць за сталом, піша, ён у халаце і пантофлях. З'яўляецца Багуся. Яна ў верхняй вопратцы, з кайстрай. Набліжаецца да Казіміра, цалуе яго ў лоб.

Казімір

Ты ўжо сабралася? Не спознішся?

Багуся

Заняткі пачнуцца праз паўгадзіны. Ты мяне кахаеш?

Казімір

Так.

Багуся

Гэтак жа моцна, як і ноччу?

Казімір

(абдымае яе)

Можа, мацней. Трэба паўтарыць, і мы адразу даведаемся.

Багуся

(смяецца)

Мацней не бывае. Усё, пішы сваю кнігу.

(Цалуе яго.)

Пакуль!

Багуся сыходзіць. Паўза. Заходзіць сонная Марыся, яна ў халаце. Сядае насупраць Казіміра.

Казімір

Ты так рана ўстала?

Марыся

Дзе Багуся?

Казімір

Пайшла на заняткі.

Марыся

Яна вырашыла больш не прапускаць?

Казімір

Яна прапусціла толькі некалькі ранішніх лекцый, да таго ж у іх хварэў выкладчык.

Марыся

Мне яна казала тое самае... Бачу, ты шмат працуеш?

Казімір

Думаю, гэтая кніга будзе мацнейшая за тыя, што я напісаў.

Марыся

Угу.

(Пазяхае.)

Але ты няблага выглядаеш, я рада... Ты не заўважыў, што Багуся схуднела? У яе такія чорныя кругі пад вачыма і кепскі апетыт. Ды яшчэ гэтыя заняткі! Ты зусім не беражэш яе!

Казімір збянтэжаны, ён робіць выгляд, што піша.

Казімір!

Казімір

Што?

Марыся

...Ты заўсёды быў жаданым госцем.

Казімір

Я разумею, Марыся.

Марыся

Я хачу сказаць табе... што і потым... ты зможаш прыязджаць сюды.

Казімір

Дзякуй, Марыся... Я... даўно не бачыў Ікара. Вы сустракаецеся?

Марыся

Мы вырашылі правесці Каляды ў гарах.

Казімір

А мастацкія выставы цябе больш не цікавяць?

Марыся

Чаму? Учора, калі вы былі ў тэатры, заходзіў Пучынскі. Ён прынёс мне новы альбом. Але ён не любіць слалама.

Казімір

Не любіць слалама? А чаму ён павінен яго любіць?

Марыся

Не ведаю. Ікар абяцаў навучыць мяне ездзіць на іртах. Ён сказаў, што калі нясешся ўніз па крутым схіле, то адчуваеш, як анёлы падтрымліваюць цябе пад рукі, каб ты не ўзляцеў, нібы птушка, іначай парушыцца свет.

Казімір

Народжаны поўзаць лётаць не можа?

Марыся

Нешта накшталт. Ты можаш дасягнуць гармоніі сам з сабой, але калі табе гэта не дазволена Богам, то расплаціцца давядзецца іншаму: жывёліне, казюрцы. Калі чалавек сам, без сваіх машын і хітрых прыстасаванняў пераадолее гравітацыю, то птушкам прыйдзецца...

Казімір

(перабівае)

Развітацца з крыламі. Гэта тэорыя няспраўджанага кандыдата ў лётчыкі? Ці няздзейсненага мастака?

Марыся

Паглядзі на сябе. Твая іронія не да месца.

Казімір

Хіба нешта не спраўдзілася з маіх задум? Я пішу кнігі, і я вольны!

Марыся

Гэта нагадала мне тое, з-за чаго я так рана зазірнула да цябе. Учора званіла Марта. Яна сказала, што чакае цябе ўжо дзесяць дзён. Яна пагражала прыехаць сёння. Я не захацела пакідаць цыдулку, а вярнуліся вы позна.

Казімір

Марта?.. Сёння?

Марыся

Калі яна не любіць начных цягнікоў, то ты маеш шанц пагаварыць з ёй па тэлефоне. Ты ж ведаеш, я не цярплю сварак у сваім доме.

Казімір

Сваркі? Але я не збіраюся ні з кім сварыцца.

Марыся

Ты думаеш, яна моўчкі ўспрыме тое, што ты...

Казімір

Што я?

Марыся

Ты павінен пазваніць ёй і сказаць, што ты вырашыў: вярнуцца ці застацца.

Казімір

Але ж я не вырашаў!

Марыся

То вырашы... Я спадзявалася, што ў адпачынку буду мець магчымасць выспацца. Пайду прылягу.

Казімір

Марыся... Марыся, што мне рабіць?

Марыся

Даць параду?.. Другім разам нарадзіся ў Афрыцы. Там ёсць плямёны, у якіх і ў наступных стагоддзях не зменіцца лад жыцця. Тады ты зможаш мець хоць дзесяць жонак адразу.

(Выходзіць.)

Казімір

Але... Але...

Казімір ходзіць па пакоі, набліжаецца да тэлефона і набірае нумар. У гэты момант звоняць у дзверы. Ён кладзе трубку і ідзе адчыняць. Паўза. Уваходзяць Казімір і Марта.

Казімір

Марта... Ты ехала начным цягніком? А я вось толькі хацеў патэлефанаваць табе.

Марта

Як бачыш, не варта. Мы чакалі цябе дзесяць дзён. Цябе ці званка.

Казімір

Але... я не мог...

Марта

Не ходзяць цягнікі ці сапсавалася тэлефонная сувязь?

Казімір

Я... пішу кнігу.

Марта

Ты можаш пісаць яе і дома.

Казімір

Дома... Там плача маленькая! Дарэчы, як вы яе назвалі?

Марта

Калі памятаеш, мінулы раз я казала, што дачка чакае тваёй прапановы. Яны не могуць зрабіць метрыку без цябе... Без яго! Ха! Нібыта гэта яму конча неабходна!

Казімір

Прабач, Марта. Я сапраўды павінен быў патэлефанаваць вам. І... мне здаецца, я ведаю, як назваць дзяўчынку.

Марта

Як?

Казімір

Багуміла.

Марта

Багуміла?

Казімір

Багуся...

Яны глядзяць адно на аднаго.

Табе падабаецца?

Марта

...Я ведаю яе?

Казімір

Каго яе... унучку?

Марта

Не прыдурайся. Сярод тваіх знаёмых не было Багумілы.

Казімір

Цяпер ёсць.

Марта

Значыць, яна замяніла Марысю і парцалянавыя статуэткі?

Казімір

Яна нікога не замяняла.

Марта

Тады скажы гэта ёй сам.

Казімір

Што?

Марта

Што тваю сям'ю замяніць немагчыма, а калі гэта здараецца, то ненадоўга і не часта. Толькі тады, калі карціць пісаць. А выходзіць кніга, і ты пачынаеш ненавідзець сябе і творцу ў сабе, бо кнігу ніхто не заўважае. А потым мінае час, і ты зноў верыш, што калі-небудзь створыш нешта значнае... Пішаш, выдаеш, губляеш сілы і надзею, покуль не закахаешся і не пачнеш пісаць наноў. Ты павінен ёй сказаць, што яна патрэбная табе для натхнення!

Казімір

Але...

Марта

Ну-ну, вядома, яна ж бачыць у табе Шылера ці Гюго. А можа, Талстога: праблемы з жонкай, героі з тонка выпісанай псіхікай і любоў пафіласофстваваць. Вось ён ідзе басанож па марозе, з кавенькай, у сярмяжных штанах. Ён любіць народ. І яго трэба аба-

раніць. Ад каго? Ды ад сям'і, вядома... Ты павінен сказаць ёй, што, як толькі ты закончыш кнігу, яна табе будзе непатрэбная! Іначай я скажу сама.

Казімір

Не, прашу цябе. Дай мне час.

Марта

Адзін дзень. Даю табе адзін дзень. Заўтра мы пабачымся.
(Хутка выходзіць.)

Казімір нервова ходзіць па пакоі. З'яўляецца сонная Марыся.

Марыся

Нехта быў?

Казімір

Марта.

Марыся

І..?

Казімір

У мяне ёсць суткі.

Марыся

(пазяхае)
Ніяк не магу прачнуцца. Давай згатуем кавы. А потым ты супакоішся і мы пагаворым. Марта так хутка сышла?

Казімір

Так. Яна заўсёды вырашала імгненна, хаця мне часам здаецца, што ёй усё вядома зараней: што яна зробіць праз гадзіну ці праз год.

Марыся

Хіба можна нешта пралічыць у адносінах да цябе?

Казімір

Як бачыш... У маладосці яна верыла, што мы з ёй Трыстан і Ізольда. Яна іграе ролю закаханай столькі, колькі я яе ведаю. І калі сыходжу з дому — я заўсёды азіраюся, каб запомніць вочы: аддаяныя, шчырыя, спужаныя, усе ў чаканні, напружанні, любові. Гэта сама паэзія адносін. Я выходжу за парог, і маё сэрца рвецца на кавалкі ад шкадобы да той, якая гульню ў каханне зрабіла адзінай мэтай жыцця. Але гэта паэзія, Марыся!

Марыся

А ты сам кахаў?

Казімір

Па-сапраўднаму? Кахаў. Вось цябе, Марту. А потым — Багусю. Хочаш, я звару табе кавы?

Марыся

Не, толькі не Багусю. Я не дазваляю табе гэта рабіць! Ты можаш класціся з ёй у ложак, называць яе пяшчотнымі словамі, але... Я не хачу, каб яна моцна прывязалася да цябе...

Казімір

А можа — я прывязаўся?

Марыся

І праз пару год ты скажаш ёй, што едзеш на курорт? У гэты... як ты казаў... Ачамчыры? Як толькі напішаш кнігу?

Паўза.

Казімір

Ты сур'ёзна так думаеш?

Марыся

Як?

Казімір

Што я напішу кнігу і... з'еду?

Марыся

Вопыт, мой мілы. Вопыт.

Казімір

А калі гэтым разам усё не так?

Марыся

Тады папярэдзь яе, што можа чакаць наперадзе. Скажы праўду.

Казімір

Бог мой, зараз ты кажаш, як Марта. Як ты падобна на яе!

Марыся

Пэўна, нельга жыць з дзвюма жанчынамі адначасова. Асабліва калі яны сябравалі ў мінулым. Спачатку мы падстройваемся адна пад адну, а потым — пад аднаго мужчыну. І нашае шчырае сяброў-

ства ператвараецца праз цябе ў што?.. у дамову... у гульню... у барацьбу. Я стамілася, Казімір. І цябе гэта забаўляла. Ты не мог не здагадвацца.

Паўза.

Казімір

Я лічыў, што вашы з Мартай адносіны — проста ідэальныя... пасля таго, як я кінуў... як мы ажаніліся з ёй. Думаў — дзве жанчыны захавалі мір, каб паказаць адна адной сваю інтэлігентнасць і выхаванасць. Гэта таксама ў нейкай ступені помста — застацца на тым узроўні для каханага чалавека, каб ён пакутаваў ад жадання вярнуцца... Мне прыкра.

Марыся

Чаму?

Казімір

Таму, што патрэбны такі доўгі час, каб зразумець: хто ж побач.

Марыся

Людзі мала давяраюць адно зднаму. І заўсёды намагаюцца абвінаваціць чалавека, не зважаючы на тое, што можа апраўдаць яго.

Казімір

Тваё дабрадзейства цалкам ілжывае... Хто ж гэта сказаў... што нашы добрыя дзеянні часцей за ўсё выдатна пераўтвораныя заганы... не памятаю.

Марыся

Калі нашы пачуцці да цябе заганныя, то ці ж не ты сам першапрычына і вынік?

Паўза.

Казімір

Скажы мне, што ты не такая.

Марыся

А якая?

Казімір

Добрая, пяшчотная, даверлівая... Успомні: мы сядзім з табой уночы ля вогнішча, на небе зорак, што бобу, вада пляскоча, і салавей так: цёх-цёх-цёх... А ты ўсміхаешся — шчыра, адкрыта і... шчаслівa. І тады я пачынаю разумець, што такое жанчына і нашто яна дадзена свету. У кожнай з вас закладзена Мадона, Матка Боска, Марыя...

Марыся

Але чалавеку дастаткова адной святой.

Казімір

Пэўна, я застаўся паганцам. Мае продкі мелі шмат багоў. Адных яны шанавалі, другіх — баяліся, трэціх ненавідзелі. У іх былі русалкі, мары, лоймы, начніцы. Былі Ляля, Дзявоя. І гэта толькі сярод жанчын.

Марыся

Хіба гэта багі?

Казімір

А іншых яны не ведалі.

Марыся

Як лёгка ты прыстасоўваеш усё пад сябе. Нават веру. Ты не зважаеш на тое, што тваёй веры патрэбны ахвяры. Да прыкладу, пакуты Марты. Ці маё самаадданае чаканне. Але... нашто табе Багуся? Ёй рана зведваць, што такое жаночы сум.

Казімір

Ёй амаль дваццаць.

Марыся

Ты скажаш ёй пра Марту?

Казімір

Не ведаю... напэўна.

Марыся

Я іду гатаваць каву.

(Выходзіць.)

Званок у дзверы. Казімір ідзе адчыняць, вяртаецца з Ікарам.

Ікар

Вось праязджаў міма... вырашыў зайсці. А дзе ж мілая гаспадыня?

З кухні вызірае Марыся.

Марыся

А-а, Ікар. Як добра, што вы зайшлі.

Ікар

Вы..?

Марыся

Што?

Ікар

Вы?

Марыся

Ах, зусім забылася. Мы дамовіліся быць на «ты».

Ікар

Вы проста цуд. Вось ехаў міма і...

Марыся

Вы..?

Ікар

Ха-ха-ха... Ніколі не думаў, што так цяжка сказаць блізкаму чалавеку «ты».

Казімір

Блізкаму чалавеку?

Марыся

(збянтэжана)

Мая кава... О, мая кава!

(Выходзіць.)

Ікар

Думаю, вы нічога не маеце супраць, што я заляцаюся да Марысі?

Казімір

Яна вам падабаецца?

Ікар

Вельмі. Вось толькі я няўпэўнены — ці падыходжу я ёй? Гэтая розніца ў гадах... Але мне заўжды падабаліся старэйшыя жанчыны... Сталыя, вопытныя, упэўненыя і... расчараваныя. У іх спіць стоены свет — глыбокі, вабны, ненажэрны. Яны ў адначассе даюць магчымасць спазнаць, чаго ты варты ў гэтым жыцці... Няпраўда, што не кожная мае такі свет. Не кожнаму ён адкрываецца!.. Бачу, вам гэта здаецца не новым. Я не філосаф. І кніг не пішу. Чэсна скажу — і чытаю я рэдка. Але... такая жанчына, як Марыся, вартая любой кнігі: што палітэканоміі, што дапаможніка па вышукванні скарбаў.

(Смяецца.)

Казімір

Ну-ну, працягвайце.

Ікар

Навошта? Пра такія рэчы не гавораць з...

(Сумеўся.)

Паўза. Уваходзіць Марыся з тацай і кубкамі з кавай.

Марыся

(Ікару)

Ты размаўляў з Казімірам пра мяне?

Ікар

Я? Мы размаўлялі з ім пра кнігі.

Сцэна чацвёртая

Тыя ж дэкарацыі. На сцэне Марыся і Марта.
Вечар.

Марта

Я вырашыла сустрэцца з табой, таму што...

Марыся

(перабівае)

Ты ж ведаеш, я нічога не маю супраць. Адкуль, ты кажаш, пазваніла?

Марта

Тут недалёка ёсць гатэль. Я зняла нумар. Казімір мае суткі, каб вырашыць. Як ты думаеш, я не паспяшалася з...

Марыся

З ультыматумам?

Марта

Вось-вось... Вельмі цяжка паводзіць сябе, як эгаістка, калі ўсё жыццё жывеш, як... як...

Марыся

...адданая сяброўка.

Марта

...як...

Марыся

...верная жонка.

Марта

Як ануча для мыцця падлогі.

Марыся

Не. Вядома, ён...

Марта

Што я магу патлумачыць знаёмым? Што мой муж — гуляка, распуснік? Мне пачнуць спачуваць і даваць парады. Я буду слухаць парады і пілаваць мужа.

Марыся

Ты маеш права...

Марта

Маё права — утрымаць мужа — спрацоўвае тады, калі я выконваю ягоныя ўмовы.

Марыся

Зразумей мяне правільна. Навошта табе гэта?

Марта

А ты... скажы... як бы ты паводзіла сябе на маім месцы?

Паўза.

Уважліва глядзяць адна на адну і раптам усміхаюцца.

...Зрэшты, я захацела сустрэцца з табой, каб даведацца: наколькі гэта сур'ёзна.

Марыся

Сур'ёзна што?

Марта

(іранічна)

Тое, што ён піша кнігу без тваіх парцалянавых статуэтак. Зрэшты, і без цябе.

Марыся

Ты... ты ведаеш?

Марта

Ён сам сказаў. Ён ніколі не хавае праўды... ад мяне.

Марыся

Мне ён сказаў, што піша сваю лепшую кнігу.

Марта

Тады гэта сур'ёзна. А яна... Багу...

Марыся

Багуміла.

Марта

Казімір не казаў ёй, што яна замяніла статуэткі?

Марыся

Любіш паіранізаваць? Адыгрывайся на ім!

Марта

Добра.

Марыся

Што ты думаеш рабіць?

Марта

Думаю зрабіць яму падарунак, які б вымусіў яго вярнуцца.

Марыся

І... калі?

Марта

На дзень народзінаў. Заўтра.

Марыся

Заўтра?

(Думае.)

Зусім забылася.

Марта

Не пазнаю цябе. Амадь дваццаць гадоў запар дасылаць яму паштоўкі на дзень народзінаў і забыцца!

(Задумліва.)

Так... А ці не знайшла ты яму замену?

Марыся

Якая ты цынічная.

Марта

Чаму? Я сказала камплімент — ты настолькі вабна выглядаеш, што я не здзіўлюся, калі ты знойдзеш маладзёна.

Марыся

Ты так лёгка разважаеш.

Марта

А што мне рабіць? Я не цнатліўка, не гаротніца, не фрыгідная. І маё сэрца моцна б'ецца, калі я бачу прыгожых мужчын. Няўжо ты думаеш, што я павінна ўсё жыццё пакутаваць ад таго, што муж кідае мяне і сыходзіць да... да...

Марыся

Я таксама больш не пакутую з таго, што ён вяртаецца... Але мне падаецца, што гэтым разам усё складаней... Ён закахаўся.

Марта

Дзякуй, што патлумачыла. Апошні раз ён «закахаўся» пару гадоў таму. Яна была паэткай... розы-бярозы! Дзякуй Богу, я ведаю свайго мужа.

Марыся

Ты не баішся памыліцца?

Марта

Ён жыве ў свеце, які прыдумалі не я і ты. Тут дзейнічаюць законы, грамадская думка і маральны кодэкс. І ён паводзіць сябе вольна настолькі, наколькі яму дазваляюць тыя, хто побач. І ўсё!

Марыся

Так трывіяльна? І ніякай фантазіі? Бунту?

Марта

Калі ён хоча мець палёт фантазіі і лічыць сябе бунтаром, хай выконвае абавязкі перад сям'ёй. Тады яму ніхто не будзе замінаць!

Марыся

Божухна, якія мы... Пакінь мне свой тэлефон. Я паспрабую пагаварыць з Багусяй ці з ім. Яны павінны хутка вярнуцца...

Марта

(запісвае на паперцы)

Так... Дамовіліся... Але... Рантам...

Марыся

Раптам ён вырашыць застацца?..

(Весела.)

Тады мы адзначым тут ягоны дзень народзінаў. А потым ты зробіш яму падарунак.

(Іранічна.)

Ты зробіш яго па тэлефоне ці прынясеш з сабой?

Марта

Я не займаюся сексам па тэлефоне!

Марыся

(смяецца)

Дык твой падарунак... падарунак...

Марта

Не забывайся, што мой падарунак ён можа атрымаць і праз кагосьці. Уяві: рыжыя валасы да сцёгнаў, астатняе — фальбонкі і пацеркі... Яна была нейкай «міс».

Марыся

(здзіўлена)

Гэта несумненна. Ён не разбэшчаны... не да такой ступені...

Марта

Тым лепш!

Марыся

Калі ён згодзіцца, я паверу, што вы вартыя адзін аднаго.

Марта

Мужык ды жонка — лепшая сполка.

Марыся

(задуменна)

Не можа быць... Багуся... Не, калі ён і сыйдзе, то не з-за гэтага.

Марта

Цудоўна! Як цудоўна! Калі клін можна выбіць клінам, то я навучуся гэта рабіць!

Марыся

І ты такая спакойная? Ты гаворыш жахлівыя рэчы і... нічога не адчуваеш?

Марта

Ён выняў маё сэрца... Ты не заўважыла, што ён жыве з двума сэрцамі... А можа быць, і... з тваім?

(Яны робяць спачувальны рух насустрач адна адной.)

Заслона.

Сцэна пятая

Тыя ж дэкарацыі. Раніца. Казімір сядзіць за сталом, раскладае пасьянс. Чутно, як недзе побач напявае Багуся. Яна ўваходзіць, хаваючы нешта за спіной.

Багуся

Мілы... Дарагі... Ты памятаеш, які сёння дзень?

Казімір

Чым жа ён асаблівы?

Багуся

Дзень, у які нараджаюцца Панны.

Казімір

Я не панна.

Багуся

Але ж ты нарадзіўся пад гэтым знакам.

Казімір

Во дурань, цюхцяй; як я мог забыцца? Але і не дзіўна: мне добра, я працую, мяне кахаюць...

Багуся

Так-так, ты — усе кепскія словы разам: дзікун, дурань, шаленец, цяльпук... як яшчэ?.. варона загуменная (*смяецца*). І я цябе віншую з днём нараджэння!

(Падае яму пакет, які хавала.)

Казімір

Што гэта?..

(Зазірае ў яго і вытрасае на стол заклееныя канверты, іх шмат.)

Лісты?

(Багуся цалуе яго.)

Багуся

(шэптам)

Лісты... да каханага... табе добра са мной?

Казімір

(шэптам)

Я дурань, цяльпук...

Багуся

Ты кахаеш мяне?

Казімір

...варона загуменная...

(Ён цалуе яе.)

Забыцца на свой дзень нараджэння! У мяне ёсць магчымасць выправіцца. Мы правядзем вечар ва ўтульным рэстаранчыку. А пакуль... я куплю чаго-небудзь выпіць. Чаго б ты хацела? Лёгкага французскага віна?

Багуся

Калі ты згадаў Францыю, то я параіла б купіць «Напалеон». Адзін глыток, і ты адчуеш смак перамогі.

(Смяецца.)

Казімір

Над сабой?

Багуся

(апускаецца перад ім на адно калена)

Вашамосць, вы скарылі мяне адным позіркам. Вам належыць мая карона *(паказвае)* і сэрца. Прыміце іх ад мяне ў падарунак на дзень народзінаў светлага пана.

(Устае, смяецца.)

Я такая шчаслівая! Ты мой пераможца!

Казімір

Часам мне здаецца, што я — пераможаны... Хаця... як кажуць вялікія, аднолькавае шчасце — быць пераможцам і пераможаным у бітвах кахання.

Багуся

Дык ты кахаеш мяне?

Казімір

Я...

Багуся

Ну!

Казімір

Я... *(па-акторску)* Напалеон запрашае вас на танец.
(Узмахвае рукой.)
Музыку!

Багуся

Зараз.
Яна падбягае да прайгравальніка і ставіць вальс.
Яны робяць некалькі кругоў па пакоі.
...Ты... ты не прачытаеш маіх лістоў?

Казімір

Лістоў? Хочаш, каб я зрабіў гэта зараз?

Багуся

...Не, мілы... Як адчуеш...

Казімір

Разумная дзяўчына. Я так стаміўся: пісаць, чытаць, пісаць, перачытваць. Цяпер трэба проста жыць, радавацца табе, тваім вуснам, рукам, шчырасці, наіву... Ты размаўляла з Марысяй?

Багуся

Сур'ёзна? Не. Яна пазбягае мяне. Ці я яе. Гэта ўсё адно як жывеш у пакоі і чакаеш, што вось-вось пагрукаюць у дзверы ці зазвоніць тэлефон. Яна нагадвае, што маё шчасце нявечнае, бо побач абавязкова жыве няшчасны.

Казімір

(паварочваецца і ідзе да стала, бяздумна, машынальна збірае лісты, складае акуратнымі стосамі)
Марыся?.. Мне здаецца, яна...

Багуся

Казімір, а-а... ты здраджваў...

Казімір

Марце?

Багуся

Марысі. Разумееш, я бачыла альбом, чытала перапіску... я шмат думала над гэтым. Мне здаецца, ты і зараз кахаеш яе.

Казімір

(уражаны)

Я-а... не ведаю.

Багуся

Я разумею. Ты творчы чалавек. Уявім, што на гэты раз ты трапіў у палац Сіняй Барады...

Казімір

Але ў казцы была дзяўчына...

Багуся

(перабівае)

Няважна! Я сказала — уявім. У тваіх руках ключык ад запаветных дзвярэй. Ты не ведаеш — што за імі. Але калі ты адчыніш іх, ты загінеш. Што робіць наша... наш... Ты адчыніш дзверы! Нават у тым выпадку, калі табе скажуць, што за імі тое самае, што ты бачыў раней. Ты не згодзішся! Адчыніць, зазірнуць — вось мэта!

(Горка смяецца.)

Прынцэса, пані Валеўска, Бона Сфорца? Не, такая, як і ранейшыя!

Казімір

Багуся... Багуся. Ты — зусім не такая. Ты іншая.

Багуся

А дзверы былі адчыненыя.

Казімір

Я ж кажу табе: ты не такая, як былыя.

(Падыходзіць, абдымае яе, суцяшае.)

Ты хочаш, каб у дзень нараджэння я плакаў над лістамі і ружамі?

Багуся

Не!.. Ружамі? Ты сказаў — ружамі? Божухна, я забылася купіць... я хацела... Казімір, мілы, не знікай. Толькі «Напалеон» і я! Абяцаеш? Я хутка.

Казімір спрабуе яе ўтрымаць, але Багуся выслізгвае і выбягае. Паўза. Заходзіць Марыся.

Марыся

Казімір! Казімір! Дай я накручу табе вушы!

Казімір

За што?

Марыся

Сорак шэсць — гэта ўзрост сталага мужчыны.

Казімір

У тваім лексіконе цяпер часта гучыць слова «мужчына». Ты спрабуеш сцвердзіцца?

Марыся

Ты зараз такі смешны, бездапаможны, і погляд у цябе зусім не злы... Як ты думаеш, — можа, мне змяніць колер вачэй? Я куплю кантактныя лінзы... Які колер ты любіш? Чорны? Зялёны?

Казімір

Калі я быў дваццацігадовым, мне падабаўся такі, як у цябе вочы... Як банальна гучыць: «калі я быў дваццацігадовым». Калі я быў шчаслівым, я любіў твае вочы, Марыся... Маё прызнанне не зменіць тваіх планаў на бліжэйшыя гады?

Марыся

Не зменіць, калі ты... вернешся дадому.

Казімір

Ты выганяеш мяне?

Марыся

Не. Я рада, што ты здолеў адвесці душу, што ты памаладзеў, што ты здаровы і вясёлы і, можа быць, шчаслівы зараз.

Казімір

Але, калі я з'еду, я буду пачуваць сябе няшчасным.

Марыся

Не больш, чым я сябе.

Казімір

А... тваё спадзяванне... ты больш не пакідаеш яго сабе?

Марыся

(крычыць)

Гэта мая справа! Няўжо табе яшчэ трэба тлумачыць, як мяне прынізілі?!

Казімір

Але хто, Марыся?

Марыся істэрычна смяецца.

Марыся, не трэба так. Не трэба. Я зараз вады... Я не пераношу істэрык.

Марыся

(раптам замаўкае, павольна)

Ты наогул не пераносіш жанчын, якія паказваюць пачуцці: ты не любіш слёз, бо яны паказваюць табе глыбіню крыўды; не любіш крыку, бо ён нагадвае табе аб правах жанчыны; не любіш істэрыкі — як вынік тваіх памылак. А адна з магчымасцяў не рабіць памылак — своечасова сысці!

Казімір

Ты другі раз нагадваеш мне пра ад'езд.

Марыся

Так! Таму што яшчэ ўчора я абяцала Марце пагаварыць з табой ці з Багусяй. І калі я не пазваню ёй сёння — яна вернецца... з падарункам.

Казімір

Яна таксама хоча павіншаваць мяне?

Марыся

Яна абяцае табе тысячу і адну ноч. Наяве.

Казімір

Вандроўка на ўсход?

Марыся

Сапраўды, чаму б табе не паехаць на ўсход: пяскі, драмадэры, саклі, турчанкі пад чадрой ці... гэтыя... казашкі.

Казімір

А яны носяць чадру?

Марыся

Не ўпэўнена. Тым заманлівей даведацца. А мы з Багусяй будзем чакаць ад цябе паштоўкі з джыгітамі на фоне гор. Ці нешта падобнае... Няўжо ты думаеш, што мяне можна кінуць другі раз? Ты можаш страціць галаву, але я не магу страціць цябе!

Казімір

Марыся, што значыць «страціць»? Нашае сяброўства праверана часам!

Марыся

Я... я... кахаю цябе.

Казімір

Не. Ты гэтага не казала.

Марыся

Але я раўную.

Казімір

Гэта нармальна. Я таксама раўную цябе да Ікара. І да Пучынскага. Да абодвух адразу... Прабач мне, Марыся, здаецца, я сапраўды не магу больш тут заставацца. Але Багуся... Яна хутка вернецца. Я не магу сысці, не пабачыўшы яе.

Уваходзіць Марта.

Марта

Вітаю, вітаю! У вас ізноў незачынена. Дарагі, з днём нараджэння!

(Падыходзіць, цалуе яго ў шчаку.)

Ты не паверыш: званю сёння дадому, і што мне кажуць? Прыйшоў адказ з Лондана! Цябе запрашаюць чытаць лекцыі. Ты так марыў пра гэта!

(Глядзіць пераможна на Марысю.)

Казімір

Адказ?.. Лекцыі?.. О, Марта, гэта папраўдзе добрая навіна. Але...

Марта

Ніякіх «але»... Другога шанцу не будзе. Яны дазволілі ўзяць з сабой жонку.

Казімір

Гэта твая тысяча і адна ноч?

Марта

Не разумею, пра што ты гаворыш...

Марыся

Пра Шахеразаду, якую ты абяцала.

Марта

Не слухай яе, Казімір, яна нешта выдумала.

Марыся

Я маю звычку казаць праўду.

Казімір

(гняўліва і амаль разгублена)

Праўду? А ці не можа быць вашая праўда праўдай толькі для вас? Вы хаваеце за словамі свае нізкія пачуцці, незадаволенасць, сваё няўдалае жыццё і расчараванне.

Марта

А як ты хочаш: слізгаць па жыцці, збіраць вяршкі і ніколі не зразумець, што існуюць боль, сум, крыўда... нянавісць?

Казімір

О, гэта было б выдатна: не ведаць ні пра што!

Паўза.

Марта

Што гэта мы, як порхаўкі?.. Збірайся, мы паспеем адсвяткаваць дзень народзінаў дома. Увечары павінны званіць з Лондана.

Казімір

Так хутка?

Марта

Запрашэнне прыйшло даўно. Я не хацела казаць раней — чакала, што ты прыедзеш і гэта... *(пачынае плакаць)* будзе табе... падарункам.

Казімір

Не плач, дарагая. Не плач. Я збяру рэчы.

(Выходзіць.)

Марта

(услед)

Хутчэй, нас чакае машына!

(Марысі.)

Хачу сказаць табе — да сустрэчы, але спадзяюся, што яе ніколі больш не будзе!

(Паварочваецца і рашуча сыходзіць.)

Паўза. Марыся ходзіць па пакоі. Выходзіць Казімір з рукапісам, збянтэжаны, хоча нешта сказаць, але вагаецца. Падыходзіць да стала і нешта піша.

Казімір

Гэта і гэта *(падсоўвае пакунак, дзе ляжаць лісты)* перадай Багусі.

Марыся

Ты нават не развітаешся з ёй?

Казімір

(адварочвае твар)

Не. Думаю, яна хутка суцешыцца. Але яна нагадвае цябе... у маладосці... Магчыма, яна казала праўду: я не варты ні цябе, ні яе.

Марыся

Эх, ты! Гэта не той выпадак, калі прайграеш у карты і хутка суцешышся... Можа, яна была адзінай жанчынай, якая іграла толькі сябе! Ды вось утрымаць цябе ўдаецца толькі тым, хто іграе чужую ролю. Чужую!..

Казімір

(нахіляе галаву, з пафасам)

Я буду глыбока нешчаслівы з таго, што быў шчаслівы ў мінулым.

Ён падыходзіць да Марысі, цалуе ёй руку. Сыходзіць. Марыся кідаецца на канапу, сціскае галаву рукамі. Доўгая паўза. Забягае Багуся з букетам ружаў.

Багуся

Казімір!.. Марыся? Ён сказаў табе, што збіраецца запрасіць нас на вячэру? Ты можаш пазваніць Ікару.

Марыся

Я нікому не буду званіць.

Багуся

(ходзіць з букетам, шукае)

Казімір!

(Марысі.)

Ты надзенеш сваю найлепшую сукню, заколеш у валасы ружу і будзеш самай прывабнай цётачкай у свеце... Казімір!

Марыся

Яго няма.

Багуся

Тады пачакаем. Казімір абяцаў прынесці «Напалеон». Я так забегалася, што пяць кропель каньяку мне не пашкодзяць. Фу-у... На!

(Аддае кветкі Марысі, сама сядае.)

Пастаў іх у вазу. Як думаеш, можа, нам з'ехаць у другую краіну? Толькі што нейкі мужык схапіў мяне за... сзаду. Ды яшчэ аблаяў. І ўсё адразу! Не выношу брыдкаслоўя! Каб не расплакацца, я падумала: можа, нам сапраўды з'ехаць у Францыю? Хамаў там няма. А калі ёсць, то я іх не зразумею... А можа, у Польшчу? Польскай мовы я таксама не ведаю... Дзе, ты сказала, Казімір?

Марыся мацае ружы, потым разглядае іх.

Марыся

Багуся... ты купіла ружы без калючак?

Багуся

(смяецца)

Я папрасіла крамніцу зрэзаць усе калючкі! Да апошняй!.. Калі я закончу вучобу, то пачну выводзіць ружы — без іголак. Як ты думаеш, мне гэта ўдасца?

Марыся

Ён прасіў перадаць табе гэта *(паказвае на пакунак)* і гэта *(перадае цыдулку)*.

Багуся

(зазірае ў пакет)

Ён вярнуў мне лісты?

(Чытае цыдулку.)

Ма... рыся... што гэта? Што?

Марыся

Ён перадаў табе на развітанне.

Багуся

Ён піша... піша... што ён кахае... цябе.

Рэзка звоніць тэлефон. Гудкі...

Заслона

1994

У ПРЫМРАК САМОТЫ, У ЗВАБНЫ АДЧАЙ...



Маёй сяброўцы С. Р.

Палова больш за цэлае.
Выслоўе Піттака з Міцілены

Перамагчы сябе самога — гэта найлепшы сродак для таго, каб не быць пераможаным.
Старажытнаіндыйскі афарызм

I

«Я немаладая, хворая жанчына», — падумаўшы гэтак — вяршыня самапрыніжэння! — я ў дзесяты раз пачала вымяраць свой пакой крокамі, няспешліва набліжаючыся да кутоў, мінаючы светлую пляму ля вакна і зноў вяртаючыся да парога, як хатні сабачка, што чакае з'яўлення гаспадароў. Але маё чаканне было марным. Не трэба суцяшэнняў! Вы — шчаслівыя, багатыя і прыгожыя — аднойчы можаце апынуцца ў такім самым становішчы. Я не жадаю вам зла, далібог! І, пэўна, я люблю вас, мае суайчыннікі, больш, чым вы думаеце. Але нашто вам гэта ведаць? Хіба для таго, каб паспачуваць? Дык я не хачу бачыць ані спачувальных поглядаў, ані ўсмешак, якімі адорваюць няшчасных кабет. Таму гэты выхадны я правяду дома адна.

Пэўна, мне трэба было адразу ж назвацца. Яніна Луцэнка. А цяпер зірніце на свае кніжныя паліцы... Так, гэта я аўтар кнігі «Прыгажосць цела і душы. Энцыклапедычны дапаможнік для жанчын». Мне трыццаць дзевяць гадоў і я добра выглядаю, таму што жыву па прынцыпах, выкладзеных у маім дапаможніку. Я захавала яшчэ звычку падабацца ўсім без выключэння мужынам: высокім, кульгавым, абаяльным, грубым, асабліва тым, хто шукае часовы прытулак. Я валодаю рэдкім дарам — падбіраць хворых жывёл і кінутых мужчын.

Калі мне было дваццаць пяць, я пабралася шлюбам з чалавекам нашмат старэйшым, вядомым сцэнарыстам, інтэлектуалам. Ён зрабіў з мяне такую, якая я ёсць і сёння. А ў трыццаць я пазнаёмілася з адным філосафам і пераехала да яго. Ягоных філасофскіх

разваг хапіла на тое, каб падняць мяне ў нябёсы і скінуць на волкую зямлю (калі мы рассталіся, быў красавік). З таго часу я жыву адна, вызначаюся прыстойнымі паводзінамі, добрым норавам, шалёнай працаздольнасцю і сумнымі вачыма. Працую рэдактарам у буйным выдавецтве, дзе адказваю за выпуск энцыклапедый і тоўстых дапаможнікаў. Я сама пісала кнігі і раіла жанчынам, як заставацца каханымі і жаданымі. А ўсё таму, што падзяляю думку Ван Гога, які лічыў жыццё без кахання грэшным і амаральным.

За сваё «дарослае» жыццё я перажыла пэўны час адзіноты, калі даводзілася стаяць перад выбарам: крочыць далей у пошуках роднай душы ці выкінуць белы сцяг перад тым, хто ў гэтую хвіліну побач і толькі чакае часіны «ашчаслівіць» мяне ў ложку. Мае разважлівасць і знешняя халоднасць адпіхваюць адчайных пасягальнікаў. Часам мне даводзіцца злавацца за гэта на сябе. А як бы хацелася сёння выцягнуць новы абрус, сервіраваць стол для дваіх, паставіць любімыя келіхі для шампанскага... і гуляць... гуляць словамі, поглядамі, усмешкамі, прымаць спакуслівыя позы на шырокай канапе і... трымаць палкага госця на адлегласці.

Я ўпершыню пашкадавала, што не дазволіла прыйсці Лявону. Магчыма, увечары мне ўдалося б стварыць рамантычны антураж і расшукаць у саракапяцігадовым шатэне новыя вабныя рысы, акрамя таго, што ён незалежны і паглядны. Я ўявіла радасную працэдуру сустрэчы, нядоўгую вячэру і наканаваную развязку. Магчыма, мы змаглі б стаць блізкімі; праўда, усе ранейшыя блізкія мужчыны заставаліся маімі ненадоўга. Я не люблю зацягнутых раманаў — з-за іх шчаслівага канца. Я ж асоба вопытная, далікатная і суровая, якая ўсе пачуцці вымярае праз налёт трагічнасці. У маім разуменні гэта дадае жанчыне магчымасць заставацца загадкавай і таямнічай.

Але ці так гэта істотна, калі на гадзінніку семнаццаць, а на скамечанай падушцы — кінутая сентыментальная кніжка, героі якой перасталі мяне цікавіць пасля першых старонак?

Я вярнулася да магнітафона і паставіла касету. Знерваваная і раздражнёная, пайшла на кухню, каб зрабіць сціплую вячэру з кансерваў, але нечакана зазваніў тэлефон. Я хуценька прысела за столік і зняла трубку.

— Янечка, ты не занятая? — замест прывітання вымавіла прыяцелька.

— Не, — адказала я і аддала некалькі вольных хвілін слязліва-стомленаму аповеду пакрыўджанай жанчыны. Відочна, яна чакала спачування.

— Ты ж разумееш, я не люблю, калі не лічацца з маімі пачуццямі, — працягвала Лілея. — А ён... ён...

Я апярэдзіла яе словы хуткагаворкай:

— Ну хочаш, я да цябе прыеду? Хочаш? А можаш сама прыехаць да мяне і застацца нанач.

Ці то яе напалохала перспектыва пакінуць мужа аднаго, ці то вырашыла пражыць сварку сам-насам з крыўдзіцелем, але ад запрашэння адмовілася.

Неспадзявана пазванілі ў дзверы. «Іду!» — гучна сказала я і развіталася з сяброўкай. Няхай думае, што я больш не адна! Паднялася і праз напаўцёмны пакой пайшла да дзвярэй, надаўшы твару адценне раўнадушнага спакою, хоць сэрца затрымцела.

— Вы адна? — спытаўся Сяргей. Я кіўнула і заплюшчыла вочы. Гэты ўсюдыісны хлопчык абавязкова заўважыць шэрыя кругі пад вачыма і мой непрыглядны твар. Пасля хвіліннага маўчання ён спытаў: — Можна да вас?

Я адступіла на крок.

— Вы сумуеце? Можна я пабуду з вамі?

У яго была манера размаўляць пытальнымі сказамі і заўважаць усё, што прыхоўваеш ад іншых.

Для таго, каб быць зразуметай, трэба патлумачыць нашыя з Сяргеем адносіны. Гэты пятнаццацігадовы юнак — мой сусед па пад'ездзе. Нашыя адносіны былі пабудаваныя на адмаўленні ўсялякіх фармальнасцяў і прыстойна-абыякавых межаў. Так жыуць побач з анёламі.

Ён крытычна агледзеў пакой і прысеў на канапу, дзе не так даўно я ўяўляла сябе ў ролі спакусніцы.

— З якімі навінамі прыйшоў да мяне, прынц? — спыталася, як толькі паспела прыбраць падушку і кнігу, на якія красамоўна і хітравата паглядаў юнак. Сяргей незадаволена хмыкнуў і прамовіў:

— Сёння мяне завуць Дон Кіхот.

— А мне як загадаеш звацца? Санча Пансам?

З ягоных дванаццаці гадоў, з часу нашага знаёмства, мы гуляем у гэтыя гульні. Ён быў Шчаўкунком, Чыпалінам, дзедам Мазаем, Пятром Вялікім і процьмай іншых герояў — у залежнасці ад настрою. На жаль, мне не ўласцівы акцёрскі талент, бо аднойчы я абавязкова адчула б сябе няўдалай актрыскай, выкінутай з тэатра, якая імкнецца перанесці хваравітыя амбіцыі на жыццё. А за адданага прыхільніка выбірае дзіця, якое ні ў чым не можа ёй пярэчыць. Аншлаг! Брава! Засталося толькі паставіць лавы ўздоўж сцен.

— Я Дон Кіхот, частуйце мяне чаем.

— Калі ты рыцар, дык мог запытаць: ці не занятая твая дама якой-небудзь справай?

Я не наважылася зірнуць яму ў вочы, каб не ўбачыць крыўды: ён так жа лёгка мяняе настрой, як імёны.

— Іду ставіць гарбатнік, — дадала міралюбіва і скіравалася на кухню. — Есці хочаш?

Мы ўжо даўно прызвычаіліся да такіх стрэч. У адрозненні ад маіх прыблудаў (катоў, сабак і істот супрацьлеглага полу) гэты ў любы момант мог сысці, ніводнага разу не выклікаўшы слёз і расчараванняў. Мілае дзіця проста расло побач, як кветка, у промнях маёй дабрыні і разумення. Пэўна, у нечым я замяняла яму маці, вядомую актрысу, якая часта ад'язджала на гастролі. З ім я пачувалася дабрадзейнай. Але, як казаў Паскаль: «Хочаце, каб людзі паверылі ў вашу дабрадзейнасць? Не хваліцеся ёю».

Зрэшты, я проста намагаюся запэўніць вас, што не маю парокаў, апісаных Фрэйдам: салодкай цягі да салодкіх хлопчыкаў. І скірую свае абдымкі хутчэй да Лявона, чымся... Але гэты твар, адухоўлены новай роляй, яскравыя светлыя вочы, тонкі завостраны нос, гэтая цнатлівая ўсмешка выклікалі ўва мне пачуцці. Не сексуальныя, бо я магла прылашчыць яго з той жа пяшчотай, з якой лашчыла б кацяня. А ягоны лягусенькі цалунак выклікаў бы ў мяне цноту.

Не зусім так, як марылася, я пачала сервіраваць стол, даручыўшы рыцару корпацца з вострымі прадметамі: адчыняць бляшанкі, рэзаць хлеб. Мы вячэралі пад музыку Баха, прытойвалі ўсмешкі і абменьваліся фразачкамі.

— Прызнайцеся, Яня, вы не чакалі сёння рыцара?

— Я была ўпэўнена, што ў наш час з'явіцца свой Дон Кіхот, але не думала, што ім будзеш ты.

— О ясная панна Яніна, хіба я не падобны на таго, хто *ад волі нябёсаў нарадзіўся ў наша жалезнае стагоддзе, каб уваскрасіць залатое*? — І без тэатральнай фальшы дадаў: — Я той, каму лёсам прызначана зведаць небяспеку, вялікія ўчынкі і смелыя подзвігі.

— І ўсё гэта дзеля сябе самога? Ці ў рыцара з'явілася Дульцынея?

Сяргей не адказаў. Нашу «змястоўную» размову перарваў тэлефон. Я ўзяла трубку, далікатна пададзеную хлопчыкам, і ўважліва зірнула на яго.

— Скажыце, што гэта сястра... а вас самой няма дома, — настойліва шаптаў сусед. Да кепскіх звычак, калі яны былі, дадалася яшчэ адна — рыцар не любіў, калі нас турбавалі.

Я слухала і згодна ківала галавой. Некаторыя мужчыны проста створаны для таго, каб іх падманвалі. Я не магла тлумачыць па тэлефоне пра свае цнатлівыя забаўкі і, не міргнуўшы, схлусіла:

— Збіраюся ў тэатр. Так, спазняюся.

Лявон папярэдзіў, што перазвоніць пазней, і я паклала трубку.

— Ты невыносны хлус, — зласліва вымавіла я. Як і трэба было чакаць, Сяргей не пакрыўдзіўся. Тады я зрабіла выгляд адначасова абражаны і гняўлівы.

— Мы не паспелі выпіць гарбаты, — нагадаў Дон Кіхот і ўзяўся за імбрычак. Я пачала падазраваць, што маленькаму крыўдзіцелю

падабаецца бачыць мяне раз'юшанай. Гэтым ён, як дарослы мужчына, пацвярджае сваё права на мяне: утрымлівае ад вольнасцяў і не дазваляе рабіць глупстваў.

Зрэшты, з чаго я так вырашыла? Усё атрымалася ненаўмысна. Я шчыра пасміхнулася, атрымала ў адказ белазубы выскал і, урэшце, вясёлы бесклапотны смех.

Мы развіталіся позна. Ля самых дзвярэй Сяргей сказаў:

— У тым выпадку, калі вас, святлейшая панна, спытаюць: «Ці ёсць на свеце рыцары?» — можаце ўпэўнена адказваць: «Ёсць яшчэ *Рыцар Засмучонага Вобліку Апошні*».

Я прычыніла за ім дзверы і, ужо лежачы ў ложку, падумала, што магла б мець сына, калі б засталася з мужам-сцэнарыстам... ці з філосафам... ці калі б проста хацела мець дзяцей. І доўга не магла заснуць, дыхаючы халаднаватым начным паветрам, насычаным стомай, вільгаццю і натхненнем. Такім жа, якім бывае паветра горада, дзе жывуць толькі трыццацідзевяцігадовыя жанчыны, ахопленыя чаканнем донкіхотаў. Сталых і верных.

II

— Ты сама ведаеш, ён бывае проста невыносным, — тлумачыла Лілея. Я пазяхнула.

— Можа, кінуць яго? — параіла я і зразумела, што зрабіла глупства. Гэтая даматурка не ўяўляе сябе без Вінцэся.

— Ён, як малое дзіця, не ведае, што робіць, — апраўдвала сяброўка свайго мужа. А я прыгадала дзіця, якое разважае, як дарослы, дзіця, якое здагадваецца пра мае думкі раней, чым яны з'явяцца. І яшчэ танклявую доўгую руку, якая стане надзейным апірышчам той, каму ён ахвяруе яе разам з сэрцам. Але, падлавіўшы сябе на сентыментальнасці, я зразумела, што перастала ўважліва слухаць Лілею.

— Ты мяне чуеш? — каторы раз паўтарыла яна. — Я пытаю: як Лявон? Ты дасі яму шанец?

— Напэўна.

— Не вагайся. У тваім ўзросце гэта можа стаць апошняй песняй.

— Не думала, што ў тваім узросце можна стаць нетактоўнай.

— Ат жа, сама разумееш. Ён закаханы ў цябе.

Я не дала веры гэтаму сцвярджэнню, але мяне забаўляла імкненне прыяцелькі рашыць мой лёс.

— Ён закахаўся ў цябе, мне Ева сказала, — па-змоўніцку дадала Лілея.

Ева — яшчэ адна мая сяброўка. Якраз яна і пазнаёміла нас з Лявонам, калі перайшла працаваць з нашага выдавецтва на два па-

верхі ніжэй, туды, дзе выпускалі падручнікі. Ён меў пасаду галоўнага рэдактара, добры аклад і халасцяцкую кватэру. Ева не стала вызнаваць прычын ягонай адзіноты мо з-за таго, што сама ладзіла сваё шчасце, і дала мне самой прайсці гэткі ж шлях.

Лілея ўспрыняла мой смех за добры знак:

— Самае галоўнае, у яго няма канкурэнтаў. А ў цябе ёсць. Многія мараць апынуцца на тваім месцы, і іх раздражняе, што ён надае табе такую ўвагу. Думаеш, ніхто не здагадваецца, каму ён носіць кветкі?

На самой справе Лявон не прыхоўваў прыязнасці і некалькі разоў падымаўся ў мой кабінет. Але кветкі ён прыносіў на спатканне, калі мы сустракаліся ў кавярні. І, здаецца, ніхто з нашых агульных знаёмых не бачыў нас сам-насам.

Відавочна, Лілея ганарылася такой роляй і занадта адкрыта выяўляла гэта. Яе голас крыху задрыжаў.

— Лілея, досыць на сёння. Я змерзла. Ты перапыніла мяне, калі я ішла ў душ.

Яна са шкадаваннем заціхла, потым прамармытала: «Ну добра, перазваню». І паклала трубку. Я выцягнулася ў ложку, разумеючы, што ізноў выратавала хлусня. Але лепш вытрываць хвілінны ўкол сумлення, чым марнаваць гадзіну на бязмэтную балбатню. Ці хацелася мне сказаць ёй, што я сама пачынаю сур'ёзна ставіцца да Лявона? А раптам гэта толькі ранішнія прымхі і ноч шчымлівай адзіноты гавораць за мяне? Я ўзгадала, як прачнулася пад раніцу і востра забажала адчуць побач цвёрдую мужчынскую руку, дотык пляча, пахрапванне. «Я стала сентыментальнай, — падумалася тады. — Засталося зрабіцца паблажлівай і дасягальнай». Я зрабіла змушана-вясёлую грымаску свайму адбітку ў люстэрку і пачала рабіць гімнастыку.

Вярнуліся бадзёрасць і моц, з'явілася жаданне ўзяцца за рукапіс і працаваць — да самазабыцця... Давялося адагнаць упартыя думкі і згатаваць каву. Я не аматарка танізуючых напояў, але па выхадных у мяне свой рытуал: я п'ю турэцкую каву і выпальваю адну цыгарэту «EVE». Падганяю жыццё пад свой густ, так блазан-мастак трымае адну карціну, не давяраючы яе гледачу, і ходзіць у майстэрню, каб атрымаць насалоду ад перажытага прагляду; так паэт піша верш для неіснуючай каханай і ўсё жыццё хавае яго ад жанчын.

Цалюткімі тыднямі я была беззаганнай, безабароннай, жаноцкай і толькі ранішнімі хвілінамі ў нядзелю ператваралася ў сучасную амазонку, прыхільніцу ваяўнічага матрыярхата, хатнюю жанчыну-вамп са здаровым румянцам на шчоках і цыгарэтай у вуснах.

Я так лёгка падпарадкоўвалася сваім жаданням, таму ведаю, чаму мяне не падпарадкаваў сабе нехта іншы. Падобна, што ніхто і

не намагаўся гэтага зрабіць Мужчыны, з якімі я жыла раней, нечакана набывалі падабенства, калі пачыналі змагацца супраць майго жадання заставацца вольнай. Спачатку яны паводзілі сябе як ваяры, потым спрабавалі расчуліць, а пазней апускалі рукі. І мы развітваліся! Хто ж па сваёй волі пойдзе ў пастку? Упэўнена, што шлюб без кахання — добраахвотная ахвяра, тое, з чаго я буду пакутаваць і на смяротным ложку. Але, калі б Бог хацеў пазбавіць нас памылак, ён не стварaў бы мужчын. А як вучыць нас Вялікая кніга: толькі праз памылкі мы ідзём да пакаяння. Адно гэта сведчыць аб дабрадзейнасці цудоўнай паловы чалавецтва!

Мы сустрэліся з Лявонам па абедзе і ён павёз мяне ў рэстаранчык. Спатканне з ім падалося будзённым, без аніякай праявы рамантызму, і таму, калі мы пазней ехалі ў ягонай машыне, я намагалася думаць пра ціхмянага героя-рыцара, які вось-вось адкрыецца перад сваёй каханай. І гэтым скорыць яе сэрца. Я нават апусціла шкло, каб вецер мог вольна гуляць з валасамі, змяняючы прычоску на свой густ. Былі апошнія дні зімы, у прыродзе ўсё выдавала на блізкі надыход цяпла, і, калі б зараз мы з Лявонам ехалі да мора, якое я так любіла, а не ў мой халодны ад адзіноты дом, магчыма, мне б удалося пакахаць яго. Адразу і незваротна. З чаго можна зрабіць выснову: атачыце жанчыну дэкарацыямі рамантызму — і яна ваша!

Мне так і не ўдалося надоўга захаваць светлы настрой, і ўжо пад'язджаючы дадому, я зразумела, што паддаюся меланхоліі. Лявон спыніў машыну:

— Я зайду да цябе?

Не заставалася анічога, як пагадзіцца. Мы падымаліся ў ліфце марудна, з ненатхнёнымі выразамі твараў, — нібы апынуліся на рэдакцыйнай планёрцы. У кватэры мы паспрабавалі размаўляць на сур'ёзныя тэмы, і гэта ненадоўга адцягнула нашыя думкі ад разваг: «Што далей?» Але ў нейкі момант мы з Лявонам змоўклі.

— Мне можна застацца?

— Усё залежыць ад цябе.

Ён падышоў і пацалаваў маю руку. Сітуацыя набывала двухсэнсоўнасць: мы былі гатовыя зрабіцца блізкімі. Я чакала пацалунка, ён — парыву. Але калі доўгі час ты адна і маеш да таго ж чуйнае сумленне, праз якое ўзвышаецца тваё «я», дык не можаш дараваць сабе дробных памылак. Я пачырванела і вырашыла адцягнуць развязку. Магчыма, ён хутка скажа «да пабачэння», «дзякуй за ўсё», сыдзе велічна-пакрыўджаны, і тады — на вастрыі няздзейсненага — я змагу разабрацца ў сваіх адчуваннях.

— Я згатую каву, — выціснула з сябе, хаця на волю ірваліся адначасова толькі два словы: «так-не».

— Выдатна, — здалося, мая прапанова дадала Лявону надзеі.

— Пачакай тут.

Ён нарэшце адпусціў маю руку і зручна ўладкаваўся ў фатэлі.

Поруч, на століку, ляжалі старонкі будучай кнігі (учора, пасля адыходу Сяргея, я паспрабавала працаваць над рукапісам).

— Ты дазволіш паліць у пакоі?

Я прынесла папяльнічку — адзіную фрывольную рэч у доме: яна адначасова нагадвала разрэзаны яблык і частку цела, уласцівую як Адаму, так і Еве. Я паставіла яе перад Лявонам і хутка вярнулася на кухню, каб прыхаваць смяшлівасць; па шчырасці, я баялася заўважыць у маім прыхільніку хаця б кроплю фарысейства. Шкада, што мы не засмяяліся разам, — смех яднае людзей. Вясёлы, гучны, яскравы — ён адкрывае душу, робіць яе безабароннай, як у той показцы, дзе сонца распранае жанчын.

Мы пілі каву і спадціху прыглядаліся адно да аднаго, робячы выгляд, што ўважліва слухаем хіт-парад па прыёмніку. Мы нават лёгка паспрачаліся — хто будзе ў лідэрах. І толькі ў тыя хвілі, калі сустракаліся поглядамі і заўважалі іранічна-смяшлівыя агеньчыкі, станавілася зразумела: мы не зусім чужыя. Я запаліла пры ім, ён падсунуў папяльнічку.

— Хочаш, я прынясу чаго-небудзь выпіць?

— Лепш згадзіцца, чым потым шкадаваць.

— Чырвонае і лёгкае або мацнейшага?

Паціскаю плячыма, але кажу:

— Чырвонае будзе лепш. Калі хочаш дадаць паэзіі да маўчання, — вазьмі «Парнас».

Мне падабалася гэтае віно за спалучэнне ўзнёсласці, загадкавасці, расчаравання і багемнай прывіднасці.

Лявон выйшаў хутка, пацалаваўшы мяне, як перад доўгім расстаннем. Я не праводзіла яго да дзвярэй — гэта выглядала б сама меней наіграным.

Я ўладкавалася ў фатэлі, апусціла падбароддзе на калені. Зацягнулася цыгарэтай, але ледзь не папярхнулася ад нечаканага званка... Можна было адразу здагадацца і не палохацца — на парозе стаяў Дон Кіхот.

— Вы паліце? — замест прывітання вымавіў нахабны рыцар. — Хутка ў вас з'явяцца зморшчыны, а зубы пажаўцеюць, і тады ніхто больш не пакахае вас.

Пасля гэтай хуткагаворкі Сяргей павітаўся і, не пытаючы дазволу, зайшоў. Ён агледзеў пакой, пустыя кубачкі, папяльніцу з недапалкамі, фатэлі, прысунутыя адзін да аднога. Не ведаю, чаму, але я адчула сябе ціхмяна-пакорлівай пад сур'ёзным поглядам юнака. І калі б удалося перамагчы гэтае пранізлівае адчуванне, якое прыніжала маю годнасць, — магчыма, я б перамагла ў будучай вырашальнай барацьбе.

Сяргей сеў на тое ж месца, дзе перад гэтым я бачыла Лявона. Ён знерухомеў, толькі пальцы моцна сціскалі драўляныя падлакотнікі; некалькі хвілін я назірала, як марудна ішоў адток крыві ад кончыкаў пальцаў, як ягоны твар станавіўся бледны, бясколерны. Вочы хлопца паступова патухалі, цела нібы дранцвела... Я спалохалася толькі ў тую хвіліну, калі ён нечакана і зусім натуральна пачаў спаўзаць з фатэля, апынуўся на падлозе і сутаргава — спачатку ледзь-ледзь, а потым моцна і рытмічна — заторгаўся. Ён хапаў паветра так прагна і хваравіта, так задыхаўся і хрыпеў, што мной авалодала паніка. Я кінулася да Сяргея, апусцілася побач, бязладна перапытваючы: «Што з табой? Што здарылася?» Расшпіліўшы верхнія гузікі на ягонай кашулі, паспрабавала масіраваць сэрца. Заставалася выклікаць «хуткую», але ў гэты момант зайшоў Лявон. Ён разгублена прыглядаўся і нічога не пытаў, чым выклікаў мой хвілінны гнеў і абураны загад:

— Дапамажы!

Мы ўдвох паклалі хлопца на канапу; ён усё яшчэ быў бледны, але дыхаў спакайней; а калі Лявон прапанаваў выклікаць доктара — адплюшчыў вочы, адмоўна паківаў галавою і прашаптаў: «Не». Я села побач і ўзяла яго за руку — халодную, танклявую, пяшчотную. Ён затрымаў мае пальцы і паціснуў іх. Ледзь-ледзь...

Лявон чакаў тлумачэнняў, але не пачуў іх. Ён прынёс з кухні кілішкі і наліў мне віна, якое я пракаўтнула адным глытком.

У роце застаўся даўкі прысмак, не вельмі прыемны, нечаканы.

— Вазьмі лёд у маразілцы... і адчыні вакно, — Лявон зрабіў гэта нязмушана, нібы адчуў сябе гаспадаром калі не маіх пачуццяў, дык майго цела. Ён з лёгкасцю знаходзіў патрэбныя рэчы: шклянкі, ручнік, штопар.

Другі келіх «Парнасу» я выпіла марудна, маленькімі глыткамі, затрымліваючы віно ў роце. Мне было ўсё адно: застанецца Лявон ці сыдзе. Другое нават усцешвала. Сяргей ляжаў ціхі, шчокі — бледны ружанец; і я злавіла сябе на жаданні сцерці з ягонага ілба кропелькі поту сваімі перасохымі вуснамі, а потым... потым — напаіць яго прама з рота маленькімі глыткамі чырвонага віна. Магчыма, гэта прачнулася ўва мне ад бясконцага даверу і адданай цеплыні хлапечай далоні з доўгімі цвёрдымі пальцамі, што ўсё яшчэ час ад часу варушыліся ў маёй руцэ.

Лявон пачаў нервавацца, хадзіць па пакоі, рабіць яскравыя знакі, каб перамовіцца сам-насам. Жывая скульптура Марыі з дарослым дзіцем больш не ўражвала. Нарэшце ён наважыўся адвесці мяне на кухню, дзе пачаў шэптам выпрошваць тлумачэнняў.

— Яніна, гэты хлопчык... хто ён?

— Сусед.

— А ты не можаш паклікаць ягоную маці?

Гэтая думка прыходзіла да мяне раней, але поціск юначай рукі па-змоўніцку апярэджваў, стрымліваў...

— Можа, яе няма дома? — ухапілася за саломінку.

— Даведайся.

Я не мела права вагацца: Лявон мог няправільна зразумець.

— Добра.

Але замест таго, каб выйсці на лесвіцу, я вярнулася да Сяргея і папярэдзіла-запытала:

— Я паклічу тваю маці?

Добра, што я стаяла ўшчыльную і Лявон не змог пабачыць страх, які лёгка чытаўся ў анёльскіх вачах.

— Як хочаце.

Імгненна страх змяніўся на пакорлівасць, абыякавасць, а мая нерашучасць падмацавалася шкадобай.

— Як пачуваешся?

— Добра. Можна я пабуду тут?

Зрэшты, калі б я для прыліку параілася з Лявонам, ён гэтак жа, для прыліку ўхваліў бы маё рашэнне — і тады б адчуў, што патрэбны мне. Але я не праявіла еднасці і тым самым падкрэсліла незалежасць і жаданне захаваць сваю волю... Пакуль магла...

Нашая дыскусія на кухні скончылася тым, што Лявон апрануўся, трагічна пацалаваў мяне ў лоб і сышоў.

Праз хвіліну я пачала злавацца на «гідкае качаня», якое не дазволіла мне затрымаць у руках сціплую сініцу. «Гідкае качаня», — прашаптала я.

— Што? — перапытаў Сяргей.

— Ты — гідкае качаня, — уголас пацвердзіла я і паправіла на ім коўдру. Праз хвіліну ён спаў ці прыкідваўся, што спіць, і толькі далікатная ўсмешка і дрыжанне вуснаў выдавалі ў ім цярплівую мудрасць усёведання.

III

«Часам трываласць даходзіць да той мяжы, калі яе можна параўнаць з глупствам», — гэтак Ева ахарактарызавала паводзіны Лявона, калі я распавяла ёй пра апошнюю сустрэчу. Здавалася, што да іншай разумнай высновы яна даходзіць сама, а потым — Шамфор, Авідзій, Цыцэрон... Ева валодала не такім ужо і рэдкім дарам павучаць іншых, і месца загадчыцы аддзела па выпуску падручнікаў падыходзіла ёй найлепш.

Я пакорліва ўздыхнула. Ева паднялася да мяне на гарбату, і мы ўжо хвілін дваццаць абмяркоўвалі мае нядаўнія прыгоды, больш падобныя на фінал у аморфнай п'есе. Яна папрасіла перадаць Сяр-

геевай маці, каб тая параілася з псіхолагам. «Падлеткі губляюць прытомнасць — гэта не дзіва, але на тое павінны быць свае прычыны: перагрузкі, стрэс, недахоп вітамінаў... А можа, ён хворы?» — Ева гатовая была паставіць дыягназ завочна, і я зазлавалася на сваю шчырасць. І тон, і твар сяброўкі выдаваў спачувальнасць: «Мы так перажывалі за цябе, так дапамагалі, а ты нават не змагла атрымаць і кроплі належнай пяшчоты...»

— Наступным разам не нарабі глупстваў.

Пэўна, калі б у нас усё атрымалася з Лявонам, яна б сказала:

— Наступным разам затрымай яго назаўсёды.

Каб Ева не была маёй сяброўкай, дык пачула б у адказ:

— Не твая справа.

Але я прамаўляла інакш і даволі дураслівым тонам:

— Я ведаю, што вы з Лілеяй клапоціцеся пра мяне, даяце разумныя парады, за што я вам вельмі ўдзячная. Але я не веру ў шчасце, якое гарантуюць шлюбныя агенцтвы.

Ева пачала развіваць тэму шчасця: што яно даецца тым, хто змагаецца за гэта, а такіх пасіўных, як я, яно пазбягае, каб не ператварыцца ў няшчасце... Яна так доўга балбатала, што нарэшце згубіла выснову новапачатай фразы і сціхла, неадрыўна гледзячы ў поўны кубак астылай гарбаты. Мне стала смешна, бо мая прыгажуня Ева, прапануючы інтрыжку з некаханым мужчынам, сама была не супраць завесці каханка, каб жа ёй толькі ўдалося перамагчы сваё сумленне! Яна не казала, што не задаволена мужам, ды спрактыкаванае вока не падводзіла ні мяне, ні Лілею. Я ўявіла яе ў празрыстай белай кашулі ў абдымках мужчыны з гатычным торсам і тварам Лявона. Яны былі б добрыя каханкі. Я адагнала фрывольныя думкі і пачаставалася пірожнымі — спакусліва-лёгка-салодкімі — найлепшымі з тых, што выпякала Ева.

Не ведаючы прычыны маёй весялосці, сяброўка перадала мне яшчэ адно пірожнае і шчыра заўсміхалася. Праз колькі хвілін мы ўжо забыліся на сваю размову і працавалі: яна ў сваім кабінеце, я — у сваім.

Наступныя дні міналі аднастайна, адзінае, што радавала, — зіма скончылася не адлігай і брудам, у размытых пастэльных колерах паветра і неба зацінькалі птушкі жаданняў. Кожную раніцу я ўважліва ўглядалася ў люстэрка, якое паказвала адно і тое ж, — пругкае цела і вабны твар. Вочы гарэлі агнём — тым, які прыцягвае мужчын, а не тым, які сведчыць аб шчаслівай задаволенасці.

Пэўна, дзень-другі я змагу яшчэ адмовіцца ад сустрэч з Лявонам, але надыдзе момант, калі тлумачэнні пададуцца проста смешнымі. Я не магу ўвесь час жыць у альтанцы дзявочага рамантызму; сакавіцкая поўня друганоч скіроўвала ў маю спальню промень, дзе ён змешваўся з ценямі і ператвараўся ў дзяркач для гуллівых вядзьмарак.

І калі Лявон патэлефанаваў наступным разам — мой голас сакатаў, вурчэў, пералiваўся самымі пяшчотнымі гукамі скрыпак і флейтаў.

А назаўтра адкрывалася Міжнародная кніжная выстава і, адбыўшы ўрачыстую частку, мы падняліся ў банкетную залу. Лявон тактоўна папытаў: ці хачу я, каб нас бачылі разам? Я дала той адказ, якога ён чакаў. Мы былі задаволеныя сабою, як два ганчакі, якіх узялі на паляванне. У гэтым натоўпе розных людзей мы знайшлі еднасць. Ён узяў маю руку і прасунуў пад свой локаць, раз-пораз прыціскаючы да сябе, калі даводзілася абысці гаваркую купку. Я апранула новы элегантны строй колеру халоднага малахіту, тканіна была добрай якасці — мяккая на вобмацак, і фасон падкрэсліваў пяшчотную бледнасць незагарэлага твару і шыі. Я падабалася сабе і яму.

— Колькі ведаю Лявона, ён ніколі не выглядаў такім шчаслівым, — шапнула мне Ева. Мой інстынкт уцёкаў знік, саступіўшы месца інстынкту самазадавальнення: пачуцці, якія чаргуюцца, на жаль, хутчэй, чым поры года. Мне захацелася трымаць у руках невялікі пук пралесак, і я сказала пра гэта Лявону. Ён нахіліўся і пацалаваў мяне ў шчаку. Мы пілі шампанскае, размаўлялі са знаёмымі, жартавалі, разыходзіліся пагаварыць, сустракаліся, дакраналіся адно да аднаго, але ўва ўсіх нашых рухах, поглядах, словах адчувалася нецярплівасць, зразумелая — непрабачальны наіў — толькі нам.

...Ужо мінуў быў тыдзень, як не паказваўся мой сусед, не турбаваў недарэчнымі ўчынкамі, не ўзрушваў адрэпеціраванымі прамовамі. Праўда, некалькі разоў нехта тэлефанаваў і маўчаў у трубку, але я не надавала значэння гэтай таямнічасці — эпоха герояў прамінула, нумар тэлефона маглі пераблытаць...

За гэты час я паспела спадціху прыгледзецца да Лявона і зрабіла выснову, што ён валодае якасцямі, якія прываблiваюць маю адзінокую эгаістычную натуру: быў элегантны, далікатны і мілы. Я вырашыла правесці з ім ноч. Не развітваючыся ні з кім, мы збеглі з банкетнай залы, злавілі на вуліцы таксі і канец вечара правялі ў нейкім рэстаранчыку, дзе п'янаваты скрыпач расчульваў залішне маркотнай ігрой. Нам з Лявонам удалося патаньчыць ля століка. За вокнамі расплывалася цямрэча, на шкле, не схаваным за фіранкамі, перасоўваліся варухлівыя светлацені, пабліскvалі яркія прадметы: келіхі, бутэлькі, жаночыя ўпрыгожанні.

Мы з Лявонам былі настолькі задаволеныя адно адным, што перасталі зважаць на прысутных і зліліся ў пацалунку.

— Табе добра?

— Надзвычай.

З таго, што мой розум, як і ў большасці жанчын, служыць не так для развагі, як для апраўдання спакус, — дык і задумвацца я пачала толькі нараніцу, калі Лявон паехаў пераапрануцца перад працай. Мой збянтэжаны позірк перахапіў яго на паўдарозе са спальні. Ён вярнуўся, выцягнуў мяне з-пад коўдры, прагна пацалаваў вочы, ружовыя торчыкі грудзей, некалькі хвіляў прыціскаў да сябе, а потым апусціў на ложак. Калі б мы прачнуліся раней ці часу ў нас было трохі болей, Лявон накрыў бы мяне не коўдрай...

Я даўно забылася на паняцце, што такое асабістае жыццё, і зараз блыталася ў здагадках: як мне ўдавалася так доўга вытрымліваць без мужчыны. Ёсць сцвярджэнне, што любоўны сум з'яўляецца тады, калі вы не зусім ведаеце свайго выбранніка. Блаславі, Божа, гэты час! Я не хацела ведаць Лявона лепей; ноч прынесла нам супакаенне, а дзень абяцаў хвіліны трымцення і чакання.

З працы я вярнулася раней: мы дамовіліся з Лявонам павячэраць у адной з утульных кавярняў у цэнтры горада. Калі пасля душу я пачала падфарбоўвацца, зазваніў тэлефон. Нехта доўга маўчаў, і я кінула трубку. Праз некалькі хвілін пазванілі ў дзверы.

— Як я вам падабаюся?

— Добры вечар, Сяргей.

— Вы ізноў памыліліся. Масье Пуаро, — прадставіўся юнак. На ім быў чорны брыль-кацялок і круглыя акуляры. Пуаро сцягнуў пальчатку і паціснуў маю руку.

— У масье ёсць справа? Заходзь і хутчэй распавядай, дзе ты быў. Але я спяшаюся.

— Вы сыходзіце?

Кіўнула яму; мае рукі ўжо былі занятыя бляшаначкай з крэмам, а вусны заціснулі грабянец.

— З... ім?

Юнак выглядаў сур'ёзна і незадаволена.

Я ўжо расчэсвала валасы і таму хутка адказала:

— З ім!

Сяргей адчуў урачысты тон і клічнік, зірнуў на мой адбітак у люстэрку і прысеў проста на кілім.

— Тут даволі змрочна, — падсумаваў ён, зняў акуляры і пачаў дбайна працiраць шкельцы.

Хлапечыя шчокі запалымнелі, ён на хвілю закашляўся, нібы яму стала блага, але ізноў зірнуў на мяне і нарэшце падзяліўся:

— Мы з маці адпачывалі пад Мінскам. У яе не было спектакляў і мы паехалі ў Дом творчасці тэатралаў.

— А школа?

— У мяне былі падручнікі... Я вам тэлефанаваў, — дадаў сур'ёзна.

— Калі? А-а, — здагадалася я. — Дык гэта ты маўчаў у трубку?

— Так, — прызнаўся юнак. — Я быў зусім нямым. Вы не спалохаліся?

— Не.

— А маці спалохалася. Давялося тлумачыць.

— А як вы размаўлялі?

— Вось так.

Сяргей паказаў рухамі, атрымалася вельмі камічна, і я рассмяялася. Ён рашуча падняўся, падышоў, каб дапамагчы мне зашпіліць кальe, зрабіў крок назад і пачаў строга азіраць мяне. Зрэшты, мой пакой і трумо выдавалі на грымёрную. Я азірнулася, войкнула і пачала рассоўваць рэчы — хутка павінен быў прыехаць Лявон.

Масье Пуаро нязмушана зноў апусціўся на кілім і паглыбіўся ў свае думкі, хаця мне час ад часу даводзілася пераступаць праз даўгалыгага сышчыка. Мой імпэт нарастаў з кожнай хвілінай, тады як Сяргей спрабаваў прыхаваць расчараванне. Дзіця хацела гуляць, а сяброўка па гульнях пакідала яго аднаго.

Лявон прыехаў своечасова. Я падфарбоўвала вусны, і Сяргей сам адчыніў дзверы. Я чула іх размову — нязначныя фразы, паблажлівы тон і аднастайныя адказы.

Мой мужчына зайшоў з букецікам кволых нарцысаў, па-гаспадарску пацалаваў у шчаку; ён доўга трымаў маю руку і нешта казаў. У праёме дзвярэй застыла недарэчная постаць Пуаро; герой быў надта малады і надта прыгожы, каб мы маглі спакойна пачувацца пры ім. Я нечакана сумелася і падміргнула, Сяргей зразумеў, спакойна развітаўся і сышоў. А разам з ім знікла і таямнічая тэатральнасць, якая адна рабіла мяне прымадонай усіх мінулых і будучых п'ес.

IV

Прайшлі два месяцы. Да мяне вярнуліся адчуванне маладосці і радаснага неспакою; працавалася лёгка, а калегі адносіліся да мяне з нейкай новай пяшчотаю. Магчыма, я прыдумала гэтую сваю хваробу — шчасце, забываючыся на тое, што канцом радасці часцей становіцца сум. Вясна сталася для мяне тым кавалачкам сыру, прымацаваным да пасткі, дзякуючы якому Лявону ўдалося ўпаляваць маю палахліва-дрогкую душу. Мой каханак быў надзіва пяшчотны ў інтымныя моманты; мы ўваходзілі ў ноч, як у мора, і шолах крухмальных прасцін быў гворам прыцішаных хваляў. Часам падавалася, што мяне, як трэску, нясе прыбой, кідае з вершаліны ўніз, а напярадзе — невядомасць і канец, які вынікае з правіла, а не з выключэння. Кажуць, што надта вялікае дабрадзейства становіцца

прыкрым, бо нам хочацца адплаціць за яго з лішкам, каб не быць абвінавачаным у няўдзячнасці. Магчыма — праўда, бо інакш чаму мне часам пачынала здавацца, што я жыву няправільна? Але такім думкам спрыялі не сустрэчы з Лявонам, а ўмольваючы Сяргееў позірк. Мой сусед ператвараўся ў задумлівага, замкнёнага юнака, які выклікаў спачуванне. І калі аднойчы ён завітаў да мяне з няшчасным выразам твару, я засмяялася ад здагадкі:

— П'еро?

Невядома з чаго зазлаваўшыся — на здагадку ці на смех? — ён скіраваўся ў ванную і доўга змываў грым; чорная, белая і чырвоная фарбы зніклі, але на іх месцы засталіся ружовыя пісягі, нацёртыя зламысна і нервова. Пазней ён «прымяраў» іншыя ролі, але адлучанасць і стома, уласцівыя П'еро, праглядалі шораз. Героі казак і раманаў яшчэ з'яўляліся на сцэне, але чамусьці ўдзельнічаць ім даводзілася ў адной і той жа п'есе, дзе побач з галоўнай гераіняй быў заўсёднапрысутны немалады каханак: не франт, не атлет, не секс-сімвал.

— Мне прапанавалі ролю.

— Але ж ты казаў, што ніколі не будзеш іграць у тэатры.

— Я так думаў.

— Відавочна, у цябе ёсць талент, але ж ты не займаўся ў студыі.

— Маці пазнаёміла мяне з рэжысёрам. Ён знайшоў мне ролю ў новай п'есе. Я буду казаць толькі некалькі фраз, але...

— Усе так пачынаюць?

— Не ведаю. Можа, некалі я сыграю тое, што хачу.

— Вось як! У цябе з'явілася любмая роля? І хто твой герой?

— Гаральд.

— Гаральд?

Я намагалася ўзгадаць...

— «Гаральд і Мод».

У ягоным голасе прамільгнулі злыя ноткі.

— А-а, малады дзівак, які пакахаў старую жанчыну? — я з цікаўнасцю зірнула на юнака. — Вось не думала, што табе хочацца заставацца незразуметым усё жыццё.

— Вы правільна сказалі. Я не люблю людзей, я хачу быць адзінокім і незразуметым.

— Гэта настрой. У маладосці ўсе прагнуць незалежнасці.

— Я сказаў — адзінокім.

— Але ж у цябе ёсць сябры, — я хутчэй запытала, чым сцвердзіла.

— Прыяцелі, — удакладніў Сяргей.

Мы памаўчалі. Я была ў тым стане спакою і ўпэўненасці, калі лёгка працягваць дыскусію, намагаючыся пераканаць іншага ў правільнасці сваёй жыццёвай пазіцыі.

— А табе не здаецца, што адзінота сведчыць пра бездапаможнасць?

Дзіўна, але зусім нядаўна я лёгка б пераканала, што гэта не так; чамусьці я забылася, як у сваёй адзіноце бачыла знак свабоды. Сяргей нічога не адказаў, толькі ўзяў са століка часопіс і пачаў гартаць. У галаву закраліся дзіўныя, неспадзяваныя думкі.

— Ты не любіш... табе не падабаюцца жанчыны? Дзяўчаты, — паправілася я.

— Не ведаю, — ён адказаў надта хутка, нібы здагадаўся, пра што я падумала, і зірнуў так уважліва, што давялося адвесці позірк. Мы сядзелі, як і раней, — насупраць, паціху мінаў вечар, які я вырашыла правесці адна. Лявон не турбаваў званкамі, мы бачыліся ўдзень.

Было яшчэ не так позна, калі раптоўна з'явіліся мае сяброўкі. Іх не бянтэжыла прысутнасць юнака — усе мы даўно знаёмыя, хаця пры Еве і Лілеі Сяргей не выходзіў з ролі сумна-абыякавага суседа, часцей маўклівага і ўдзячнага. Але гэтым разам, пабачыўшы жанчын, ён павесялеў, пачаў жартаваць, дапамагаць ім распранацца, развешваць мокрыя плашчы (на вуліцы ішоў дождж), подбегам кінуўся ставіць гарбатнік. Мяне не магла не парадаваць гэтая сцэнка, каб толькі не бянтэжлівае пытанне «ты не любіш... дзяўчат?». Я вырашыла пагаварыць з ім пазней.

Ева і Лілея прынеслі вясёлую неспадзяванку, нязмушаную свежасць прахалоды і, шчодра жэстыкулюючы, распрысквалі іх па пакоі, як кроплі майскага дажджу. Захацелася адчуць мокрыя цурочкі, выструніцца пад імі і застыць на колькі хвілін.

Сяргей зусім разняволіўся, і калі хто і змог бы адчуць раптоўную несуладнасць думак, дык гэта я. Мой пакой на імгненне ператварыўся ў вясёлы сялянскі лужок, на якім квахталі куры, гігікалі гусі, мычэў цялок і брахаў кволы цюцька: юнак смяшыў нас, вымушаючы прымаць удзел у шумлівай гульні. Засталося выцягнуць саламяны капялюш і прайграць яго ў фанты. За сваёй шчыраю энергіяй, дзіцячай няўрымслівасцю, шчодрай фантазіяй Сяргей хаваў сапраўдную ролю назіральніка за маімі паводзінамі і думкамі. Тое прыйшло ў галаву пазней, і я ведала, што адкрыццё — праўда. А пакуль я з захапленнем смяялася над прыдумкамі гасцей ды манерна піла гарбату, утульна ўладкаваўшыся на канапе.

Паездкі з Лявонам у стыльныя кавярні і дарагія рэстараны падаліся нерэальнымі, пустымі, як сцэна ў надуманым рамане. «Наступным разам я выцягну Лявона на вёску, — думалася мне. — Мы будзем блукаць па пыльных вулках, выйдзем да стаўка, каб пасядзець на пахілай вярбе. А насупраць, з лесу выйдуць «Песняры» і шырокім крокам пойдуць праз луг, да нас, спяваючы «Касіў Ясь канюшыну», — з іроніяй дадала сама сабе і блазнавата засмяялася.

Аптымістычнае жаданне пабыць на прыродзе не знікла. Я прапанавала сяброўкам правесці наступныя выхадныя за горадам. Нас будзе шасцёра, і мы выедзем рана, на ўзыходзе сонца. І будзем на нашым улюбёным месцы праз нейкія дваццаць хвілін.

Той, хто стаўся нявольнай прычынай будучых прыгод, апынуўся па-за планамі. Ён зразумеў гэта сам.

— Ужо позна. Я пайду.

Мы адчулі сябе ніякавата, і, мажліва, Ева і Лілея не ўбачылі нічога незвычайнага ў нявыказаным адмаўленні, непрыманні — усё выйшла само сабою так, як і павінна быць. Гэта не яны, а я прызвычаілася да Сяргея, да ягонай прысутнасці.

— А ты, — далікатна пачала пытаць я, — ты не зможаш паехаць з намі?

— Мне трэба рыхтавацца да іспытаў. — У ягоным голасе пачулася варожасць. — «І дай Бог вам такога шчасця, як беднаму студэнту Ансельму, які атрымаў прыгажуню Серпенціну і залаты гаршэчак».

Сяргей манерна пакланіўся, пацалаваў маім сяброўкам рукі і падышоў да мяне:

— Гофмана любіце?

Ён глядзеў проста ў вочы: ускудлачаны, востры, без ценю фальшы, імгненны філосаф, які ўпэўнена просіць не захінаць яму сонца*.

— Гофмана?

— Я прынясу вам... пасля наступных выхадных.

...Час ад часу ты ўспрымаеш самога сябе нібы збоку, фатаграфуеш, націснуўшы кнопку свядомасці. Я «выцягнула» свой фотаздымак ужо пасля адыходу гасцей: на фоне палымнеючых вяргіняў і ззяючых астраў узнік спалоханы твар з пераможнай усмешкай і цікаўнасцю ў вачах. Адзін, два, тры... замры.

V

Лявон з'явіўся ў прызначаны час без ваганняў: ён імкнуўся пазнаёміцца з усімі маімі сябрамі. Мы заехалі па Лілею і Вінцэся. Ева з Віктарам з'явіліся праз некалькі хвілін.

Дзве машыны, наладкаваныя прысмакамі і вясёлымі вандроўнікамі, кіраваліся па Ракаўскай шашы да прызначанага месца. Там, на беразе танклявага ручая, стаялі драўляныя столікі з лавамі і чарнелі месцы былых кастрышчаў. Мы любілі зрэдзьчас наязджаць

---

* За такую просьбу быў забіты легіянерамі Архімед.

сюды. Пэўна, і Лявон упадабаў гэтае месца ў лесе, непадалёк ад дарогі.

Мы звярнулі з шашы і прыпыніліся. Віктар, гуллівы бландзін з яснымі шэрымі вачыма, адразу ж спусціўся да ручая і паклаў у халодную ваду бляшанкі піва і бутэльку віна. Было не горача, але праз колькі часу мы паскідалі лёгкія курткі і кофты; запалала кастрышча; на століку стаялі выцягнутыя з валізаў варка з мясам, прыправы, кетчуп, хлеб, розныя пакункі. Покуль на «нашым» месцы мы былі адны, але многія мінчукі ведалі пра яго, і не было спадзеву, што ў такі гожы дзень сюды ніхто не зазірне. Мужчыны цягалі сухое галлё, Лявон шчыраваў з сякерай. Яму пасавалі паношаныя джынсы, скураныя спартовыя туфлі, блакітная клятчатая кашуля — яны рабілі яго вобраз блізкім, жаданым, але разам з тым і аскетычным да самаадрачэння. Я ніколі не бачыла яго ў простай, нязмушанай абстаноўцы, адпаведнай натуральным законам першабытнасці.

Калі нешта падаўжае радасць жыцця, дык гэта ўпэўненасць. Простая ўпэўненасць ў сабе, сваіх сілах, сваіх пачуццях. Зараз мне здавалася, што, калі б Лявон падышоў і прапанаваў з гэтага дня жыць разам, я б не адмовіла. Водар вясновага лесу вяртаў маладосць і прагу да жыцця. Хацелася, каб ніколі не міналі цёплыя дні і чароўныя ночы, каб кружылася галава ад пяшчоты і ветру, ад віна і пацалункаў, а наперадзе былі б — праца, дом, радасці, турботы...

Незалежна ад гэтых перажыванняў існавала іншая пэўнасць, што недзе там, у будучым, мяне чакае «сапраўднае» жыццё, а не часовае задавальненне сабой. Я вырашыла, што ўсё гэта — перажыванне і разуменне — ад нервовай узрушанасці і неспакою апошніх месяцаў. А ці не здаецца мне, што хаос майго існавання — залежнасці-незалежнасці ад Лявона, чакання і абыякавасці, жадання і непрыняцця, — я ператварыла ў сістэму самасцвярджэння?

— Табе сумна? — спытаўся Віктар. Ён заўжды добра ставіўся да мяне. Сухавата-разважлівая Ева скарыла яго трываласцю і інтэлектам.

Ён быў з тых мужчын, якім да апошніх дзён патрэбна нянька.

— Усё добра.

— Мне падабаецца твой сябра. Добры мужык.

Я ўсміхнулася.

...Ужо мінуў поўдзень, выцягнутыя цені перасунуліся, і ў зялёным пейзажы з'явіліся новыя фарбы. Усё нібыта стаіла дыханне: і гэтыя дрэвы, звернутыя да мяне, і цішыня, і праніклівае святло, свежае, гожае, як празрыстая слюда, што ахоўвае нежывы букет узімку. Фларыстыка раптам напоўнілася пахамі блізкага лета, і жвавы сонечны зайчык знайшоў заспакоены прытулак у маёй памяці.

Але мой погляд перабег, і слых злавіў мілагучны плёскат, а потым шум матора: жыццё ўзнавілася.

Недалёка спынілася машына, пачуўся бесклапотны смех; бясспрэчна, там была моладзь. Дзявочы голас з імгненнай ненатуральнай узрушанасцю, прагнасцю. А між намі — паляна, залацістае сонца і філігранныя ўзоры пераможна-ззяючай лістоты. Аднолькавасць мэтаў дзвюх розных купак людзей: зрабіць прыватным хоць на некалькі гадзін маленькі кавалачак Прыроды; гіпнатычнае імкненне нашчадкаў да ўяўнай прарадзімы павінна было калі не з'яднаць, дык не даць з'явіцца палахліва-раўнівай адасобленасці. І як толькі зразумелі прысутнасць адно аднаго, мы знітаваліся, змацаваліся кожны паасобку: два невялікія гурты і сонца-пастух.

Нарэшце наш пікнік быў закончаны: маса з'елі, выпілі віно і можна было не падтрымліваць бесклапотную размову ні пра што. Мне захацелася заглыбіцца ў хвою, туды, куды не дасягае ўважлівы позірк Лявона, дзе самаадсутнасць і ціша.

— Хочаш, пагуляем па лесе? — Лявон узяў мяне за локаць.

— Я пагуляю адна.

На імгненне ён збянтэжыўся, нібы я сказала недарэчнасць, але прыбраў руку. За столікам наша задаволена-вясёлая кампанія пачала гульню ў карты. Лілея двухсэнсоўна падміргнула нам, а я павярнулася і разгублена рушыла насустрач дрэвам.

— Далёка не заходзь! — у голасе Лявона чуліся ноткі клапатлівай пяшчоты. Я кіўнула.

— І хутчэй, мы цябе чакаем, — здаецца, Віктар. Я азірнулася і ўсміхнулася ім, каб не пакінуць сумневу, што са мной усё добра і можна не хвалявацца.

Я прамінула першыя дрэвы і адразу ж спіною адчула, як закончылася прастора, мяне абступілі цёмныя прамыя ствалы соснаў; вырашыла не заглыбляцца, а кіраваць уздоўж краю. Лес быў не дужа густы: добра бачны два тонкія слупкі дыму над нашым і чужым кастрышчам. Духмяна і цёпла вакол. Збоку я заўважыла рухомы цень — нехта ішоў нетаропка, нягучна пастукваючы па дрэвах дубцом. Постаць і спакойныя, упэўненыя жэсты выклікалі давер. Мы б і не сутыкнуліся, калі б юнак не скіроўваўся да мяне. Я спынілася і адразу ж пазнала яго.

— Якое выдатнае, ціхае месца, — сказаў Сяргей. — Мы прыехалі на машыне...

— Толькі не кажы, што збіраеш галлё і выпадкова натрапіў на мяне.

— А гэта... — для большай пэўнасці ён падняў сухі дубец, якім толькі што стукаў па соснах. Ён зірнуў прама ў вочы, хаваючы няёмеласць. Усведамленне ягонай прысутнасці — узрушэнне; падалося — я адчуваю, як пульсуе ягоная кроў, як сцінаюцца сківіцы і

доўга не можа пракаўтнуцца сліна; нібы наша стрэча выклікала аскоміну. А наяве — два ўкамянелыя, утрапёныя звяркі, што восьвось раззлуюцца... Відочна, у ім нешта змянілася, нібы ён імгненна пасталеў, — але, насуперак гэтай здагадцы, я звярнула-адцягнула ўвагу на другаснае, дробязнае. Зусім нядаўна ён нахіляўся над кастрышчам — на правай шчацэ ледзь бачныя пісягі попелу. Ён прагна ўздыхнуў і працягнуў руку — асцярожна, марудна ягоныя пальцы набліжаліся да майго твару.

— Ты... запэцкалася... можна? — дотык халаднаватых пальцаў. Сінхронны рух.

— І ты.

Сяргей недаверліва пасміхнуўся. Я бачыла толькі вочы: два вялікія жэралы незнаёмай планеты, якія ведалі праўду нечаканасці нашага з'яўлення тут. І пальцы, што вучыліся прамаўляць на мове пачуццяў, нясмела сцвярджалі: «Нарэшце... гэта ты». «Не», — раскрыліся вусны. «Так», — адказалі вусны. Два розумы паверылі ў існасць чароўных дзіцячых казак і штурхнулі нас насустрач. Твары наблізіліся так шчыльна, што неабачлівыя героі забыліся на існаванне іншых людзей, іншай рэчаіснасці, і, зрэшты, іншых казак.

VI

Тое, што адбывалася са мной потым, было неверагодным. Я зноў прагнула незалежнасці. Зрэшты, у мяне быў свой дом, праца, і я падпарадкоўвалася Лявону роўна настолькі, каб не зрабіць балючым наш разрыў. Цяжкасць была толькі ў тым, каб сказаць яму словы праўды і пражыць з'едлівасць. Мне ж ён не мог зрабіць балюча, бо не існавала кахання... толькі самападман, жаданне і шал.

Я прайшла ў ванную і стала пад ледзь цёплы душ. У гэтую хвіліну мне забажалася адчуць над сабой сапраўдныя хвалі, моцныя ўдары, а не марудны іх бег, каб можна было на нейкія хвілі схавацца пад вадой і, магчыма, прыцішыць сверб сумлення, сумненні і сорам. Але, падставіўшы твар пад гонкія струменьчыкі, я адчула, як цела захліствае пачуццё незразумелага і з таго бесклапотнага шчасця.

— Што здарылася? — запытаў Лявон, калі ўдзень (неверагодна даўно!) я вярнулася з лесу да сяброў.

— Анічога.

Я намагалася нязмушана прамовіць такое кароткае слова. Але вусны палалі ад пацалункаў і я ўсё выціралa іх, нібы мой юнак карыстаўся памадай. Але ж гэта я, я фарбавала вусны і баялася, што ад палкіх парыванняў яркія пісягі застануцца на твары. Зялёная сцяблінка, якой я спрабавала перабіць смак пацалункаў, не дапама-

гала. Відавочна, нешта адбывалася, і мне даводзілася толькі здзіўляцца жанчыне, якая ў Трыццаць Дзевяць гадоў так і не навучылася прыхоўваць пачуцці.

— Пэўна, моладзь займалася ў лесе каханнем, і Яніна гэта пабачыла.

Ратаванне прыйшло ад Евы. Мае шчокі запалымнелі, як уявілася няздзейсненае: мы з Сяргеем нястрымна апускаемся долу. Лілея таксама не ўтрывала:

— Што ты бачыла?

— Нічога. І нікога... Мне падалося, што я заблукала.

— Ты клікала?

— Не. Проста я задумалася, а потым зразумела, што адышлася далёка.

Мы вярнуліся ў горад вясёлыя, смяшліва-гаваркія. У апошні момант я папярэдзіла Лявона, што стамілася і хачу пабыць адна. Ён не пярэчыў, мае збянтэжанасць і раптоўнае хваляванне засталіся забытымі. Лявон пацалаваў мяне ў шчаку і спакойна ад'ехаў ад пад'езда.

Потым я ляжала ў замкнёнай кватэры і бесперастанку вяртала ся ў лес... Да таго моманту, як у дзверы пазванілі. На ім не было звыклых акцёрскіх аксэсуараў і прыкмет грыму. І ў новай ролі ён падабаўся мне больш. Ягоная ціхая ветлівасць ператварылася ва ўпэўненасць, а хлапечая цнатлівасць у неадольны агонь жадання. Дома ён папярэдзіў, што з'едзе на два дні. Ён не пытаў майго рашэння.

Я адключыла тэлефон, ведаючы, што раніцай давядзецца званіць на працу і выдумляць прычыну, каб застацца... Але ўсё гэта імгненна знікла, калі недаверліва-пераможна прагучала пытанне:

— Ты мяне кахаеш?

Я чула ягоны голас, знаёмыя інтанацыі, разумеючы новае прызначэнне ягонай прысутнасці тут. Ён заставаўся для мяне сябрам і адначасова станавіўся мужчынам, з якім мы пазнаёміліся толькі ўдзень. Закаханы хлопчык выклікаў шкадаванне, узрушаны юнак — пяшчоту, незнаёмец-мужчына — прагнасць.

Мы ведалі твар і голас адно аднаго, але не ведалі насалоды. Пытанне павісла ў паветры, настойліва прыцятае новым патрабавальным знакам:

— Ты мяне кахаеш?

Я толькі выдыхнула, як ён абхапіў мяне рукамі і моцна прыціснуў. Ён трымаў мяне ў абдымках некалькі хвілін, але менавіта яны далі ўпэўненасць, што мой абранец дужы і моцны, ён — рыцар і абаронца будучага кароткага шчасця.

...Калі ён заснуў у маіх абдымках, прыйшлі думкі, у якіх пераважалі цвярозыя развагі. Я ляжала, а марудныя хвіліны прыносілі

новы пакутлівы боль самааналізу. «Я не маю права кахаць яго. І як патлумачыць Лявону тое, што адбылося? Я вартая нянавісці, у горшым выпадку — іроніі, злосці... Але за што сябе асуджаць? Я хачу падарыць каханне гэтаму юнаку... А калі яно зробіць яго няшчасным? І ці не зрабіла я няшчасным Лявона?»

Я заснула ў пакутах, але так і не прызналася да канца ў сваёй памылцы. Хацелася, каб Сяргей абняў мяне, прылашчыў, прыціснуў да сябе на цёплым вільготным ложку, поўным смутку, разгубленасці і шчасця... Я заснула ў той момант, калі вакно адкрыла суцішанаму погляду блакітна-ружовае неба і палёт ранішніх галубоў.

.....

...Мы адначасова адплюшчылі вочы... Я прайшла ў ванную і стала пад ледзь цёплы душ. У гэтую хвіліну мне забажалася адчуць пад сабой хвалі, іх моцныя ўдары ў выструненае, гладкае цела, каб можна было на нейкія хвілі забыцца і, магчыма, прыцішыць сверб сумлення, сумненні і сорам. Але, падставіўшы твар пад гонкія струменьчыкі, я адчула, як цела захліствае пачуццё незразумелага і з таго бесклапотнага шчасця...

...Мы адначасова адплюшчылі вочы.

— Мілая мая, — усміхнуўся Сяргей.

— Мілы... — няўпэўнена паўтарыла я.

— Не.

Ён правёў пальцам па маіх вуснах і пяшчотна пацалаваў.

— Цяпер ты можаш называць мне мяне проста: Вялікі.

Ultima ratio*.

1995

---

* Апошні довад, рашаючы аргумент (*лац.*).

25 кастрычніка 2002 года ў газеце «Літаратура і мастацтва» з'явіўся тэкст пад назваю «Траекторыя блуканняў — і супраціўнага руху. *Змушаны эксклюзіў*». Публікацыя гэта сталася ўнікальнаю таму, што тычылася кнігі, якая на той момант існавала ў «віртуальна-рукапісным» варыянце, з прычыны адсутнасці фінансавых сродкаў на яе выданне.

Аднак, Слова насамрэч мае ўласцівасць матэрыялізавацца, таму артыкул кандыдата філалагічных навук, літаратуразнаўцы, крытыка І.Шаўляковай урэчаўляецца як прадмова, брама ў мастацкі свет кнігі В. Куртаніч «Залюстрэчча для Алісы».

Ірына ШАЎЛЯКОВА

ТРАЕКТОРЫЯ БЛУКАННЯЎ — І СУПРАЦІЎНАГА РУХУ

Змушаны эксклюзіў

Эпоха эстэтычнага міжчасся правакуе творцу на «эмацыйна-пачуццёвы эксгібіцыянізм»: адны аўтары задавальняюцца цнатліва-какетлівым «стрыптызам», другія чэрпаюць натхненне ў «бруталь-насці» адчуванняў, трэція перажываюць экстаз, эпатуючы ды шакіруючы носьбітаў унармаванай маралі — пакідаючы «шнар... на твары свету» (Г. Мілер)... Варта заўважыць: размова не столькі пра хваравітую цягу да цялеснай аголенасці (у нашым кантэксце — актуалізацыю ў літаратурна-мастацкім полі (неа-)натуралісцкай эстэтыкі), колькі пра надзвычайную ўвагу сённяшніх пісьменнікаў да «фізіялогіі пачуцця». [Апошняе, напэўна, вымагае ад творцы шчэ большай адвагі, бо ў маналітна-магутнай свядомасці «шырокай чытацкай аўдыторыі» вобраз галоўнага персанажа ці я-героя стала праецыруецца на маральны воблік самога аўтара.]

Творы Вольгі Куртаніч *справакаваныя* эпохаю — міжчассем, міжсезоньем, міжбыццём у тлуста-галінастай ***НЯПЭЎНАСЦІ***.

Яе паэзія здаецца мне *кампрамісам* з беспадстаўнасцю жыцця: аўтар апранае лірычнага героя ў «маньерыстычна-ракакошна-ампірныя» тропы, з энтузіязмам упрыгожвае імі свой паэтычны космас, нібы хаваючы за шыкоўным арнаментам, дэкаратыўнаю «ляпнінаю» татальна-глабальную разгубленасць, і адчай, і адзіноту. [Рускія вершы, як на мой густ, згаданымі тропамі перанасычаныя (напрыклад, зборнік 2001 года «В блистании строк...»), у арыгінальных беларускіх вершай той «арнаменталізм» паўстае значна больш натуральным, умеркаваным — параўнайце з цыклам вершаў «Валавуд» у «ЛіМе» за

13 верасня 2002 года)]. Таму і злосць альбо раздражнёнасць у гэтай мастацкай прасторы ўспрымаюцца часткаю рытуалу: сусветная самота *нібы* «замацаваная» ў эстэтычнай норме.

Яе проза ўяўляецца мне *формаю супраціву* эпосе і адначасова пэўным *выклікам* мастацкаму канону айчыннага — грунтоўна-салідна-прыстойнага — «прыгожага пісьменства». У гэтым супрацьдзеянні, хадзе «супраць плыні» няма і ценю дэманстратыўнай капрызлівасці «enfant terrible»: ідэйна-эстэтычныя пошукі, логіка аўтарскай творчасці (і стваральнасці) вынікаюць з першаснага непрыймання *тыповасці* (прадмета, з'явы і асабліва пачуцця) як усярэдненасці, той «дурной паўтаральнасці», растыражыраванасці жыццёвых праяў і вобразаў, праз якую страчваецца каштоўнасць пакутлівай, апрыёрна простай — і найскладанай — асалоды быць.

«Залюстрэчча для Алісы» (1994, 1996) — жанр вызначаны празаікам як «раман-парафраз», — узнікае на скрыжаванні аўтарскага адмаўлення звыкла-пазнавальнага, прадказальнага, чакаемага (паводле тэматыкі, унутранай будовы, вобразна-выяўленчых сродкаў і г.д.) аповеду — і традыцыйнай выкшталцонай «літаратуры пачуцця». У *літаратуразнаўстве* парафраз(а) — не блытаць з перыфразам(аю)! — гэта літаратурны тэкст, што з'яўляецца скарочаным ці пашыраным пераказам іншага тэкста. У гэтым сэнсе жанравае наватарства Вольгі Куртаніч паўстае сумніўна паспяховым, бо ўтрымлівае семантыку другаснасці, своеасаблівага «эпігонства». Аднак у кантэксце *музыказнаўства* парафраз(а) асэнсоўваецца як твор віртуознага характару на адну ці некалькі запазычаных тэм, што аздабляюцца і вар'іруюцца (прычым асобныя варыяцыі звязваюцца паміж сабою разнастайнымі пераходамі, пасажамі).

«Раман-парафраз» Вольгі Куртаніч адмыслова спалучае супраціў (эпосе) і гульню (з ёю ж): так, *інтэртэкстуальнасць* («меч» і «арала», «клюшка» і «коўзанка» постмадэрну) адразу ж выразна акрэсліваецца ў якасці вызначальнага сюжэтна-кампазіцыйнага прынцыпу. Аднак настроенасць на другаснасць аповеду (прадчуванне «паразітарных» стасункаў з творамі Л. Кэрала) нейтралізуецца ад самага пачатку разгортвання аповеду: бо *гульня* (на розных узроўнях індывідуальна-аўтарскага стылю) ніколі не азмрочваецца нематываванаю альбо навязліваю *гуллівасцю*, а *пачуццёвасць* тут ніколі не асацыіруюецца з легкаважнасцю ці таннасцю.

Паэтыка дзівацтваў у «Залюстрэччы для Алісы» знітоўваецца з *паэтыкаю дзівосаў* — блуканні сярод звабна-тлумнага кірмашу, які адначасова ёсць дзея, лабірынт, імгненныя люстрункі, зліццё вечнасці з нябытам.

Зрэшты, у прозе Вольгі Куртаніч адсутнасць пэўнасці (што ўсведамляецца як атмасфера, скразная «музычная» тэма, усюдыісны і з цяжкасцю вербалізуемы матыў) — зусім не нагода для апатыі; гэтак-

сама ў хаосе с к р о з ь бязладнасць, какафонію заўважаецца адмысловае суладдзе, *гармонія няправільнасці*. У аповесці «Па вузкай дарозе ў цесную браму» (1997) «бязмэтны» рух («Мы ехалі ў Сафію: ён — дадому, я — у нікуды»; «Што раблю я тут, у незнаёмым горадзе, я, жанчына, якая прагне вясны?») заварожвае менавіта сваёю непрадказальнасцю, «непраграмуемасцю» наступнага — аўтарска—сааўтарскага (чытацкага) кроку: «Гісторыя паўторыцца наноў. У марах, успамінах, наяве — тое яшчэ не ведае ніхто з вас. <...> Хроніка апошніх дзён завершыцца абдымкамі на вакзале; паводле злой іроніі, цягнік прыбудзе ўвечары, у той час, калі размытыя цені падкрэсляць прысутнасць чорных постацяў; жалоба скончаная! — крыкну ў адкрытае вакно, але ніхто не зразумее, хіба што нехта адзін, а можа...»

У «індывідуальным» (адзінкава-ўніверсальным) космасе прозы Вольгі Куртаніч шматкроп'е — як штандар збройнага чыну, сімвалічная выява аднаго прыватнага «Дрэва Сусвету». Бо *ад яго* ратуюцца яе героі, але і *ў ім*, шматзначна-няпэўным, ратуюцца. [У апавяданні «У прымрак самоты, у звабны адчай» (1995) тыя «ўцёкі» дэкарыраваны пастаральнымі пейзажамі, у п'есе «Ружы для чужога каханка» (1994) — класічна-авангарднымі «геаметрычнымі фігурамі» (Ён — і Яна[3], г. зн. сяброўка, жонка і пляменніца сяброўкі), у аповесці «Эдэм пачынаецца летам» — бліскавіцамі багемнасці .]

«Агасферавым кляйном» — напаўсцёртым ці свежавыпаленым, — пазначаны, побач з іншымі героямі, Запознены з аповесці «Распусніца, альбо Чырвоная Шапачка са Швальмштата» (2000—2001). Часам ён Уладальнік, часцяком Няўдачнік — р а с к р о п л е н а с ц ь, раскрыжаванасць яшчэ аднаго лёсу на ростанях Долі: «Горад клікаў, але без указальнікаў...<...> Запознены азірнуўся, ён згубіў перспектыву быцця; побач мастак маляваў нямецкі пейзаж вечаровага горада, сонца садзілася за статую незнаёмага пакутніка, жыццярадаснасць змрочнага быту...».

У прозе Вольгі Куртаніч пахі — уцялесненыя, гукі — пластычныя, і ўсё аказваецца не тым, чым здавалася пры першым набліжэнні, і аўтар рухаецца не ў кірунку звыклых чаканняў чытача, а супраць іх, нават супраць сябе, насуперак сваім абяцанням. [*Такая* проза не прадчуваецца ў яе вершах — хутчэй, паўстае контраргументам, надзвычай пераканаўчым і ў сэнсе *паэтычнасці*.]

У гэтым святе сціплага супраціву творца — заложнік уласнае перамогі: прагнучы трыумфу над НЯПЭЎНАСЦЮ, ці ўзрадуешся перамозе над сабою — дзіцем, плёнам, няпэўным чыннікам эры Няўпэўнасці?..

Неістотная, але неабходная заўвага: кніга прозы Вольгі Куртаніч, якую складаюць раман-парафраз «Залюстрэчча для Алісы», аповесці «Па вузкай дарозе ў цесную браму», «Распусніца, альбо Чырвоная

Шапачка са Швальмштата», «Эдэм пачынаецца летам», апавяданне «У прымрак самоты, у звабны адчай», п'еса «Ружы для чужога каханка», існуе ў віртуальным (камп'ютэрным) і рукапісным (самая, пэўна, бессмяротная — шкада, толькі «метафізічна» даступная, — «інкарнацыя» тэксту) фарматах.

Разнапафасна засведчаны на розных грамадска-дзяржаўных узроўнях крызіс беларускага кнігадрукавання, такім чынам, аб'ектыўна спрыяе ўзрастанню ролі, пашырэнню ўплывовасці крытыкі (ці, прынамсі, яе герменеўтычнай фракцыі): калі нічога не зменіцца, і дасць Бог крытыку ногі, як таму ваўку, і жвавасці, і інтэрпрэтатарскага імпэту, дык у хуткім часе ўся найноўшая беларуская літаратура будзе даступная Вам, вельмішаноўны Чытач, у чужым эмпірычным вопыце. [Sapienti sat?*]

---

* Разумнаму дастаткова *(лац.)*.

ЗМЕСТ

Раман-парафраз
Залюстрэчча для Алісы 3

Аповесці
Па вузкай дарозе ў цесную браму 85
Распусніца, альбо Чырвоная Шапачка са Швальмштата . 117
Эдэм пачынаецца летам 149

П'еса
Ружы для чужога каханка 177

Апавяданне
У прымрак самоты, у звабны адчай... 283

І. Шаўлякова. Траекторыя блуканняў —
і супраціўнага руху 307

Літаратурна-мастацкае выданне

Куртаніч (Мешчаракова) Вольга Іванаўна

Залюстрэчча для Алісы

Раман-парафраз, аповесці, п'еса, апавяданне

Рэдактар *С. Расянчук*
Карэктар *І. Барзенка*
Камп'ютэрны набор і вёрстка *Л. Ваўчок*
Адказны за выпуск *Г. Вінярскі*

Падпісана да друку 21.03.2003 г. Фармат 84x108 $^{1}/_{32}$
Папера афсетная. Ул.-выд. арк. 13,51. Ум. друк. арк. 16,38.
Наклад 300 асоб. Зак. 703.

МГА «Беларускі кнігазбор».
220034, Мінск, вул. Фрунзе, 5.
Тэл./факс (017) 220-70-27.
Ліцэнзія ЛВ № 105 ад 31.12.2002 г.

Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка
ў друкарні УП «Ходр» БелТІЗ.
220004, г. Мінск, вул. Вызвалення, 9.
ЛП № 91 ад 12.12.2002 г.

"А любовь она всегда причудница... Очень важно, берясь за эту тему, идти от описательности к психологии. Это очень сложно, но именно так и создавался мой роман "Залюстрэчча для Алісы". Думаю, после выхода в свет *этот роман станет самым скандальным произведением современной отечественной литературы.* Здесь сплетены воедино христианство, иудаизм, мистика, эротика, чувства и чувственность.

И вместе с тем по отзывам известных литературных критиков, читавших роман в рукописном варианте, это высокохудожественное творение..."

З інтерв'ю газеце "Советская Белоруссия"

Проза Вольгі Куртаніч -- гэта анталогія пачуцця і міфалогія пачуццёвасці, выкшталцоная літаратурная гульня, не азмрочаная таннаю гуллівасцю.

Ірына Шаўлякова, літаратурны крытык

Беларускай літаратуры заўжды не хапала еўрапейскасці. Дзякуючы незраўнальнаму таленту Вольгі Куртаніч наша нацыянальная проза становіцца ЕЎРАПЕЙСКАЙ...

Андрэй Федарэнка, пісьменнік

Kurtanich. narod. ru

9 789856 638988

Вольга КУРТАНІЧ

ЗАЛЮСТРЭЧЧА ДЛЯ АЛІСЫ